unesco

# ПЕРААСЭНСОЎВАЕМ НАШУ БУДУЧЫНЮ РАЗАМ

## Новы сацыяльны кантракт на адукацыю

ДАКЛАД МІЖНАРОДНАЙ КАМІСІІ ПА БУДУЧЫНІ АДУКАЦЫІ

**ЮНЕСКА – глабальны лідар у адукацыі**

Галоўны прыярытэт ЮНЕСКА – адукацыя, бо гэта адно з асноўных правоў чалавека, падмурак для міру і ўстойлівага развіцця. ЮНЕСКА – гэта спецыялізаванае агенцтва Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па адукацыі, якое прапануе глабальнае і рэгіянальнае лідарства ў забеспячэнні прагрэсу, умацоўвае ўстойлівасць і здольнасць нацыянальных сістэм забяспечваць патрэбы ўсіх навучэнцаў. ЮНЕСКА таксама ўзначальвае працу па рэагаванні на сучасныя глабальныя выклікі праз трансфармацыйнае навучанне, надаючы асаблівую ўвагу гендарнай роўнасці і праблемам Афрыкі ва ўсіх сваіх дзеяннях.

**Ініцыятыва "Будучыня адукацыі"**

Міжнародная камісія па будучыні адукацыі была заснавана ЮНЕСКА ў 2019 годзе для пераасэнсавання таго, як веды і навучанне могуць фарміраваць будучыню чалавецтва і планеты. Ініцыятыва прадугледжвае шырокі ўдзел грамадства і экспертаў і накіравана на актывізацыю глабальных дэбатаў адносна пераасэнсавання адукацыйных патрэбаў у свеце, які робіцца ўсё больш складаным, неакрэсленым і крохкім.

unesco

Арганізацыя ААН
па пытаннях адукацыі,
навукі і культуры

Апублікаваны ў 2021 годзе Арганізацыяй ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры
7, place de Fontenoy, 75352 Парыж 07 SP, Францыя

© UNESCO 2021

ISBN 978-92-3-100478-0

CC BY SA

Гэтая публікацыя знаходзіцца ў адкрытым доступе згодна з ліцэнзіяй Attribution-ShareAlike 3.0 IGO (CC-BY-SA 3.0 IGO) (http://creativecommons.org/licenses/by-sa/3.0/igo/). Карыстальнікі зместу гэтай публікацыі пагаджаюцца на ўмовы выкарыстання. Сховішча адкрытага доступу ЮНЕСКА (http://www.unesco.org/open-access/terms-use-ccbysa-en).

Выкарыстаныя абазначэнні і прэзентацыя матэрыялу ў гэтай публікацыі не атаясамліваюцца з выказваннем якога-небудзь меркавання з боку ЮНЕСКА адносна прававога статусу любой краіны, тэрыторыі, горада, раёна ці ўладаў або адносна дэлімітацыі іх межаў.

Сябры Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі нясуць адказнасць за выбар і падачу фактаў, якія змяшчаюцца ў гэтай публікацыі, а таксама за выказаныя ў ёй погляды. Яны не абавязкова супадаюць з поглядамі ЮНЕСКА і не накладаюцьна Арганізацыю аніякіх абавязкаў.

Copy-editor: Mary de Sousa

Designed and printed by UNESCO

Printed in France

Праца Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі была шчодра падтрымана Шведскім агенцтвам па пытаннях міжнароднага развіцця (Sida), урадам Францыі і банкам "Santander".

К А Р О Т К А Е   Р Э З Ю М Э

## Новы сацыяльны кантракт на адукацыю

Чалавецтва і наша планета Зямля знаходзяцца пад пагрозай. Пандэмія толькі ўзмацніла доказы нашай крохкасці і нашай узаемазвязанасці. Цяпер неабходныя тэрміновыя супольныя меры, каб змяніць курс і пераасэнсаваць нашу будучыню. У гэтым дакладзе Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі прызнаецца здольнасць адукацыі ажыццявіць глыбокія змены. Перад намі стаіць падвойная задача: выканаць нявыкананае абяцанне забяспечыць права кожнага дзіцяці, юнака ці дзяўчыны і дарослага на якасную адукацыю і цалкам рэалізаваць трансфармацыйны патэнцыял адукацыі як шляху да ўстойлівай калектыўнай будучыні. Для гэтага нам патрэбны новы сацыяльны кантракт на адукацыю, каб выправіць несправядлівасць і адначасова рэфармаваць будучыню.

нам патрэбны новы сацыяльны кантракт на адукацыю, **каб выправіць несправядлівасць і адначасова рэфармаваць будучыню**

Гэты новы сацыяльны кантракт павінен грунтавацца на правах чалавека і засноўвацца на прынцыпах адмовы ад дыскрымінацыі, на сацыяльнай справядлівасці, павазе да жыцця, на чалавечай годнасці і на культурнай разнастайнасці. Ён павінен укараняць этыку клопату, узаемнасці і салідарнасці, умацоўваць адукацыю як грамадскую справу і агульнае дабро.

Гэты даклад, які рыхтаваўся два гады ў працэсе глабальных кансультацый з удзелам каля аднаго мільёна чалавек, прапануе ўрадам, установам, арганізацыям і грамадзянам ва ўсім свеце распрацаваць новы сацыяльны кантракт на адукацыю, які дапаможа нам пабудаваць мірную, справядлівую і ўстойлівую будучыню для ўсіх нас.

Прадстаўленыя тут бачанні, прынцыпы і прапановы з’яўляюцца толькі зыходным пунктам. Іх пераклад і кантэкстуалізацыя былі калектыўнай працай. Шмат якія з адметных момантаў ужо існуюць. У дакладзе зроблена спроба іх вызначыць і абаперціся на іх. Гэта не падручнік і не схема дзеянняў, а пачатак вельмі важнай размовы.

UNESCO unesco

“Паколькі войны пачынаюцца ў свядомасці мужчын і жанчын, менавіта ў свядомасці мужчын і жанчын неабходна будаваць абарону міру”.

# ПЕРААСЭНСОЎВАЕМ НАШУ БУДУЧЫНЮ РАЗАМ

## Новы сацыяльны кантракт на адукацыю

ДАКЛАД МІЖНАРОДНАЙ КАМІСІІ ПА БУДУЧЫНІ АДУКАЦЫІ

# Прадмова

## Генеральнай дырэктаркі ЮНЕСКА

### Одры Азуле

Калі штосьці і зблiжала нас у апошнiя паўтара года, дык гэта пачуццё безабароннасці ў сучаснасці і няўпэўненасці ў будучыні. Цяпер мы ведаем больш, чым калі-небудзь раней, што патрэбныя неадкладныя дзеянні, каб змяніць курс чалавецтва і выратаваць планету ад далейшага разбурэння. Але гэтыя дзеянні павінны быць доўгатэрміновымі і спалучацца са стратэгічным мысленнем.

Адукацыя адыгрывае жыццёва важную ролю ў вырашэнні гэтых складаных задач. Тым не менш, як паказала пандэмія, адукацыя нетрывалая: на піку пандэміі COVID-19 1,6 мільярда навучэнцаў пацярпелі ад закрыцця школ па ўсім свеце.

Мы ніколі так не шануем нешта, як пры сутыкненні з яго стратай. Таму ЮНЕСКА вітае гэты новы даклад “Пераасэнсоўваем нашу будучыню разам: новы сацыяльны кантракт на адукацыю”, падрыхтаваны Міжнароднай камісіяй па будучыні адукацыі пад кіраўніцтвам Яе Экцэленцыі мадам Сахле-Ворк Зеўдэ (Shale-Work Zewde), прэзідэнткі Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія.

З моманту свайго заснавання 75 гадоў таму ЮНЕСКА замовіла некалькі глабальных дакладаў, каб пераасэнсаваць ролю адукацыі ў моманты ключавых трансфармацый грамадства. Першым быў даклад Камісіі Фор 1972 года “Вучымся быць: свет адукацыі сёння і заўтра”, потым – даклад Камісіі Дэлора 1996 года “Навучанне: скарб унутры”. Абодва гэтыя даклады былі праніклівымі і ўплывовымі; аднак за апошнія гады свет кардынальна змяніўся.

Як і папярэднія даклады, даклад Камісіі Сахле-Ворк пашырае дыскусію адносна дактрынаў і прынцыпаў, неабходных для накiравання адукацыі на паляпшэнне існавання ўсіх жывых істот на гэтай планеце. Ён распрацоўваўся на працягу двух гадоў на аснове шырокіх кансультацый з больш чым мільёнам чалавек.

Калі даклад чамусьці нас і вучыць, дык гэта асэнсаванню таго, што мы павінны зрабіць неадкладныя крокі для змены курса, таму што будучыня людзей залежыць ад будучыні планеты, і абедзве будучыні знаходзяцца пад пагрозай. У дакладзе прапаноўваецца новы кантракт на адукацыю, якая накiравана на перабудову нашых зносін паміж сабой, з планетай і з тэхналогіямі.

Гэты новы сацыяльны кантракт – наш шанц выправіць былыя несправядлівасці і змяніць будучыню. Ён перш за ўсё грунтуецца на праве на якасную адукацыю на працягу ўсяго жыцця, разглядаючы выкладанне і навучанне як агульныя намаганні грамадства і таму агульнае дабро для ўсіх.

Рэалізацыя гэтага бачання адукацыі не з'яўляецца невыканальнай задачай. Надзея жыве, асабліва сярод малодшых пакаленняў. Аднак нам спатрэбяцца крэатыўнасць і інтэлект усяго свету, каб гарантаваць, што наша будучыня будзе вызначацца інклюзіяй, роўнасцю, правамі чалавека і мірам. Нарэшце, гэта менавіта тое, што гэты даклад нас заклікае зрабіць. Нават зыходзячы з гэтага, можна сказаць, што ў ім ёсць каштоўныя ўрокі для кожнага з нас.



**Одры Азуле**
Генеральная дырэктарка ЮНЕСКА

# Прадмова

## Прэзідэнткі
## **Я. Э. Сахле-Ворк Зеўдэ**

Старшыні Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі
Прэзідэнткі Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія

Будучыня нашай планеты патрабуе лакальнага і дэмакратычнага вызначэння. Будучыні, да якой мы імкнёмся, можна дасягнуць толькі праз калектыўныя і індывідуальныя дзеянні, якія грунтуюцца на багатай разнастайнасці народаў і культур.

У нас толькі адна планета, аднак мы дрэнна падзяляем яе рэсурсы і не выкарыстоўваем іх рупліва. Існуюць непрымальныя няроўнасці паміж рознымі рэгіёнамі свету. Нам далёка да дасягнення гендарнай роўнасці для жанчын і дзяўчат. Нягледзячы на абяцаную магчымасць аб’яднання праз тэхналогіі, захоўваецца велізарная лічбавая няроўнасць, асабліва ў Афрыцы. Існуе вялікая асіметрыя ў магчымасцях людзей атрымліваць і ствараць веды.

Адукацыя – гэта асноўны шлях да ліквідацыі гэтых укаранёных няроўнасцей. Абапіраючыся на нашы веды, мы павінны трансфармаваць адукацыю. Класы і школы маюць вялікае значэнне, але ў будучыні іх трэба будаваць і выкарыстоўваць па-іншаму. Адукацыя павінна фарміраваць неабходныя для прафесій XXI стагоддзя навыкі з улікам змены характару працы і розных спосабаў забеспячэння эканамічнай бяспекі. Акрамя таго, трэба пашырыць глабальнае фінансаванне для забеспячэння ўсеагульнага права на адукацыю.

Павага да правоў чалавека і клопат аб адукацыі як аб грамадскім дабры павінны стаць цэнтральнымі ніцямі, якія сшываюць наш супольны свет ва ўзаемазвязаную будучыню. Як сцвярджаецца ў гэтым дакладзе, гэтыя два ўніверсальныя прынцыпы павінны стаць падмуркамі адукацыі паўсюдна. Права на якасную адукацыю ва ўсім свеце і на навучанне, якое стварае магчымасці для людзей сумесна працаваць на агульную карысць, будуе падмурак для пасляховай, разнастайнай будучыні адукацыі. Паслядоўна прытрымліваючыся правоў чалавека і грамадскага дабра, мы зможам падтрымаць і скарыстацца багаццем розных шляхоў да ведаў і існавання ў свеце, якія чалавечыя культуры і грамадствы зводзяць да фармальнага і нефармальнага навучання, а таксама ведаў, якімі мы можам дзяліцца і якія мы можам супольна складаць.

Гэты даклад з’яўляецца вынікам калектыўнай працы Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі, якая была заснавана ЮНЕСКА ў 2019 годзе. Прызнаючы адказнасць і ўнёсак кожнага сябра нашай разнастайнай і геаграфічна шырокай групы, я б хацела асабіста падзякаваць Антоніу Новоа, паслу Партугаліі ў ЮНЕСКА, які ўзначальваў камітэт Камісіі па даследаваннях і распрацоўцы дакументаў. Прыведзеныя ў дакуменце “Пераасэнсоўваем нашу будучыню разам” прапановы ўзніклі ў выніку працэсу глабальнага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва, які паказаў, што існуе багата крэатыўнасці, руплівасці і надзеі ў свеце, у якім нарастаюць нявызначанасць, складанасць і нестабільнасць. У прыватнасці, разглядаецца будучыня наступных вырашальных тэматычных пытанняў: устойлівасць; веды; навучанне; выкладчыкі і выкладанне; праца, навыкі і кампетэнцыі; грамадзянства; дэмакратыя і сацыяльная інклюзія; народная асвета; а таксама вышэйшая адукацыя, даследаванні і інавацыі.

На працягу апошніх двух гадоў на працу Камісіі ўплывала глабальная пандэмія, і сябры Камісіі выдатна ўсведамлялі праблемы дзяцей, моладзі і навучэнцаў усіх узростаў, якім давялося сутыкнуцца з масавым закрыццём школ. Мы прысвячаем даклад “Пераасэнсоўваем нашу будучыню разам” менавіта вучням і настаўнікам, чые жыцці парушыў COVID, а таксама іх надзвычайным высілкам, каб забяспечыць дабрабыт, развіццё і працяг навучання ў выпрабавальных абставінах.

Мы спадзяемся, што прапановы, якія тут змяшчаюцца, а таксама грамадскі дыялог і калектыўныя дзеянні, да якіх заклікаюць аўтары даклада, паслужаць каталізатарам для фарміравання мірнай, справядлівай і ўстойлівай будучыні чалавецтва і планеты.



**Я. Э. Сахле-Ворк Зеўдэ**
Старшыня Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі
Прэзідэнтка Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія

# Міжнародная камісія па будучыні адукацыі

**H.E. Sahle-Work Zewde**, Прэзідэнтка Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія і Старшыня Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі

**António Nóvoa**, прафесар педагагічнага інстытута Лісабонскага ўніверсітэта і старшыня навукова-праектнага камітэта Міжнароднай Камісіі па будучыні адукацыі

**Masanori Aoyagi**, прафесар-эмерыт, Такійскі ўніверсітэт

**Arjun Appadurai**, прафесар-эмерыт, праграма "СМІ, культура і камунікацыя" Нью-Ёркскага ўніверсітэта, прафесар глабальнай праграмы Макса Вебера Цэнтра выпускнікоў Барда ў Нью-Ёрку

**Patrick Awuah**, заснавальнік і прэзідэнт, Універсітэт Ашэсі, Гана

**Abdel Basset Ben Hassen**, прэзідэнт, Арабскі інстытут правоў чалавека, Туніс

**Cristovam Buarque**, прафесар-эмерыт, Бразільскі ўніверсітэт

**Elisa Guerra**, настаўніца і заснавальніца, каледж Вальe-дэ-Філадэльфія, Мексіка

**Badr Jafar**, генеральны дырэктар, кампанія "Crescent Enterprises", Аб'яднаныя Арабскія Эміраты

**Doh-Yeon Kim**, прафесар-эмерыт Сеульскага нацыянальнага ўніверсітэта, былы міністр адукацыі, навукі і тэхналогій, Рэспубліка Карэя

**Justin Yifu Lin**, дэкан, прафесар, Інстытут новай структурнай эканомікі, Пекінскі ўніверсітэт

**Яўген Марозаў**, пісьменнік

**Karen Mundy**, дырэктарка Міжнароднага інстытута планавання адукацыі (МІПА) ЮНЕСКА і прафесарка (у водпуску), Таронцкі ўніверсітэт – Інстытут адукацыі ў Антарыа

**Fernando M. Reimers**, прафесар, Гарвардская вышэйшая педагагічная школа, ЗША

**Tarcila Rivera Zea**, прэзідэнтка, Цэнтр карэнных культур Перу CHIRAPAQ

**Serigne Mbaye Thiam**, Міністр водазабеспячэння і каналізацыі, Сенегал

**Vaira Vike-Freiberga**, былая Прэзідэнтка Латвіі, цяпер сустаршыня Міжнароднага цэнтра Нізамі Гянджэві, Баку

**Maha Yahya**, дырэктарка, Сярэднеўсходні цэнтр Карнегі, Ліван

# Падзякі

Гэты даклад быў бы немагчымы без каштоўнага ўнёску вялікай колькасці людзей, сетак і арганізацый.

Камісія выказвае падзяку ўсім аўтарам незалежных дакладаў, даведачных дакументаў, а таксама асобам, арганізацыям і сеткам, якія прынялі ўдзел у глабальных кансультацыях аб будучыні адукацыі (гл. спісы ўдзельнікаў і ўнёскаў у дадатках).

Неацэнны ўнёсак зрабіў Кансультатыўны савет па будучыні адукацыі, які прадстаўляе вядучых дзеячаў і ключавых стратэгічных партнёраў у сферы глабальнай адукацыі, даследаванняў і інавацыях са ўсяго свету (гл. поўны спіс асобаў і арганізацый у дадатку).

Асаблівая падзяка наступным экспертам, якія цесна супрацоўнічалі з Сакратарыятам ЮНЕСКА ў працэсе аналізу і падрыхтоўкі даклада, а таксама тым, хто рэцэнзаваў ранейшыя версіі дакумента: Tracey Burns, Paul Comyn, Peter Ronald DeSouza, Inés Dussel, Keri Facer, Hugh McLean, Ebrima Sall, François Taddei, Malak Zaalouk і Javier Roglá Puig.

Нарэшце, Камісія хацела б шчыра падзякаваць ЮНЕСКА і, у прыватнасці, спадарыні Стэфаніі Джаніні (Stefania Giannini), памочніцы Генеральнага дырэктара па адукацыі, за яе кіраўніцтва, а таксама Sobhi Tawil, дырэктару Каманды па даследаваннях будучыні навучання і інавацый, і яго камандзе за нястомную падтрымку працы Камісіі. У Каманду ўваходзілі: Aida Alhabshi, Alejandra Castaneda, Catarina Cerqueira, Anett Domiter, Keith Holmes, Iaroslava Kharkova, Stephanie Magalage, Jack McNeill, Fengchun Miao, Michela Pagano, Maya Prince, Noah W. Sobe, Elena Toukan і Mark West. Каманду таксама падтрымалі многія калегі па арганізацыі, якія ўнеслі разнастайны ўклад у Ініцыятыву “Будучыня адукацыі”.

# Змест


Прадмова Генеральнай дырэктаркі ЮНЕСКА Одры Азуле .... 5
Прадмова Я. Э. Прэзідэнткі Сахле-Ворк Зеўдэ .... 7
Міжнародная камісія па будучыні адукацыі .... 9
Падзякі .... 10
Рэзюмэ .... 13

## УВОДЗІНЫ .... 20

Выжыванне чалавецтва, правы чалавека і жывая планета знаходзяцца пад пагрозай .... 21
Неабходнасць новага сацыяльнага кантракта на адукацыю .... 23
Пераазначэнне мэтаў адукацыі .... 25
Структура даклада .... 28

## ЧАСТКА I
## ПАМІЖ МІНУЛЫМІ АБЯЦАННЯМІ І НЯВЫЗНАЧАНАЙ БУДУЧЫНЯЙ .... 31

**РАЗДЗЕЛ 1.** НАСУСТРАЧ БОЛЬШ СПРАВЯДЛІВАЙ АДУКАЦЫЙНАЙ БУДУЧЫНІ ... 32
Няпоўнае і няроўнае пашырэнне адукацыі .... 33
Беспрасветная беднасць і рост няроўнасці .... 37
Клубок выключэнняў .... 39

**РАЗДЗЕЛ 2.** ЗБОІ І НОВЫЯ ТРАНСФАРМАЦЫІ .... 42
Планета ў небяспецы .... 43
Адкат ад дэмакратыі і рост палярызацыі .... 53
Нявызначаная будучыня ў сферы працы .... 55

## ЧАСТКА II
## АБНАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ .... 62

**РАЗДЗЕЛ 3.** ПЕДАГОГІКА СУПРАЦОЎНІЦТВА І САЛІДАРНАСЦІ .... 64
Пераасэнсаванне педагагічных падыходаў .... 66
Педагагічныя падарожжы ў кожным узросце і на кожным этапе .... 72
Абнаўленне місіі вышэйшай адукацыі .... 76
Прынцыпы дыялогу і дзейнасці .... 77

**РАЗДЗЕЛ 4.** НАВУЧАЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ І АГУЛЬНЫ ЗДАБЫТАК ВЕДАЎ, ЯКІ РАЗВІВАЕЦЦА ... 78
Удзел у агульным здабытку ведаў ... 80
Роля вышэйшай адукацыі ў пашырэнні магчымасцяў ... 91
Прынцыпы дыялогу і дзеянняў ... 94

**РАЗДЗЕЛ 5.** ТРАНСФАРМАЦЫЙНАЯ ПРАЦА НАСТАЎНІКАЎ ... 95
Новы погляд на настаўніцтва як на супрацоўніцкую прафесію ... 97
Шлях станаўлення настаўніка, пераплецены з жыццём ... 100
Грамадская салідарнасць дзеля ператварэння настаўніцтва ... 104
Прынцыпы дыялогу і дзейнасці ... 108

**РАЗДЗЕЛ 6.** ЗАХАВАННЕ І ПЕРАЎТВАРЭННЕ ШКОЛ ... 109
Незаменная роля школ ... 111
Неабходнае пераўтварэнне школ ... 113
Пераход ад школы да вышэйшай адукацыі ... 119
Прынцыпы дыялогу і дзейнасці ... 120

**РАЗДЗЕЛ 7.** АДУКАЦЫЯ Ў РОЗНЫЯ ЧАСЫ І Ў РОЗНЫХ ПРАСТОРАХ ... 121
Накіраванне адукацыйных магчымасцяў у бок інклюзіі і ўстойлівасці ... 124
Пашырэнне часу, калі адбываецца адукацыяі ... 130
Пашырэнне права на адукацыю ... 133
Прынцыпы дыялогу і дзейнасці ... 135

## ЧАСТКА III
## КАТАЛІЗАЦЫЯ НОВАГА САЦЫЯЛЬНАГА КАНТРАКТА НА АДУКАЦЫЮ ... 136

**РАЗДЗЕЛ 8.** ЗАКЛІК ДА ДАСЛЕДАВАННЯЎ І ІНАВАЦЫЙ ... 137
Новая праграма даследаванняў у галіне адукацыі ... 139
Пашырэнне ведаў, даных і фактапагічнай базы ... 142
Наватарства ў будучыні адукацыі ... 146
Прынцыпы дыялогу і дзейнасці ... 149

**РАЗДЗЕЛ 9.** ЗАКЛІК ДА ГЛАБАЛЬНАЙ САЛІДАРНАСЦІ І МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА ... 150
Рэагаванне на ўзмацненне хісткасці сусветнага парадку ... 151
Насустрач сумесным мэтам, абавязацельствам, нормам і стандартам ... 154
Кааперацыя ў стварэнні ведаў і выкарыстанні фактапагічнага матэрыялу ... 155
Роля ЮНЕСКА ... 157
Прынцыпы дыялогу і дзейнасці ... 158

## ЭПІЛОГ І ПРАЦЯГ
## БУДУЕМ БУДУЧЫНЮ АДУКАЦЫІ РАЗАМ ..................... 160

**Прапановы па стварэнні новага сацыяльнага кантракта ..................................... 162**
**Заклікі да дзеянняў ..................................................................................... 169**
**Дыялог і ўдзел ............................................................................................. 172**
**Запрашэнне да працягу працы ........................................................................ 174**

## ДАДАТКІ ..................................................................................... 176

**Выбраная літаратура ................................................................................... 177**
Незалежныя даклады ........................................................................................ 177
Даведачныя дакументы ..................................................................................... 179
Унёскі ў глабальныя кансультацыі ...................................................................... 181
Публікацыі Міжнароднай Камісіі па будучыні адукацыі ........................................ 182
**Міжнародная Камісія па будучыні адукацыі ......................................................... 183**
Мандат ........................................................................................................... 183
Члены ............................................................................................................. 183
**Ініцыятыва “Будучыня адукацыі” ........................................................................ 189**
**Удзельнікі глабальных кансультацый ................................................................. 190**

# Рэзюмэ

Наш свет перажывае пераломны момант. Мы ўсведамляем, што веды і навучанне з'яўляюцца асновай для абнаўлення і трансфармацыі. Аднак глабальныя дыспарытэты і настойлівая неабходнасць пераасэнсаваць, чаму, як, што, дзе і калі мы вывучаем, азначаюць, што адукацыя яшчэ не выконвае свайго абяцання дапамагчы нам у фарміраванні мірнай, справядлівай і ўстойлівай будучыні.

У пошуках росту і развіцця мы, людзі, перагрузілі наша прыроднае асяроддзе, пагражаючы нашаму ўласнаму існаванню. Сёння высокі ўзровень жыцця суіснуе з катастрафічнай няроўнасцю. Усё больш людзей удзельнічаюць у грамадскім жыцці, аднак тканіна грамадзянскай супольнасці і дэмакратыі руйнуецца ва ўсім свеце. Хуткія тэхналагічныя змены пераствараюць многія бакі нашага жыцця. Аднак гэтыя наваўвядзенні не накіраваны належным чынам на роўнасць, інклюзію і ўдзел у дэмакратычных працэсах.

Кожны сёння нясе важкія абавязкі як перад цяперашнім, так і перад будучымі пакаленнямі: забяспечыць, каб наш свет быў светам багацця, а не дэфіцыту, і каб усе карысталіся ў поўнай меры аднолькавымі правамі чалавека. Нягледзячы на тэрміновасць дзеянняў ва ўмовах моцнай нявызначанасці, **у нас ёсць падставы для надзеі**. Як від мы знаходзімся ў той кропцы нашай калектыўнай гісторыі, калі мы маем найбольшы доступ да інструментаў супрацоўніцтва, чым калі-небудзь раней. Патэнцыял для ўключэння ўсяго чалавецтва ў стварэнне лепшай будучыні ніколі не быў такім вялікім.

У гэтым глабальным дакладзе Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі задаецца пытанне: якую ролю можа адыгрываць адукацыя ў фарміраванні нашага агульнага сусвету і будучыні, калі мы ўглядваемся ў 2050 год і пазней. Прадстаўленыя прапановы ўзніклі ў выніку двухгадовага глабальнага працэсу ўзаемадзеяння і супольнай працы, які паказаў, што велізарная колькасць людзей – дзяцей, моладзі і дарослых – добра ўсведамляе, што **мы ўзаемазвязаныя** на гэтай планеце і што вельмі важна, каб **мы працавалі разам**.

Многія людзі ўжо самі ажыццяўляюць гэтыя змены. Гэты даклад уключае іх унёсак па ўсіх аспектах: пачынаючы з пытанняў, як інакш пабудаваць навучальныя прасторы, да дэкаланізацыі навучальных праграм і важнасці грамадскага і эмацыйнага выхавання; у ім таксама закранаюцца рэальныя і нарастаючыя страхі людзей адносна змянення клімату, крызісаў накшталт COVID-19, фэйкавых навін і лічбавай няроўнасці.

Адукацыя – шлях, якім мы арганізуем выкладанне і навучанне на працягу жыцця – доўгі час адыгрывала асноватворную ролю ў трансфармацыі чалавечых супольнасцей. Яна звязвае нас са светам і паміж сабой, адкрывае перад намі новыя магчымасці і ўзмацняе нашы здольнасці да дыялогу і дзейнасці. **Аднак дзеля таго, каб стварыць мірную, справядлівую, устойлівую будучыню, патрэбна трансфармацыя самой адукацыі.**

## Новы сацыяльны кантракт на адукацыю

Адукацыя можа разглядацца ў тэрмінах сацыяльнага кантракта – няяўнага пагаднення паміж членамі грамадства аб супрацоўніцтве для агульнай выгады. Сацыяльны кантракт ёсць нешта большае, чым пагадненне, бо ён адлюстроўвае нормы, абавязацельствы і прынцыпы, якія фармальна прапісаны ў заканадаўстве і ўкаранёныя ў культуры. **Зыходны пункт – гэта супольнае бачанне грамадскіх мэтаў адукацыі**. Кантракт складаецца з асноватворных і арганізацыйных прынцыпаў, якія фарміруюць структуру адукацыйных сістэм, а таксама размеркаванай працы па іх стварэнні, падтрыманні і ўдасканаленні.

На працягу дваццатага стагоддзя народная асвета была ў асноўным накіравана на падтрымку нацыянальнага грамадзянства і імкнення да развіцця з дапамогай абавязковага школьнага навучання дзяцей і моладзі. Аднак сёння, калі мы сутыкаемся з сур’ёзнымі рызыкамі для будучыні чалавецтва і самой жывой планеты, мы павінны тэрмінова перастварыць адукацыю, каб дапамагчы нам вырашаць агульныя праблемы. Гэты акт **перастварэння азначае супрацоўніцтва па стварэнні будучыні, якая ёсць супольнай і ўзаемазалежнай**. Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен аб’яднаць нас вакол супольных намаганняў і забяспечыць веды і інавацыі, патрэбныя для фарміравання ўстойлівай і мірнай будучыні для ўсіх на аснове сацыяльнай, эканамічнай і экалагічнай справядлівасці. Ён павінен, як і гэты даклад, адстойваць ролю настаўнікаў.

Ёсць тры асноўныя пытанні, якія мы павінны задаць, углядаючыся ў 2050 год: **“Што мы павінны працягваць рабіць?”, “Ад чаго мы павінны адмовіцца?”, “Што трэба творча вынайсці нанова?**”

### Асноватворныя прынцыпы

Любы новы сацыяльны кантракт павінен будавацца на шырокіх прынцыпах, якія ляжаць у аснове правоў чалавека – гэта інклюзія і роўнасць, супрацоўніцтва і салідарнасць, а таксама калектыўная адказнасць і ўзаемасувязь, – і кіравацца наступнымі двума асноватворнымі прынцыпамі:

- **Забеспячэнне права на якасную адукацыю на працягу жыцця**. Права на адукацыю, якое ўстаноўлена ў Артыкуле 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, павінна заставацца падмуркам новага сацыяльнага кантракта на адукацыю, і яно павінна быць пашырана і распаўсюджана на права на якасную адукацыю на працягу жыцця. Яно таксама павінна ахопліваць права на інфармацыю, культуру і навуку, а таксама права на доступ і ўнёсак у агульныя веды, калектыўныя рэсурсы ведаў чалавецтва, якія назапашваліся пакаленнямі і якія бесперапынна змяняюцца.
- **Умацаванне адукацыі як грамадскай справы і грамадскага дабра**. Як агульная справа грамадства, адукацыя будуе агульныя мэты і дазваляе індывідуальна і супольна працвітаць разам. Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен не толькі забяспечыць дзяржаўнае фінансаванне адукацыі, але і ўключыць абавязацельства ўсяго грамадства забяспечыць удзел кожнага чалавека ў грамадскіх дыскусіях

адносна адукацыі. Гэты акцэнт на ўдзеле ў дыскусіі ўзмацняе адукацыю як грамадскае дабро, як форму супольнага дабрабыту, якая выбіраецца і дасягаецца разам.

Гэтыя асноватворныя прынцыпы абапіраюцца на дасягненні чалавецтва на сённяшні момант дзякуючы адукацыі і дапамагаюць забяспечыць, каб адукацыя давала будучым пакаленням магчымасць пераасэнсаваць іх будучыню і абнавіць свой свет у той час, як мы рухаемся да 2050 года і далей.

## Паміж мінулымі абяцаннямі і нявызначанай будучыняй

Пашырэнне сацыяльнай і эканамічнай няроўнасці, змяненне клімату, страта біяразнастайнасці, выкарыстанне рэсурсаў, якое перавышае планетарныя межы, адкат ад дэмакратыі і прарыўная (рэвалюцыйная) тэхналагічная аўтаматызацыя – гэта адметныя рысы нашага цяперашняга гістарычнага моманту. Гэтыя шматлікія крызісы і выклікі, якія ўзаемна накладаюцца, абмяжоўваючы нашы асабістыя і калектыўныя правы чалавека, ужо нанеслі значную шкоду жыццю на Зямлі. Пры тым, што пашырэнне адукацыйных сістэм стварыла магчымасці для многіх, вялікая колькасць людзей засталася з нізкай якасцю навучання.

Гледзячы ў будучыню, вельмі лёгка намаляваць нават больш змрочную карціну. Можна ўявіць спустошаную планету, дзе застаецца менш месца для пражывання чалавека. Да экстрэмальных сцэнарыяў будучыні таксама адносіцца карціна свету, у якой якасная адукацыя – прывілея элітаў, і дзе вялікія групы людзей жывуць у галечы, бо не могуць карыстацца базавымі таварамі і паслугамі. Ці будуць існуючыя няроўнасці ў адукацыі толькі пагаршацца з часам, пакуль навучальныя праграмы не згубяць актуальнасць? Як гэтыя магчымыя змены будуць уплываць на асноўныя чалавечыя якасці?

Ніводная тэндэнцыя не з’яўляецца прадвызначанай. Магчымы шматлікія альтэрнатыўныя варыянты будучыні, і прарыўныя трансфармацыі можна заўважыць у некалькіх ключавых галінах:

- Планета ў небяспецы, аднак працягваюцца дэкарбанізацыя і азеляненне эканомікі. Тут ужо лідзіруюць дзеці і моладзь, якія заклікаюць да канструктыўных дзеянняў і жорстка дакараюць тых, хто адмаўляецца заўважаць неадкладнасць сітуацыі.
- На працягу апошняга дзесяцігоддзя ў свеце адбываюцца адкат ад дэмакратычнага кіравання і рост папулісцкіх настрояў, якія грунтуюцца на сентыментах ідэнтычнасці. У той самы час назіраецца рост актыўнага ўдзелу грамадзян і актывізму ў адказ на дыскрымінацыю і несправядлівасць ва ўсім свеце.
- Лічбавыя тэхналогіі маюць велізарны патэнцыял, аднак мы яшчэ не ведаем, як спраўдзіць гэтыя шматлікія абяцанні.
- Праблема стварэння годных, арыентаваных на чалавека працоўных месцаў стане больш складанай, паколькі штучны інтэлект, аўтаматызацыя і структурныя

трансфармацыі перакройваюць ландшафт занятасці ва ўсім свеце. У той жа час усё больш людзей і суполак прызнаюць каштоўнасць працы па доглядзе і мноства спосабаў забеспячэння эканамічнай бяспекі.

Кожны з гэтых прарываў нясе значныя наступствы для адукацыі. У сваю чаргу тое, што мы робім разам у адукацыі, будзе вызначаць яе рэакцыю.

Зараз тыя шляхі, якімі мы арганізуем адукацыю ва ўсім свеце, не дастатковыя, каб спрыяць існаванню справядлівых і мірных грамадстваў, здаровай планеты і супольнаму прагрэсу на карысць усіх нас. На самой справе некаторыя з нашых цяжкасцей вынікаюць з таго, як мы рэалізуем адукацыю. **Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен даць нам магчымасць думаць па-іншаму** аб навучанні і сувязях паміж вучнямі, настаўнікамі, ведамі і светам.

## Прапановы па аднаўленні адукацыі

**Педагогіка павінна быць арганізавана вакол прынцыпаў кааперацыі, супрацоўніцтва і салідарнасці**. Яна павінна спрыяць развіццю інтэлектуальных, сацыяльных і маральных здольнасцяў вучняў да супрацоўніцтва і пераўтварэння свету з суперажываннем і спагадай. Таксама мае адбыцца і адмаўленне ад прадузятасці, забабонаў і разладу. Ацэнка павінна адлюстроўваць гэтыя педагагічныя мэты такім чынам, каб спрыяць істотнаму росту і навучанню ўсіх вучняў.

**Навучальныя праграмы павінны рабіць упор на экалагічнае, міжкультурнае і міждысцыплінарнае навучанне, якое дае магчымасць навучэнцам атрымліваць і ствараць веды, адначасова таксама развіваючы іх здольнасць да крытычнага асэнсавання і выкарыстання ведаў**. Навучальныя праграмы павінны інтэграваць экалагічнае разуменне чалавецтва, якое збалансуе наша стаўленне да Зямлі як да жывой планеты і нашага адзінага дома. Распаўсюджванню дэзынфармацыі трэба супрацьстаяць з дапамогай навуковай, лічбавай і гуманістычнай граматнасці, развіваючы здольнасць адрозніваць няпраўду ад праўды. У кантэксце адукацыі метады і стратэгіі павінны спрыяць актыўнай грамадзянскай пазіцыі і актыўнаму ўдзелу ў дэмакратычных працэсах.

**Выкладанне павінна рабіцца больш прафесійнай, супольнай працай, дзе шануецца праца настаўнікаў як прадзюсараў ведаў і ключавых фігур у трансфармацыі адукацыі і грамадства**. Праца настаўнікаў павінна характарызавацца супрацоўніцтвам і каманднай дзейнасцю. Разважанні, даследаванні і стварэнне ведаў і новых педагагічных практык павінны стаць неад’емнай часткай выкладання. Гэта азначае, што неабходна падтрымліваць іх аўтаномію і свабоду і што яны павінны цалкам удзельнічаць у грамадскіх дэбатах і дыялогу адносна будучыні адукацыі.

**Школы павінны быць адукацыйнымі аб’ектамі, якія ахоўваюцца, у сувязі з інклюзіяй, роўнасцю, асабістым і калектыўным дабрабытам, якія яны падтрымліваюць, і яны таксама павінны быць пераасэнсаваны, каб яны маглі лепш спрыяць трансфармацыі**

**свету ў бок больш справядлівай, роўнай і ўстойлівай будучыні**. Школы павінны быць месцамі, якія аб'ядноўваюць розныя групы людзей і прапануюць ім выклікі і магчымасці, не даступныя ў іншых месцах. Архітэктура школ, іх памяшканні, расклады і планы заняткаў, падзел вучняў на групы павінны быць перагледжаны, каб заахвочваць людзей і даваць ім магчымасці працаваць разам. Лічбавыя тэхналогіі павінны быць накіраваны на падтрымку школ, а не на іх падмену. Школы павінны мадэляваць будучыню, да якой мы імкнёмся, забяспечваючы правы чалавека і становячыся прыкладамі ўстойлівасці і вугляроднай нейтральнасці.

**Мы павінны выкарыстоўваць і пашыраць адукацыйныя магчымасці, якія мы маем на працягу жыцця і ў розных культурных і грамадскіх прасторах**. Ва ўсе перыяды жыцця людзі павінны мець істотныя магчымасці для якаснай адукацыі. Мы павінны злучаць прыродныя, пабудаваныя і віртуальныя пляцоўкі для навучання, старанна выкарыстоўваючы лепшыя магчымасці кожнай з іх. Асноўныя абавязкі ляжаць на ўрадах, чые магчымасці дзяржаўнага фінансавання і рэгулявання адукацыі трэба ўзмацняць. Права на адукацыю павінна быць пашырана на ўсё жыццё і ахопліваць права на інфармацыю, культуру, навуку і доступ да інтэрнэту.

## Каталізацыя новага сацыяльнага кантракта на адукацыю

Маштабныя змены і інавацыі магчымы. Мы створым новы сацыяльны кантракт на адукацыю дзякуючы мільёнам індывідуальных і калектыўных дзеянняў, праяў мужнасці, лідарства, супраціву, крэатыўнасці і клопату. Новы сацыяльны кантракт павінен пераадолець дыскрымінацыю, маргіналізацыю і выключэнне. Мы павінны забяспечыць гендарную роўнасць і правы ўсіх людзей незалежна ад іх расы, этнічнасці, рэлігіі, інваліднасці, сексуальнай арыентацыі, узросту ці статусу грамадзянства. Патрабуецца моцная прыхільнасць грамадскаму дыялогу, супольным абмеркаванням і дзеянням.

**Заклік да даследаванняў і інавацый**. Новы сацыяльны кантракт патрабуе сусветнай супольнай даследчай праграмы, накіраванай на права на адукацыю на працягу жыцця. Гэтая праграма павінна быць засяроджана на праве на адукацыю і ўключаць розныя віды фактычнага матэрыялу і шляхоў да ведаў, у тым ліку гарызантальнае навучанне і абмен ведамі праз межы. Трэба вітаць унёскі ўсіх удзельнікаў – ад настаўнікаў да вучняў, ад акадэмікаў і даследчых цэнтраў да ўрадаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці.

**Заклік да глабальнай салідарнасці і міжнароднага супрацоўніцтва**. Новы сацыяльны кантракт на адукацыю патрабуе новых памкненняў да глабальнага супрацоўніцтва ў падтрымку адукацыі як грамадскага дабра, заснаванага на больш справядлівым і раўнапраўным узаемадзеянні дзяржаўных і недзяржаўных удзельнікаў. Акрамя плыняў дапамогі ў сферы адукацыі ў фармаце поўнач-поўдзень, неабходна ствараць веды і факты ў фармаце поўдзень-поўдзень; таксама трэба ўзмацняць трохбаковае супрацоўніцтва. Міжнародная супольнасць павінна адыграць ключавую ролю ў аказанні дапамогі дзяржавам і недзяржаўным удзельнікам у вырашэнні агульных задач, працы з нормамі

і стандартамі, неабходнымі для рэалізацыі новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Пры гэтым неабходна трымацца прынцыпу субсідыярнасці і заахвочваць намаганні на мясцовым, нацыянальным і рэгіянальным узроўнях. Адукацыйныя патрэбы асоб, якія шукаюць прытулку, бежанцаў, асоб без грамадзянства і мігрантаў, у прыватнасці, патрабуюць дапамогі праз міжнароднае супрацоўніцтва, з удзелам міжнародных устаноў.

**Універсітэты і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны прымаць актыўны ўдзел у кожным аспекце стварэння новага сацыяльнага кантракта на адукацыю**. Творчыя, інавацыйныя і адданыя ўзмацненню адукацыі як грамадскага дабра ўніверсітэты адыгрываюць ключавую ролю ў будучыні адукацыі, пачынаючы ад падтрымкі даследаванняў і развіцця навукі і заканчваючы ўдзелам у якасці партнёраў у працы іншых адукацыйных установаў і праграмах у сваёй мясцовасці і па ўсім свеце.

**Вельмі важна, каб кожны мог удзельнічаць у будаўніцтве будучыні адукацыі** – дзеці, моладзь, бацькі, настаўнікі, даследчыкі, актывісты, наймальнікі, культурныя і рэлігійныя лідары. У нас ёсць глыбокія, багатыя і разнастайныя культурныя традыцыі, на якія мы можам абапірацца. Людзі маюць вялікую калектыўную суб’ектнасць, калектыўны інтэлект і калектыўную крэатыўнасць. І зараз мы сутыкаемся з сур’ёзным выбарам: працягваць рухацца па няпэўным шляху або радыкальна змяніць курс.

У гэтым дакладзе прапануюцца адказы на тры асноўныя пытанні: “Што мы павінны рабіць па-ранейшаму?”, “Ад чаго мы павінны адмовіцца?” і “Што трэба творча пераасэнсаваць?” Аднак **гэтыя прапановы ёсць толькі пачатак**. Даклад – гэта хутчэй запрашэнне да абмеркавання і асэнсавання, чым схема дзеянняў. Гэтыя пытанні трэба ўзнімаць і адказваць на іх у супольнасцях, у краінах, у школах, у адукацыйных праграмах і сістэмах усіх відаў ва ўсім свеце.

**Стварэнне новага сацыяльнага кантракта на адукацыю – гэта крытычны крок насустрач супольнаму пераасэнсоўванню нашай будучыні.**

# Уводзіны

Мы сутыкаемся з экзістэнцыяльным выбарам: працягваць рух па няпэўным шляху ці радыкальна змяніць курс. Працягваць цяперашні шлях азначае змірыцца з несумленнай няроўнасцю і эксплуатацыяй, нарастаючым гвалтам у шматлікіх формах, эрозіяй згоды ў грамадстве і свабодаў чалавека, працяглым руйнаваннем навакольнага асяроддзя, а таксама з небяспечнай і, магчыма, катастрафічнай стратай біяразнастайнасці. Працягваць цяперашні шлях азначае не здолець прадбачыць і ліквідаваць рызыкі, якія суправаджаюць тэхналагічныя і лічбавыя трансфармацыі нашага грамадства.

Мы павінны неадкладна супольна пераасэнсаваць нашу будучыню і прыняць крокі для ажыццяўлення гэтых новых планаў. Веды і навучанне ёсць аснова для абнаўлення і трансфармацыі. Аднак глабальныя дыспарытэты і настойлівая неабходнасць пераасэнсаваць, чаму, як, што, дзе і калі мы вывучаем, азначаюць, што адукацыя не робіць таго, што яна павінна рабіць, каб дапамагчы нам у фарміраванні мірнай, справядлівай і ўстойлівай будучыні.

Мы ўсе маем абавязак перад цяперашнім і будучымі пакаленнямі: зрабіць так, каб наш свет быў светам багацця, а не галечы, і каб кожны ў поўнай меры карыстаўся правамі чалавека. Нягледзячы на неадкладнасць дзеянняў і ўмовы моцнай нявызначанасці, мы маем прычыны, каб быць поўнымі надзеі. Як від мы знаходзімся ў той кропцы нашай калектыўнай гісторыі, калі мы маем найбольшы доступ да ведаў і інструментаў, якія дазваляюць нам супрацоўнічаць. Патэнцыял далучэння чалавецтва да супольнага стварэння будучыні ніколі не быў большым.

Адукацыя – шляхі, якімі мы арганізуем выкладанне і навучанне на працягу жыцця, – доўгі час адыгрывала асноватворную ролю ў трансфармацыі чалавечых супольнасцей. Адукацыя – гэта тое, як мы арганізуем міжпакаленчы цыкл перадачы і сумеснага стварэння ведаў. Яна злучае нас са светам і з іншымі людзьмі, дае нам новыя магчымасці, узмацняе нашы здольнасці да дыялогу і дзеяння. Аднак для фарміравання той будучыні, да якой мы імкнёмся, адукацыя сама па сабе павінна быць трансфармаваная.

У гэтым глабальным дакладзе Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі задаецца пытанне, якую ролю можа адыгрываць адукацыя ў фарміраванні нашага супольнага свету і агульнай будучыні, калі мы ўявім перыяд да 2050 года і пасля яго. Прапановы, якія ў ім прадстаўлены, узніклі ў выніку двухгадовага глабальнага працэсу ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва, які паказаў, што велізарная колькасць людзей – дзяцей, моладзі і дарослых – добра ўсведамляе, што на гэтай планеце мы звязаныя адно з адным у тым сэнсе, што праблемы свету адбіваюцца на ўсіх нас. Многія людзі па ўсім свеце падзяляюць не менш моцнае ўсведамленне таго, што мы павінны працаваць разам, пачынаючы з усведамлення разнастайнасці і розніцы.

Прагназаванне будучыні – гэта тое, што мы як людзі робім увесь час. Ідэі адносна будучыні адыгрываюць важную ролю ў мысленні, стратэгіі і практыцы адукацыі. Яны фарміруюць усё – ад штодзённага прыняцця рашэнняў вучнямі і сем’ямі да вялікіх планаў па зменах у адукацыі, якія распрацоўваюць міністэрствы асветы.

У гэтым дакладзе прызнаецца, што існуе мноства магчымых сцэнарыяў будучыні адносна адукацыі, пачынаючы з радыкальнай трансфармацыі і заканчваючы глыбокім крызісам. У ім сцвярджаецца, што асноўная мэта абмеркавання будучыні адукацыі – дазволіць нам па-іншаму вызначыць рамкі сучаснасці, выявіць траекторыі, якія могуць узнікаць, і звярнуць увагу на магчымасці, якія могуць адкрывацца ці закрывацца для нас. Любое даследаванне магчымых і альтэрнатыўных варыянтаў будучыні ўзнімае глыбокія пытанні этыкі, роўнасці і справядлівасці: якая будучыня ёсць пажаданай і для каго? І, паколькі адукацыя не проста падпадае пад уплыў знешніх фактараў, але і адыгрывае ключавую ролю ў раскрыцці патэнцыйных варыянтаў будучыні ў розных кутках планеты, супольнае пераасэнсоўванне нашай будучыні зусім натуральна, калі не абавязкова, уключае новы сацыяльны кантракт на адукацыю.

Любое даследаванне магчымых і альтэрнатыўных варыянтаў будучыні ўзнімае глыбокія пытанні этыкі, роўнасці і справядлівасці: якая будучыня ёсць пажаданай, і для каго?

## Выжыванне чалавецтва, правы чалавека і жывая планета знаходзяцца пад пагрозай

Сама ідэя аб тым, што годнасць кожнага чалавека каштоўная, упэўненасць у тым, што ўсе людзі маюць асноўныя правы, што здароўе Зямлі, нашага адзінага дома – усё гэта пад пагрозай. Каб змяніць курс і ўявіць альтэрнатыўную будучыню, нам трэба неадкладна змяніць баланс у нашых адносінах паміж сабой, з жывой планетай і з тэхналогіямі. Мы павінны нанова даведацца аб нашых узаемазалежнасцях, а таксама аб нашым месцы і нашай суб’ектнасці ў свеце, які належыць не толькі людзям.

Мы сутыкаемся са шматлікімі крызісамі, якія накладаюцца адзін на адзін. Пашырэнне сацыяльнай і эканамічнай няроўнасці, змяненне клімату, страта біяразнастайнасці, выкарыстанне рэсурсаў, якое перавышае планетарныя межы, адкат ад дэмакратыі, разбуральная тэхналагічная аўтаматызацыя і гвалт – адметныя рысы нашага цяперашняга гістарычнага моманту.

Парадаксальныя тэндэнцыі развіцця вядуць нас па шляху да няўстойлівай будучыні. Глабальныя ўзроўні беднасці знізіліся, але ўзрасла няроўнасць паміж краінамі і ўнутры іх. Найвышэйшы ўзровень жыцця суіснуе з найбольшай няроўнасцю ў гісторыі. Змяненне клімату і экалагічная дэградацыя пагражаюць выжыванню чалавецтва і іншых відаў на планеце Зямля. Усё больш людзей актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці,

аднак грамадзянская супольнасць і дэмакратыя руйнуюцца ў многіх кутках планеты. Тэхналогіі звязалі нас больш цесна, чым калі-небудзь раней, аднак яны таксама спрыяюць фрагментацыі грамадства і напружанасці ў ім. Глабальная пандэмія далей падкрэсліла нашы шматлікія ўразлівасці. Гэтыя крызісы і выклікі стрымліваюць і абмяжоўваюць нашы асабістыя і калектыўныя правы чалавека. І яны ў асноўным – вынік выбару і дзеянняў чалавека. Яны вынікаюць са створаных намі грамадскіх, палітычных і эканамічных сістэм, у якіх кароткатэрміновае мае прыярытэт над доўгатэрміновым, а інтарэсы меншасці могуць узяць верх над інтарэсамі большасці.

Кліматычныя і экалагічныя катастрофы паскараюцца праз эканамічныя мадэлі, якія залежаць ад няўстойлівых узроўняў выкарыстання рэсурсаў. Эканамічныя мадэлі, якія аддаюць перавагу кароткатэрміновым прыбыткам і празмернаму спажыванню, цесна звязаны спажывецкім індывідуалізмам, канкурэнтнасцю і адсутнасцю суперажывання, якія характэрныя для вельмі многіх грамадстваў па ўсім свеце. Сусветнае багацце стала моцна сканцэнтраваным, а крайняя эканамічная няроўнасць падрывае згоду ў нашых грамадствах.

Рост аўтарытарызму, выключны папулізм і палітычны экстрэмізм кідаюць выклік дэмакратычнаму кіраванню менавіта ў той час, калі нам патрэбны ўзмоцненае супрацоўніцтва і салідарнасць для вырашэння агульных праблем, якія не ведаюць і не паважаюць палітычных межаў. Нягледзячы на дзесяцігоддзі працы па падтрымцы намаганняў грамадстваў прасунуць мірныя формы вырашэння рознагалоссяў, сённяшні свет адзначаны ростам сацыяльнай і палітычнай палярызацыі. Мова нянавісці, безадказнае распаўсюджванне фэйкавых навін, рэлігійны фундаменталізм, выключны нацыяналізм – усе гэтыя праявы пашырыліся дзякуючы новым тэхналогіям і са стратэгічнага пункту гледжання ў рэшце рэшт выкарыстоўваюцца ў вузкіх інтарэсах. Сусветны парадак, замацаваны на агульных каштоўнасцях, якія сфармуляваны ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, слабее. Наш свет сутыкнуўся з крызісам каштоўнасцей, пра які сведчыць рост карупцыі, бяздушнасці, неталерантнасці і нецярпімасці, а таксама нармалізацыя гвалту.

Паскораная глабалізацыя і нарастаючая мабільнасць людзей разам з вымушанымі міграцыяй і перамяшчэннем занадта часта ўзмацняюць дэгуманізуючае ўздзеянне расізму, нецярпімасці, неталерантнасці і дыскрымінацыі. Гэтыя формы гвалту над чалавечай годнасцю ёсць праявы ўладных структур, якія хутчэй імкнуцца да дамінавання і кантролю, чым да супрацоўніцтва і вызвалення. Гвалт у выглядзе ўзброенага канфлікту, акупацыі, палітычных рэпрэсій не толькі знішчае жыцці, але і падрывае самую канцэпцыю чалавечай годнасці. Часта тыя, хто карыстаецца прывілеямі і выгадамі ад гегеманістычных сістэм, займаюцца дыскрымінацыяй на аснове гендарнай, расавай, этнічнай, рэлігійнай ці сексуальнай прыналежнасці і прыгнятаюць групы людзей, якіх яны лічаць пагрозай, незалежна ад таго, гэта карэнныя народы, жанчыны, бежанцы, мігранты, феміністкі, праваабаронцы, экалагічныя актывісты ці палітычныя дысідэнты.

Лічбавае пераўтварэнне нашых грамадстваў беспрэцэдэнтна ўплывае на наша жыццё. Камп'ютары хутка змяняюць спосабы стварэння, доступу, распаўсюджвання, праверкі

і выкарыстання ведаў. Шмат чаго робіць інфармацыю больш даступнай і адкрывае новыя і перспектыўныя шляхі да адукацыі. Аднак існуе вялікая колькасць рызыкаў: навучанне можа звужацца ці пашырацца ў лічбавых прасторах; тэхналогіі даюць новыя рычагі ўлады і кантролю, якія могуць як вызваляць, так і рэпрэсаваць. Распазнаванне твару і штучны інтэлект могуць звузіць наша права на прыватнае жыццё так, што было немагчымым усяго дзесяцігоддзе таму. Мы павінны пільна сачыць за тым, каб бягучыя тэхнічныя пераўтварэнні дапамагалі нам развівацца і не пагражалі развіццю будучых разнастайных спосабаў пазнання або інтэлектуальнай і творчай свабоды.

Наш лад жыцця больш не знаходзіцца ў раўнавазе з планетай, з тым багаццем жыцця, якое на ёй існуе, што пагражае нашаму цяперашняму і будучаму дабрабыту, а таксама нашаму далейшаму існаванню. Наша некрытычнае прыняцце тэхналогій занадта часта небяспечна аддаляе нас адзін ад аднаго, скарачае камунікацыю і парушае ўзаемаразуменне, нягледзячы на магчымасць дасягнуць адваротнага. І гэтыя планетарныя і тэхналагічныя дысбалансы спрыяюць трэцяму і не менш небяспечнаму разыходжанню: наш дысбаланс паміж сабой у выглядзе хуткага нарастання няроўнасці, падрыву даверу і рэпутацыі, дэманізацыі “іншых” і нежадання супрацоўнічаць і больш істотна супрацьстаяць гэтаму мноству глабальных выклікаў, якое працягвае пашырацца.

Калі глядзець у будучыню, вельмі лёгка малюецца нават больш змрочная карціна. Можна ўявіць спустошаную планету, дзе застаецца менш месца для пражывання чалавека. Да экстрэмальных сцэнарыяў будучыні таксама адносіцца карціна свету, у якім якасная адукацыя – прывілея элітаў, і дзе вялікія групы людзей жывуць у галечы, бо не могуць карыстацца базавымі таварамі і паслугамі. Ці будуць навучальныя праграмы з часам губляць актуальнасць, а існуючыя няроўнасці ў адукацыі толькі пагаршацца? Ці будзе наша чалавечнасць і далей разбурацца?

Выбар, які мы супольна робім сёння, будзе вызначаць нашу агульную будучыню. Выжывем мы ці загінем, будзем жыць мірна ці дазволім гвалту вызначаць наша жыццё, ставімся мы да Зямлі ўстойлівым чынам ці не – гэтыя пытанні будуць грунтоўна вызначацца і вырашацца тым выбарам, які мы робім сёння, і нашымі магчымасцямі дасягнуць нашых агульных мэтаў. Разам мы можам змяніць курс.

> Выбар, які мы супольна робім сёння, будзе вызначаць нашу агульную будучыню.

## Неабходнасць новага сацыяльнага кантракта на адукацыю

Адукацыя – гэта падмурак абнаўлення і трансфармацыі нашых грамадстваў. Яна мабілізуе веды, каб дапамагчы нам знайсці шлях у свеце, які змяняецца і поўны нявызначанасці. Сіла адукацыі палягае ў яе здольнасці злучаць нас са светам і іншымі людзьмі, выводзіць нас за межы прасторы, у якой мы ўжо жывём, і адкрываць перад намі новыя магчымасці.

Яна дапамагае аб'ядноўваць нас вакол калектыўных намаганняў; яна дае навуку, веды і інавацыі, якія нам патрэбны, каб вырашаць агульныя праблемы. Адукацыя выхоўвае ўзаемаразуменне і будуе патэнцыял, якія могуць зрабіць нашу будучыню больш сацыяльна інклюзіўнай, эканамічна справядлівай і экалагічна ўстойлівай.

Сем'ям, супольнасцям і ўрадам ва ўсім свеце добра вядома, што, нягледзячы на недахопы, школы і сістэмы адукацыі могуць ствараць магчымасці і прапаноўваць шляхі да асабістага і супольнага руху наперад. Урады і арганізацыі грамадзянскай супольнасці шырока прызнаюць, што адукацыя – гэта ключавы, хоць і не адзіны, фактар прагрэсу ў дасягненні пажаданых вынікаў развіцця, фарміравання навыкаў і кампетэнцый для працы і падтрымкі актыўнага і дэмакратычнага грамадзянства. Адукацыя па праве з'яўляецца асновай "Рамак устойлівага развіцця да 2030 года", якія ўяўляюць сабой інклюзіўнае бачанне руху чалавецтва да агульнага дабрабыту, справядлівасці і міру, а таксама да ўстойлівых зносін з навакольным асяроддзем.

Аднак адукацыя ў розных краінах не адпавядае нашым пажаданням. Нягледзячы на значнае пашырэнне доступу ва ўсім свеце, з-за шматлікіх выключэнняў сотням мільёнаў дзяцей, моладзі і дарослым па-ранейшаму адмаўляюць у іх асноўным праве на якасную адукацыю. Захоўваецца дыскрымінацыя, часта сістэматычная, па прыкметах полу, этнічнай прыналежнасці, мовы і культуры, а таксама ў сувязі са спосабамі атрымання ведаў. Адсутнасць доступу ўскладняецца крызісам актуальнасці: вельмі часта фармальнае навучанне не адпавядае патрэбам і памкненням дзяцей, моладзі і іх супольнасцей. Нізкая якасць навучання душыць творчасць і цікаўнасць. Заканамернасці выключэння, адсеву ці выцяснення вучняў на ўсіх узроўнях адукацыі паказваюць на неадпаведнасць цяперашняй школьнай мадэлі, каб даць дзецям і моладзі змястоўнае навучанне і адчуванне сваёй суб'ектнасці і мэты. Тыя, хто мае доступ да адукацыі, усё часцей не падрыхтаваныя ні да сучасных, ні да будучых выклікаў.

Больш за тое, сістэмы адукацыі часта ўзнаўляюць і ўвекавечваюць тыя самыя ўмовы, якія пагражаюць нашай агульнай будучыні – ці дыскрымінацыя і выключэнне, ці няўстойлівы лад жыцця, – абмяжоўваючы магчымасці сапраўднай трансфармацыі адукацыі. Гэтыя калектыўныя недахопы абумоўліваюць неабходнасць у новым супольным бачанні, абноўленых прынцыпах і абавязацельствах, якія маглі б вызначаць і накіроўваць нашы дзеянні ў галіне адукацыі.

Зыходны пункт для любога сацыяльнага кантракта на адукацыю – гэта супольнае бачанне грамадскіх мэтаў адукацыі. Сацыяльны кантракт на адукацыю складаецца з асноватворных і арганізацыйных прынцыпаў, якія ствараюць структуру сістэм адукацыі, а таксама з размеркаванай працы па іх стварэнні, падтрыманні і ўдасканаленні.

На працягу дваццатага стагоддзя народная асвета была па сутнасці накіравана на падтрымку нацыянальнага грамадзянства і намаганняў па развіцці. Яна ў асноўным прымала форму абавязковага школьнага навучання дзяцей і моладзі. Аднак сёння, з улікам тых цяжкіх рызыкаў, з якімі мы сутыкаемся, мы павінны неадкладна нанова стварыць

адукацыю, каб паспрыяць вырашэнню нашых агульных праблем. Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен дапамагчы нам аб’яднацца вакол калектыўных дзеянняў і даць веды і інавацыі, патрэбныя для фарміравання ўстойлівай і мірнай будучыні для ўсіх на аснове сацыяльнай, эканамічнай і экалагічнай справядлівасці.

Стварэнне новага сацыяльнага кантракта азначае разгляд таго, якім чынам усталяваныя меркаванні аб адукацыі, ведах і навучанні не даюць нам адкрываць новыя шляхі і рухацца да той будучыні, якую мы жадаем. Простае пашырэнне існуючай мадэлі развіцця адукацыі не з’яўляецца жыццяздольным шляхам наперад. Нашы цяжкасці ўзніклі не толькі ў выніку абмежаваных рэсурсаў і сродкаў. Нашы праблемы таксама вынікаюць з таго, чаму і як мы выхоўваем, і з тых шляхоў, якімі мы арганізуем навучанне.

## Перааначэнне мэтаў адукацыі

Сістэмы адукацыі падтрымліваюць памылковае спадзяванне, што кароткатэрміновыя прэрагатывы і выгады маюць большае значэнне, чым доўгатэрміновая ўстойлівасць. Яны падкрэсліваюць каштоўнасці асабістага поспеху, нацыянальнай канкурэнцыі і эканамічнага развіцця на шкоду салідарнасці, разуменню нашай узаемазалежнасці і клопату адзін пра аднаго, а таксама пра планету.

Адукацыя павінна быць накіравана на тое, каб аб’яднаць нас вакол калектыўных намаганняў і забяспечыць веды, навуку і інавацыі, неабходныя для фарміравання ўстойлівай будучыні для ўсіх на аснове сацыяльнай, эканамічнай і экалагічнай справядлівасці. Яна павінна выправіць мінулыя несправядлівасці, адначасова рыхтуючы нас да экалагічных, тэхналагічных і сацыяльных зменаў, якія маюць адбыцца.

Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен быць замацаваны ў двух асноватворных прынцыпах: (1) права на адукацыю; і (2) прыхільнасць адукацыі як грамадскай сацыяльнай дзейнасці і грамадскага дабра.

### Забеспячэнне права на якасную адукацыю на працягу жыцця

Трэба, каб дыялог і дзеянні, якія патрэбныя для стварэння новага сацыяльнага кантракта на адукацыю, цвёрда караніліся ў прыхільнасці да правоў чалавека. Напісаная ў 1948 годзе Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека вызначае неад’емныя правы членаў нашай чалавечай сям’і і забяспечвае найлепшы “компас” для ўяўлення новай будучыні адукацыі. Права на адукацыю – крытычнае для рэалізацыі ўсіх іншых сацыяльных, эканамічных і культурных правоў – павінна служыць пуцяводным святлом і асновай для новага сацыяльнага кантракта. Гэтая праваабарончая прызма патрабуе, каб адукацыя была для ўсіх, незалежна ад даходаў, гендару, расы ці этнічнасці, рэлігіі, мовы, культуры, сексуальнасці, палітычнай прыналежнасці, інваліднасці ці любых іншых характарыстык, якія могуць выкарыстоўвацца для дыскрымінацыі і выключэння.

Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен цвёрда караніцца ў прыхільнасці да правоў чалавека.

Права на адукацыю павінна быць пашырана і распаўсюджана на права на якасную адукацыю на працягу жыцця. Права на адукацыю, якое доўгі час тлумачылася як права дзяцей і моладзі на школьную адукацыю, павінна забяспечваць адукацыю ва ўсіх узростах і ва ўсіх сферах жыцця. З гэтай больш шырокай перспектывы права на адукацыю цесна звязана з правам на інфармацыю, культуру і навуку. Яно патрабуе глыбокай прыхільнасці развіццю магчымасцяў чалавека. Яно таксама цесна звязана з правам на доступ да агульнага здабытку ведаў ці на ўнёсак у гэты супольны рэсурс інфармацыі, ведаў і мудрасці чалавецтва.

Безупынны цыкл стварэння ведаў праз спаборніцтва, дыялог і дэбаты – гэта тое, што дапамагае каардынаваць дзеянні, ствараць навуковыя ісціны і заахвочваць да інавацый. Ён з’яўляецца адным з найбольш каштоўных, невычэрпных рэсурсаў чалавецтва і ключавым аспектам адукацыі. Чым больш людзей маюць доступ да агульнага здабытку ведаў, тым больш багатым ён становіцца. Развіццё мовы, лічэння і пісьма паспрыяла распаўсюджванню ведаў у часе і прасторы. Гэта, у сваю чаргу, дазволіла грамадствам дасягнуць надзвычайных вышынь калектыўнага росквіту і цывілізацыйнага будаўніцтва. Агульны здабытак ведаў тэарэтычна мае бязмежныя магчымасці. Разнастайнасць і інавацыі, якія агульны здабытак ведаў робіць даступнымі, паходзяць з запазычанняў і крэдытаў, з эксперыментаў, якія перасякаюць дысцыплінарныя межы, а таксама з пераасэнсавання старога і стварэння новага.

На жаль, існуюць бар’еры, якія перашкаджаюць роўнасці ў доступе да агульнага здабытку ведаў і ўнёску ў яго. Існуюць значныя хібы і скажэнні ў назапашаных чалавецтвам ведах, якія неабходна ліквідаваць і выправіць. Перспектывы, мовы і веды карэнных народаў доўгі час былі маргіналізаванымі. Таксама ў значнай ступені недастаткова прадстаўленыя жанчыны і дзяўчаты, меншасці і групы насельніцтва з нізкім узроўнем даходу. Абмежаванні адбываюцца ў выніку камерцыялізацыі і празмерна абмежавальных законаў аб інтэлектуальнай уласнасці, а таксама ў выніку адсутнасці адпаведнага рэгулявання і падтрымкі суполак і сістэм, якія кіруюць усім агульным здабыткам ведаў. Мы павінны абараняць права на інтэлектуальную і мастацкую ўласнасць мастакоў, пісьменнікаў, навукоўцаў і вынаходнікаў. І ў той жа час мы павінны ўзяць на сябе абавязацельства падтрымліваць адкрытыя, роўныя магчымасці для прымянення і стварэння ведаў. Праваабарончы падыход, які ўключае прызнанне калектыўных правоў інтэлектуальнай уласнасці, павінен прымяняцца да агульнага здабытку ведаў, каб абараніць карэнныя народы і іншыя маргіналізаваныя групы ад незаконнага і без згоды прысваення і выкарыстання іх ведаў.

Пашырэнне права на адукацыю на працягу жыцця патрабуе прыхільнасці да ліквідацыі бар’ераў і забеспячэння таго, каб агульны здабытак ведаў быў адкрытым і трывалым рэсурсам, які адлюстроўвае розныя спосабы пазнання і існавання ў свеце.

## Узмацненне адукацыі як грамадскай справы і грамадскага дабра

Як сумеснае намаганне грамадства, адукацыя стварае агульныя мэты і дазваляе асобным людзям і супольнасцям быць паспяховымі разам. Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен не толькі забяспечыць адэкватнае і ўстойлівае дзяржаўнае фінансаванне адукацыі, але і ўключаць абавязацельства ўсяго грамадства далучыць усіх людзей да грамадскіх дыскусій аб адукацыі. Гэты акцэнт на ўдзеле ў працэсе ёсць тое, што ўмацоўвае адукацыю як грамадскае дабро – форму супольнага дабрабыту, якая супольна выбіраецца і дасягаецца.

Адукацыю як грамадскае дабро характарызуюць дзве агульныя рысы. Па-першае, адукацыя мае вопыт агульнага звязвання людзей паміж сабой і са светам. У адукацыйных установах настаўнікі, выхавацелі і навучэнцы аб’ядноўваюцца ў сумеснай дзейнасці, якая з’яўляецца як індывідуальнай, так і калектыўнай. Адукацыя дазваляе людзям выкарыстоўваць і папаўняць спадчыну ведаў чалавецтва. Як калектыўны акт сумеснай творчасці, адукацыя пацвярджае годнасць і здольнасць асобных людзей і суполак, стварае агульныя мэты, развівае магчымасці для калектыўных дзеянняў і ўмацоўвае нашу агульную чалавечнасць. Таму вельмі важна, каб адукацыйныя ўстановы прымалі максімальна разнастайных вучняў, каб тыя маглі вучыцца адзін у аднаго, нягледзячы на адрозненні.

Па-другое, адукацыя кіруецца агульна. Як сацыяльны праект адукацыя ўключае ў сябе шмат розных удзельнікаў у адміністрацыі і кіраўніцтве. Стратэгіі і працэсы прыняцця рашэнняў павінны ўлічваць разнастайныя галасы і пункты гледжання. Цяперашняя тэндэнцыя да больш шырокага і дыверсіфікаванага ўдзелу недзяржаўных арганізацый у стратэгіі, забеспячэнні і маніторынгу адукацыі з’яўляецца выразам нарастаючых патрабаванняў права голасу, празрыстасці і падсправаздачнасці ў адукацыі як грамадскай справе. Удзел настаўнікаў, моладзевых рухаў, грамадскіх груп, фондаў, няўрадавых арганізацый, прадпрыемстваў, прафесійных асацыяцый, мецэнатаў, рэлігійных установ і грамадскіх рухаў можа ўмацаваць справядлівасць, якасць і актуальнасць адукацыі. Недзяржаўныя ўдзельнікі адыгрываюць важныя ролі ў забеспячэнні права на адукацыю, захоўваючы прынцыпы адмовы ад дыскрымінацыі, роўнасці магчымасцяў і сацыяльнай справядлівасці.

Грамадскі характар адукацыі выходзіць далёка за межы яе забеспячэння, фінансавання і кіравання дзяржаўнымі ўстановамі. Народная асвета – гэта адукацыя, якая (1) адбываецца ў публічнай прасторы, (2) спрыяе грамадскім інтарэсам і (3) падсправаздачная ўсім. Усе школы, незалежна ад таго, хто іх арганізуе, павінны выхоўваць навучэнцаў у духу правоў чалавека, шанаваць разнастайнасць і супрацьстаяць дыскрымінацыі. Нельга забываць, што народная асвета выхоўвае народ. Яна ўмацоўвае нашу агульную прыналежнасць аднаму чалавецтву на адной планеце, шануючы нашы адметнасці і разнастайнасць.

Прыхільнасць адукацыі як грамадскай дзейнасці і грамадскага дабра азначае, што спосабы кіравання адукацыяй на мясцовым, нацыянальным і глабальным узроўнях

павінны быць інклюзіўнымі і супольнымі. Урадам трэба ўсё больш засяроджвацца на рэгуляванні і абароне адукацыі ад камерцыялізацыі. Нельга дапускаць, каб рынкі і далей перашкаджалі станаўленню адукацыі як аднаго з правоў чалавека. Наадварот, адукацыя павінна служыць інтарэсам усіх людзей.

Новы сацыяльны кантракт павінен фарміравацца ў рамках права на адукацыю на працягу жыцця і на аснове прыхільнасці адукацыі як грамадскага і агульнага дабра, калі мы жадаем, каб ён дапамог нам пабудаваць шляхі да сацыяльна, эканамічна і экалагічна справядлівай і ўстойлівай будучыні. Гэтыя асноватворныя прынцыпы дапамогуць нам накіроўваць дыялог і дзеянні на абнаўленне ключавых вымярэнняў адукацыі, ад педагогікі і вучэбнай праграмы да даследаванняў і міжнароднага супрацоўніцтва.

## Структура даклада

Структурна гэты даклад мае тры часткі, якія складаюцца з некалькіх раздзелаў, кожны з якіх змяшчае прапановы па пабудове новага сацыяльнага кантракта на адукацыю і шэраг кіруючых прынцыпаў дыялогу і дзеянняў. Ён завяршаецца эпілогам, у якім прапануюцца шляхі ажыццяўлення рэкамендацый у розных сітуацыях. Хаця даклад, дзе гэта патрэбна, спасылаецца на вынікі даследаванняў, гэтых спасылак у тэксце няма. У дадатку пералічаны даведачныя дакументы, якія былі падрыхтаваны спецыяльна ў рамках гэтай ініцыятывы.

Частка I даклада “Паміж ранейшымі абяцаннямі і нявызначанай будучыняй” прадстаўляе двайную глабальную праблему справядлівасці і актуальнасці ў адукацыі, якая ляжыць у аснове патрэбы ў новым сацыяльным кантракце, які можа дапамагчы ліквідаваць недаступнасць адукацыі і забяспечыць устойлівую будучыню. Яна складаецца з двух раздзелаў.

У раздзеле 1 даводзіцца хроніка падзей у галіне права на адукацыю, якое замацавана ў артыкуле 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, праз прызму выкананых і нявыкананых абяцанняў. Раздзел 2 засяроджваецца на ключавых парушэннях і надыходзячых трансфармацыях з улікам чатырох напрамкаў маштабных перамен, якія часткова супадаюць: экалагічных змяненняў, тэхналагічнага паскарэння, кіравання і грамадскай раздробленасці, а таксама новых рынкаў працы. З позіркам у 2050 год у гэтым раздзеле ставіцца пытанне: якім чынам гэтыя парушэнні і трансфармацыі адаб’юцца на адукацыі, і як адукацыя можа змяніцца, каб лепей рэагаваць на іх.

У частцы II даклада “Абнаўленне адукацыі” прыводзяцца аргументы ў падтрымку перагляду і абнаўлення канцэпцыі адукацыі ў пяці ключавых вымярэннях: педагогіка, вучэбныя праграмы, выкладанне, школы, а таксама шырокі спектр адукацыйных магчымасцяў на працягу жыцця ў розных культурных і сацыяльных прасторах. Кожнае з гэтых пяці вымярэнняў абмяркоўваецца ў спецыяльным раздзеле, дзе выкладзены прынцыпы, якія кіруюць дыялогам і дзеяннямі.

Раздзел 3 змяшчае заклік да педагогікі супрацоўніцтва і салідарнасці, якая выхоўвае эмпатыю, павагу да рознасці і суперажыванне, а таксама будуе патэнцыял людзей да сумеснай працы з мэтай змянення як саміх сябе, так і свету. Раздзел 4 заахвочвае да стварэння экалагічных, міжкультурных і міждысцыплінарных навучальных праграм, якія падтрымліваюць доступ вучняў да ведаў і іх магчымасць ствараць веды, адначасова таксама развіваючы іх здольнасці да крытычнага аналізу і прымянення ведаў. У раздзеле 5 падкрэсліваецца важнасць трансфармацыйнай працы настаўнікаў і даецца рэкамендацыя зрабіць настаўніцтва яшчэ больш прафесійным і супрацоўніцкім. У раздзеле 6 растлумачваецца неабходнасць абараняць школы як грамадскія пляцоўкі, якія падтрымліваюць навучанне, інклюзію, роўнасць, а таксама асабісты і калектыўны дабрабыт, у той жа час змяняючы іх, каб можна было лепш рэалізаваць справядлівую і раўнапраўную будучыню. Раздзел 7 разглядае важнасць адукацыі ў розныя часы і ў розных месцах, з прызнаннем таго, што яна не адбываецца выключна ў афіцыйных установах, а часцей за ўсё зазнаецца ў мностве грамадскіх прастораў і на працягу жыцця.

Частка III даклада “Каталізацыя новага сацыяльнага кантракта на адукацыю” прапануе ідэі для пачатку стварэння новага сацыяльнага кантракта на адукацыю праз заклікі да даследаванняў, а таксама да глабальнай салідарнасці і міжнароднага супрацоўніцтва.

Раздзел 8 змяшчае заклік да сумеснага парадку дня даследаванняў у галіне права на адукацыю на працягу жыцця, дапускаючы, што кожны мае адыграць нейкую ролю ў генерацыі, стварэнні і абмеркаванні ведаў, якія патрабуюцца ў стварэнні новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Раздзел 9 разглядае абнаўленне тэрміновай неабходнасці пабудаваць і ўмацаваць глабальную салідарнасць і міжнароднае супрацоўніцтва з упартасцю, рашучасцю і паслядоўнасцю, а таксама з бачаннем сітуацыі як да, так і пасля 2050 года.

Даклад завяршаюць эпілог і працяг, дзе сцвярджаецца, што выкладзеныя ў тэксце ідэі і прапановы трэба ўвасабляць у праграмы, рэсурсы і дзейнасць рознымі шляхамі і ў розных абставінах. Такая трансфармацыя павінна быць вынікам працэсаў супрацоўніцтва і камунікацый з іншымі людзьмі, чый удзел мае вялікае значэнне для ўвасаблення гэтых ідэй у планы і дзеянні. Вызначэнне і рэалізацыя абнаўлення адукацыі залежыць ад лідараў на шматлікіх урадавых узроўнях, адміністратараў у галіне адукацыі разам з выкладчыкамі і вучнямі, сем’ямі, суполкамі і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці.

Перад намі стаіць задача па ўзмацненні сумеснага сталага глабальнага дыялогу аб тым, што ўзяць з сабой наперад, што пакінуць ззаду і што патрабуе творчага пераасэнсоўвання як у адукацыі, так і ва ўсім свеце. Мы лічым, што гэта абнаўленчая праца: усвядоміць сур’ёзнасць праблем, з якімі мы сутыкаемся калектыўна як людзі і насельнікі свету, які з’яўляецца не толькі чалавечым, і знайсці шлях наперад, які не дазволіць адбыцца простаму паўтарэнню. Шчыра кажучы, мы ведаем, што тое, што было, нават калі яно стане больш хуткім, вялікім і эфектыўным, вядзе нас да прорвы: пагаршэнне клімату і хісткія экасістэмы – гэта, магчыма, найважнейшыя папераджальныя сігналы. Абнаўленне азначае прасейванне з цяжкасцю заваяваных ведаў і досведу, каб ажывіць і ўдасканаліць нашы

Гэты даклад служыць запрашэннем і прапановай праграмы дыялогу і дзеянняў для дасягнення гэтай мэты.

адукацыйныя сістэмы. Яно ўключае выкарыстанне і арганізацыю таго, што вядома, каб стварыць нанова і ўсталяваць больш перспектыўны шлях.

Новы сацыяльны кантракт на адукацыю ўжо пэўны час знаходзіцца ў распрацоўцы. Зараз неабходны шырокі, інклюзіўны і дэмакратычны дыялог з грамадствамі і мабілізацыя для яго ажыццяўлення. Гэты даклад служыць запрашэннем і прапановай праграмы дыялогу і дзеянняў для дасягнення гэтай мэты.

# Частка І

## Паміж мінулымі абяцаннямі і нявызначанай будучыняй

Каб распачаць разважанні аб будучыні адукацыі, мы павінны спачатку высветліць, дзе адукацыя знаходзіцца зараз, а таксама магчымыя варыянты будучыні, да якіх вядуць сучасныя праблемы і новыя трансфармацыі. У адукацыі, як і ў іншых сферах жыцця, мінулае ў асноўным застаецца з намі. Мы павінны ўлічваць доўгатэрміновыя гістарычныя тэндэнцыі. Вывучаючы ўчарашнія выключэнні і недахопы, мы можам лепш зразумець, чаму адукацыя не спраўдзіла нашых надзей.

У гэтай першай частцы даклада акрэсліваецца глабальны стан адукацыі ў сувязі з нарматыўнымі абавязацельствамі адносна роўнасці, справядлівасці і ўстойлівасці і разглядаюцца шляхі, якімі мы можам чакаць развіцця гэтых пытанняў у будучыні. Выяўляецца, што адукацыя знаходзіцца ў стане вострага дысанансу паміж мінулымі абяцаннямі і нявызначанай будучыняй.

Першы раздзел гэтай часткі засяроджваецца на прагрэсе, які быў дасягнуты ў адукацыі на працягу апошніх 50 гадоў. У ім даследуюцца такія фактары, як эканамічны рост, беднасць і гендарная дыскрымінацыя, як яны перасякаюцца з дасягненнямі адукацыі (і ўплываюць на іх). У ім сцвярджаецца, што мінулае нельга ігнараваць, але тое, што адбудзецца далей, будзе вызначацца нашымі выбарамі і ўчынкамі, якія мы робім сёння і будзем рабіць на працягу наступных трыццаці гадоў.

У наступным раздзеле гэтай часткі разглядаюцца ўзнікаючыя трансфармацыі ў чатырох ключавых сферах: у экалогіі, у тэхналогіях, у палітычнай сферы і ў будучыні, што чакае сферу працы. Немагчыма прадказаць будучыню, аднак мільён людзей, якія прынялі ўдзел у гэтай ініцыятыве, у значнай ступені згодныя, што самым небяспечным і разбуральным шляхам было б ігнараваць тыя змены, якія ўжо адбываюцца.

# Раздзел 1

## Насустрач больш справядлівай адукацыйнай будучыні

Гэта тое, што павінна заахвочваць наша сістэма адукацыі. Яна павінна спрыяць грамадскім мэтам сумеснага жыцця і сумеснай працы дзеля грамадскага дабра. Яна павінна рыхтаваць нашу моладзь да дынамічнага і канструктыўнага ўдзелу ў развіцці грамадства, усе члены якога маюць справядлівую долю ў агульным, добрым ці кепскім, лёсе, і ў якім прагрэс вымяраецца дабрабытам людзей, а не прэстыжнымі будынкамі, аўтамабілямі ці іншымі рэчамі, якія належаць прыватным асобам ці дзяржаве. Таму наша адукацыя павінна выхоўваць пачуццё абавязку перад усім грамадствам і дапамагаць вучням прымаць каштоўнасці, якія адпавядаюць нашаму варыянту будучыні.

**Джуліус Ньерэрэ (Julius Nyerere)**, "Адукацыя для самастойнасці", 1967 год

Як далёка мы зайшлі ў адукацыі за апошнія трыццаць – пяцьдзясят гадоў? У якім стане адукацыя знаходзіцца зараз? Дзе яна павінна змяніць курс у першую чаргу, калі мы глядзім у далёкую будучыню?

У гэтым раздзеле адукацыя ў апошняй палове мінулага стагоддзя разглядаецца з двух пунктаў гледжання. Па-першае, дэталёва апісваюцца тэндэнцыі, якія назіраюцца ў паказчыках адукацыі з цягам часу, і, дзе магчыма, мы выходзім за сярэднія значэнні для разумення іх дзялення па рэгіёнах, групах даходаў, гендарных і ўзроставых групах і іншых фактарах. Па-другое, у ім прадстаўлены больш якасны разгляд гэтых і іншых тэндэнцый у адукацыі, з асаблівым засяроджваннем на справядлівасці, якасці, а таксама рэагаванні адукацыі на некаторыя прычыны найбольш значных перабояў у ёй, такія як канфлікты і міграцыя.

Доўгатэрміновыя статыстычныя тэндэнцыі даводзяць толькі адну частку гісторыі, у залежнасці ад таго, што можна і што нельга вымераць. Аднак, калі іх разглядаць у комплексе, яны паказваюць верагодныя будучыя напрамкі і магчымыя шляхі да зменаў. Доступ да адукацыйных магчымасцяў, уключэнне маргіналізаваных катэгорый насельніцтва, граматнасць і стварэнне сістэм бесперапыннага навучання маюць пэўныя агульныя рысы, але і значныя разыходжанні як паміж, так і ўнутры краін, рэгіёнаў і груп даходаў у свеце. Аналіз тэндэнцый таксама падкрэслівае, якія галіны патрабуюць увагі ў першую чаргу і якія патрабуюць новых і неадкладных мер рэагавання. Позірк на верагодную будучыню адукацыі з пункту гледжання гістарычных і сучасных выклікаў дапамагае нам разважаць аб іншых варыянтах будучыні, якія могуць з'явіцца.

Апошнія пяцьдзясят гадоў прагрэсу былі вельмі няроўнымі, і сённяшнія хібы ў доступе да адукацыі, удзеле і выніках заснаваны на ўчарашніх выключэннях і прыгнёце. Заўтрашні прагрэс залежыць не толькі ад іх выпраўлення, але і ад стаўлення пад сумнеў дапушчэнняў і ўмоў, якія прывялі да такой несправядлівасці і няроўнасці. Напрыклад, гендарная роўнасць павінна разглядацца не толькі як самастойная мэта, але і як перадумова забеспячэння ўстойлівай будучыні адукацыі.

Сённяшнія хібы ў доступе да адукацыі, удзеле і выніках заснаваны на ўчарашніх выключэннях і прыгнёце.

## Няпоўнае і няроўнае пашырэнне адукацыі

З таго часу, як адукацыя была прызнаная правам чалавека, пашырэнне доступу да адукацыі ва ўсім свеце было ўражлівым па многіх паказчыках. Калі ў 1948 годзе была прынята Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, насельніцтва планеты складала 2,4 мільярда чалавек, з якіх толькі 45 % калі-небудзь хадзілі ў школу. Сёння насельніцтва свету складае 8 мільярдаў, больш за 95 % з якіх наведвалі школу. У 2020 годзе доля вучняў пачатковай школы перавысіла 90 %, сярэдняй школы – 85 % і старэйшых класаў сярэдняй школы – 65 %. У выніку за апошнія пяцьдзясят гадоў ва ўсім свеце назіраецца відавочнае зніжэнне

долі дзяцей і падлеткаў, якія не наведваюць школу. Яшчэ больш уражвае тое, што такое пашырэнне доступу адбылося ў перыяд значнага росту насельніцтва. Калі ў 1970 годзе ў пачатковую школу не хадзіла больш чым адно з чатырох дзяцей, у 1970 гэты працэнт упаў да менш за 10 %. Паляпшэнні найбольш відавочныя для дзяўчынак, якія склалі амаль дзве трэція дзяцей, якія не хадзілі ў школу ў 1990 годзе. Пасля таго, як гендарны парытэт у пачатковай адукацыі быў амаль дасягнуты ва ўсім свеце, дзяўчынкі ўжо не з'яўляюцца непрапарцыянальна прадстаўленымі сярод тых, хто не наведвае школу, за выключэннем краін з найбольш нізкімі ўзроўнямі даходаў і ў Чорнай Афрыцы.

Таксама адбылося значнае павелічэнне ўдзелу ў дашкольнай адукацыі ў свеце, ва ўсіх рэгіёнах і групах краін па даходах, асабліва пасля 2000 года. Глабальныя ўзроўні наведвання школ выраслі з крыху больш за 15 % у 1970 годзе да 35 % у 2000 годзе, дасягнуўшы больш за 60 % у 2019 годзе. У краінах з высокімі і сярэднімі даходамі ўзроўні наведвання школ збліжаюцца, прычым амаль усеагульны ўдзел у дашкольнай адукацыі чакаецца да 2050 года. У сусветным маштабе гендарныя дыспарытэты звузіліся з часам, і гендарны парытэт ці амаль што парытэт быў дасягнуты ў наведванні дашкольных устаноў. Гэта добрая прыкмета для гендарнага парытэту ў пачатковай школе ў бліжэйшыя гады, па меры таго, як будзе адбывацца пераход ад дашкольнай да пачатковай адукацыі дзяцей, якія лепш падрыхтаваныя да паспяховага навучання ў школе.

Пашырэнне ўдзелу ў адукацыі прывяло да няўхільнага росту граматнасці сярод моладзі і дарослых у перыяд з 1990 да 2020 года ва ўсіх краінах, незалежна ад стану іх развіцця. Узроўні граматнасці моладзі ў краінах з даходамі ніжэй за сярэдні і сярэднімі даходамі наблізіліся да тых, якія назіраюцца ў краінах з даходамі вышэй за сярэдні ўзровень на 90+%. Таксама ў апошнія трыццаць гадоў адбылося значнае паляпшэнне ва ўзроўнях граматнасці сярод маладых жанчын ва ўсіх краінах, што скараціла гендарны разрыў. Гендарны парытэт ва ўзроўнях граматнасці зараз назіраецца ў краінах з высокімі і сярэднімі даходамі, а ў астатніх краінах гендарныя разрывы скарачаюцца ў бок да парытэту. Гэта таксама добрая прыкмета для будучыні ўсеагульнай граматнасці сярод дарослых, па меры таго як юнакі і дзяўчаты становяцца дарослымі.

За апошнія пяцьдзясят гадоў таксама значна павысіўся ахоп вышэйшай адукацыяй. У глабальным маштабе ў 1970 годзе ахоп узрос ад 10 % сярод моладзі і дарослых у свеце да 40 % сёння. Рост залічэння ў ВНУ таксама адбыўся адначасова з фемінізацыяй удзелу ў вышэйшай адукацыі на працягу апошніх пяцідзесяці гадоў. Калі ў 1970-х і 1980-х гадах у вышэйшай адукацыі былі ў асноўным мужчыны, у 1990-х быў дасягнуты гендарны парытэт, і пасля гэтага ўдзел жанчын працягваў расці хутчэй, чым удзел мужчын. Гэта адбываецца ў краінах усіх груп даходаў, за выключэннем краін з нізкімі даходамі, і ва ўсіх рэгіёнах, за выключэннем Чорнай Афрыкі, дзе вышэйшая адукацыя ахоплівае 7 % навучэнак жаночага полу і 10 % навучэнцаў мужчынскага полу. Прагнозы тэндэнцый пасля 1970 года паказваюць, што краіны з высокімі даходамі могуць дасягнуць 100 % ахопу ўжо ў 2034 годзе, тады як краіны з сярэднімі даходамі могуць дасягнуць ахопу ад 60 % да 80 % у 2050 годзе. З іншага боку, ахоп вышэйшай адукацыяй у краінах з даходамі ніжэй за сярэднія дасягне толькі 35 % да 2050 года, і менш за 15 % – у краінах з нізкімі даходамі.

Аднак, нягледзячы на гэты выдатны прагрэс у пашырэнні адукацыйных магчымасцяў, які адбыўся ў апошнія дзесяцігоддзі, доступ да якаснай вышэйшай адукацыі застаецца няпоўным і няроўным. Узровень пазбаўлення магчымасцяў атрымаць адукацыю застаецца ашаламляльным. Сёння адзін з чатырох маладых людзей у краінах з нізкімі даходамі па гэты час застаецца непісьменным. Нават у краінах з сярэднімі і высокімі даходамі Праграма АЭСР па міжнароднай ацэнцы вучняў паказала, што значныя долі школьнікаў ва ўзросце 15 гадоў не ў стане разумець прачытанае па-за межамі найбольш базавых узроўняў, і гэта ў свеце, які патрабуе больш складанага ўдзелу ў грамадскім і эканамічным жыцці. Тым не менш, нават паводле агульнапрынятых вызначэнняў, узроўні граматнасці сярод дарослых складаюць менш за 75 % у краінах з даходамі ніжэй сярэдняга і крыху больш за 55 % у краінах з нізкімі даходамі. Пры тым, што гендарныя разрывы ў граматнасці сярод дарослых таксама скараціліся пасля 1990 года, яны застаюцца значнымі, асабліва сярод бедных. У краінах з нізкімі даходамі больш за 2 з 5 жанчын непісьменныя. Кожнае пятае дзіця ў краінах з нізкімі даходамі і кожнае дзясятае ў свеце, ці каля 250 мільёнаў дзяцей, дагэтуль не ахопленыя пачатковай школай і сёння. Акрамя прабелаў у базавай граматнасці – чытанні, матэматыцы, навуках, згодна з міжнацыянальнымі даследаваннямі Міжнароднай асацыяцыі па ацэнцы поспехаў у адукацыі і АЭСР, аналагічныя хібы назіраюцца ў грамадзянскай граматнасці, глабальнай кампетэнтнасці і сацыяльна-эмацыйных кампетэнцыях – усе яны набываюць усё большае значэнне для ўдзелу ў грамадскім і эканамічным жыцці.

Сітуацыя яшчэ больш драматычная на ўзроўні сярэдняй школы. Трое з пяці падлеткаў, юнакоў і дзяўчат у краінах з нізкімі даходамі ў цяперашні час не наведваюць сярэднюю школу, і гэта нягледзячы на абавязацельствы забяспечыць усеагульную, бясплатную, роўную і якасную адукацыю на пачатковым і сярэднім узроўнях. Яўна вызначаюцца дыспарытэты. Пры тым, што залічэнне ў школы на ніжнім сярэднім узроўні з'яўляецца амаль усеагульным (98 %) у краінах з высокімі даходамі, больш за трэць дарослых (40 % дзяўчынак і 34 % хлапчукоў) не ахоплены ніжэйшай сярэдняй адукацыяй у краінах з нізкімі даходамі. Дыспарытэты ў наведванні старэйшых класаў сярэдняй школы яшчэ больш выразныя, калі менш за 35 % дзяўчынак і 45 % хлапчукоў ахоплены гэтай адукацыяй у краінах з нізкімі даходамі ў параўнанні з больш за 90 % хлапчукоў і дзяўчынак у краінах з высокімі даходамі.

Акрамя доступу і залічэння ў школы, тэндэнцыі ў заканчэнні адукацыі паказваюць на змены ў якасці і актуальнасці забеспячэння адукацыі. У свеце больш чым кожны чацвёрты вучань малодшых класаў сярэдняй школы і больш за палову вучняў у старэйшых класах сярэдняй школы не завяршаюць цыкл навучання. Амаль 60 % вучняў вышэйшай школы ў краінах з даходамі ніжэй за сярэдні і каля 90 % у краінах з нізкімі даходамі кідаюць школу да завяршэння цыклу сярэдняй адукацыі. Такая драматычная страта патэнцыялу і талентаў моладзі недапушчальная. Масавыя маштабы датэрміновага пакідання школ можна растлумачыць шэрагам чыннікаў, уключаючы нязначнасць зместу навучання, недахоп увагі да асаблівых сацыяльных патрэбаў дзяўчынак і эканамічныя абставіны, у якіх жывуць бедныя людзі, адсутнасць культурнай адчувальнасці і значнасці, а таксама педагагічныя методыкі і працэсы, якія не адпавядаюць рэаліям жыцця моладзі. Гэтае вымярэнне, якое

ў асноўным абмінаюць увагай, датычыцца таго, што многія людзі называюць “глабальным крызісам навучання”.

Недастатковая якасць выкладання – адзін з ключавых “адштурхоўваючых” фактараў, якія могуць прымусіць вучняў пакінуць школу, не завяршыўшы навучання. Настаўнікі – найбольш важны фактар якасці адукацыі, пры ўмове, што яны маюць дастатковае прызнанне, падрыхтоўку, падтрымку, рэсурсы, аўтаномію і магчымасці для далейшага развіцця. Пры належнай падтрымцы настаўнікі могуць забяспечыць эфектыўныя, культурна значныя і роўныя адукацыйныя магчымасці для сваіх вучняў. Прафесіяналізацыя адукацыі мае вялікае значэнне для падтрымкі развіцця ў навучэнцаў іх поўнага патэнцыялу для ўдзелу ў грамадскім і эканамічным жыцці. Гэта патрабуе стварэння бесперапыннага працэсу падтрымкі прафесіі, які ўключае адбор таленавітых кандыдатаў, забеспячэнне іх якаснай і актуальнай першаснай падрыхтоўкай, іх эфектыўную падтрымку ў першыя гады настаўніцтва і бесперапыннае прафесійнае развіццё, структураванне прафесійных абавязкаў настаўнікаў такім чынам, каб спрыяць супрацоўніцкаму прафесіяналізму, робячы школы навучальнымі арганізацыямі, ствараючы настаўніцкія кар’ерныя лесвіцы, якія прызнаюць і ўзнагароджваюць павышэнне досведу ў педагогіцы ці ў адміністратыўнай сферы, і ўлічваючы галасы настаўнікаў у фарміраванні будучыні прафесіі і адукацыі. Стварэнне такога бесперапыннага працэсу патрабуе калектыўнага лідарства, каб усе гэтыя розныя кампаненты былі ўзгодненыя паміж сабой. Многія культурныя нормы падрываюць прафесіяналізацыю настаўніцтва; напрыклад, выкарыстанне прызначэння настаўнікаў, каб тыя абслугоўвалі інтарэсы, якія адрозніваюцца ад інтарэсаў іх вучняў: палітычны патранаж; выкарыстанне праграм выхавання настаўнікаў у якасці “дойных кароў” тымі ўстановамі, якія іх праводзяць; кар’ерныя схемы, у якіх не прызнаецца ўплыў настаўнікаў на навучанне вучняў; адсутнасць стандартных практык ці стандартаў для ўстаноў, якія падрыхтоўваюць настаўнікаў; матэрыяльныя ўмовы ў прафесіі, якія значна горшыя за ўмовы працы ў іншых прафесіях, дзе патрабуецца такі ж узровень падрыхтоўкі і аб’ём працы; ціск на настаўнікаў, каб тыя выконвалі працу, якая прыніжае іх прафесійны статус, напрыклад, патрабаванне, каб яны ўдзельнічалі ў палітычных кампаніях, або спагнанне абавязковых грашовых узносаў у тое, што не з’яўляецца іх вольным выбарам ці ідзе ў разрэз з іх свабодай, ідэнтычнасцю і правамі чалавека, уключаючы сексуальныя дамаганні на працоўным месцы ці прымус да рэлігійнай або палітычнай лаяльнасці.

> У свеце назіраецца трывожнае зніжэнне долі кваліфікаваных настаўнікаў пачатковай школы.

Аднак з ростам даступнасці школьнага навучання і пашырэння попыту на настаўнікаў у свеце назіраецца трывожнае зніжэнне долі кваліфікаваных настаўнікаў пачатковай школы. Гэта адбываецца ў шэрагу рэгіёнаў свету, і ў прыватнасці ў Чорнай Афрыцы, дзе доля настаўнікаў пачатковай школы з мінімальнымі кваліфікацыямі знізілася з 85 % у 2000 годзе да каля 65 % у 2020 годзе. Зніжэнне таксама назіраецца ў рэгіёнах, якія раней мелі высокія долі кваліфікаваных настаўнікаў пачатковай школы, такіх як арабскі рэгіён, дзе гэты паказчык упаў з 98 % у 2004 годзе да 85 % у 2020 годзе. Яшчэ больш істотнае зніжэнне долі кваліфікаваных настаўнікаў адбываецца на

ўзроўні сярэдняй школы ў Чорнай Афрыцы. Толькі палова ўсіх настаўнікаў сярэдняй школы ў Чорнай Афрыцы мелі мінімальныя кваліфікацыі ў 2015 годзе ў параўнанні з амаль 80 % дзесяць гадоў раней.

Ахоп моладзі сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (ССА) таксама застаецца нізкім у многіх частках свету. Пэўны прагрэс можна назіраць у перыяд з 2000 па 2020 год у Цэнтральнай Азіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, а таксама ва Усходняй Азіі і ў Ціхаакіянскім рэгіёне ў ахопе праграмамі ССА 15–24-гадовых – да 15 %. Аднак у краінах з найбольш нізкімі даходамі і ў такіх рэгіёнах, як Чорная Афрыка і Паўднёвая Азія, ахоп ССА захаваўся нізкім і стагніруе на ўзроўні ўсяго каля 1 % узроставай групы. Важна нагадаць, што развіццё прафесійных навыкаў не абмяжоўваецца фармальнай адукацыяй і навучаннем і што ў многіх краінах са значнай доляй нефармальнага сектару эканомікі моладзь можа мець доступ да традыцыйнага вучнёўства ці нефармальнага развіцця навыкаў. Аднак, згодна з дадзенымі Міжнароднай арганізацыі працы, больш чым кожны пяты чалавек ва ўзросце ад 16 да 24 гадоў у свеце не ахоплены адукацыяй, навучаннем ці працай; дзве трэці з іх складаюць маладыя жанчыны.

Гэтыя лічбы відавочна адлюстроўваюць нашу калектыўную няздольнасць забяспечыць усеагульнае права на адукацыю для ўсіх дзяцей, моладзі і дарослых, нягледзячы на паўторныя глабальныя абавязацельствы пасля, як мінімум, 1990 года. Асабліва гэта тычыцца дзяўчынак і жанчын, дзяцей і моладзі з абмежаванымі магчымасцямі, выхадцаў з бедных сямей, сельскіх населеных пунктаў, карэнных народаў і меншасцей, а таксама тых, хто пакутуе ад наступстваў гвалтоўных канфліктаў і палітычнай нестабільнасці. Маргіналізаваныя супольнасці па-ранейшаму выключаны з працэсу з-за сукупнасці сацыяльных, эканамічных, культурных і палітычных фактараў.

Каб спрыяць трансфармацыі будучыні, адукацыя павінна, па-першае, стаць больш інклюзіўнай, звяртаючыся да ліквідацыі мінулых несправядлівасцей. Трэба дакладна выявіць чыннікі такой няроўнасці і такіх выключэнняў, каб палітыка і стратэгіі падтрымлівалі маргіналізаваных вучняў, асабліва тых, хто знаходзіцца ў складаным становішчы.

## Беспрасветная беднасць і рост няроўнасці

Беднасць застаецца ключавым чыннікам доступу да адукацыйных магчымасцяў. Яна з’яўляецца дадатковым інтэнсіфікатарам дыспарытэтаў для навучэнак; асоб з абмежаванымі магчымасцямі; тых, хто знаходзіцца ў нестабільных і канфліктных сітуацыях; а таксама тых, хто быў маргіналізаваны з-за сваёй этнічнасці, мовы ці аддаленага знаходжання.

З 1990 па 2020 год глабальная эканоміка вырасла ў памерах у два з паловай разы, галоўным чынам дзякуючы хуткаму эканамічнаму росту ў краінах Усходняй Азіі і Ціхаакіянскага рэгіёну, асабліва ў Кітаі, і паслядоўнаму пашырэнню эканомік краін, чые даходы з’яўляюцца высокімі і вышэйшымі за сярэдні ўзровень. З іншага боку, на краіны, дзе даходы сярэднія

або ніжэйшыя за сярэдні ўзровень, прыходзіцца толькі адна дзясятая частка сусветнага аб'ёму вытворчасці, нягледзячы на той факт, што ў 2020 годзе ў іх пражывала больш за палову насельніцтва свету. Гэта ёсць вынік значнай розніцы паміж тэмпамі росту ў розных рэгіёнах на працягу апошніх трыццаці гадоў. У 1990 годзе эканомікі Кітая і Чорнай Афрыкі былі падобнымі па памерах і складалі адпаведна каля 2 % і 1,5 % ад глабальнай эканомікі. Праз трыццаць гадоў на Кітай прыходзіцца 16 % сусветнага ВУП, у той час як на Чорную Афрыку – усяго 2 %.

Глабальны эканамічны рост прывёў да паляпшэння індывідуальных даходаў і ўмоў жыцця, а таксама да зніжэння сусветных узроўняў беднасці. Дадзеныя Сусветнага Банка паказваюць, што ў перыяд з 1990 па 2020 год глабальны гадавы даход на душу насельніцтва павялічыўся на 75 %. Калі ў 1990 годзе больш за траціну насельніцтва свету лічылася беднымі, сёння глабальны паказчык беднасці ніжэй за 10 %. Аднак зніжаныя тэмпы эканамічнага росту ў краінах з нізкімі даходамі перашкаджаюць прагрэсу ў скарачэнні беднасці і не даюць надзеі на скарачэнне няроўнасці ў даходах. Праблема выкаранення глабальнай беднасці застаецца актуальнай. І сапраўды, нягледзячы на глабальнае зніжэнне ў паказчыках беднасці ў апошнія трыццаць гадоў, каля 690 мільёнаў чалавек ва ўсім свеце дагэтуль жывуць у беднасці, менш чым на два долары ЗША ў дзень. Згодна з дадзенымі Сусветнага Банка, чвэрць насельніцтва свету, ці каля 1,8 мільярда чалавек, жывуць на 3,20 ці меней долараў ЗША ў дзень. Надзвычайная беднасць у асноўным сканцэнтравана ў Чорнай Афрыцы, пераважна ў сельскай мясцовасці, і яна непрапарцыйна больш закранае жанчын. Дзве трэці бедных – дзеці і моладзь да 25 гадоў.

Пасля 1980-х гадоў хуткі эканамічны рост у краінах, якія сталі на шлях развіцця, а таксама ў эканоміках з сярэднімі даходамі, прывёў да паступовага скарачэння няроўнасці паміж краінамі. Аднак у той жа час няроўнасць унутры краін павялічылася, хоць і з іншай хуткасцю. Пачынаючы з 1980-х гадоў адбыліся значныя ўсплёскі няроўнасці ў даходах у Кітаі, Індыі, Паўночнай Амерыцы і Расійскай Федэрацыі; больш умеранае павелічэнне назіралася ў Еўропе. Тым часам у краінах арабскага свету, як і ў Чорнай Афрыцы і шмат у чым у Бразіліі, няроўнасць традыцыйна была і застаецца высокай. Згодна з Дакладам 2018 года аб няроўнасці ў свеце, больш за палову ўсіх даходаў у Чорнай Афрыцы і ў арабскім свеце ці ў такіх краінах, як Бразілія і Індыя, прыпадае на 10 % тых, хто лепш зарабляе. Амаль ва ўсіх краінах капітал перайшоў з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную. У той час, як пашыраліся эканомікі, урады рабіліся больш беднымі, што абмяжоўвае магчымасці для пераразмеркавання даходаў і скарачэння няроўнасці.

Маёмасная няроўнасць па-рознаму адбіваецца на адукацыі. Няроўнасць пераходзіць у сацыяльную ізаляцыю бедных, што падрывае грамадскую згуртаванасць, якая неабходна для развіцця і належнага кіравання грамадства. Няроўнасць таксама прыводзіць да таго, што дзеці, якія нарадзіліся ў розных абставінах, маюць вельмі розныя ўзроўні падтрымкі адукацыі, што робіць выраўноўванне ўмоў у школах больш складаным. Забеспячэнне школамі роўных адукацыйных магчымасцяў для ўсіх дзяцей незалежна ад іх абставін з'яўляецца перадумовай для больш справядлівай і раўнапраўнай будучыні.

Гэта робіцца больш праблематычным у грамадствах, дзе існуе больш нераўнапраўя. І сапраўды, крайняя няроўнасць таксама можа фарміраваць умовы для карупцыі ў адукацыі, калі нястрымнае жаданне прасунуцца наперад можа падштурхнуць да незаконных кароткіх шляхоў і калі не стае магчымасцяў для эфектыўнага нагляду. У дакладзе “Transparency International” аб глабальнай карупцыі за 2013 год напісана, якія шматлікія формы можа прымаць карупцыя ў адукацыі, у тым ліку перанакіраванне рэсурсаў, прызначаных для закупак і паставак, подкуп за адзнакі і паступленне, кумаўство пры найме і назначэнні стыпендый, акадэмічны плагіят і неправамерны палітычны і карпаратыўны ўплыў на даследаванні. Аслаблены грамадскі і інстытуцыянальны давер можа аслабіць упэўненасць у каштоўнасці і цэласнасці адукацыі і, што больш важна, можа выклікаць прынятце карупцыі як сацыяльнай нормы з ранніх гадоў жыцця.

## Клубок выключэнняў

Беднасць і няроўнасць даходаў перасякаюцца з іншымі чыннікамі дыскрымінацыі, якія прыводзяць да выключэння з адукацыі. Так, гендарная дыскрымінацыя значна ўскладняецца іншымі чыннікамі, такімі як беднасць, ідэнтыфікацыя як прадстаўніка карэнных народаў і інваліднасць, якія надалей адхіляюць дзяўчынак ад іх адукацыйных правоў. У той час, як большасць груп даходаў і рэгіёнаў дэманструюць набліжэнне да гендарнага парытэту ў наведванні школ, у краінах з самым нізкім даходам або ў Чорнай Афрыцы сітуацыя іншая. Згодна з дадзенымі Інстытута статыстыкі ЮНЕСКА (UIS), на кожных 100 хлопчыкаў малодшага школьнага ўзросту, якія не наведваюць школу ў краінах Чорнай Афрыкі, прыходзіцца 123 дзяўчынкі, якія таксама выключаны з адукацыі. Выключэнне дзяўчынак яшчэ больш прыкметнае ў малодшых і старэйшых класах сярэдняй школы. У 9 краінах з найніжэйшымі даходамі дзяўчынкі з найбольш бедных асяроддзяў ходзяць у школу на 2 гады менш за хлапчукоў. Гэты гендарны спад наведвальнасці, асабліва ў сярэдняй адукацыі, паказвае, колькі яшчэ трэба зрабіць, каб утрымаць дзяўчынак на ўсёй працягласці навучання. Пачатковы доступ да адукацыі недастатковы. Адказнасць за забеспячэнне таго, каб дзяўчынкі праходзілі поўны цыкл сярэдняй адукацыі, выходзіць далёка за рамкі школы. Яна звязана з грамадскімі і эканамічнымі выклікамі, з якімі дзяўчынкі дагэтуль сутыкаюцца ва ўсім свеце, асабліва ва ўзросце палавога выспявання, у сувязі з такімі пытаннямі, як ранні шлюб ці ранняя і непажаданая цяжарнасць, хатняя праца, а таксама менструальная гігіена і стыгма.

Інваліднасць негатыўна адбіваецца на адукацыі ва ўсіх рэгіёнах і групах даходаў, дзе сістэмы адукацыі не праводзяць палітыку інклюзіі. Перашкоды, з якімі сутыкаюцца інваліды, значна ўскладняюцца беднасцю. Большасць дзяцей-інвалідаў жывуць у бедных краінах. Узроўні як сярэдняй, так і цяжкай інваліднасці ва ўсіх узростах вышэй у краінах з нізкімі і сярэднімі даходамі ў параўнанні з багатымі краінамі. Беднасць з’яўляецца як прычынай, так і наступствам інваліднасці, і сістэмы адукацыі абавязаны падтрымліваць права на адукацыю вучняў з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама, наколькі гэта магчыма, уключаць іх у адукацыйнае асяроддзе з найменшымі абмежаваннямі.

Акрамя таго, розныя канфлікты з’яўляюцца прычынай таго, што палова людзей у свеце не наведваюць школу. Гвалтоўны канфлікт робіць немагчымай працу альбо наведванне школ і можа прывесці да перасялення ўсяго насельніцтва. Адукацыйныя ўстановы, іх супрацоўнікі і вучні могуць быць мішэнямі і ахвярамі выкраданняў, згвалтаванняў і вярбоўкі ў салдаты.

Дзеці і моладзь з карэнных народаў і этнічных меншасцей сутыкаюцца з рознымі перашкодамі, якія абмяжоўваюць іх доступ да якаснай адукацыі на ўсіх узроўнях. Акрамя эканамічных, моўных і геаграфічных бар’ераў, на высокія ўзроўні адтоку сярод дзяцей і моладзі з карэнных народаў уплываюць такія чыннікі, як расізм, дыскрымінацыя і адсутнасць культурнай значнасці. Фармальная адукацыя ўвогуле не прызнае веды і сістэмы навучання карэнных народаў і не адпавядае рэаліям і памкненням карэнных народаў як у сельскай, так і ў гарадской мясцовасці.

Гістарычна склалася так, што адукацыя таксама выкарыстоўваецца для парушэння культурных і рэлігійных правоў дзяцей, напрыклад, як інструмент асіміляцыі карэнных народаў і этнічных меншасцей з асноўным насельніцтвам, або як інструмент рэлігійнай індактрынацыі ці знішчэння рэлігійнай ці культурнай ідэнтычнасці дзяцей з меншасцей у парушэнне іх асноўных правоў. Спадчына тых часоў, калі адукацыя выкарыстоўвалася ў якасці зброі супраць дзяцей і сем’яў карэнных народаў, дагэтуль адчуваецца праз сістэмную дыскрымінацыю і ігнараванне. Напрыклад, дзеці з аддаленых населеных пунктаў, дзе пражываюць карэнныя народы ці меншасці, часта вымушаны пакідаць свае супольнасці, каб працягваць адукацыю, жывучы ў інтэрнатах або школах-інтэрнатах, што пазбаўляе іх сем’яў і супольнасцей, а таксама культурнай падтрымкі.

Эканамічная глабалізацыя ўсё больш уплывае на тое, што і як вывучаюць вучні. Яна змяніла чаканні адносна таго, што павінны ведаць дзеці і моладзь, каб забяспечыць сваё працаўладкаванне ў дваццаць першым стагоддзі. Падрыхтоўка да працаўладкавання – важная адукацыйная задача. Аднак існуюць падводныя камяні, калі вызначаюцца занадта вузкія мэты адукацыі, асабліва калі яны не супадаюць з рэаліямі жыцця і магчымасцямі вучняў і сем’яў. Больш шырокі падыход да спосабаў набыцця ведаў прызнае, што існуюць больш шырока разнастайныя шляхі прымянення, стварэння і распаўсюджвання ведаў у розных кантэкстах, культурах і абставінах. Яны будуюцца не толькі на базавых навыках пісьма і лічэння, але і на багатай спадчыне ведаў у розных культурах, якая ўлічвае ўсё глабальнае, лакальнае, спрадвечнае, увасобленае, культурнае, навуковае і духоўнае.

Гэта асабліва так, калі гаворка ідзе пра мову карэннага народа, мову меншасці, а таксама пра вучняў розных этнасаў, якіх можна залічыць да тых, хто не наведвае школу. Роўнасць у адукацыі павінна ахопліваць шматлікія формы ведаў і самавыяўлення чалавецтва. Шырокамаштабныя ацэнкі часта не ўлічваюць валоданне матчынай мовай, што можа надалей маргіналізаваць вучняў з меншасцей і карэнных народаў і падштурхнуць іх да датэрміновага пакідання школы. Напрыклад, вынікі “Праграмы міжнароднага даследавання чытацкай граматнасці” паказалі, што вучні чацвёртага класа, якія не размаўлялі дома на мове, на якой праводзіўся тэст, мелі менш шанцаў дасягнуць

мінімальнага ўзроўню чытацкіх навыкаў, чым іншыя вучні. Мы павінны прыняць сусвет, які мае шматлікія жывыя рэаліі, а не навязваць адзінае бачанне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гарантаванне поўнага выкарыстання асабістых і калектыўных правоў патрабуе сапраўднай ацэнкі разнастайных патэнцыялаў людзей.

Роўнасць у адукацыі павінна ахопліваць шматлікія формы ведаў і самавыяўлення чалавецтва.

Калі новы сацыяльны кантракт на адукацыю будзе кіравацца правамі чалавека, то трэба прызнаць і пацвердзіць пачуццё ідэнтычнасці вучняў – культурнай, духоўнай, сацыяльнай і моўнай, асабліва сярод карэнных, рэлігійных, культурных і гендарных меншасцей і сістэматычна маргіналізаваных груп насельніцтва. Адпаведнае прызнанне ідэнтычнасці ў навучальных праграмах, педагогіцы і інстытуцыйных падыходах можа прама паўплываць на ўтрыманне вучняў, іх псіхічнае здароўе, самапавагу і дабрабыт супольнасцей.

Каб далучыць тых, каму не дапамаглі іншыя рашэнні, спатрэбяцца іншыя сродкі і меры. Аднак гэтая праца робіцца яшчэ больш праблематычнай у свеце рэальных існуючых грамадскіх і адукацыйных хібаў, якія ўзнікаюць у выніку змены клімату, глабальных пандэмій і небяспекі. У 2020 годзе адна толькі пандэмія COVID-19 прывяла да таго, што 1,6 мільярда дзяцей і маладых людзей ва ўсім свеце пацярпелі ад закрыцця навучальных устаноў. Нават калі школы адчыніліся зноў, у іх не вярнуліся мільёны вучняў, асабліва з больш бедных і маргіналізаваных супольнасцей. Няроўнасць у адукацыйных магчымасцях яшчэ больш павялічылася.

Стварэнне новага сацыяльнага кантракта на адукацыю становіцца ўсё больш актуальным з улікам надыходзячых грамадскіх зменаў і радыкальных зрухаў на гарызонце. Ён павінен звяртацца да вырашэння існуючага клубка няроўнасцей, якія замацоўваюць адукацыйнае і грамадскае выключэнне; гэты кантракт павінен дапамагаць у фарміраванні экалагічна ўстойлівай і сацыяльна справядлівай і інклюзіўнай сумеснай будучыні.

# Раздзел 2

## Збоі і новыя трансфармацыі

Тут я хачу падкрэсліць, што адзін з вялікіх урокаў майго жыцця – перастаць верыць у трываласць сучаснасці, у бесперапыннасць станаўлення, у прадказальнасць будучыні. Перарывістыя, раптоўныя, нечаканыя выбухі адбываюцца бязлітасна; яны ўзрушваюць або змяняюць, да лепшага ці горшага, наша асабістае жыццё, наша грамадскае жыццё, жыццё нашай нацыі, жыццё чалавецтва.

**Эдгар Марын (Edgar Morin)**, "Урокі стагоддзя жыцця", 2021

Па меры таго, як мы рухаемся да рубяжа сярэдзіны стагоддзя, 2050 года, той тып адукацыі, які нам будзе патрабавацца, у значнай ступені залежыць ад таго, як, згодна з нашымі чаканнямі, будзе выглядаць свет з улікам верагоднасці вялікай разнастайнасці ў сем'ях, супольнасцях, краінах і рэгіёнах.

У гэтым раздзеле мы паглядзім у будучыню, звярнуўшы ўвагу на збоі, ад якіх чакаецца глыбокі ўплыў на чатыры сферы, якія часта перакрыжоўваюцца: экалогія, спосаб нашага жыцця і ўзаемадзеянне з тэхналогіямі, нашы сістэмы кіравання і сфера працы.

Нягледзячы на няўпэўненасць прагнозаў, прадбачанне трансфармацыйных зрухаў дае падмурак для планавання і стварэння альтэрнатыўных сцэнарыяў таго, як лепш узгадніць адукацыю з патрэбамі чалавецтва ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі і далей.

## Планета ў небяспецы

Навукоўцы прыйшлі да кансэнсусу адносна таго, што дзесяцігоддзі перад 2050 годам і, у прыватнасці, 2020-я гады будуць вырашальнымі для будучыні людзей і ўсіх іншых форм жыцця на Зямлі. Крокі, якія мы робім – або не робім – для скарачэння выкідаў вуглякіслага газу, будуць вызначаць тое, як будзе выглядаць будучыня ў 2030-я і 2040-я гады; і яны будуць мець хвалевы эфект на сотні тысяч, калі не на мільёны гадоў. Маштаб і хуткасць змен, якія мы ажыццяўляем на Зямлі, не маюць гістарычных прэцэдэнтаў і вельмі мала геалагічных прэцэдэнтаў. Паводле ацэнак, хімічны склад атмасферы змяняецца ў дзесяць разоў хутчэй, чым нават падчас самых экстрэмальных зрухаў, якія назіраліся за ўвесь перыяд эпохі млекакормячых. Зараз на Зямлі гарачэй, чым было калі-небудзь з пачатку апошняга ледніковага перыяду, які пачаўся 125 тысяч гадоў таму. І паколькі наступствы змянення клімату, якія ўжо адбыліся, закладзены ў нашых сістэмах, яны будуць фарміраваць жыццё на планеце на працягу наступных прыкладна трыццаці гадоў. Мы павінны прыстасавацца да змянення клімату, змякчыць і павярнуць назад гэтыя змены; адукацыя, якая ўключае змяненне клімату і накіравана на яго, павінна адпавядаць гэтым тром мэтам.

Падпісанне Парыжскага кліматычнага пагаднення 2015 года адзначыла гістарычнае глабальнае абавязацельства – працаваць над скарачэннем глабальных выкідаў такіх парніковых газаў, як $CO_2$ і метан, якія растуць з пачатку індустрыяльнай эры. Урады свету паабяцалі садзейнічаць таму, каб планета праграплялася не больш чым на 2°C у параўнанні з даіндустрыяльным узроўнем (і пажадана – не больш чым на 1,5°C). Тым не менш выкіды па-ранейшаму растуць, нягледзячы на абавязацельствы скараціць маштабы спальвання выкапнёвага паліва. У дакладзе 2021 года Міжурадавай групы экспертаў па змяненні клімату адзначана, што хуткасць глабальнага пацяплення вышэйшая, чым чакалася нават некалькі гадоў таму. На глабальным узроўні мы аказаліся няздольнымі стабілізаваць выкіды парніковых газаў, не кажучы пра тое, каб рэзка іх скараціць. Наступствы гэтага бяздзеяння – паўсюль вакол нас, і шмат у чым яны разбуральныя: становяцца нормай знясільвальная спякота, больш частыя і працяглыя засухі, патопы, пажары і выміранне,

якое паскараецца. І, нягледзячы на пастаянныя папярэджанні, занадта шмат людзей дагэтуль не разумеюць наступствы такой чалавечай дзейнасці, як здабыча і спальванне вугляродаў, каб забяспечыць сучасны свет энергіяй. Чалавечая дзейнасць прывяла да кліматычных зрухаў, якія таксама выклікалі гібель паловы трапічных каралавых рыфаў на планеце, раставанне 10 трыльёнаў тон ільду і значнае павышэнне кіслотнасці акіяна. Хоць калісьці і здавалася, што нулявыя выкіды вугляроду могуць пачакаць да 2050 года, каб прадухіліць некаторыя з найгоршых наступстваў змены клімату, нядаўнія навуковыя даследаванні паказваюць, што гэты тэрмін наступіць значна раней. Тое, што адбудзецца ў наступныя некалькі гадоў, – усяго толькі нанасекунда ў велізарнай гісторыі Зямлі – можа накіраваць нас на кашмарны шлях жыцця ва ўмовах усё больш нестабільнага і небяспечнага клімату – або клімату, які зменіцца, але менш жорстка, і застанецца адносна камфортным для людзей.

Актуальнасць сітуацыі ўсё часцей усведамляецца ў сем'ях, на прадпрыемствах, у храмах і школах па ўсім свеце. Зразумела, што менавіта дзеці і моладзь ініцыявалі найбольш моцныя заклікі да дзеянняў і жорстка дакараюць тых, хто адмаўляецца прызнаць хісткасць цяперашняга моманту і прыняць значныя меры па выпраўленні сітуацыі. Кансультацыі, якія сталі інфармацыйнай асновай гэтага даклада і якія паслядоўна праводзіліся ў фокус-групах як сярод моладзі, так і самімі маладымі людзьмі, а таксама апытанні юнакоў і дзяўчат відавочна сведчаць аб высокім узроўні заклапочанасці змяненнем клімату і разбурэннем навакольнага асяроддзя.

## Выхад за планетарныя межы

Пацяпленне атмасферы і акіянаў Зямлі ідзе рука аб руку з эксплуатацыяй рэсурсаў, штурхаючы планету да мяжы. З 1950 па 2020 год насельніцтва свету патроілася, яно вырасла з 2,5 мільярда да амаль 8 мільярдаў чалавек у выніку росту нараджальнасці і хуткага павелічэння працягласці жыцця. Сярэднестатыстычны чалавек пражыў на Зямлі ў 2020 годзе ў два разы больш, чым у 1920 – выдатнае дасягненне, якое адлюстроўвае незлічоныя грамадскія і навуковыя поспехі. Прадказальна, што такі выбуховы рост насельніцтва суправаджаецца павелічэннем патрэбаў у рэсурсах. І насельніцтва працягвае расці, хоць і больш павольнымі тэмпамі, чым у папярэдні стагоддзі. Згодна з цяперашнімі прагнозамі, насельніцтва вырасце да 9,7 мільярда ў 2050 годзе і потым, у 2100 годзе, верагодна, выйдзе на плато каля 11 мільярдаў.

Гэты рост у спалучэнні з імклівым паскарэннем спажывання і прамысловай дзейнасці ставіць вялікія патрабаванні да рэсурсаў і часта абарочваецца стрэсам для навакольнага асяроддзя. З 1950 года спажыванне людзьмі вады падвоілася, вытворчасць і спажыванне харчоў павысіліся ў 2,5 разы, а спажыванне драўніны патроілася. Па падліках, на 2050 год запыт на харчаванне вырасце яшчэ на 35 %, запыт на ваду – на 20–30 %, а запыт на энергію – на 50 %.

Сёння мы значна выходзім за планетарныя межы ў плане здабывання сыравіны, спажывання і адходаў. Па некаторых падліках, сучасны экалагічны след чалавека патрабуе

1,6 такіх планет Зямля, каб падтрымліваць нас і засвойваць нашы адходы. Гэта азначае, што з тым, як працягвае расці наша выкарыстанне рэсурсаў, цяпер планеце патрэбны год і восем месяцаў, каб аднавіць тое, што мы выкарыстоўваем за адзін год. Без карэкцыі курсу ў 2050 годзе мы будзем выкарыстоўваць рэсурсы ў чатыры разы хутчэй таго часу, які патрабуецца для іх папаўнення, і мы перададзім будучым пакаленням моцна вынішчаную планету.

Сёння мы значна выходзім за планетарныя межы ў плане здабывання сыравіны, спажывання і адходаў.

Забруджванне, пабочны прадукт нашага спажывання і эксплуатацыі рэсурсаў, хутка стала найбуйнейшай экалагічнай прычынай хвароб і смерці; паводле ацэнак, яно стала прычынай да 9 мільёнаў выпадкаў заўчаснай смерці ў год, што значна больш, чым СНІД, малярыя, сухоты і ваенныя дзеянні разам узятыя. Яго часта называюць не толькі найбуйнейшым крызісам аховы здароўя на планеце, але і звязваюць з цяжкасцямі ў навучанні і інваліднасцю. Шмат калі сама дарога ў школу і са школы можа несці пагрозу для здароўя чалавека з-за небяспечнага ўзроўню забруджвання паветра, і многія ўстановы адукацыі, калі вы ўжо ў іх апынуліся, не маюць працуючых паветраных фільтраў, адпаведных сістэм ачысткі сцёкавых вод і чыстай вады. Іншыя навучальныя ўстановы знаходзяцца ў месцах з небяспечнымі ўзроўнямі хімічных адходаў і іншых форм таксічнага забруджвання.

Нават калі заўтра будзе дасягнуты нулявы ўзровень выкідаў і ў нас будуць на 100 % чыстыя энергетычныя сістэмы, мы ўсё роўна сутыкнёмся са шкоднымі экалагічнымі наступствамі няўстойлівай дзейнасці, такой як высечка лясоў, празмерны вылаў рыбы, прамысловая сельская гаспадарка, здабыча карысных выкапняў і адходы – усё гэта, у дадатак да наступстваў змены клімату, ужо ўбудавана ў нашу сістэму. Каскадныя наступствы толькі выяўляюцца. Біясфера Зямлі – гэта інтэграваная сістэма, у якую ўваходзяць людзі і якая можа супрацьстаяць значным ціскам, але чым больш мы нагружаем экасістэмы, ад якіх залежым, тым бліжэй мы становімся да пераломных момантаў, якія могуць прывесці да незваротнага разбурэння.

За гэта адказныя людзі, але не для ўсіх гэтая адказнасць роўная. Прывілеяваныя групы і багацейшыя рэгіёны планеты выкарыстоўваюць значна больш рэсурсаў і спальваюць нашмат больш вугляродаў, чым іншыя. У той час, як мы працуем разам над зменай кірунку, грамадская справядлівасць павінна ахопліваць экалагічную справядлівасць, і наадварот. Мы павінны зрабіць так, каб тыя, хто нясе найменшую адказнасць за такое напружанне планеты, не працягвалі плаціць за гэта непамерную цану.

## Наступствы змянення клімату для адукацыі

У цяперашні час змяненне клімату і дэстабілізацыя экасістэм прама і ўскосна адбіваюцца на адукацыі. Інтэнсіфікацыя экстрэмальных прыродных з’яў і звязаных з імі стыхійных бедстваў перашкаджае і нават можа пазбавіць доступу да адукацыі. Дзеці, моладзь

і дарослыя навучэнцы могуць перасяляцца ў месцы, аддаленыя ад адпаведных навучальных устаноў. Школьныя будынкі могуць быць разбураныя або перапрафіляваныя для забеспячэння прытулку або іншых паслуг. Нават там, дзе школы і ўніверсітэты працягваюць працаваць, недахоп настаўнікаў з прычыны перамяшчэння з'яўляецца агульным наступствам стыхійных бедстваў, звязаных са змяненнем клімату.

Павышэнне тэмпературы стварае асаблівую небяспеку для адукацыі. Значная колькасць даследаванняў паказваюць, што гарачыня негатыўна ўплывае на навучанне і пазнанне, і большасць школ і жылых дамоў у свеце ў цяперашні час не маюць адпаведных матэрыялаў, канструкцый і тэхналогій, каб значным чынам зніжаць тэмпературу і забяспечваць клімат-кантроль. Так адбываецца ў краінах з надзвычайнай спякотай і ў краінах (шмат з якіх – багатыя), якія толькі перыядычна адчуваюць рэзкія ўсплёскі тэмпературы. Апошнія прагнозы дазваляюць зрабіць выснову, што без значнага зруху ў рэгуляванні выкідаў парніковых газаў трэць насельніцтва свету да 2070 года, верагодна, будзе жыць у раёнах, якія лічацца непрымальна гарачымі для чалавека. Ужо зараз вучні ва ўсім свеце прызвычайваюцца да ўказанняў не хадзіць у школу і заставацца дома з-за небяспечных узроўняў спякоты ці іншых надзвычайных прыродных з'яў, якія, верагодна, будуць толькі расці ў маштабах, узроўні і частаце.

Акрамя прамога ўздзеяння змянення клімату і забруджвання на вучняў, настаўнікаў і школьныя супольнасці, яны маюць ускосны ўплыў на сродкі існавання і дабрабыт. Высокая верагоднасць адсутнасці харчовай бяспекі, распаўсюджванне хвароб і пагаршэнне эканамічнай нестабільнасці ствараюць новыя выклікі для забеспячэння права на адукацыю. У гэтых сітуацыях мы таксама ведаем, што наступствы падзяляюцца няроўна.

Факты сведчаць, што змяненне клімату павышае гендарную няроўнасць, асабліва паміж найбольш беднымі і маргіналізаванымі людзьмі, а таксама тымі, хто залежыць ад натуральнай гаспадаркі. Там, дзе рэсурсаў бракуе, яны, як правіла, размяркоўваюцца няроўным чынам. Калі жанчыны і дзяўчынкі перамяшчаюцца ў выніку наступстваў змянення клімату, для іх існуе шмат большая верагоднасць трапіць у пастку галечы. Перспектыва іх вяртання дамоў і аднаўлення свайго жыцця, у тым ліку праз адукацыю, ніжэйшая, чым у мужчын, якія апынуліся ў тых жа абставінах. Змяненне клімату таксама можа павялічыць знешнюю міграцыю мужчын, павышаючы цяжар клопатаў аб выжыванні сям'і для жанчын. У некаторых сітуацыях раннія шлюбы дзяўчынак – адзін з нешматлікіх варыянтаў падтрымкі сем'яў, што ставіць крыж на перспектыве атрымання адукацыі такімі дзяўчынкамі. У той самы час жанчыны адыгрываюць важную ролю ў кліматычнай справядлівасці – як маці, настаўніцы, работніцы, кіраўніцы, прадстаўніцы і лідаркі супольнасці – і часта знаходзяцца ў авангардзе адаптацыі і змякчэння наступстваў змянення клімату.

Жанчыны карэнных народаў валодаюць ведамі, якія дапамагаюць змяншэнню і адаптацыі да наступстваў змянення клімату: устойлівае кіраванне лясамі, пасяўная праца, збор вады, біяразнастайнасць, устойлівасць сельскагаспадарчых культур, а таксама захаванне і адбор насення; аднак іх унёсак часта ігнаруецца.

Занадта часта тыя, хто больш за ўсіх пацярпеў ад змянення клімату, недастаткова прадстаўлены ў грамадскіх дэбатах – як у свеце ў цэлым, так і ў сваіх краінах і мясцовасцях. Акрамя гэтага, найвялікшыя групы ў сферы адукацыі, у якія ўваходзяць вучні, настаўнікі і сем'і, часта прыкметна адсутнічаюць у дыскусіях па змяненні клімату і яго наступствах для адукацыі. Вельмі важна, каб яны адыгрывалі вядучую ролю ў выпрацаванні спосабаў рэагавання адукацыі. Патрэба ў падыходах, якія прадугледжваюць шырокі ўдзел, выходзіць за межы палітыкі і планавання адукацыі і таксама датычыцца даследаванняў і стварэння ведаў аб выкліканых людзьмі зменах на планеце і ў адукацыі.

У сучасны момант атрыманне і завяршэнне адукацыі звязаны з няўстойлівымі практыкамі. Найбольш адукаваныя краіны і народы свету больш за ўсіх паскараюць змяненне клімату. Пры тым, што мы чакаем, каб адукацыя прапанавала шляхі да міру, справядлівасці і праvoў чалавека, мы толькі зараз пачынаем чакаць і сапраўды патрабаваць, каб яна адчыніла каналы і стварыла магчымасці для ўстойлівасці. Трэба актывізаваць працу ў гэтым напрамку. Калі быць адукаваным азначае жыць няўстойліва, мы павінны перагледзець нашы ўяўленні аб тым, што павінна рабіць адукацыя і што значыць быць адукаваным.

## Падстава для надзеі

Адукацыя сама па сабе занадта доўга грунтавалася на арыентаванай на эканамічны рост парадыгме мадэрнізацыйнага развіцця. Аднак ёсць раннія прыкметы таго, што мы рухаемся насустрач новай, экалагічна арыентаванай адукацыі, заснаванай на разуменні, якое можа аднавіць баланс нашага жыцця на Зямлі і прызнаць яго ўзаемазалежныя сістэмы і іх межы. Штогадовае святкаванне Дня Зямлі ў красавіку стала адным з найбуйнейшых свецкіх святаў у гісторыі чалавецтва. Кліматычны рух падштурхнуў дзяцей да больш актыўных намаганняў, накіраваных на тое, каб іх бачанне будучыні было пачутае і рэалізаванае. Іх дзеянні ёсць рэпетыцыі будучыні іншага тыпу.

Акрамя гэтага, устойлівае развіццё ўсё часцей прызнаецца як кіруючым прынцыпам адукацыі, так і прынцыпам арганізацыі навучальных праграм.

Мы не можам скідаць з рахунку магчымую будучыню ў 2050 годзе, калі адбудзецца радыкальная трансфармацыя чалавечай экасвядомасці і нашых укладаў жыцця ў балансе з жывой Зямлёй.

Нягледзячы на тое, што важнасць экалагічнай адукацыі прызнаецца ўжо дзесяцігоддзямі і ўхваляецца ў шматлікіх палітычных урадавых заявах, існуе значны разрыў паміж палітыкай і практыкай і нават большы разрыў з вынікамі. Згодна з даследаваннямі эфектыўнасці адукацыі ў галіне змянення клімату, адукацыя шмат у чым засяроджваецца на выкладанні навук без развіцця поўнага дыяпазону кампетэнцый, неабходных для прыцягнення вучняў да эфектыўных дзеянняў.

> Нам патрэбныя абноўленыя і больш эфектыўныя падыходы, каб дапамагчы вучням развіваць магчымасці адаптавацца да змяненняў клімату і змякчаць яго наступствы.

Нам патрэбныя абноўленыя і больш эфектыўныя падыходы, каб дапамагчы вучням развіваць магчымасці адаптавацца да змяненняў клімату і змякчаць яго наступствы. Нашы стратэгіі павінны грунтавацца на ведах аб тым, як спрыяць больш глыбокаму навучанню і развіццю грамадзянскай кампетэнтнасці, і на апошніх даследаваннях у галіне развіцця навыкаў для жыцця і працы.

## Лічбавасць, якая злучае і падзяляе

Наш гістарычны момант вызначаецца паскарэннем тэхналагічнай трансфармацыі нашых грамадстваў, якое характарызуецца лічбавай рэвалюцыяй і прагрэсам біятэхналогій і нейранавук, якія адбываюцца зараз. Тэхналагічныя інавацыі перафарміравалі наш стыль жыцця і навучання, і, безумоўна, гэта тэндэнцыя працягнецца.

Лічбавыя тэхналогіі, інструменты і платформы можна накіраваць у бок падтрымкі правоў чалавека, павышэння чалавечых магчымасцяў і спрыяння калектыўным дзеянням у напрамку міру, справядлівасці і ўстойлівасці. Сцвярджаючы відавочнае, можна сказаць, што лічбавая граматнасць і лічбавы доступ – гэта асноўнае права ў дваццаць першым стагоддзі; без гэтых фактараў становіцца ўсё цяжэй удзельнічаць у грамадскім і эканамічным жыцці. Адзін з горкіх урокаў глабальнай пандэміі – гэта тое, што, калі былі зачыненыя школы, тыя, хто меў падключэнне і магчымасць выкарыстоўваць лічбавыя навыкі, маглі працягваць вучобу дыстанцыйна (і аператыўна атрымліваць іншую важную інфармацыю), у той час як тыя, хто не меў такога доступу і навыкаў, былі пазбаўленыя навучання і іншых выгадаў, якія даюць рэальныя навучальныя ўстановы. Праз гэты лічбавы падзел пашырыўся разрыў у адукацыйных магчымасцях і выніках адукацыі як паміж краінамі, так і ўнутры краін. Перш за ўсё трэба ліквідаваць гэты падзел і прызнаць лічбавую граматнасць вучняў і настаўнікаў адным з асноўных відаў граматнасці дваццаць першага стагоддзя.

Аднак выкарыстанне тэхналогій для развіцця чалавечых магчымасцяў, каб зрабіць свет больш інклюзіўным і ўстойлівым, павінна быць мэтанакіраваным і стымуляваным. Тэхналогіі маюць доўгую гісторыю скажэння нашых правоў і абмежавання ці нават прыніжэння нашых магчымасцяў. Паспешлівае прыняцце новых распрацовак як цудадзейных рашэнняў рэдка прыводзіла да поспеху. Лепшыя вынікі далі распрацоўкі, накіраваныя на паступовыя паляпшэнні, і культура, якая заахвочвае тэхналагічныя эксперыменты з прызнаннем рызыкаў і разуменнем таго, што не існуе простых, універсальных рашэнняў.

Лічбавасць – усё тое, што было ператворана ў лікавыя паслядоўнасці для перадачы, захоўвання і аналізу з дапамогай камп'ютараў – насычае шырокія сферы чалавечай дзейнасці. Як форма інфраструктуры (складнік сувязі) лічбавасць шмат робіць для "злучэння" нас. Аднак "лічбавая няроўнасць" захоўваецца як з пункту гледжання доступу да інтэрнэту, так і навыкаў і кампетэнцыяў, неабходных для выкарыстання тэхналогій у калектыўных і асабістых мэтах.

Існуюць унутраныя супярэчнасці ў лічбавізацыі і лічбавых тэхналогіях. У лічбавых тэхналогіях існуюць некалькі логік, частка якіх маюць вялікі эмансіпацыйны патэнцыял, астатнія маюць вялікае ўздзеянне і нясуць вялікія рызыкі. У гэтым сэнсе “лічбавая рэвалюцыя” нічым не адрозніваецца ад іншых вялікіх момантаў тэхналагічных пераменаў, такіх як сельскагаспадарчыя і прамысловыя рэвалюцыі. Асноўныя калектыўныя дасягненні прыходзяць з трывожным павелічэннем няроўнасці і адчужэння. Задача складаецца ў тым, каб пераадолець гэтыя змешаныя наступствы праз інжынерныя тэхналагічныя распрацоўкі для забеспячэння правоў чалавека і роўных магчымасцяў.

Тэхналогія не з’яўляецца нейтральнай – яна можа абумоўліваць дзеянні і прыняцце рашэнняў, пры гэтым падзяляючы і змяняючы свет, а таксама чалавечае разуменне і дзеянні.

Асобныя рысы лічбавых тэхналогій могуць ствараць значную пагрозу для разнастайнасці ведаў, культурнай інклюзіі, празрыстасці і інтэлектуальнай свабоды; такім жа чынам, як і іншыя аспекты могуць спрыяць абмену ведамі і інфармацыяй. У цяперашні час алгарытмічныя шляхі, платформавы імперыялізм і схемы кіравання лічбавымі інфраструктурамі ўяўляюць вострую праблему для падтрымання адукацыі як грамадскага дабра. Праблемы, якія яны ўзнімаюць, сталі цэнтральнымі ў сучасных дэбатах аб адукацыі, у прыватнасці, аб лічбавізацыі адукацыі і магчымым з’яўленні новых гібрыдных або толькі віртуальных мадэляў школьнага навучання.

Сфера адукацыі ўжо некалькі дзесяцігоддзяў уцягнута ў шэраг разнастайных, часовых і ўзнікаючых сувязяў з лічбавымі тэхналогіямі. Па ўсім свеце ў класах і дамах выкарыстоўваюцца камп’ютары; усё часцей у розных адукацыйных умовах выкарыстоўваюцца мабільныя тэлефоны, якія маюць асабліва важную ролю ва ўмовах беднасці, у прыватнасці, у Чорнай Афрыцы, дзе не заўсёды ёсць магчымасць карыстацца персанальнымі камп’ютарамі. Інтэрнэт, электронная пошта, мабільныя даныя, патокавыя трансляцыі відэа і аўдыя, а таксама мноства складаных інструментаў для сумеснай працы і навучання ствараюць велізарныя і ўражальныя магчымасці і перспектывы для адукацыі.

Сучасныя трансфармацыі маюць значныя наступствы для права на адукацыю, а таксама для культурных правоў, звязаных з мовай, спадчынай і памкненнямі. Таксама вялікі ўплыў адбываецца на правы на інфармацыю, даныя і веды, а таксама права на ўдзел у дэмакратычных працэсах. Стрыжнёвыя прынцыпы чалавечай годнасці, уключаючы права на прыватнасць і права дамагацца ўласных мэтаў, выходзяць на сцэну, калі мы разглядаем тыя разбуральныя змены, якія прынесла лічбавізацыя.

Дасягненні ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій працягваюць змяняць тое, за што цэніцца навучанне, шляхі, якімі навучанне адбываецца, а таксама тое, як арганізуюцца сістэмы адукацыі. Лічбавыя тэхналогіі значна знізілі выдаткі на збор інфармацыі і на дзеянні на аснове інфармацыі. Яны таксама спрасцілі ўдзел большай колькасці людзей у гэтых працэсах. Грамадзянскія і навуковыя праекты з’яўляюцца выдатнымі прыкладамі таго, як лічбавыя тэхналогіі могуць дапамагчы пашырыць аб’ём сабранай і прааналізаванай інфармацыі, а таксама колькасць і разнастайнасць людзей,

якія прымаюць удзел у гэтай працы. Стварэнне, распаўсюджванне і выкарыстанне даных, а таксама веданне таго, што даныя могуць узнікаць праз лічбавыя працэсы, змянілі шляхі, якімі развіваюцца навуковыя дасягненні і спецыялізаваны вопыт – таксама, як і шляхі, якімі інфармацыя і веды становяцца даступнымі ці недаступнымі для грамадства па ўсім свеце. У той жа час лёгкасць збору і аналізу даных з дапамогай камп'ютара хутка зацяніла альтэрнатыўныя формы разважанняў і асэнсавання, з такімі наступствамі, як перавага лікавых набораў даных над іншымі відамі даных, уключаючы асабісты досвед і іншыя віды інфармацыі, якія, хоць і з'яўляюцца актуальнымі, амаль не падлягаюць колькаснаму вымярэнню.

Па меры таго, як мы прызвычайваемся да свету, дзе ў кішэнным мабільным тэлефоне можна імгненна атрымаць больш тэкставай і графічнай інфармацыі, чым з усіх нашых найвялікшых фізічных бібліятэк за ўсе тысячагоддзі, адукацыя павінна выходзіць за межы распаўсюджвання і перадачы ведаў і замест гэтага забяспечваць пашырэнне магчымасцяў навучэнцаў праз веды, а таксама адказнае выкарыстанне гэтых ведаў навучэнцамі. Першачарговая задача адукацыі зводзіцца да таго, каб даць людзям інструменты для асэнсавання акіянаў інфармацыі, якія знаходзяцца на адлегласці ўсяго некалькіх дотыкаў да экрана ці націскаў на клавішы.

## Лічбавыя веды і выключэнні з іх

Лічбавыя тэхналогіі сталі адлюстроўваць спецыфічную і дамінуючую плынь ведаў, унікальную для пострэнесанснага Захаду, якая зрабіла непатрэбнай значную частку традыцыйных ведаў. Веды рыбакоў, маракоў і вандроўнікаў пра клімат і навігацыю былі вынесеныя на абочыну астраномамі, кліматолагамі і метэаролагамі, якія валодаюць тэхналогіямі і атрыманымі з іх дапамогай данымі. Аналагічным чынам веды фермераў, паляўнічых, збіральнікаў і жывёлаводаў, якія часта стагоддзямі перадаваліся наступным пакаленням, былі выцесненыя на абочыну праз тэхнічныя веды, досвед і тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца аграномамі, экспертамі ў лясной гаспадарцы, прафесійнымі прыродаахоўнікамі, фармацэўтычнымі кампаніямі і нутрыцыёлагамі. Гэтае выцясненне не звязаных з тэхналогіямі шляхоў да ведаў пазбавіла чалавецтва велізарнага і разнастайнага архіву ведаў аб тым, як быць чалавекам, аб прыродзе і навакольным асяроддзі і аб касмалогіі. Педагогі могуць зрабіць шмат чаго, каб прызнаць, вярнуць і аднавіць гэтыя веды, якія складаюць ДНК культурнай разнастайнасці чалавецтва. У сваю чаргу педагогіка як навука сама стала экспертнай кампетэнцыяй, якая часта абвяргае ці ставіцца з падазрэннем да нефармальных, традыцыйных і цяжкадаступных ведаў.

Адна з найкаштоўнейшых формаў ведаў, якой пагражае трыумф лічбавізацыі, – гэта сам аспект сацыяльнага. Нягледзячы на хвалёныя абмен данымі, выхад у інтэрнэт і сацыяльныя адносіны, большасць арыентаваных на прыбытак лічбавых ведаў грунтуюцца на ізаляцыі асобы – карыстальніка, пакупніка ці гледача – і могуць вельмі лёгка справакаваць адзіноту, эгаізм і нарцысізм. І менавіта таму, што лічбавая граматнасць, прылады, платформы і прапускная здольнасць камп'ютарных сетак вельмі няроўна размеркаваны

між краінамі і ўнутры краін, існуе няўвага да тых, хто шануе карэнныя традыцыйныя, нізкатэхналагічныя, эфемерныя і некамерцыйныя формы ведаў, а таксама абапіраецца на іх.

Часткова лічбавая няроўнасць існуе таму, што яна па вызначэнні ігнаруе тых, хто не ўваходзіць у лічбавую сферу, і ўсё, што не падпадае пад яе метады вымярэння, захоўвання і аналізу. У гэтым сэнсе яна таксама можа слушна называцца “платформавым імперыялізмам”. Рашэнне палягае не ў спрошчанай інклюзіўнай лічбавізацыі. Яно – у больш складаным грамадскім узаемадзеянні са шляхамі выкарыстання лічбавых тэхналогій для падтрымкі грамадскага дабра ў спалучэнні з новай ацэнкай таго, што застаецца па-за лічбавай сферай.

Мы ўсе павінны калектыўна падтрымліваць і выхоўваць здольнасць да супраціву негатыўным аспектам лічбавізацыі, якія могуць усё шырэй распаўсюджвацца ў 2050 годзе – асабліва з акцэнтам на колькасных, алгарытмічных і “красвордных” вызначэннях ведаў. Але супраціў гэтым тэндэнцыям не азначае супраціў самой лічбавізацыі.

У эпоху COVID-19 мы назіраем, што лічбавыя тэхналогіі маюць вялікае значэнне для аховы здароўя і народнай асветы і даюць незаменныя інструменты, апроч іншага, для дыстанцыйнай адукацыі, адсочвання кантактаў і вакцын, атрымання надзейнай інфармацыі аб вірусе. Тым не менш лічбы без наратыву, сувязь без культурнай інклюзіі, інфармацыя без надання магчымасцяў і лічбавыя тэхналогіі ў адукацыі без выразных мэтаў не з’яўляюцца пажаданымі паказчыкамі або сродкамі чалавечага развіцця.

> Лічбы без наратыву, сувязь без культурнай інклюзіі, інфармацыя без надання магчымасцяў і лічбавыя тэхналогіі ў адукацыі без выразных мэтаў не з’яўляюцца пажаданымі.

Нягледзячы на святочны тон, які суправаджае мноства каментароў адносна лічбавай рэвалюцыі, яна таксама можа тлумачыцца як няздольнасць выкарыстаць магчымасці, якія прапануюць гэтыя тэхналогіі і якія з’яўляюцца патэнцыяльна глыбока трансфармацыйнымі. Лічбавыя платформы, як яны выкарыстоўваюцца зараз, у асноўным адпавядаюць мэтам, якія спрыяюць больш шырокім бізнес-задачам. Іх дызайнерскія суполкі таксама звычайна выключаюць непрывілеяваныя групы, у тым ліку жанчын, а таксама моўныя, этнічныя і расавыя меншасці і інвалідаў, распаўсюджваючы аднабокую і неаб’ектыўную інфармацыю, якая не прадстаўляе чалавецтва ў цэлым. Аднак гэта не павінна стаць лёсам даступных сёння магутных лічбавых тэхналогій. Яны могуць зрабіць шмат больш, каб надаць людзям магчымасці і аб’яднаць іх, чым тыя звычайна камерцыйныя штампы, якія мы стварылі для іх і якіх мы зараз чакаем.

Стварэнне больш гнуткага лічбавага асяроддзя будзе патрабаваць пэўнага аддзялення яго базавай інфраструктуры ад бізнес-мадэляў і аўтарытарных рэгулятыўных імпульсаў, якія зараз стрымліваюць пазітыўнае развіццё і магчымае грамадскае дабро, якое можна стварыць.

## “Узлом” чалавечай прыроды навучэнцаў

Дасягненні біятэхналогіі і нейранавукі патэнцыйна могуць вызваліць такія механізмы ў арганізме чалавека, якія раней нельга было ўявіць. Належнае этычнае кіраванне і абмеркаванні ў грамадскай сферы будуць набываць усё большую актуальнасць, каб гарантаваць, што тэхналагічныя дасягненні, якія ўплываюць на генетычную сістэму і нейрахімію чалавека, будуць спрыяць устойлівай, справядлівай і мірнай будучыні.

Новыя інструменты нейранавукі ўжо дазваляюць даследчыкам наўпрост вывучаць тое, як функцыянуе чалавечы мозг, у процілегласць вывадам адносна функцыянавання мозга на аснове паводзінаў. Аднак большасць сучасных метадаў запісу мозга абапіраюцца на высока кантраляванае асяроддзе, якое далёка адстаіць ад рэальных умоў адукацыі і ўзаемадзеянняў у яе працэсе. Адзін з папулярных сёння напрамкаў даследаванняў – гэта выяўленне зон мозга, якія выбарачна актывізуюцца падчас розных відаў навучальнай дзейнасці (такіх як разуменне мовы ці матэматычнае абгрунтаванне). Аднак яны пакуль што даюць мала інфармацыі аб тым, як трэба структураваць выкладанне, і патрабуюць далейшых даследаванняў.

Тым не менш назапашваецца каштоўная інфармацыя з даследаванняў, якія ўлічваюць мозг як біялагічны орган, які можа знаходзіцца ва ўмовах, больш ці менш аптымальных для навучання. Важнасць здароўя мозга як кампанента фізічнага здароўя цела ўмацоўвае ўзаемазалежнасці паміж навучаннем і агульным дабрабытам чалавека і далей канкрэтызуе сувязі паміж правам на адукацыю і іншымі правамі, такімі як права на здароўе.

З’яўляецца ўсё больш доказаў нейрапластычнасці чалавечага мозга – у тым сэнсе, што мозг фізічна змяняецца на працягу жыцця чалавека. Пры тым, што першыя гады жыцця застаюцца крытычным перыядам фарміравання, мы цяпер разумеем, што наш мозг здольны да шырокага навучання і “перабудовы” ва ўсіх узростах і што пэўныя хімічныя рэчывы могуць спрыяць перабудове чалавечага мозга, што, напрыклад, дазваляе пацыентам перажываць траўмы. Гэтыя распрацоўкі маюць патэнцыйныя наступствы для адукацыі і навучання дарослых.

> Пры тым, што першыя гады жыцця застаюцца крытычным перыядам фарміравання, мы цяпер разумеем, што наш мозг здольны да шырокага навучання і “перабудовы” ва ўсіх узростах.

Нейрапластычнасць таксама мае важныя наступствы для адаптацыі людзей да экалагічных і тэхнічных перамен. Як сцвярджаецца ў гэтым дакладзе, людзі ўсіх узростаў, не толькі дзеці, будуць усё часцей вымушаныя вучыцца жыць на пашкоджанай планеце. Нейрапластычнасць таксама падключаецца ў той час, калі ўсё больш людзей па ўсім свеце займаюцца лічбавым чытаннем з экрана. Узнік шэраг важных пытанняў адносна лёгкасці адцягнення ўвагі, цяжкасці працяглага захавання ўвагі, а таксама з’яўлення таблічных, “пераглядных” рэжымаў чытання. Наша сённяшняе разуменне шляхоў, якімі мозг перастварае сябе, каб павысіць свае магчымасці выконваць пастаўленыя перад

ім задачы, служыць карысным напамінам пра тое, што звязанае з друкаваным тэкстам лінейнае чытанне само па сабе з'яўляецца надзвычай складанай неўралагічнай задачай. Культурнае і біялагічнае значэнне для чалавецтва прызнаецца многімі навукоўцамі, якія апісваюць гэты пераход ад вуснага да пісьмовага ў шматлікіх чалавечых культурах. У нейкім сэнсе людзі ўжо пэўны час "узломваюць" сябе. Многія слушна мяркуюць, што з часам мы адаптуемся да новых тэхналогій чытання, з якімі мы зараз сутыкаемся. Дзеля будучыні адукацыі пытанне трэба ставіць не аб выбары паміж чытаннем лічбавага ці друкаванага тэксту, а хутчэй аб тым, што ў імкненні да шматлікіх відаў граматнасці настаўнікі павінны забяспечыць, каб вучні займаліся як лінейным, так і таблічным чытаннем. Друкаваны і лічбавы варыянты варта разглядаць як узаемадапаўняльныя і істотныя фарматы тэксту. Належнае кіраванне гэтымі новымі распрацоўкамі ў неўралогіі і біятэхналогіях будзе залежаць ад адкрытых даных, адкрытай навукі і пашыранага разумення права на адукацыю, якое ўключае правы на падключэнне, на даныя, на інфармацыю і на абарону прыватнага жыцця.

## Адкат ад дэмакратыі і рост палярызацыі

Крытычнае мысленне, інавацыі і рэалізацыя асабістых і сумесных мэтаў квітнеюць ва ўмовах дэмакратыі, якія прадугледжваюць удзел усіх людзей і дзе шануюцца правы чалавека. Аднак на працягу мінулага дзесяцігоддзя ў свеце назіраліся сур'ёзны адкат ад дэмакратычнай формы кіравання і рост абмежавальных папулісцкіх настрояў, якія кіруюцца ідэнтычнасцю. Такія настроі квітнеюць з прычыны незадаволенасці тых, хто застаўся ні з чым дзякуючы глабалізаванаму сусветнаму парадку – парадку, дзе разбураюцца сцены, знікаюць межы і рух людзей, тавараў і ідэй пашыраецца так, як ніколі раней у сучаснай гісторыі. Гэтыя настроі далей падмацоўваюцца міграцыяй і перамяшчэннем насельніцтва ў выніку канфліктаў, эканамічных цяжкасцей і цяжару праблем, звязаных са змяненнем клімату.

Арганізацыі, якія займаюцца даследаваннямі і маніторынгам стану дэмакратыі ў свеце, па-рознаму апісваюць наступствы гэтых змен. Часопіс навін "The Economist" спасылаецца на зрух ад поўнай да дэфектнай дэмакратыі. Міжнародная грамадская арганізацыя "Freedom House" бачыць рух ад свабодных да часткова свабодных палітычных сістэм, у той час як інстытут V.Dem апісвае пераход ад выбарчай дэмакратыі да выбарчай аўтакратыі. Калі пакінуць тэрміналогію ўбаку, агульным з'яўляецца тое, што многім дэмакратыя падаецца больш уразлівай сёння, чым яна была ў нядаўнім мінулым.

Гэтаму ёсць розныя тлумачэнні – ад уздыму папулісцкіх лідараў і росту натывізму, які выяўляецца ў нацыяналізме, да магутнасці сацыяльных медыя з іх магчымасцямі распаўсюджваць наўмысна ілжывыя "фэйк-ньюз" у рэальным часе, а таксама маніпуляцый данымі і мікратаргетынгу паведамленняў з мэтай уплыву на грамадскія паводзіны. Таксама маюць уплыў фанабэрыстасць эліт і больш агульны рост неспакою адносна месца асобы ў свеце, а таксама будучыні, якая робіцца ўсё больш нявызначанай.

Свет выглядае ўсё больш падзеленым і палярызаваным, а многія дэмакратычныя інстытуты – у аблозе. Ім кідаюць выклік тыя, хто адчувае, што дэмакратыя не выканала сваіх абавязкаў, і тыя, хто адчувае, што яна зайшла занадта далёка. Ідэі перавагі адных над другімі і розныя віды шавінізму набіраюць моц, наносяць шкоду разнастайнасці ідэнтычнасцей, дыялогу і ўзаемаразуменню. Правы – грамадзянскія, сацыяльныя, чалавечыя, экалагічныя – замяняюцца або скарачаюцца аўтарытарнымі ўладамі, якія кіруюць з дапамогай страхаў, забабонаў і дыскрымінацыі.

Перабоі ў грамадзянскім дыскурсе і рост замахаў на свабоду выказвання меркаванняў – усё гэта мае вялікія наступствы для адукацыі, якая грунтуецца на правах чалавека, грамадзянстве і ўдзеле грамадзян на мясцовым, нацыянальным і глабальным узроўнях.

> Перабоі ў грамадзянскім дыскурсе і рост замахаў на свабоду выказвання меркаванняў – усё гэта мае вялікія наступствы для адукацыі.

У той жа час у многіх сферах растуць мабілізацыя актыўных грамадзян і грамадзянскі актывізм. Гэтае супрацьдзеянне паказвае на супраціўляльнасць і новую будучыню дэмакратычнай палітыкі з удзелам людзей. Яно вар'іруецца ад экалагічных рухаў, часта пад кіраўніцтвам моладзі, да барацьбы грамадзян супраць рэжымаў, якія пазбаўляюць меншасці іх асноўных правоў чалавека. Яны ўключаюць патрабаванні па ўсім свеце аднавіць дэмакратычныя правы і паважаць вяршэнства закону. Да гэтай пратэставай мабілізацыі належаць такія антырасісцкія рухі, як "Black Lives Matter" ("Жыцці чарнаскурых маюць значэнне"), рух "#metoo" ("і я таксама"), якія супрацьстаіць гендарным дамаганням і гвалту, а таксама заклікі да дэкаланізацыі навучальных праграм і адукацыйных устаноў. Пытанні, якімі занепакоены гэтыя рухі, павінны адбівацца на будучых навучальных планах. Адукацыя павінна адыграць пэўную ролю ў заахвочванні і забеспячэнні моцнага дэмакратычнага грамадзянства, дыскусійных прастораў, працэсаў з удзелам грамадзян, практык супрацоўніцтва, клапатлівых адносін і сумеснай будучыні.

Выкліканы пандэміяй COVID-19 глабальны крызіс аховы здароўя надаў штуршок і тэрміновасць значнай частцы гэтага грамадзянскага ўдзелу і актывізму праз абуджэнне салідарнасці, якая назіралася ў шматлікіх прыкладах аб'яднання супольнасцей. Многія ўрады зразумелі, што пытанні аховы здароўя і іншыя неадкладныя праблемы нельга вырашыць без дапамогі грамадства ў цэлым, без самаадказнасці і ўзаемнага клопату людзей. Грамадскі аспект быў вынайдзены наноў.

Пандэмія адначасова павялічыла адкат ад дэмакратыі. Паміж іншых наступстваў мы назіраем пашырэнне выканаўчай улады, распаўсюджванне тэхналогій назірання, абмежаванні на масавыя сходы і свабоду перамяшчэння, размяшчэнне ваенных у цывільных месцах, а таксама перабоі ў выбарчых календарах. Якімі б ні былі аргументы забеспячэння аховы здароўя, варта нагадаць, што тое, што адбываецца ва ўмовах надзвычайнага становішча, ёсць вызначальным праяўленнем кіравання.

Невядомыя траекторыі гэтых палітычных пераўтварэнняў будуць з намі, прынамсі, некалькі дзесяцігоддзяў са шматлікімі наступствамі для адукацыі, таму што зрывы будуць фарміраваць парадак дня ў галіне адукацыі і таму што тое, што адбываецца ў дачыненні да доступу да адукацыі, навучальных праграм і педагогікі, у сваю чаргу, будзе фарміраваць палітычныя пераўтварэнні ва ўсім свеце.

Свет знаходзіцца ў паваротнай кропцы, калі фарміруюцца палітычныя грамадствы ва ўмовах дэфіцыту цярпення, якое часткова змяншаюць рытмы сацыяльных медыя. Наша няздольнасць слухаць адзін аднаго рэзка абмяжоўвае грамадскае жыццё. Клопат і пашана да іншых патрабуюць практыкі і ўзмацнення – а гэта тое, чаму добра можа спрыяць адукацыя, адначасова нарошчваючы патэнцыял вучняў для фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі і ўдзелу ў дэмакратычных працэсах.

## Нявызначаная будучыня ў сферы працы

Як адукацыя можа лепш падтрымліваць асобных людзей, супольнасці і грамадствы ў будучыні дзеля значнай працы і эканамічнага дабрабыту?

Каштоўным зыходным пунктам з’яўляюцца Рэкамендацыі 2019 года Глабальнай камісіі МАП па пытаннях будучыні ў сферы працы, якія тычацца менавіта забеспячэння будучыні працы, у цэнтры якой знаходзіцца чалавек. Гэта канцэпцыя ставіць людзей і працу, якую яны выконваюць, у цэнтр эканамічнай і сацыяльнай палітыкі і практыкі бізнесу.

Беспрацоўе сёння застаецца на вельмі высокім узроўні. Мільярды людзей працуюць у ненадзейных умовах нефармальнай занятасці. Больш за 300 мільёнаў працоўных, якія атрымліваюць заработную плату, дагэтуль жывуць у крайняй галечы. Мільёны мужчын, жанчын і дзяцей апынуліся ў пастцы сучаснага рабства. Яшчэ павінен адбыцца прагрэс у сферы бяспекі на працоўных месцах, а таксама выкараненне пераследу. У большай частцы свету дагэтуль застаюцца вялікія гендарныя разрывы датычна ўдзельнай вагі ў працоўнай сіле і аплаты працы мужчын і жанчын.

Пачынаючы з 1990 года паказчыкі ўдзелу ў працоўнай сіле павольна зніжаюцца амаль ва ўсіх рэгіёнах свету і катэгорыях даходаў. У прыватнасці, гэта датычыцца ўдзелу моладзі (ад 15 да 24 гадоў), які скараціўся з 50 % у 1990 годзе да менш чым 33 % сёння. Пры тым, што гэта можна часткова звязаць з больш высокімі ўзроўнямі сярэдняй і вышэйшай адукацыі на працягу апошніх трыццаці гадоў, сярод моладзі кожны пяты сёння не працуе і не вучыцца. І кожны чацвёрты мае няпоўную занятасць.

Захоўваюцца значныя разыходжанні паміж доляй на рынку працы і магчымасцямі на аснове гендарнага фактару. На працягу апошніх некалькіх дзесяцігоддзяў доля жанчын на рынку працы няўхільна павялічвалася, што з часам скарачала гендарны разрыў; аднак зыходны пункт быў такім нізкім, што дыспарытэт застаецца трывожна шырокім. У 2019 годзе доля жанчын у працоўнай сіле была ніжэй за 50 %, у той час як доля мужчын была каля 75 %. На колькасць жанчын на рынку працы ўплывае павелічэнне паказчыкаў

ахопу жанчын адукацыяй. Лепшы ўзровень жыцця можа падштурхнуць жанчын да добраахвотнага выхаду з рынку працы. Аднак існуе шмат фактаў, якія сведчаць аб ніжэйшай якасці даступных жанчынам працоўных месцаў. Неаплатная і сямейная праца застаецца пастаяннай перашкодай для павелічэння долі жанчын на рынках працы.

Адзін з паказчыкаў велізарных гендарных дыспарытэтаў, якія існуюць дагэтуль, – гэта захаванне прафесійнай сегрэгацыі паміж мужчынамі і жанчынамі. Наогул, тое, што фармальна лічыцца "працай", і тое, што вымяраецца як "прадукцыйнасць", робіць значную частку асноўнай працы нябачнай. Гэта тычыцца важнай для грамадства працы, якая, аднак, была часта "фемінізаванай" і тыпова рабілася дома. Прыклады ўключаюць догляд, выхаванне дзяцей, догляд хворых, уборку, гатаванне ежы, а таксама фізічную і эмацыйную падтрымку іншых людзей. У тых выпадках, калі гэта праца фармалізавана, такія прафесіі часта нізкааплатныя і маюць ніжэйшы статус.

Паляпшэнне якасці працы, а таксама пашырэнне выбару і свабоды для людзей у дасягненні эканамічнай бяспекі ў тым выглядзе, як яны самі жадаюць, верагодна, застануцца глабальнай задачай яшчэ некаторы час, асабліва ў кароткатэрміновай перспектыве з-за перабояў і няўдач, выкліканых пандэміяй COVID-19. Гэты глабальны крызіс разбурыў сферу працы такімі шляхамі, якія дагэтуль застаюцца ў цэнтры ўвагі і, як чакаюць многія, будуць мець доўгатэрміновыя негатыўныя наступствы. Закрыццё працоўных месцаў і скарачэнне працоўнага часу закранулі мільёны людзей ва ўсім свеце. Згодна з цяперашнімі ацэнкамі МАП, магчыма, зніклі ўжо каля 150 мільёнаў працоўных месцаў.

COVID-19 сур'ёзна стрымаў высілкі па скарачэнні гендарнага разрыву і аднаўленні пасля той шкоды, якую прычыніла глабальная няроўнасць. Нягледзячы на пачатковы аптымізм адносна таго, што пераключэнне працы з дому можа быць карысным для жанчын з высокай кваліфікацыяй, адбылося адваротнае. Ва ўсіх рэгіёнах і ў большасці краін, нягледзячы на ўзровень даходаў, жанчыны церпяць ад страты працоўных месцаў значна больш за мужчын.

> **COVID-19 сур'ёзна стрымаў высілкі па скарачэнні гендарнага разрыву і аднаўленні пасля той шкоды, якую прычыніла глабальная няроўнасць.**

Складаная карціна паўстае з поглядам на будучыню працы. Тэхналагічныя дасягненні, напрыклад, у сферах штучнага інтэлекту, аўтаматызацыі і робататэхнікі створаць новыя працоўныя месцы, пры гэтым выцясняючы многіх, а тыя, хто страціць працу ў гэтым працэсе, могуць быць менш за ўсіх падрыхтаванымі, каб скарыстацца новымі магчымасцямі. "Азеляненне" нашых эканомік створыць мільёны працоўных месцаў па меры таго, як мы будзем прымаць устойлівыя практыкі і чыстыя тэхналогіі; аднак знікнуць іншыя працоўныя месцы, калі краіны скароцяць свае вугляродна- і рэсурсаёмістыя сектары эканомікі. Платформавая эканоміка можа адрадзіць працоўныя практыкі дзевятнаццатага стагоддзя і ператварыць будучыя пакаленні ў "лічбавых падзёншчыкаў". Малаверагодна, што набытыя сёння навыкі будуць супадаць з тымі, якія будуць патрабавацца на заўтрашніх працоўных месцах, і шмат якія навыкі састарэюць. Гэтыя зрухі выставяць дадатковыя патрабаванні да сістэм адукацыі

і прафесійнай падрыхтоўкі і павысяць узровень даступнай падтрымкі тых, на каго непасрэдна ўплываюць змены на рынку працы.

## Адукацыя, развіццё навыкаў і пераход ад школы да працы

Усе гэтыя перыядычныя выклікі і нядаўнія няўдачы маюць наступствы ў сферах адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі. Школы і іншыя адукацыйныя ўстановы павінны адыграць важную ролю ў падрыхтоўцы і падтрымцы людзей у дасягненні эканамічнага дабрабыту ва ўмовах свабоды і годнасці. Незалежна ад таго, ці прывядзе гэта да поспеху і рэалізацыі ў фармальнай эканоміцы, нефармальнай эканоміцы ці, напрыклад, у хатняй працы, працы па доглядзе і іншых відах працы, мы не без падставы чакаем, што адукацыя адыграе ролю ў забеспячэнні роўных эканамічных магчымасцяў і дазволіць людзям набываць істотныя спецыяльнасці і прафесіі.

У той жа час адукацыя не ў стане кампенсаваць хібы ў іншых стратэгічных сферах, якія выклікалі – і працягваюць выклікаць – зніжэнне якасці працоўных месцаў, а таксама масавае беспрацоўе. Адукацыя ёсць частка цэлага, але палітыка ў галіне макраэканомікі, прамысловасці і занятасці звычайна дае больш эфектыўныя рычагі для стварэння якасных працоўных месцаў, асабліва ў бліжэйшай перспектыве. Узроўні адукацыі і беспрацоўя сярод моладзі часам растуць паралельна. Няпоўная занятасць, немагчымасць знайсці працу, якая адпавядае імкненням, навыкам і магчымасцям чалавека, – гэта глабальная праблема, якая не знікае, а пашыраецца нават сярод выпускнікоў ВНУ ў многіх найбагацейшых краінах свету. Гэта вельмі небяспечны перакос: сацыёлагі даказваюць, што, калі высокаадукаваныя катэгорыі насельніцтва не здольны ўжываць свае навыкі і кампетэнцыі для годнай працы, гэта прыводзіць да незадаволенасці, хваляванняў і часам выклікае палітычныя і грамадзянскія канфлікты.

Нельга скідаць з рахункаў несупадзенне навыкаў у пераходзе ад школы да працы. Навучанне павінна адпавядаць сферы працы. Моладзь мае патрэбу ў моцнай падтрымцы пасля заканчэння адукацыі, каб інтэгравацца ў рынкі працы і дапамагаць сваім супольнасцям і грамадствам у адпаведнасці са сваім патэнцыялам. Лідары сектараў эканомікі і супольнасцей павінны мець большае дачыненне да сярэдняй і вышэйшай адукацыі, каб вучні мелі досвед кантактаў са сферай працы і шэрагам прафесій. Адукацыйныя ўстановы павінны не толькі даваць кансультацыі па прафесійнай арыентацыі, але і прапаноўваць педагогам падтрымку праз магчымасці бесперапыннага навучання, каб яны не адставалі ад зменаў у сваёй прафесіі і ў сферы працы. Пазакласная дзейнасць як у сярэдняй, так і ў вышэйшай адукацыі, павінна ўключаць магчымасці навучання на працоўных месцах. Такім чынам навучэнцы не толькі атрымліваюць рэальны досвед, але і паляпшаюць якасць і актуальнасць сваёй адукацыі і падрыхтоўкі. Таксама важна, каб методыка навучання давала доступ да прафесійна-тэхнічных прадметаў, не закрываючы магчымасці іх вывучэння ў будучыні.

Адукацыя сама па сабе не стварае попыту на працоўную сілу. Яна таксама не можа вырашыць праблемы сістэмнага беспрацоўя. Мноства рэформ з “боку прапановы”, якія

закранулі пазакласную дзейнасць і развіццё навыкаў у апошнія гады, самі па сабе не будуць ні ствараць працоўныя месцы, ні спрыяць росту занятасці.

Аднак адукацыя можа выхоўваць людзей так, каб яны займаліся інавацыямі, прымянялі свае веды, вырашалі праблемы і выконвалі складаныя задачы. У прыватнасці, школьная адукацыя на больш высокіх узроўнях выхоўвае людзей з глыбокімі ведамі і навыкамі пазнання і надзеяй, што яны будуць мець магчымасць прымяніць свае веды і навыкі на практыцы. Адзіны акцэнт на адукацыі дзеля працы або дзеля развіцця прадпрымальніцкіх навыкаў недарэчны. Адукацыя павінна быць накіравана на тое, каб даваць людзям магчымасць ствараць доўгатэрміновы сацыяльна-эканамічны дабрабыт для сябе, сваіх сем’яў і сваіх супольнасцей.

> Адукацыя павінна быць накіравана на тое, каб даваць людзям магчымасць ствараць доўгатэрміновы сацыяльна-эканамічны дабрабыт для сябе, сваіх сем’яў і сваіх супольнасцяў.

Навучыцца ўжывацца з тэхналогіямі надзвычай важна для працоўнай будучыні. Адной з лепшых стратэгій падрыхтоўкі да зялёнай эканомікі і вугляродна-нейтральнай будучыні з’яўляецца забеспячэнне кваліфікацый, праграмамі, у тым ліку навучальнымі, якія даюць “зялёныя навыкі” як для новых прафесій і сектараў, так і для тых галінаў, дзе адбываецца пераход да нізкавугляроднай эканомікі. Яшчэ адным важным крокам будзе поўнае “азеляненне” нашага навучальнага асяроддзя. Наданне вучням магчымасці пракладаць шлях у стварэнні вугляродна-нейтральных сістэм адукацыі – перспектыўная стратэгія падрыхтоўкі іх да істотнай працы ў зялёнай эканоміцы.

## Змяненне дакументаў аб адукацыі ў будучыні

Дакументы аб адукацыі знаходзяцца на перакрыжаванні адукацыі і рынкаў працы. Адна з ключавых роляў школ, універсітэтаў і праграм пазакласных заняткаў – сертыфікаваць набыццё навучэнцамі навыкаў, кампетэнцый і ведаў. Расце ўсведамленне таго, што людзі маюць асноўнае права на прызнанне і пацвярджэнне іх навучання, нават у абставінах пазашкольнай і нефармальнай адукацыі.

Адзіны акцэнт на кваліфікацыі сам па сабе не з’яўляецца дастатковым. Хоць важна думаць пра вынікі, мы не павінны выпускаць з-пад увагі грамадскія працэсы і ўзаемадзеянні, якія ляжаць у аснове адукацыі. Дакументы аб кваліфікацыі заўжды служаць толькі “проксі” таго, што іх уладальнік можа рабіць, і яны працуюць толькі дзякуючы грамадскаму даверу, што сведчыць аб каштоўнасці даверу да адукацыйных мэтаў і дзейнасці.

У той час, як перамена кар’еры і месца працы робіцца больш распаўсюджанай і рухомай, неабходны дадатковыя даследаванні таго, як мы маглі б даць людзям больш магчымасцяў перамяшчацца паміж роднаснымі прафесіямі. Урады, педагогі, працадаўцы і шырокае грамадства павінны сумесна працаваць над вызначэннем відаў прафесійных заняткаў і працы, якія будуць забяспечвацца і развівацца іх грамадствамі. Сістэмы, якія адсочваюць

і аналізуюць змены на рынку працы і змены ў навыках, патрэбных для пэўных прафесій і працоўных месцаў, робяцца больш складанымі; а сістэмы адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі павінны лепш выкарыстоўваць гэту інфармацыю, каб карэктаваць свае праграмы і прапаноўваць актуальныя варыянты навучання для сферы працы. Установы павінны набываць больш вонкавыя погляды і больш прагрэсіўныя падыходы да кваліфікацый, навучальных праграм і іх складання.

## Структурная трансфармацыя рынкаў працы

Разам з тэхналагічнымі і экалагічнымі зменамі існуе шэраг разнастайных структурных эканамічных чыннікаў, якія перафарміруюць рынкі працы. Мы зараз назіраем рост “гіг-эканомікі” – эканомікі фрылансераў і падрадчыкаў, і верагодна, што ў будучыні значэнне нефармальнай эканомікі для мільярдаў людзей ва ўсім свеце ўзмацніцца. Такія новыя мадэлі занятасці будуць узмацняць ціск на рост запыту на перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі існуючых работнікаў. Як і раней, сістэмы адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі павінны прапаноўваць больш гнуткія варыянты навучання, каб зрабіць установы і праграмы больш даступнымі для большай колькасці навучэнцаў і даць ім магчымасці вывучаць тое, што ім патрэбна, дзе ім патрэбна і калі ім патрэбна.

Дэмаграфічныя змены – гэта яшчэ адзін ключавы чыннік будучыні працы, які, верагодна, будзе мець істотны ўплыў да 2050 года. Хуткае павелічэнне колькасці моладзі ў некаторых рэгіёнах можа пагоршыць сітуацыю беспрацоўя сярод моладзі і міграцыйны ціск. Іншыя рэгіёны сутыкнуцца са старэннем насельніцтва і дадатковай нагрузкай на сацыяльнае забеспячэнне і іншыя сістэмы дапамогі.

У сучасны момант міжнародная супольнасць выкарыстоўвае разлікі “каэфіцыентаў дэмаграфічнай нагрузкі”, дзе супастаўляецца агульная колькасць насельніцтва і колькасць людзей ва ўзросце ад 15 да 65 гадоў, якія лічацца эканамічна прадуктыўнымі і такім чынам забяспечваюць сродкі для падтрымання маладых і старых. Чакаецца, што да 2050 года паказчыкі дэмаграфічнай нагрузкі рэзка ўзрастуць у Еўропе, Паўночнай Амерыцы і больш памяркоўна – у Азіі, у Лацінскай Амерыцы і ў Карыбскім рэгіёне – гэта азначае, што меншая колькасць працоўных будзе забяспечваць большую колькасць тых, хто не працуе (у асноўным пенсіянераў). Між тым, прагназуецца, што агульны каэфіцыент дэмаграфічнай нагрузкі для Афрыкі знізіцца, бо палова насельніцтва рэгіёну будзе ва ўзросце да 25 гадоў.

Гэтыя дэмаграфічныя зрухі, калі адбываецца рост прапорцый маладых і старых людзей, маюць значныя наступствы для сферы працы, а таксама для сістэм адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі. З гэтым звязаныя тэндэнцыі па пашырэнні магчымасцяў пазакласных заняткаў і адукацыі дарослых, а таксама па аднаўленні бесперапыннага навучання. Чалавечае даўгалецце можа таксама павялічыцца, і, магчыма, разам з ім можа падоўжыцца перыяд працоўнага жыцця. Калі людзі ў гадах захоўваюць актыўнасць і ўдзельнічаюць у жыцці грамадства, яны ўзбагачаюць грамадства і эканоміку дзякуючы сваім навыкам і досведу. Пашырэнне правоў і магчымасцяў маладых людзей для поўнага раскрыцця іх патэнцыялу

і доступу да новых магчымасцяў зробіць іх заўтрашнімі рэалізатарамі перамен. Гэта азначае інвесціраванне ў здольнасці людзей, якія даюць ім магчымасць набываць навыкі, праходзіць перападрыхтоўку, павышаць сваю кваліфікацыю, і падтрымку іх падчас розных пераходных перыядаў, з якімі яны сутыкнуцца на працягу свайго жыцця.

Па меры разгортвання гэтых трансфармацый будуць змяняцца патрабаванні да адукацыі; некаторыя з іх можна мадыфікаваць (такія, як патрэба пашыраць колькасць класаў пачатковай школы і наймаць больш настаўнікаў у некаторых рэгіёнах), а іншыя – не, з улікам складанасці ўзаемазвязаных чыннікаў і невядомых траекторый магчымых трансфармацый. Па гэтай прычыне адукацыйныя і навучальныя ўстановы павінны ўзмацніць сувязі са сваімі мясцовымі супольнасцямі і і зацвердзіцца ў якасці асноўных устаноў. Цеснае супрацоўніцтва з іншымі мясцовымі ўстановамі дазволіць школам і ўстановам лепш разумець і забяспечваць патрэбы сваіх супольнасцей у навучанні.

## Якая праца будзе цаніцца ў будучыні?

Па меры таго, як мы набліжаемся да 2050 года, узнікае магчымы сцэнарый, які будзе ўяўляць сабой беспрэцэдэнтны разрыў з гісторыяй чалавецтва: у свеце можа скончыцца праца для рабочых у афіцыйнай эканоміцы, нягледзячы на ўзровень іх кваліфікацыі, па прычыне прарыўных тэхналагічных дасягненняў. Як будзе адукацыя функцыянаваць у грамадстве, дзе толькі невялікая колькасць людзей маюць фармальную занятасць? Якая новая адукацыя спатрэбіцца людзям, каб жыць без афіцыйнай працы? Эвалюцыя чалавечых грамадстваў прывяла да шанавання індывідуальнай працы. Мара аб залатым веку свабоды ад цяжкай працы існуе тысячагоддзі. Але сёння падаецца, што праблема ў меншай ступені звязана з арганізацыяй беспрэцэдэнтнага вольнага часу. Прывід масавага беспрацоўя зараз навісае над заможнымі краінамі, як гэта было дзесяцігоддзямі ў бедных краінах. Шмат чаго трэба пераасэнсаваць. Як лепш накіраваць прадуктыўныя і творчыя імпульсы людзей у іншым напрамку на карысць грамадства і іх саміх?

> Якой павінна быць новая адукацыя, каб людзі жылі без фармальнай працы?

На шчасце, некаторыя лепшыя прапановы на такі выпадак таксама адпавядаюць існуючым адукацыйным намаганням па стварэнні годных працоўных месцаў. Шматслаёвая нявызначанасць вакол будучыні працы і планеты паказвае, што мы павінны аддаць перавагу здольнасці навучэнцаў ствараць сэнсы.

Насамрэч мы, магчыма, павінны ў першую чаргу глыбока пераасэнсаваць, што азначае ствараць каштоўнасць. Калі мы разважаем аб будучыні працы і адукацыі, мы стаім перад выбарам: захаваць шырока распаўсюджаны супярэчлівы склад мыслення, калі мы чакаем ад адукацыі адначасова і занадта шмат, і занадта мала, – ці засяродзіцца на тым, з чым адукацыя можа добра справіцца.

Як і што мы шануем, можа змяніцца ў будучыні і будзе вельмі адрозніваецца ад таго, што чалавецтва калі-небудзь ведала ва ўмовах нашых эканомік – натуральнай, сельскагаспадарчай, індустрыяльнай і постіндустрыяльнай.

Эканамічная бяспека паходзіць не толькі ад афіцыйнай эканомікі. Мы таксама павінны ўлічваць працу па доглядзе, якая існуе ў хатніх умовах, назапашванне рэсурсаў агульнага дабрабыту і падтрымку інфраструктуры (як матэрыяльную, так і нарматыўную), якую забяспечваюць урады. Нягледзячы на тое, што многія з нашых традыцыйных разрозненых падыходаў і ўкаранёных інтарэсаў змякчаюць гэта, больш шырокія падыходы да разумення таго, што спрыяе эканамічнай бяспецы, могуць стаць звычайнай з'явай у 2050 годзе.

Адукацыя спрыяе стварэнню доўгатэрміновага эканамічнага дабрабыту асобных людзей, іх сем'яў і іх супольнасцей, калі яна прытрымліваецца шырокага бачання, якое ахоплівае сферу афіцыйнай аплатнай працы і выходзіць далёка за яе межы. Гнуткасць ва ўмовах няўпэўненай занятасці ў будучыні павінна быць убудаваная ў новы сацыяльны кантракт на будучыню адукацыі.

# Частка II
## Абнаўленне адукацыі

У 1921 годзе педагогі са ўсяго свету сабраліся ў горадзе Кале (Францыя) на першы кангрэс Новага адукацыйнага таварыства, групы, якая пашырала сваю працу на працягу наступных двух дзесяцігоддзяў і якая дапамагла ў фарміраванні і станаўленні ЮНЕСКА і яе адукацыйнага мандата. На сваёй першай сустрэчы таварыства аб'явіла аб стварэнні "новай адукацыі для новай эры".

Мэта гэтага даклада не менш амбіцыйная. Аднак гэта не проста яшчэ адзін заклік пачаць нанова. Нам патрэбны новыя педагогікі, новыя падыходы да навучальнай праграмы, новыя абавязацельствы перад настаўнікамі, новае бачанне школы, новая ацэнка часу і месцаў адукацыі. Аднак гэта не азначае, што мы павінны пазбавіцца таго, што мы ўжо маем. Замест гэтага мы павінны перагледзець лепшыя педагагічныя і адукацыйныя традыцыі, абнавіць гэту спадчыну і дадаць перспектыўныя новыя складнікі, якія дапамогуць нам сфарміраваць узаемазвязаную будучыню чалавецтва і жывой планеты.

На працягу апошняга стагоддзя і нават раней грамадствы і сем'і ўскладалі свае спадзяванні на абавязковае школьнае навучанне, якое павінна было выканаць абяцанне адукаваць іх дзяцей. І школы ва ўсім свеце арганізаваліся дзіўным чынам аднолькава. Хоць гэтыя характарыстыкі маюць розныя канфігурацыі ў розных рэгіёнах і культурах, яны распаўсюдзіліся і прэваліруюць па ўсім свеце, нівелюючы разнастайнасць адукацыйнага досведу, якая адзначалася ў папярэднія эпохі. Сацыяльны кантракт на адукацыю, які быў усталяваны ў дзевятнаццатым і дваццатым стагоддзях, увасабляўся ў наступных прынцыпах арганізацыі навучання: па-першае, адукацыя разглядалася як педагагічны праект, што грунтуецца на ўроках, якія выкладаюць настаўнікі ў рамках структуры класаў і класных памяшканняў – структуры, якая, нягледзячы на ўмовы сумеснага навучання, аддавала перавагу асабістым дасягненням. Па-другое, адукацыя праводзілася праз навучальную праграму, якая была арганізавана ў выглядзе сеткі прадметаў. Па-трэцяе, выкладанне задумвалася як адасобленая практыка, якая абапіралася на прафесійную кампетэнтнасць аднаго настаўніка, які павінен быў кіраваць эфектыўным навучаннем, звычайна ў рамках адной дысцыпліны. Па-чацвёртае, школы былі арганізаваныя па мадэлі, якая мела значныя архітэктурныя, арганізацыйныя і працэдурныя падабенствы незалежна ад кантэксту.

І, па-пятае, адукацыя была арганізавана для навучання групаў вучняў аднолькавага ўзросту ў спецыялізаваных установах, якія працавалі на адноснай адлегласці ад іх сем’яў і супольнасцей, і заканчвалася, калі дзеці і моладзь лічыліся падрыхтаванымі для будучага дарослага жыцця.

Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен узмацніць адукацыю як грамадскую справу, сумеснае грамадскае абавязацельства, як адно з найважнейшых правоў чалавека і як адзін з найважнейшых абавязкаў дзяржаў і грамадзян. У сваю чаргу, ключавыя ролі адукацыі – гэта выхоўваць грамадзян, якія рухаюць наперад правы чалавека. Гэта цягне за сабой пабудову патэнцыялу, які робіць вучняў аўтаномнымі і этычнымі мысліцелямі і дзеячамі. Гэта азначае падрыхтоўку іх да сумеснай працы з іншымі і развіццё іх суб’ектнасці, адказнасці, эмпатыі, крытычнага і крэатыўнага мыслення разам з поўным спектрам сацыяльных і эмацыйных навыкаў. Каб узгадніць адукацыю з гэтым амбіцыйным бачаннем неабходна ўсталяваць новыя шляхі арганізацыі навучання. Адукацыя можа лічыцца адным з цэнтральных складнікаў для дасягнення чалавецтвам міру паміж людзьмі і на планеце Зямля. У Частцы II гэтага даклада прапануюцца шляхі рэалізацыі новага сацыяльнага кантракта, які спрыяе развіццю права на адукацыю і ўзмацняе адукацыю як грамадскае дабро і калектыўную справу, якая павялічвае наш чалавечы патэнцыял клопату і кааперацыі.

Вылучаныя ў гэтых пяці раздзелах кіруючыя прынцыпы дыялогу і дзейнасці вынікаюць з глабальных кансультацый, у якіх Камісія ўдзельнічала на працягу апошніх двух гадоў, і асобная ўвага надавалася ўнёску моладзі. Аднак гэтыя кіруючыя прынцыпы таксама паходзяць з трывалай базы навуковых ведаў у галіне адукацыі, якія будаваліся на працягу дзесяцігоддзяў даследаванняў і разважанняў, як у акадэмічных, так і ў прафесійных супольнасцях.

Пераўтварэнне гэтых кіруючых прынцыпаў у палітыку і практыку знаходзіцца ў руках усіх тых, хто чытае гэты даклад. Кожны навучэнец, вучань, педагог і бацька / маці мае патэнцыял і магчымасць працаваць на месцы і звязвацца з іншымі людзьмі, як побач, так і на адлегласці, для трансфармацыі штодзённых адукацыйных практык, устаноў і сістэм. Гэтыя шматлікія вялікія і малыя акты супрацоўніцтва і партнёрства ёсць менавіта тое, што нарэшце будзе трансфармаваць будучыню. Мэта Камісіі пры стварэнні гэтага даклада зводзіцца да пашырэння дыскусіі праз ідэі і прынцыпы ў мэтах гэтай трансфармацыі. Састаўленне даклада было адной сумеснай справай. Ажыццяўленне яго ідэй стане другой.

# Раздзел 3

## Педагогіка супрацоўніцтва і салідарнасці

Сапраўдная адукацыя павінна задзейнічаць мэты і энергію тых, каго яна навучае. Каб забяспечыць такі ўдзел, настаўнікі павінны будаваць адносіны, поўныя клопату і даверу, і ў рамках такіх адносін вучні і настаўнікі павінны сумесна фарміраваць задачы адукацыі.

**Нэл Нодынгз (Nel Noddings)**, "Філасофія адукацыі"

**У новым сацыяльным кантракце на адукацыю педагогіка павінна грунтавацца на кааперацыі, салідарнасці, збудаванні патэнцыялу вучняў і настаўнікаў для сумеснай працы ў атмасферы даверу адзін да аднаго дзеля трансфармацыі свету.**

Сумеснае пераасэнсаванне будучыні патрабуе педагогікі, якая спрыяе супрацоўніцтву і салідарнасці. Тое, як мы вучымся, павінна вызначацца тым, чаму мы вучымся і што мы вывучаем. Асноватворнае абавязацельства выкладаць і прасоўваць правы чалавека азначае, што мы павінны шанаваць правы навучэнца. Мы павінны ствараць магчымасці для таго, каб людзі вучыліся адзін ад аднаго і шанавалі адзін аднаго, нягледзячы на любыя адрозненні – гендарныя, рэлігійныя, расавыя; розную сексуальную ідэнтычнасць, сацыяльныя класы, інваліднасць, нацыянальнасць і г. д. Паважаць годнасць людзей азначае вучыць іх думаць самастойна, а не што і як думаць. Гэта азначае стварэнне магчымасцяў для вучняў, каб яны маглі выявіць сваё ўласнае пачуццё мэты і вызначыць, якім будзе іх паспяховае жыццё. У той жа час мы павінны разам пабудаваць свет, дзе такое жыццё можа быць рэалізаванае, і гэта азначае супрацоўніцтва па стварэнні магчымасцяў для паляпшэння свету.

Педагогіка супрацоўніцтва і салідарнасці павінна грунтавацца на такіх агульных прынцыпах, як адмова ад дыскрымінацыі, павага да разнастайнасці, рэпарацыйнае правасуддзе, і існаваць у рамках этыкі клопату і ўзаемнасці. Неабходнымі з'яўляюцца міждысцыплінарнае, міжпакаленчае і міжкультурнае навучанне. Такая педагогіка адначасова чэрпае з агульнага здабытку ведаў і дапаўняе яго, яна ажыццяўляецца бесперапынна, прызнаючы ўнікальныя магчымасці кожнага ўзросту і ўзроўню адукацыі.

Актыўнае навучанне прызнае важнасць распрацоўкі канцэптуальных, а таксама працэдурных ведаў. Яно прызнае неабходнасць кагнітыўнага і эмацыйнага ўзаемадзеяння дзеля культывацыі ведаў, магчымасці пераводзіць веды ў дзеянні, а таксама схільнасці да дзеянняў. Педагагічныя практыкі грунтуюцца на пакаленнях досведу, разважанняў і даследаванняў, якія ўсе патрабуюць пастаяннай перапрацоўкі ў святле патрабаванняў сучаснасці і будучыні. Магутныя стымулы навучання – гэта сапраўднасць (разуменне сувязяў паміж тым, што вывучаецца, і светам, у якім мы жывём) і актуальнасць (разуменне сувязяў паміж тым, што мы вывучаем, і нашымі каштоўнасцямі). Праектнае і праблемнае навучанне дае шмат магчымасцяў для сапраўднага, актуальнага навучання і пасуе да нашай прыроднай зацікаўленасці ў ведах і разуменні.

У першай палове гэтага раздзела падкрэсліваюцца магчымыя падыходы да педагогікі, заснаванай на супрацоўніцтве і салідарнасці, у тым ліку калабарытыўнай, міждысцыплінарнай і праблемнай педагогікі, якая паважае і падтрымлівае разнастайнасць, якая заклікае вучняў забыцца на забабоны і падзелы, якая гоіць раны ад несправядлівасці і якая выкарыстоўвае асэнсаваную ацэнку на карысць самой педагогікі. Гэтыя падыходы актуальныя для адукацыі ва ўсіх умовах, у тым ліку ў нефармальным і пазашкольным асяроддзі, такім як у музеях, бібліятэках, летніх лагерах і грамадскіх цэнтрах і інш. Далей у раздзеле вывучаецца дапасаванне гэтых педагагічных прыярытэтаў да ўнікальных патрэбаў і магчымасцяў фармальнай адукацыі на кожным этапе жыцця: падтрымка

ранняга дзяцінства і супрацоўніцтва на працягу дзяцінства, раскрыццё ўнікальнага патэнцыялу падлеткаў і моладзі і абнаўленне місіі вышэйшай адукацыі. Раздзел завяршаецца кіруючымі прынцыпамі для ажыццяўлення дыялогу і дзейнасці да 2050 года, што зацікавіць, у прыватнасці, педагогаў, а таксама менеджараў і планіроўшчыкаў сістэм адукацыі. Гэтыя прынцыпы ўключаюць: фарміраванне больш глыбокіх сувязяў з больш шырокім светам, спрыянне супрацоўніцтву, стварэнне этычных фондаў, развіццё эмпатыі і выкарыстанне ацэнкі для падтрымкі навучання.

## Пераасэнсаванне педагагічных падыходаў

Педагогіка – справа, звязаная з адносінамі. І настаўнікі, і навучэнцы змяняюцца праз педагагічны кантакт, навучаючыся адзін ад аднаго. Прадуктыўнае напружанне паміж адначасовымі асабістымі і калектыўнымі зменамі вызначае педагагічныя кантакты. Наша ўнутранае жыццё ўплывае на наша асяроддзе і ў той жа час знаходзіцца пад яго глыбокім уплывам.

Вучні, настаўнікі і веды фарміруюць класічны педагагічны трыкутнік. Выкладанне і навучанне як сілкуюцца з агульнага здабытку ведаў, так і дапаўняюць яго. Праз педагагічныя кантакты адукацыя таксама звязвае нас з агульнай спадчынай назапашаных ведаў чалавецтва і дае нам магчымасці ўзбагаціць яе.

Сёння гэты трыкутнік трэба ўяўляць у больш шырокім свеце. Нам патрэбна педагогіка, якая дапамагае нам вучыцца ў свеце і разам са светам, паляпшаючы яго. Такая педагогіка заклікае нас працягваць даведвацца пра годнасць кожнага чалавека і цаніць як вялікае дасягненне тое, што даюць правы на сумленне і свабоду думкі – і пры гэтым забыцца пра чалавечую выключнасць і ўласніцкі індывідуалізм. Педагогіка павінна грунтавацца на этыцы ўзаемнасці і клопату і прызнаваць узаемазалежнасці між асобамі, групамі і біялагічнымі відамі. Яна павінна заахвоціць нас да разумення значнасці таго, што ў нас ёсць агульнага, сістэмнай узаемазалежнасці, якая звязвае нас паміж сабой і планетай.

> Настаўнікі і вучні павінны разам сфарміраваць супольнасць тых, хто шукае веды і стварае іх.

Настаўнікі і вучні павінны разам сфарміраваць супольнасць тых, хто шукае веды і стварае іх, хто сілкуецца з агульнага здабытку ведаў чалавецтва і дапаўняе яго. Гэта цягне за сабой разважанні аб тым, што існуе і што можа быць пабудавана, і прызнанне таго, што ўсе – як настаўнікі, так і вучні – маюць права разглядаць сябе здатнымі ствараць веды разам з іншымі людзьмі.

За ўсімі педагагічнымі намерамі ляжаць пытанні аб сэнсе і мэце. Што настаўнікі прапануюць вучням у якасці дзеянняў і ўзаемадзеянняў – і з якой мэтай? Які сэнс вучні надаюць сваім уласным высілкам пры атрыманні адукацыі? Трансфармацыйныя педагагічныя кантакты робяць магчымым дыялог з аднакласнікамі, аднагодкамі і членамі супольнасці. Настаўнікі, якія даюць вучням магчымасці даследаваць, ствараць і ўзаемадзейнічаць з вядомымі

і невядомымі аб’ектамі, падмацоўваючы іх цікаўнасць і зацікаўленасць, эфектыўна валодаюць мастацтвам, навукай і рамяством настаўніцтва. У наступных раздзелах прадстаўлены перспектыўныя стратэгіі пераводу новага сацыяльнага кантракта на адукацыю ў сітуацыі педагагічных кантактаў.

## Міждысцыплінарнае праблемна-арыентаванае сумеснае навучанне

Будучыня паставіць перад вучнямі новыя праблемы і надзеліць іх новымі магчымасцямі. Усведамленне таго, што свет працягне змяняцца, можа быць убудаваным у навучальныя праграмы і методыкі, мэтанакіравана культывуючы патэнцыял навучэнцаў у распазнаванні і вырашэнні праблем. Калі адукацыя арыентавана на пастаноўку праблем, вучні ўцягваюцца ў праекты, ініцыятывы і дзейнасць, якая патрабуе вынаходак і супрацоўніцтва. Сутыкаючыся з выразнымі мэтамі і задачамі, вучні павінны пераадольваць межы паміж дысцыплінамі, каб знайсці жыццяздольныя і творчыя рашэнні. Акцэнт на праблемах і праектах у навучанні можа замацаваць асабісты досвед вучняў, дапамагчы ім убачыць, што свет не стабільны і змяняецца, назапасіць веды, развіваць пранікл івасць і здольнасці студэнтаў да граматнасці і асэнсаванага выказвання сваіх думак.

Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года прызнае неабходнасць прымаць ва ўлік шырокі спектр канвергентных падыходаў да праблем, з якімі сутыкаюцца вучні. У прыватнасці, у Мэце ўстойлівага развіцця 4.7 вучні вызначаюцца як грамадзяне свету, якім патрабуюцца веды і кампетэнцыі, каб пабудаваць устойлівую будучыню ва ўсё больш узаемазалежным свеце. Гэтыя магчымасці набываюць яшчэ большую вагу, калі мы разглядаем перыяд да 2050 года і пасля яго. У саміх Мэтах устойлівага развіцця прапануюцца рамкі для стварэння структуры міждысцыплінарнага навучання на аснове праблем і праектаў, што дапамагае вучням развіваць патэнцыял для прасоўвання поўнага спектра мэтаў.

Засяроджанасць на сумесных праблемах і праектах азначае, што перавага аддаецца вывучэнню, даследаванням і сумеснаму будаўніцтву. Асабістыя веды і магчымасці пашыраюцца ў сувязях з іншымі людзьмі, падкрэсліваючы, як падзяляецца суб’ектнасць, а таксама ў сувязі з разнастайнымі і сеткавымі вымярэннямі саміх ведаў. Праектны і праблемны падыходы не зніжаюць патрэбы ў ведах, а, хутчэй, ставяць веды ў межы жывога комплексу дынамікі і іх прымянення.

Многія найбольш выніковыя формы адукацыі адбываюцца ў асяроддзі, якое ўзбагачаецца пастаянным плынню ідэй, якія выходзяць за межы тыповых прадметаў. Педагогіка павінна адлюстроўваць міждысцыплінарнасць, таксама як праблемы і загадкі планеты не абмяжоўваюцца рамкамі дысцыплінарных межаў. Аднак, паколькі існуе шмат магчымых рашэнняў той ці іншай праблемы, трэба выбіраць такія педагагічныя падыходы, якія культывуюць каштоўнасці і прынцыпы ўзаемазалежнасці і салідарнасці. Сэрвіснае навучанне і ўзаемадзеянне з грамадствам размываюць межы паміж класам і супольнасцю, кідаюць выклік меркаванням вучняў і звязваюць іх з больш шырокімі сістэмамі, працэсамі

і досведам, які выходзіць за рамкі іх уласнага досведу. Вельмі важна, каб вучні ставіліся да ідэі сэрвісу сціпла, паважліва, без патэрналізму, асабліва ў адносінах да тых, хто можа сутыкацца з рознымі матэрыяльнымі выклікамі. Сэрвіснае навучанне не павінна быць заняткам найбольш прывілеяваных; усе навучэнцы могуць удзельнічаць у дыялогавым працэсе паляпшэння дабрабыту ў рамках сваіх супольнасцей. Сэрвіснае навучанне патэнцыйна можа зрабіць салідарнасць цэнтральным прынцыпам педагогікі вырашэння праблем, замест таго, каб аддаваць перавагу рашэнням, якія проста з'яўляюцца найбольш мэтазгоднымі ці меркантыльнымі.

## Шанаванне і падтрымка разнастайнасці і плюралізму

Пераасэнсаваць будучыню разам азначае ўявіць грамадства, у якім разнастайнасць і плюралізм умацоўваюцца і ўзбагачаюцца для нашай агульнай чалавечнасці. Нам патрэбна такая адукацыя, якая дазваляе выходзіць за межы прасторы, у якой мы зараз жывём, адукацыя, якая суправаджае нас на шляху ў невядомае.

Педагогіка салідарнасці павінна грунтавацца на інклюзіўнай і міжкультурнай адукацыі, якая заўважае ўсе формы дыскрымінацыі і сегрэгацыі ў доступе да адукацыі, у тым ліку дзяцей і моладзі з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі і тых, хто сутыкаецца з няцярпімасцю на глебе расы, гендарнай ідэнтычнасці, класа, інваліднасці, рэлігіі ці нацыянальнасці. Права на інклюзію згодна з разнастайнымі рэаліямі кожнага чалавека з'яўляецца адным з найбольш важных правоў чалавека. Педагогіка павінна з радасцю прымаць вучняў у адукацыйную супольнасць і дапамагаць ім развіваць навыкі інклюзіі і шанавання годнасці ўсіх іншых людзей. Педагогіка без інклюзіі паслабляе адукацыю як грамадскае дабро і падрывае магчымасць пабудавання свету, які ўсеагульна падтрымлівае годнасць і правы чалавека.

> Педагогіка салідарнасці таксама павінна прызнаваць і выпраўляць сістэматычныя выключэнні і парушэнні, навязаныя расізмам, сексізмам, каланіялізмам і аўтарытарнымі рэжымамі ва ўсім свеце.

З самага пачатку працэс навучання павінен шанаваць разнастайнасць, рознасць і плюралізм, а таксама ўзбройваць вучняў, каб тыя маглі наўпрост супрацьстаяць нецярпімасці і дыскрымінацыі. Ні асобныя людзі, ні канцэпцыі не могуць ахопліваць усе рашэнні складаных, шматгранных выклікаў, якія стаяць перад планетай. Педагогіка салідарнасці таксама павінна прызнаваць і выпраўляць сістэматычныя выключэнні і парушэнні, навязаныя расізмам, сексізмам, каланіялізмам і аўтарытарнымі рэжымамі ва ўсім свеце. Без шанавання розных культур і тэорый ведаў, розных спосабаў жыцця і бачання свету немагчыма пабудаваць педагогіку салідарнасці. Педагогіка салідарнасці мабілізуе гэтыя адрозненні ў рэальным часе. Рост мабільнасці людзей ва ўсім свеце – праз іх выбар ці ў выніку вымушанага перамяшчэння – стварыў новыя педагагічныя рэаліі, якія прыносяць культурную і расавую разнастайнасць свету наўпрост у класы і адукацыйнае асяроддзе. Настаўнікі працуюць у новых абставінах са студэнтамі з разнастайным

досведам навучання, належаць да разнастайных моў і культур. Педагогіка павагі, інклюзіі, прыналежнасці, будаўніцтва міру і трансфармацыі канфліктаў выходзіць за рамкі простага прызнання адрозненняў ці талерантнасці да іх. Такая педагогіка павінна заахвочваць вучняў сядзець побач адзін ля аднаго і працаваць разам. Адукацыя, якая дазваляе юнакам і дзяўчатам разумець і злучаць разам сваё мінулае, сучаснасць і будучыню, аналізаваць няроўнасці, якія фарміруюць іх досвед, супрацьстаяць выключэнню і маргіналізацыі, ёсць адна з найлепшых форм падрыхтоўкі да невядомай будучыні.

Свет багаты на шматкультурныя і шматэтнічныя грамадствы; і адукацыя павінна прасоўваць міжкультурнае грамадзянства. Акрамя навучання каштоўнасці, якую ўяўляе сабой разнастайнасць, адукацыя павінна прасоўваць навыкі, каштоўнасці і ўмовы, неабходныя для гарызантальнага, дэмакратычнага дыялогу з разнастайнымі групамі, сістэмамі ведаў і практыкамі. Сцвярджэнне культурнай ідэнтычнасці чалавека – аснова для міжкультурнага грамадзянства. Ведаць, кім ты з’яўляешся, ёсць зыходны пункт для павагі да іншых. Міжкультурная адукацыя не павінна выкарыстоўвацца ў якасці інструмента для асіміляцыі культурных меншасцей, карэнных народаў ці іншых маргіналізаваных груп у дамінуючае грамадства; хутчэй, яна павінна прасоўваць больш збалансаваныя і дэмакратычныя ўладныя адносіны ў нашых грамадствах. Нам неабходна педагогіка, якая стварае ўзаемна ўзбагачаючы абмен ведамі, практыкамі і рашэннямі на аснове ўзаемадапаўняльнасці, узаемнасці і павагі.

Мы навучаемся адзін ад аднаго менавіта праз нашы адрозненні; і тое, што мы вывучаем, набывае сэнс менавіта праз нашы агульныя абставіны. Важна адрозніваць “педагагічную дыферэнцыяцыю”, якая датычыцца адрозненняў у агульнай прасторы, ад гіпер-персаналізаванага навучання, якое абумоўлена штучным інтэлектам і якое выдаляе кантэкст і навучэнцаў з грамадскіх і калектыўных прастораў і ўзаемасувязяў. Неабходна абагульніць нашы адрозненні ў рамках большага ўзаемаразумення.

Педагогіка заўсёды адбываецца ў неаднародным па сутнасці прасторава-часавым кантынууме, які ўзнікае і бесперапынна змяняецца. Могуць існаваць дзве аднолькавыя копіі адной кнігі, але не існуе двух аднолькавых шляхоў яе чытання. Могуць існаваць два аднолькавыя планы ўрока ці блокі навучальнай праграмы, але не існуе двух ідэнтычных спосабаў навучання. Гэтая ідэя заклікае да асцярожнага стаўлення да некаторых тэндэнцый у галіне адукацыйных тэхналогій, якія пераважаюць у “глабальнай індустрыі адукацыі”. Нам патрэбны чалавечы дадатак і супрацьвага да росту распаўсюджвання аўтаматызаваных сістэм, якія выкарыстоўваюць штучны інтэлект і абяцаюць даць гатовыя шляхі да выкладання, навучання ці ацэнкі. У тых выпадках, калі яны выкарыстоўваюцца, трэба дакладна ўяўляць абмежаванні такіх методык, а таксама рызыкі ўзмацнення існуючых уладных структур і праблемных меркаванняў, якія, як правіла, маргіналізуюць тых, хто “праходзіць” навучанне не так, як іншыя. Наша энергія павінна быць засяроджана на рызыковых практыках эмпатыі, этыкі, салідарнасці, сумеснага будаўніцтва і справядлівасці, якія мусяць выкладацца і вывучацца з цярпеннем і для якіх не існуе тэхналагічных спрашчэнняў. Гэта глыбока чалавечая дзейнасць, якую лепш за ўсё ажыццяўляюць людзі.

## Вучыцца адвучвацца ад разладу

Педагогіка кааперацыі і салідарнасці патрабуе не толькі прыняцця і прыхільнасці да падтрымання разнастайнасці. Яна патрабуе адвучыцца ад прадузятасці, забабонаў і разладу. Сапраўды, веды – гэта не ўпакаваны для продажу "гатовы прадукт". Педагогіка можа асвятляць, як веды складаліся гістарычна і як яны будаваліся ў дыялогу, замест таго, каб проста спрыяць перадачы ведаў.

Культурныя рэсурсы ёсць ключавая частка нашых суадносінаў з ведамі. Адукацыйная палітыка ўсё часцей накіравана на ліквідаванне несправядлівасці ў адносінах да гендару, расы, этнічнасці, рэлігіі, месца пражывання, нацыянальнасці, наяўнасці дакументаў, інваліднасці, сексуальнай ідэнтычнасці ці сацыяльнага класа паходжання. Пры гэтым менш увагі надаецца замоўчванню і выключэнню калектыўных успамінаў, памкненняў, культурных традыцый і карэнных традыцыйных ведаў у адукацыі і агульным здабытку ведаў. Навучанне крытычнаму стаўленню да ўсталяваных дамінуючых ведаў займае цэнтральнае месца ў педагогіцы салідарнасці. Мы ўсе павінны навучыцца адвучвацца.

> Культурныя рэсурсы ёсць ключавая частка нашых суадносінаў з ведамі.

Збірацца разам, вывучаць невядомую рэальнасць адзін аднаго і крытычна ставіцца да ўстаноўленых ведаў можа быць складана, нават небяспечна. Усе адукацыйныя ўстановы павінны быць бяспечнымі месцамі, нават сховішчамі, дзе навучэнцаў заахвочваюць спрабаваць, адважвацца, цярпець паразы і тварыць. Педагогіка павінна стымуляваць фантазію і творчае мысленне і прасоўваць інтэлектуальную свабоду, у тым ліку права рабіць памылкі і вучыцца на іх. Асяроддзе, якое дазваляе і робіць магчымым гэтую падчас бязладную навучальную працу, мае крытычнае значэнне для развіцця сапраўднага разумення, эмпатыі, этычных рамак і ацэньвання адрозненняў у разуменнях і пунктах гледжання. Педагогі павінны працаваць над стварэннем асяроддзя, якое будзе дазваляць вучням быць уразлівымі і свабоднымі ад страху асуджэння, калі яны змагаюцца з новымі ідэямі і складанымі ведамі.

## Вучыцца загойваць раны, нанесеныя несправядлівасцю

Веданне цесна звязанае з пачуццямі. Чалавечы інтэлект наўпрост звязаны са свядомасцю і афектам. Прызнанне гэтай узаемасувязі адкрывае велізарнае поле адукацыйных магчымасцяў. Мы можам супрацьстаяць любому адзінкаваму манакулярнаму бачанню і ацаніць шэраг іншых шляхоў да ведаў і пачуццяў, іншых шляхоў жыцця, іншых эпістэмалогій. Дэкаланізацыя педагогікі можа быць дасягнута праз канструктыўныя гарызантальныя ўзаемасувязі паміж эпістэмалагічнымі дапушчэннямі і перспектывамі.

Мы таксама прадбачым значэнне адукацыі для рэпарацыйнага правасуддзя і салідарнасці. Салідарнасць заўсёды была неабходнай для пабудовы згуртаванага грамадства, і нядаўна яна стала важнай педагагічнай мэтай як у фармальным, так і ў менш фармальным навучанні. Педагогіка салідарнасці дапамагае абысці прыгнятальніцкія рэжымы, фарміруючы

ўсведамленне аб неабходнасці калектыўнай свядомасці і калектыўных дзеянняў. Адукацыйная праца можа засяроджвацца на шырокай салідарнасці праз сімпатыю, эмпатыю і спагаду для стварэння магчымасцяў для гаення ранаў. Эмпатыя, як здольнасць праяўляць увагу да іншых людзей і падзяляць іх пачуцці, разам з этыкай з'яўляецца неад'емнай часткай справядлівасці. Навучанне загойваць мінулыя несправядлівасці павінна быць крытычным кампанентам педагогікі супрацоўніцтва і салідарнасці.

## Узмацненне асэнсаванай ацэнкі

На самым фундаментальным узроўні ацэнка ёсць натуральны працэс сістэмных эмпірычных назіранняў аб прагрэсе і выкліках, з якімі сутыкаюцца вучні падчас навучання. Трэба з асцярогай праводзіць ацэнку падчас састаўлення праграм, стандартызацыі і выкарыстання яе для размеркавання вучняў па класах. Усе ацэначныя рашэнні заснаваны на шэрагу дапушчэнняў, якія павінны адпавядаць дапушчэнням, прынятым у навучальным плане, і метадыцы, ад якіх яны адштурхоўваюцца.

З пункту гледжання педагогікі супрацоўніцтва і салідарнасці, педагогі павінны дакладна вызначыць, якія педагагічныя мэты падлягаюць і якія не падлягаюць вымярэнню. Значную частку важных аспектаў навучання нельга вымераць ці палічыць. Калі нешта не падлягае колькаснаму вымярэнню, гэта не значыць, што нельга назіраць сэнс у прагрэсе. Напрыклад, мэту сумеснай працы можна назіраць эмпірычна, калі група вучняў праходзіць тэмы перамоваў, вырашэння канфліктаў і правядзення эксперыментаў, і ў гэтым працэсе растуць іх здольнасці выслухоўваць розныя пункты гледжання, даваць і прымаць канструктыўныя заўвагі і ствараць дастатковыя магчымасці для ўдзелу кожнага.

Існуе шмат тэорый ацэнкі, якія будуць працягваць абмяркоўвацца ў наступныя дзесяцігоддзі. Педагогі і палітыкі павінны памятаць, што кожная праверка, ацэнка і шкала пакідае педагагічны след. Трэба супраціўляцца ціску, накіраванаму на завышэнне патрабаванняў да тэсціравання малодшых вучняў, бо гэта абмяжоўвае педагагічныя варыянты для школ і настаўнікаў, правакуе канкурэнцыю і скарачае магчымасці для супрацоўніцтва і сумеснага будаўніцтва. Мае рацыю тое, што пэўныя складнікі спаборніцтва могуць заахвочваць вучняў да атрымання больш высокіх дасягненняў як на асабістым, так і на калектыўным узроўні. Пры гэтым настаўнікі павінны мець магчымасць вызначыць, калі спаборніцкую дзейнасць можна выкарыстоўваць дзеля пэўных педагагічных мэтаў, а не ў якасці рэакцыі на вонкавы ціск у сувязі з часта аддаленымі і невядомымі эталонамі.

Вымярэнне і ацэнка з'яўляюцца важнымі для разумення наступстваў адукацыі, але паказчыкі павінны быць належнымі, змястоўнымі і добра прадуманымі. Глабальнае пашырэнне прыватнага рэпетытарства, якое часта завецца "ценявой адукацыяй", дае добры прыклад таго, як вузкі акцэнт на абмежаваных паказчыках адукацыйных дасягненняў (часта з упорам на кароткачасовае запамінанне і кагнітыўныя навыкі нізкага ўзроўню) скарачае навучальную праграму, неабходную для падрыхтоўкі вучняў да дасягнення больш вялікіх мэтаў, як на асабістым, так і на сацыяльным узроўні. З пункту

гледжання будучыні відавочна, што існуе неабходнасць у змяненні негатыўнага ўплыву нарастаючай канкурэнцыі ў адукацыі і вузкага акцэнту на інструктаванні, выкліканым экзаменамі з высокімі крытэрыямі.

## Педагагічныя падарожжы ў кожным узросце і на кожным этапе

Педагогіка ўдзелу і супрацоўніцтва падыходзіць для ўсіх узроўняў адукацыі, а таксама для ўсіх адукацыйных устаноў, як фармальных, так і нефармальных. Гэтыя педагагічныя методыкі могуць ужывацца на любым этапе жыцця, хоць магчымасці для супрацоўніцтва і педагагічнага сумеснага будаўніцтва адрозніваюцца ў залежнасці ад розных этапаў чалавечага прагрэсу і развіцця. Ва ўсім свеце ўзроўні адукацыі часта класіфікуюцца як дашкольная, пачатковая, сярэдняя і вышэйшая адукацыя. Хаця існуе мноства тыпаў чалавечага інтэлекту, вялікая разнастайнасць чалавечых інтарэсаў і спосабаў навучання, і хоць людзі не развіваюцца лінейна, ёсць прыдатныя для развіцця спосабы падтрымкі навучання, а таксама разумныя спосабы ўшанавання адрозненняў паміж навучэнцамі і персаналізацыі навучання. Распаўсюджанае ўяўленне аб тым, што адукацыя праходзіць праз розныя фазы, прыпадабляе яе да мэтанакіраванага падарожжа, якое павінна стаць даступным для ўсіх. Астатняя частка гэтага раздзелу больш падрабязна разглядае педагагічныя дылемы і магчымасці, якія ўзнікаюць на кожным узроўні і этапе жыццёвага цыкла, з акцэнтам на тым, як можна выкарыстоўваць педагогіку ўдзелу і супрацоўніцтва.

### Падтрымка падмуркаў ранняга дзяцінства

У дзіцячых вачах свет можа выглядаць па-новаму. Мала хто можа аднаўляць свой погляд на свет, як гэта робяць дзеці. Дзіцячая ўвага да чужога досведу і цікаўнасць, якую яны праяўляюць да невядомага і поўнага магчымасцяў свету, служаць прыкладам для людзей усіх узростаў. Пільная ўвага да патэнцыялу гэтага перыяду, калі чалавек сутыкаецца з новым, павінна быць часткай дашкольнай адукацыі і захоўвацца ва ўсіх адукацыйных сітуацыях.

Якасная дашкольная адукацыя павінна быць прыярытэтам для кожнага грамадства. Першыя гады чалавечага жыцця – гэта час значнай пластычнасці і развіцця мозга, калі адбываецца надзвычайны і істотны фізічны, кагнітыўны, сацыяльны і эмацыйны рост. Вялікі корпус адукацыйных даследаванняў паказвае на важнасць дашкольнай адукацыі як ключавога падмурка ўсяго будучага навучання і поспехаў.

Дашкольнай адукацыі ў значнай ступені ўнутрана ўласцівая педагагічная арыентацыя на супрацоўніцтва і ўзаемазалежнасць. На гэтым этапе варта зрабіць акцэнт на цесных чалавечых сувязях, пошуку і гульні. Варта памятаць, што задаткі не абавязкова супадаюць са здольнасцямі і схільнасцямі, якія развіваюцца пазней. Некаторыя з найлепшых навуковых пошукаў могуць паўстаць у выніку простага захаплення, напрыклад, кузуркамі. Творчая ролевая гульня можа быць магутнай асновай для комплекснай формы граматнасці. Як нам

кажуць дашкольныя педагогі, тое, што выглядае як легкадумная гульня, часта з'яўляецца вельмі сур'ёзнай справай разумення сябе і свету.

Праблемы навакольнага асяроддзя і змянення клімату, з якімі зараз сутыкаецца планета, маюць важныя наступствы для дашкольнай адукацыі. Хаця ў многіх сітуацыях дамінуе педагогіка, арыентаваная на індывідуальнасць дзяцей, гэтыя падыходы неабходна перагледзець, паколькі яны павінны адлюстроўваць факт таго, што, як і ўсе людзі, дзеці з'яўляюцца часткай больш чым чалавечага свету. Дашкольная адукацыя мае важную ролю ў развіцці адносінаў дзяцей да месца, дзе яны жывуць, і да іншых жывых істот. Каб найлепшым чынам дапамагчы дзецям добра ўладкавацца ў будучым сусвеце, мы павінны падтрымаць дашкольную педагогіку, арыентаваную на крытычны аналіз, выклікі і стварэнне новых магчымасцяў.

На гэтым узроўні сувязі паміж домам і школай з'яўляюцца наймацнейшымі. Ключавая роля належыць сем'ям, якім патрэбна падтрымка ў мэтах развіцця дзяцей і паляпшэння іх фізічнага, сацыяльна-эмацыйнага і кагнітыўнага развіцця. Мы ведаем, што навучанне чалавека праходзіць у пастаянным узаемадзеянні з навакольным асяроддзем. Аптымальныя ўмовы навучання даюць немаўлятам і малым дзецям дастатковую стымуляцыю на іх роднай мове (мовах). Сумеснае чытанне кніг і ўжыванне багатага слоўнікавага запасу ў штодзённым узаемадзеянні дапамагае развіваць навыкі граматнасці, якія складаюць грунтоўны кампанент адукацыі. Падключэнне дзяцей да тэлевізараў, планшэтаў ды іншых электронных прыладаў ёсць кепская замена патрэбнага ім якаснага інтэрактыўнага сацыяльнага досведу. Урады і бізнес павінны паляпшаць палітыку ў галіне бацькоўскіх водпускаў. Для бацькоў і сем'яў адукацыя, якая падтрымліваецца і адбываецца ў раннім узросце, будзе істотна паляпшацца, калі дзіцячыя садкі, бібліятэкі, музеі, грамадскія цэнтры і паркі атрымліваюць належнае фінансаванне і лічацца неабходнымі грамадскімі паслугамі. Прыказка "Патрэбна цэлая вёска, каб выгадаваць дзіця" стала банальнай праз празмернае выкарыстанне, аднак гэта часткова таму, што стрыжнёвая ідэя ў шмат каго знаходзіць водгук: дашкольная адукацыя – гэта тое, чаго мы дасягаем разам.

На жаль, у многіх грамадствах дашкольная адукацыя не прызнаецца такім жа абавязкам грамадства, як і пачатковая адукацыя. Не хапае якасных або ў дастатковай колькасці дзіцячых садкоў. Педагогі гэтага ўзроўню часта атрымліваюць мізэрную аплату, нібыта адзіная значная мэта – гэта забеспячэнне фізічнага догляду. У выніку некаторыя найважнейшыя формы несправядлівасці развіваюцца ў раннім дзяцінстве: у той час, як сем'і з больш высокімі ўзроўнямі адукацыі і лепшымі рэсурсамі даюць сваім дзецям высакаякасную адукацыю, якая часта недасяжная для тых, хто залежыць ад грамадскіх цэнтраў, якія не адпавядаюць патрабаванням, не атрымліваюць належнага фінансавання і маюць нізкааплатных і горш падрыхтаваных педагогаў. Урады павінны забяспечыць належнае і ўстойлівае дзяржаўнае фінансаванне якаснай дашкольнай адукацыі, каб забяспечыць навучанне, рост і развіццё ўсіх дзяцей з нараджэння.

Укаранёныя няроўнасці і забабоны, якія падзяляюць нашы грамадствы, засвойваюцца ў раннім узросце – і часцей за ўсё празназіранне, чым праз непасрэдныя ўказанні.

Напрыклад, калі мужчыны па-ранейшаму складаюць менш за 2 % дашкольных педагогаў, хлопчыкі ўскосна вучацца, што яны не павінны імкнуцца клапаціцца пра малодшых і ўразлівых. Калі дзяцей не агортваць роднай мовай і мовай продкаў, яны рызыкуюць згубіць гэтую каштоўную сувязь са сваякамі і культурныя шляхі да ведаў і камунікацыі, якія злучаюць іх з іх спадчынай у прасторы і часе. У многіх грамадствах, дзе школы раней выкарыстоўваліся ў якасці інструмента асіміляцыі і падаўлення, існуе вельмі папулярнае перакананне аб неабходнасці ператварыць і зачыніць гэтыя прыгнятальныя ўстановы. Трэба прыняць меры, каб ініцыятывы ў галіне дашкольнай адукацыі пазбягалі бясконцага культурнага адчужэння і забабонаў. Дашкольная педагогіка павінна зацвярджаць і ўзмацняць асабістыя і калектыўныя культурныя ідэнтычнасці і спрыяць міжкультурнаму дыялогу, які грунтуецца на павазе да разнастайнасці.

## Сумесная адукацыя для ўсіх дзяцей

Нягледзячы на масавае пашырэнне доступу да пачатковай адукацыі ва ўсім свеце ў перыяд з 1990 па 2020 гады, шмат чаго застаецца зрабіць, каб павысіць якасць у кожнай сферы навучання, напоўніцу выкарыстоўваючы патэнцыял педагогікі ўдзелу і супрацоўніцтва.

На жаль, у шмат якіх школах і грамадствах уласцівыя малодшаму дзіцячаму ўзросту натуральная цікаўнасць і дапытлівасць заахвочваюцца ўсё менш, калі дзеці пераходзяць у старэйшыя класы, дзе яны маюць менш магчымасцяў гуляць, даследаваць, супрацоўнічаць і наладжваць зносіны. Немагчыма адмаўляць каштоўнасць асабістай практыкі нованабытых ведаў і навыкаў ва ўсіх галінах мастацтва і навуках. Аднак можна сказаць, што зашмат часу прысвячаецца ізаляванай індывідуальнай працы на пачатковым узроўні, што абмяжоўвае ключавыя магчымасці сумеснага будаўніцтва, супрацоўніцтва і вырашэння праблем.

Тым не менш расце колькасць прыкладаў сумесных і супрацоўніцкіх педагагічных ініцыятыў як у рамках, так і па-за рамкамі школ і фармальных адукацыйных устаноў. У некаторых рэгіёнах мясцовыя школы ўяўляюць сабой творчы адказ мясцовых супольнасцей на прадбачанне новых адукацыйных магчымасцяў, рэакцыю на мясцовыя патрабаванні і задзейнічаюць глыбокія культурныя рэзервы. Існуюць і іншыя адукацыйныя праграмы, якія падчас лічацца "пазашкольнымі", якія супрацоўнічаюць са школамі і павышаюць магчымасці для сумеснай адукацыі і культурнага паразумення праз сувязь з мясцовымі старэйшынамі, лідарамі супольнасцей і захавальнікамі ведаў.

## Раскрыццё патэнцыялу падлеткаў і моладзі

Сёння моладзь сутыкаецца са шматлікімі і разнастайнымі рэаліямі ва ўсім свеце, у тым ліку з рознымі рызыкамі пры вызначэнні іх правоў на адукацыю, абарону ад гвалту, жаночага абразання і ранніх шлюбаў, а таксама з нарастаючым абцяжарваннем удзелу ў забеспячэнні сям'і. Іншыя сутыкаюцца з ростам сацыяльнай ізаляцыі, праблемамі з псіхічным здароўем і крызісам ідэнтычнасці і жыццёвай мэты. На працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў

адукацыя ў markрознай ступені дапамагала змякчаць праблемы на гэтым этапе жыцця, спрыяючы здаровым сацыяльным узаемадзеянням, адносінам з аднагодкамі і пачуццю мэтанакіраванасці ў сучасных і будучых справах. Аднак у іншых выпадках адукацыя пагоршыла праблемы праз павышэнне акадэмічнага ціску і сацыяльнага адчужэння.

Час юнацтва можна параўнаць толькі з малодшым дзіцячым узростам па істотнасці нейралагічных і фізічных зменаў, якія адбываюцца за кароткі час – некалькі гадоў або месяцаў. Юнакі і дзяўчаты робяць значныя скачкі ў інтэлектуальных здольнасцях, аднак культурныя чаканні і падыходы могуць адрознівацца адносна таго, калі яны будуць гатовыя ўзяць на сябе поўныя абавязкі дарослага чалавека, ці яны павінны засяродзіцца на падрыхтоўцы да будучыні. Адукацыя можа даць магчымасць рабіць абедзве справы адначасова – кідаючы маладым людзям выклік і ў той жа час надзяляючы іх дастатковымі магчымасцямі, каб істотна ўзаемадзейнічаць са светам.

Часта менавіта на гэтым этапе жыцця юнакі і дзяўчаты ўдасканальваюць свае інтарэсы, развіваюць свае таленты і вызначаюць тыя прафесіі, праз якія яны могуць найлепш вынайсці сваё прызначэнне. Пераадоленне разрыву паміж тэорыяй і практыкай, паміж быццам бы бясконцай падрыхтоўкай і істотным досведам, выхоўванне ўстойлівага пачуцця мэты ў жыцці – важныя педагагічныя задачы на гэтым этапе. Моладзь, якую часта характарызуе моцнае пачуццё справядлівасці, востра ўспрымае крывадушнасць дарослых. У святле гэтага наратывы пра недахопы, у якіх моладзь вызнаецца як па сваёй сутнасці праблемная, бунтарская або небяспечная для грамадскага дабра, асабліва шкодзяць і абмяжоўваюць магчымасці для міжпакаленчага супрацоўніцтва і падтрымкі гэтага важнага, хоць і часам складанага пераходнага перыяду. Калі разглядаць справу з пункту гледжання магчымасцяў, становіцца ясна, што вельмі нешматлікія мадэлі сярэдняй адукацыі ў дастатковай ступені раскрываюць неверагодны патэнцыял моладзі.

Тым не менш пераасэнсаванне будучыні ўжо адбываецца. Усё часцей моладзевыя рухі і арганізацыі прапаноўваюць іншыя падыходы да праблем. “Па пятніцах – да будучыні” (Fridays For The Future), “Рух Усходу Сонца” (the Sunrise Movement) і тысячы падобных праектаў па ўсім свеце ўяўляюць сабой рэпетыцыю будучыні іншага тыпу. У шэрагу краін Лацінскай Амерыкі і Паўднёвай Азіі сістэмы адукацыі і педагогікі, якія разглядаюць маргіналізаваную сельскую моладзь у якасці зыходнага пункту, замест пашырэння арыентаванай на горад мадэлі, аднаўляюць у падлеткаў і моладзі пачуццё гонару за практыкі карэннага насельніцтва і продкаў. Гэтыя і многія іншыя прыклады з’яўляюцца практычным выразам здольнасці адукацыі падтрымліваць моладзь у стварэнні шмат шырэйшага кола варыянтаў заможнай і справядлівай будучыні.

Усё часцей моладзевыя рухі і арганізацыі прапаноўваюць іншыя падыходы да праблем.

## Абнаўленне місіі вышэйшай адукацыі

Разам са стварэннем і распаўсюджваннем ведаў адукацыя складае частку цэнтральнай місіі ўніверсітэта, аднак шмат дзе яна ў апошнія дзесяцігоддзі была занядбаная праз шляхі арганізацыі, акрэдытацыі і фінансавання адукацыі. У некаторых месцах выкладчыкаў ацэньваюць выключна па іх асабістых выніках, што служыць прыкметай таго, што меркаваная прадукцыйнасць цэніцца вышэй за якасць, актуальнасць і каштоўнасць іх унёску ў выкладанне, настаўніцтва, нарошчванне патэнцыялу і развіццё партнёрскіх адносінаў з супольнасцямі, якім яны імкнуцца прынесці карысць.

У многіх ВНУ педагогіка адышла на задні план. Магчыма, што будучыя ўніверсітэты пойдуць па гэтым шляху, дэлегуючы выкладчыцкія задачы іншым установам ці спецыяльным цэнтрам са складаным тэхналагічным абсталяваннем на аснове штучнага інтэлекту. Таксама магчыма ўявіць будучыню абноўленага ўніверсітэта, дзе цэнтральнае месца займае міжпакаленчая адукацыйная місія, якая нязменна звязана з ведамі і даследаваннямі. Прафесійна-тэхнічныя ўстановы падчас сутыкаюцца з другім бокам гэтага маятніка – выкладанне часта абмежавана трэніроўкай і тэхнікай, а больш глыбокія сацыяльныя, этычныя і канцэптуальныя пытанні застаюцца па-за сферай іх кампетэнцыі. Аднак развіццё і выкарыстанне вытворчага патэнцыялу, які мае такое вялікае значэнне для нашай асабістай і калектыўнай будучыні, павінна разглядацца як багатае педагагічнае поле для развіцця глыбокага разумення, прафесійных навыкаў і абдуманых адносін.

Каб абнавіць адукацыйную місію вышэйшай адукацыі, неабходна мець моцныя сувязі з пачатковай і сярэдняй адукацыяй і задзейнічаць педагагічныя стратэгіі за рамкамі традыцыйнай лекцыі і мадэлі перадачы ведаў, якую яна прадстаўляе. Кааперацыйная праца студэнтаў, распрацоўка даследчых праектаў, заданні па вырашэнні праблем, індывідуальныя заняткі, дыялог падчас семінараў, палявыя даследаванні, напісанне работ, практычныя даследаванні, грамадскія праекты – усе гэтыя і шмат іншых педагагічных форм павінны ўзбагаціць вышэйшую адукацыю. Каб вярнуць вышэйшую адукацыю на першы план, неабходна надаць большую вагу працы выкладчыкаў і падтрымаць іх педагагічнае навучанне і рост.

Такія каштоўнасці, як павага, эмпатыя, роўнасць і салідарнасць, павінны складаць стрыжань місіі ўніверсітэтаў, каледжаў і тэхнічных інстытутаў у будучыні. Вышэйшая адукацыя павінна прышчэпліваць этыку і падтрымліваць студэнтаў, каб яны станавіліся лепшымі і больш здольнымі грамадзянамі, якія лепш усведамляюць свае абавязкі перад грамадствам і навакольным асяроддзем. Вышэйшая адукацыя таксама павінна быць актуальнай у сацыяльна-культурным плане. Шанаванне культурнай разнастайнасці, прыхільнасць да абароны правоў чалавека і нецярпімасць да расізму, сексізму, класавасці, этнацэнтрызму і дыскрымінацыі ва ўсіх іх формах павінны быць ключавымі задачамі адукацыі. Вышэйшая адукацыя, якая прасоўвае такія каштоўнасці і прынцыпы, выходзіць за рамкі лекцыйных залаў і віртуальных прастораў. Яна пастаянна змястоўна развіваецца, надзяляючы людзей магчымасцямі паляпшаць саміх сябе, развіваць моцныя каштоўнасныя сістэмы і змяняць сваё асяроддзе.

## Прынцыпы дыялогу і дзейнасці

У гэтым раздзеле прапануецца, каб новы сацыяльны кантракт на адукацыю быў арганізаваны на прынцыпах супрацоўніцтва і салідарнасці, будуючы патэнцыял вучняў для сумеснай працы і трансфармацыі свету. У перспектыве да 2050 года ёсць чатыры прынцыпы, якімі павінен кіравацца дыялог, і дзеянні, неабходныя для выканання гэтай рэкамендацыі:

- **Узаемазвязанасць і ўзаемазалежнасць павінны фарміраваць педагогіку**. Узаемасувязі, якія існуюць паміж выкладчыкамі, вучнямі і ведамі, выходзяць у больш шырокі свет. Усе навучэнцы звязаныя са светам, і ўсё навучанне адбываецца ў свеце і са светам. Вучні павінны даведацца, як на іх уплываюць учынкі іншых людзей і як іх уласныя дзеянні ўздзейнічаюць на іншых; і па гэтай прычыне класы і школы павінны злучаць навучэнцаў з іншымі людзьмі, якія адрозніваюцца ад іх.

- **Супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне павінны выкладацца і практыкавацца належным чынам на розных узроўнях і для розных узростаў**. Адукацыя будуе патэнцыял людзей да сумеснай працы, для трансфармацыі саміх сябе і свету, у той час як супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне вызначаюць характарыстыкі адукацыйных супольнасцей. Гэта можа датычыцца як адукацыі і навучання дарослых, так і дашкольнай адукацыі.

- **Як мы вучымся, павінна грунтавацца на салідарнасці, спагадзе, этыцы і эмпатыі**. Мы павінны вітаць уключэнне ўсёй разнастайнасці культурных рэсурсаў чалавецтва ў адукацыю і перайсці ад шанавання разнастайнасці і плюралізму да іх падтрымкі і прасоўвання. Навучанне павінна быць сканцэнтравана на пазбаўленні ад перадузятасці, забабонаў і расколаў. Эмпатыя – як здольнасць праяўляць увагу да іншых людзей і падзяляць іх пачуцці – неабходная для будавання педагогікі салідарнасці.

- **Ацэнка павінна быць узгодненая з гэтымі мэтамі і мець значэнне для росту і навучання студэнтаў**. Экзамены, тэсты і іншыя інструменты ацэнкі павінны адпавядаць мэтам і намерам адукацыі. Значная частка важнага навучання не падлягае лёгкаму вымярэнню ці падліку. Прыярытэт трэба надаваць арганізаванаму настаўнікамі фарматыўнаму ацэньванню, якое спрыяе навучанню вучняў. Мы павінны знізіць значнасць канкурэнтнай, стандартнай ацэнкі з высокімі крытэрыямі.

Мы ўсе павінны працаваць разам на мясцовым, рэгіянальным і глабальным узроўнях, каб у 2050 годзе педагогіка супрацоўніцтва і салідарнасці стала агульнай і даступнай для ўсіх.

# Раздзел 4

## Навучальныя праграмы і агульны здабытак ведаў, які развіваецца

Сапраўдная цяжкасць – гэта тое, што людзі не ўяўляюць, чым адукацыя з’яўляецца на самой справе. Мы ацэньваем каштоўнасць адукацыі тым жа чынам, як мы ацэньваем каштоўнасць зямлі ці акцый на біржавым рынку. Мы жадаем даваць толькі такую адукацыю, якая дазволіць вучню зарабляць больш. Мы амаль ніколі не задумваемся над паляпшэннем характару навучэнцаў. Мы кажам, што дзяўчынкі не павінны зарабляць грошы, – дык навошта іх адукоўваць? Пакуль будуць захоўвацца такія думкі, няма надзеі, што мы калі-небудзь зазнаем сапраўдную каштоўнасць адукацыі.

**Махатма Гандзі**, “Сапраўдная нацыянальная адукацыя”, 1907 год

**У новым сацыяльным кантракце на адукацыю навучальныя праграмы павінны выйсці за рамкі крыніцы агульных ведаў і ахопліваць экалагічнае, міжкультурнае і міждысцыплінарнае навучанне, якое дапамагае вучням ствараць веды, развіваючы свае здольнасці да крытычнага аналізу і яго прымянення.**

Трэба ўсталяваць новыя суадносіны паміж адукацыяй і ведамі, магчымасцямі і каштоўнасцямі, якія яна выхоўвае. Гэта пачынаецца з вывучэння магчымасцяў і ведаў, якія дазваляюць вучням будаваць мірны, справядлівы і ўстойлівы свет, і адсочвання па навучальных праграмах тых шляхоў, якія дапамагаюць вучням развіваць такія магчымасці. Каб распрацаваць новы сацыяльны кантракт на адукацыю разам, мы павінны думаць аб навучальных праграмах як аб нечым большым, чым сетка школьных прадметаў. Пытанні адносна навучальных праграм павінны тычыцца нарошчвання кампетэнцый і двух важных працэсаў, якія заўсёды прысутнічаюць у адукацыі: набыццё ведаў у рамках агульнай спадчыны чалавецтва і калектыўнае стварэнне новых ведаў і новых сусветаў.

Існуе шмат напрамкаў і тэорый адносна таго, як і што выкладаць і як і чаму навучацца. Мадэлі навучання можна класіфікаваць як арыентаваныя на дзяцей ці прадметы, навучэнцаў ці настаўнікаў. Веды можна залічыць у наступныя катэгорыі: акадэмічныя ці прыкладныя, прыродазнаўчыя ці гуманітарныя, агульныя ці спецыяльныя. Кожны падыход мае, што прапанаваць, але неабходныя новыя парадыгмы і перспектывы, каб адпавядаць узрастаючай складанасці ўзаемадзеянняў ведаў са светам. Педагогі павінны падыходзіць да навучання, адначасова задаючыся пытаннем: што трэба вывучаць, і ад чаго трэба адвучвацца? Гэта вельмі важнае пытанне ў гэтым крытычным скрыжаванні, калі асноўная парадыгма развіцця і эканамічнага росту патрабуе пераасэнсавання ў святле экалагічнага крызісу.

> Што трэба вывучаць, і ад чаго трэба адвучвацца?

Разгляд узгаданых пытанняў пачынаецца ў гэтым раздзеле з кароткага абмеркавання агульнага здабытку ведаў; сцвярджаецца, што ён патрабуе канцэптуальнага перагляду як спадчына ўсяго чалавецтва і пашырэння з уключэннем разнастайных шляхоў да ведаў і разумення. Акцэнт на ведах, якія тут робіцца, не азначае, што змест павінен дамінаваць. Веды заўсёды развіваюцца адносна таго, як яны ствараюцца, прымяняюцца і пераглядаюцца. У гэтым раздзеле размешчаны адкрыты заклік актывізаваць нашы калектыўныя намаганні па нарошчванні маштабнага патэнцыялу для стварэння далейшых ведаў і іх прымянення для вырашэння складаных пытанняў і выклікаў, з якімі сутыкаецца чалавецтва.

Адукацыя можа арганічна адказваць на пытанні “што” і “як”. Авалодванне зместам не павінна канкурыраваць з прымяненнем, навыкамі ці развіццём магчымасцяў. Наадварот, базавыя веды і навыкі могуць і пераплятацца, і дапаўняць адно аднаго. Ужо некалькі дзесяцігоддзяў дэбаты адносна навучальных праграм вагаюцца паміж аб’ёмам ведаў і кампетэнцыямі. Надышоў час распрацаваць механізм, які будзе падтрымліваць моцны падыход да ведаў, адначасова не адмаўляючыся ад дасягненняў праектнага і праблемнага падыходаў, напрыклад, у сэнсе цеснага дыялогу аб сучасных праблемах і павышэння актуальнасці навучання па праграмах для вучняў.

У гэтым раздзеле разглядаюцца ўзаемасувязі паміж агульным здабыткам ведаў і навучальнымі праграмамі і сцвярджаецца неабходнасць разумення неад'емнай сувязі паміж такімі здольнасцямі, як пісьменнасць, матэматычная граматнасць, навуковы пошук, мастацтва і грамадзянства. Ён завяршаецца Кіруючымі прынцыпамі дыялогу і дзейнасці да 2050 года, якія ўяўляюць роўную цікавасць як для настаўнікаў і педагогаў, так і для распрацоўшчыкаў навучальных праграм, у тым ліку адносна паляпшэння агульнага доступу да здабывання ведаў і прыярытэту адукацыі ў галіне змянення клімату, навуковага пошуку і правоў чалавека.

## Удзел у агульным здабытку ведаў

Навучальныя праграмы павінны падыходзіць да ведаў як да вялікага дасягнення чалавецтва, якое належыць кожнаму. У той жа час у навучальных праграмах трэба ўлічваць той факт, што агульны здабытак ведаў захоўвае значныя выключэнні і прысваенні, якія патрабуюць выпраўлення ў святле справядлівасці. Веды ніколі не бываюць поўнымі, і педагогі павінны заклікаць вучняў і даваць ім магчымасці ўдзельнічаць у далейшым сумесным стварэнні ведаў. Існуе зашмат формаў адукацыі, якія звязваюць перадачу ведаў больш з усталяваннем бар'ераў і ўзнаўленнем няроўнасці, чым з узбагачэннем усяго чалавецтва і нашага сумеснага, калектыўнага дабрабыту. Адукацыя, якая на першы план ставіць мэтанакіраваную, удумлівую працу з ведамі, дапамагае будаваць эпістэмную, кагнітыўную і рэпарацыйную справядлівасць.

Мы павінны супраціўляцца гегемоніі на веды і спрыяць магчымасцям для творчасці, неабмежаванасці і эксперыментам, ажыццяўленне якіх магчыма толькі пры поўным уключэнні разнастайных эпістэмалагічных поглядаў чалавецтва. Трэба адкінуць атрыманыя ў спадчыну забабоны, адвольныя іерархіі і эксплуататарскія ўяўленні. Адукацыя можа павышаць магчымасць людзей абапірацца на агульны здабытак ведаў, каб кожнае пакаленне рабіла свой унёсак у пераасэнсаванне свету. Навучальныя праграмы павінны развівацца і ўдасканальваць нашы магчымасці ўзаемадзейнічаць і працаваць з ведамі. Так, пісьменнасць, матэматычная граматнасць і навуковы пошук маюць вырашальнае значэнне для таго, каб людзі маглі асэнсоўваць і рабіць свой унёсак у свет, і яны патрабуюць паўсюднага пашырэння і паглыблення.

Адзін з аспектаў распрацоўкі адкрытых і агульных праграм – гэта супраціўленне ціску, які вымушае будаваць межы паміж дысцыплінамі і прадметамі ў якасці зафіксаваных ці крытычна неабходных лімітаў. Наадварот, лепш направіць энергію на абмеркаванне складанасці свету і гістарычнай якасці сістэмаў ведаў. Увядзенне такога ўяўлення аб вялікай колькасці і трансверсальнасці ў навучальныя праграмы дапамагае нам развіваць новыя і прадуктыўныя напрамкі, абапіраючыся на ўстойлівыя падмуркі ведаў.

Ва ўсіх гэтых значных напрамках працы неабходна памятаць аб тым, што навучальная праграма ніколі не ствараецца з "завершанымі ведамі", яна, хутчэй, грунтуецца на ведах, якія злучаюць розныя пакаленні, перадаюць культурную спадчыну і робяць магчымымі

перагляд і абнаўленне. Гэтае ўсведамленне павінна прывесці нас да выкладання ўсіх прадметаў з гістарычнай перспектывы ў рамках дыялогу паміж пакаленнямі, змест і новы сэнс якому будуць надаваць вучні праз сваё навучанне.

## Прыярытэты навучальных праграм для будучыні адукацыі

Мы павінны перайсці ад вузкага погляду на адукацыю да сур’ёзнай працы з больш значнымі мэтамі. Падыходы да навучальных праграм павінны звязаць кагнітыўную сферу з навыкамі вырашэння праблем, наватарствам і творчасцю, а таксама ўключаць развіццё сацыяльна-эмацыйнага навучання і самапазнання. Прыведзеныя тут тыпы ўзаемадзеяння з адукацыйнымі праграмамі накіраваны на аб’яднанне і зняцце абмежаванняў. Апісаныя ніжэй прыярытэты навучальных праграм накіраваны на падтрымку інклюзіі, гендарнай роўнасці, ліквідацыі несправядлівасці і шырокай барацьбы з няроўнасцю, што неабходна для сумеснага пераасэнсавання будучыні.

## Навучальныя праграмы для пашкоджанай планеты

Як мы можам ужывацца на планеце, якая знаходзіцца пад нарастаючым стрэсам? Адукацыя павінна рэагаваць на змяненне клімату і разбурэнне навакольнага асяроддзя, рыхтуючы вучняў да адаптацыі да змянення клімату, змякчэння яго наступстваў ці яго звароту назад. Мы павінны перагледзець і пераасэнсаваць навучальныя праграмы, каб прывіць прынцыпова новы погляд на месца людзей як часткі планеты. Ва ўсіх сферах вучні павінны сутыкацца з вострай неабходнасцю экалагічнай устойлівасці – жыць у межах планеты і не ставіць пад пагрозу будучыя пакаленні ці прыродныя экасістэмы, часткай якіх усе мы з’яўляемся. Уменне жыць з павагай і адказнасцю на планеце, пашкоджанай праз дзейнасць чалавека, можа пранікаць ва ўсе прадметныя галіны. Мы больш не можам прасоўваць ідэю выключнасці людзей ці пазіцыяніраваць свет як “нешта там”, як вонкавы аб’ект, які трэба вывучаць. Наадварот, мы павінны стымуляваць суб’ектнасць і дзеянні, якія з’яўляюцца міжасабовымі і калектыўна размеркаванымі. Гэта азначае прызнанне таго, што мы жывём і вучымся ў свеце прыроды.

Змяненне таго, як мы разглядаем жывы свет у адукацыйных праграмах, – адна з важных стратэгій аднаўлення раўнавагі нашых узаемасувязяў з ім. Аднак навучальныя праграмы, якія накіроўваюць вучняў быць толькі абаронцамі прыроды, недастатковыя. Гэтыя падыходы дагэтуль дапускаюць падзел паміж людзьмі і іх навакольным асяроддзем.

Асаблівая ўвага павінна быць нададзена адукацыі ў галіне змянення клімату. Эфектыўная і актуальная адукацыя ў галіне змянення клімату ўлічвае гендарную праблематыку, прымае міжгаліновы падыход да сацыяльна-эканамічных чыннікаў незалежна ад часу і месца, а таксама спрыяе крытычнаму мысленню і актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Такая адукацыя прызнае, што цяперашнія ўзроўні вытворчасці і спажывання ў свеце з’яўляюцца няўстойлівымі і што багатыя краіны робяць непрапарцыйны ўнёсак у барацьбу са змяненнем клімату, а цяжар яго наступстваў у асноўным нясуць найбяднейшыя краіны. Яна

таксама прызнае каланіяльную і індустрыяльную спадчыну, якая парушыла гарманічныя ўзаемасувязі паміж светам людзей і больш чым чалавечым светам у незлічоных традыцыйных супольнасцях. Адукацыя ў галіне змянення клімату павінна даваць вучням магчымасць абмяркоўваць справядлівыя і ўстойлівыя альтэрнатывы і прымаць меры ў сваіх мясцовых супольнасцях і, кіруючыся салідарнасцю, за іх межамі.

> Навучальныя праграмы павінны даваць магчымасць нанова вучыцца разумець, якім чынам мы ўзаемазвязаныя з жывой і пашкоджанай планетай.

Навучальныя праграмы павінны даваць магчымасць нанова вучыцца разумець, якім чынам мы ўзаемазвязаныя з жывой і пашкоджанай планетай, і адвучыцца ад чалавечай высакамернасці, якая прывяла да маштабнай страты біяразнастайнасці, разбурэння цэлых экасістэмаў і незваротнага змянення клімату. Мы можам разгледзець магчымасць “перамоткі” навучальных праграм праз развіццё глыбокай сувязі са светам прыроды і прыманне біясферы ў якасці адукацыйнай прасторы. Мы можам пераасэнсаваць навучальныя праграмы з уключэннем у іх дыялогу паміж пакаленнямі адносна важных практык, звязаных з ведамі, як жыць разам з планетай, накшталт тых, што маюць месца ў шматлікіх моладзевых і грамадскіх рухах. Феміністкія погляды і галасы карэнных народаў могуць шмат у чым дапамагчы ў гэты крытычны момант. Сістэмы ведаў карэнных народаў павышаюць усведамленне вучняў аб тым, што яны з’яўляюцца часткай натуральнай супольнасці і могуць чэрпаць з каштоўнасцей, практык і духоўнай свядомасці, якія дазвалялі чалавецтву тысячагоддзямі жыць у гармоніі з планетай. Кожная жывая істота мае сваё месца ва ўстойлівай экасістэме, а здольнасці жыць у гармоніі – браць не больш і не менш за тое, што неабходна для ўзаемнага існавання і дабрабыту, – можна навучыцца праз адукацыю. Феміністкая філасофія выступае супраць ідэй спаборніцтва, якія ляжаць у аснове жорсткіх і эксплуататарскіх адносінаў з прыродай. Эканамічныя мадэлі, якія грунтуюцца на няспынным пашырэнні спажывання і панавання на Зямлі, увекавечваюць бяздумны вымысел. Ёсць парогі эканамічнай эфектыўнасці, у рамках якіх мы павінны навучыцца жыць, каб дасягнуць дакладнага балансу грамадскага дабрабыту і экалагічнай устойлівасці.

> Здольнасці жыць у гармоніі – браць не больш і не менш за тое, што неабходна для ўзаемнага існавання і дабрабыту, – можна навучыцца праз адукацыю.

Сацыяльная справядлівасць неаддзельная ад экалагічнай. Мы не можам навучыцца клопату аб жывой планеце без таго, каб таксама навучыцца клопату адзін пра аднаго. Клопат не толькі звязаны з прыхільнасцямі або стаўленнямі, але ён мае цэнтральны кагнітыўны складнік. Навучальная праграма павінна ўключаць глыбокія веды таго, як ствараюцца навуковыя і тэхнічныя падыходы да планетарнага; як Зямля і сусвет дакументуюцца, візуалізуюцца і асэнсоўваюцца; і як звязаныя з ведамі практыкі пераплятаюцца ў практыцы жыцця на гэтай пашкоджанай планеце. Дыскусія адносна моцных бакоў і абмежаванняў інфармацыйных інструментаў, а таксама індывідуальных і калектыўных праектаў адыгрывае важную ролю ў развіцці актуальных навучальных

праграм, якія павышаюць калектыўную свядомасць і мабілізацыю на абарону магчымасці комплекснага жыцця на планеце.

Этыка клопату дае нам магчымасць усведамлення сябе як узаемазвязаных асобаў, якія адначасова з'яўляюцца моцнымі і ўразлівымі. Яна вымушае нас разважаць над тым, які ўплыў мы маем на іншых людзей і на свет і як іншыя людзі і свет уплываюць на нас. Важна, каб навучальныя праграмы выхоўвалі этыку клопату пра ўсіх, незалежна ад гендарнай прыналежнасці, каб ліквідаваць гендарны дысбаланс у доглядзе як у хатнім, так і ў грамадскім жыцці. Жыццёва важныя для грамадства рэпрадукцыйныя веды аб выхаванні дзяцей, доглядзе за хворымі і старымі, вядзенні хатняй гаспадаркі і рэагаванні на фізічныя і псіхалагічныя патрэбы сем'яў таксама належаць да агульнага здабытку ведаў чалавецтва і натуральна распаўсюджваюцца на нашы адносіны да нашай пашкоджанай і ўразлівай планеты і догляду за ёй. Такія тэмы, як "Руплівасць", "Клопат", "Як клапаціцца пра іншых" і "Як успрымаць клопат пра сябе", павінны быць уключаны ў навучальныя праграмы, якія дазваляюць нам пераасэнсаваць разам нашу ўзаемазалежную будучыню.

## Інтэграцыя ведання і пачуцця

Навучальныя праграмы павінны ставіцца да вучняў як да цэласных асобаў, якія, маладыя і старыя, прыносяць свае цікаўнасці і прагу да навучання ў адукацыйныя асяроддзі. Яны таксама прыносяць эмоцыі, страхі, няўпэўненасць, давер і запал. Навучальныя праграмы, якія ставяцца да вучняў як да паўнавартасных людзей, падтрымліваюць іх сацыяльна-эмацыйныя ўзаемадзеянні са светам і робяць іх больш здольнымі да супрацоўніцтва для паляпшэння свету.

Даныя нейранавукі паказваюць, што веданне і пачуццё з'яўляюцца часткай адных і тых жа кагнітыўных працэсаў, якія адбываюцца не ў асобнай ізаляцыі, а ў непасрэдных шырокіх адносінах з іншымі людзьмі. У апошнім дзесяцігоддзі была зроблена велізарная адукацыйная праца, у прыватнасці, каб прывесці сацыяльна-эмацыйнае навучанне ў асноўнае рэчышча адукацыйнай практыкі ў некаторых частках свету. Найлепшыя падыходы да сацыяльна-эмацыйнага навучання ахопліваюць сацыяльную, эмацыйную, кагнітыўную і этычную сферы ідэнтычнасці вучняў. Яны звязваюць траекторыі развіцця асобаў з іх больш шырокай значнасцю для грамадскага адзінства. Навучанне эмпатыі, супрацоўніцтву, ліквідацыя забабонаў і перадузятасці, а таксама вырашэнне канфліктаў высока цэняцца ў кожным грамадстве, асабліва ў грамадствах, якія змагаюцца з даўнімі падзеламі.

> Навучанне эмпатыі, супрацоўніцтву, ліквідацыя забабонаў і перадузятасці, а таксама вырашэнне канфліктаў высока цэняцца ў кожным грамадстве.

Практыкі сацыяльна-эмацыйнага навучання неаднастайныя і патрабуюць належнай кантэкстуалізацыі. Для іх неабходныя свядома запланаваны досвед навучання, добрая сувязь з настаўнікамі, станоўчы досвед зносін з аднагодкамі, узаемапаразуменне паміж пакаленнямі і ўдзел у супольнасці.

Уважлівасць, спачуванне і крытычны пошук – усё гэта падтрымлівае эфектыўнае сацыяльна-эмацыйнае навучанне. Трэба, аднак, прызнаць, што такое навучанне ставіць дадатковыя патрабаванні да настаўнікаў і што яны патрабуюць падтрымкі, каб выконваць гэту працу. Разглядаючы перыяд да 2050 года, мы не можам сабе дазволіць недастатковых інвестыцый у сацыяльна-эмацыйнае навучанне, якое ёсць падмуркам для творчасці, маральнасці, меркаванняў і дзеянняў людзей па вырашэнні будучых праблем.

Абыходжанне з вучнямі як з паўнавартаснымі людзьмі ўключае прызнанне іх фізічных патрэбаў і магчымасцяў на ўсіх этапах жыцця. Здаровая будучыня патрабуе якаснага фізічнага выхавання, якое спрыяе развіццю асноўных рухальных навыкаў і ахоплівае ўсе віды фізічных магчымасцяў, гендарнай прыналежнасці і паходжання. Якаснае фізічнае выхаванне можа значна павысіць перакананасць, упэўненасць у сваіх сілах, каардынацыю і кантроль, здольнасць да каманднай працы, спагадлівасць да патрабаванняў уласнага фізічнага асяроддзя і паляпшае вербальную і невербальную камунікацыю. Фізічнае выхаванне не павінна разглядацца выключна як пагоня за найбольшымі фізічнымі здольнасцямі, а празмерная залежнасць ад спаборніцтваў і параўнанняў з іншымі можа выключыць удзел больш шырокага кола вучняў. Каштоўнасць, на якой яно павінна грунтавацца, зводзіцца да таго, што кожны навучэнец можа прытрымлівацца здаровага і актыўнага ладу жыцця, і што развіццё эмпатычных і паважлівых адносін праз сумесную дзейнасць можа дапамагчы навучанню сумесным дзеянням на працягу жыцця.

Такім жа чынам, прымаючы цэласны адукацыйны падыход да сексуальнасці чалавека з улікам узросту і культуры, мы прызнаем важнасць сацыяльнай і эмацыйнай граматнасці, прасоўваем абмеркаванне пытанняў павагі і згоды, ствараем разуменне фізічных і эмацыйных працэсаў у перыяд фізічнай сталасці, а таксама спрыяем паважлівым адносінам і роўнасці. Цяжка ўявіць будучыню, у якой дзяўчынкі ў многіх частках свету па-ранейшаму выключаюцца, таму што існуе магчымасць шкоды для іх фізічнага ці сексуальнага здароўя; і гэта рэальнасць, з якой шмат дзе сутыкаюцца асабліва дзяўчынкі-падлеткі, што перашкаджае іх далейшаму навучанню ў сярэдняй школе. Здароўе, смяротнасць і дабрабыт маці і дзяцей цесна звязаныя з комплексным сексуальным выхаваннем. Разам з больш шырокімі падыходамі да здароўя і дабрабыту адукацыя, якая грунтуецца на каштоўнасцях роўнасці, павагі і ўпэўненасці ў сваіх сілах, ператвараецца ў пашыраныя магчымасці для справядлівых і раўнапраўных адносін паміж людзьмі ва ўсіх грамадствах.

## Пашырэнне відаў граматнасці і стварэнне шматмоўнай будучыні

Нашы моўныя здольнасці і адносіны да мовы займаюць цэнтральнае месца ў ідэнтычнасці, ведах чалавека і яго існаванні ў свеце; яны забяспечваюць нашы зносіны і дазваляюць нам абапірацца на тое, чаму ўжо навучыліся іншыя, каб дасягаць новых вышынь разумення. Мова ёсць падмурак агульнага здабывання ведаў. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў адукацыя рабіла кожнае пакаленне больш здольным да чытання і пісьма, чым папярэдняе пакаленне. Аднак, каб пашырыць удзел і інклюзію, у будучыні граматнасць павінна

выйсці за рамкі чытання і пісьма і павысіць магчымасць разумення і выражэння ва ўсіх іх формах – вуснай, тэкстуальнай, а таксама праз пашырэнне разнастайнасці сродкаў, уключаючы аповед і мастацтва.

Зразумела, што пісьмо і маўленне не адзіныя спосабы, якімі людзі запісвалі свой досвед і перадавалі яго новым пакаленням, таму трэба больш рашуча ўводзіць у навучальную праграму вобразы і цялесныя веды. Пры гэтым вусныя і пісьмовыя веды адыгралі бясспрэчную ролю ў гісторыі чалавецтва: у прыватнасці, пісьмо як тэхналогія чалавечых ведаў забяспечыла цыркуляцыю і перамяшчэнне надпісаў, пашыраючы магчымасці назапашваць і кадыфікаваць досвед людзей у мностве розных культур. Гэтыя веды трэба захаваць для будучых пакаленняў.

Граматнасць наўпрост звязана з магчымасцямі будучага навучання і грамадскага ўдзелу. Але гэта не выключальнік “укл-выкл”, і нашы здольнасці да камунікацыі і разумення праз мову могуць умацоўвацца бесперапынна на працягу жыцця. У будучым адукацыя ў галіне граматнасці можа развіваць магчымасці чытаць глыбока, шырока і крытычна, дакладна і эфектыўна камунікаваць праз маўленне і пісьмо, а таксама слухаць з увагай, эмпатыяй і праніклівасцю. Напрыклад, выхаванне ў вучняў здольнасцей і схільнасцей да самастойнага чытання і пошуку складаных тэкстаў ва ўсіх дысцыплінах адчыняе дзверы ў шмат шырэйшы дыяпазон магчымых варыянтаў будучыні дзякуючы больш адпаведнаму абмену з агульным здабыткам ведаў. Адукацыя ў галіне граматнасці можа выходзіць за рамкі класаў і школ і ператварацца ў абавязак усяго грамадства. Напрыклад, нядаўнія высілкі некаторых індыйскіх медыйных сетак зрабіць размяшчэнне субтытраў на адной мове стандартнай практыкай сведчаць аб больш шырокім умацаванні навыкаў чытання, асабліва сярод тых, хто вучыў азы чытання і пісьма ў школе, але патрабуе большай практыкі і ўпэўненасці ў сваіх сілах.

Навучальныя праграмы дэманструюць пераход ад нацыянальнага аднамоўя да шматмоўя, акрамя іншага, праз выкладанне замежных моў, моў карэнных народаў і моў жэстаў. Гэты пераход патрабуе падтрымкі і пашырэння. Таксама важна, каб навучэнцы-дзеці, моладзь і дарослыя мелі доступ да варыянтаў адукацыі найвышэйшай якасці на сваёй роднай мове і на мове сваіх продкаў. Гэта інтуітыўна зразумела ў адносінах да выкладання і навучання, аднак гэта таксама важна ў сэнсе асноў павагі і арыентацыі сістэм адукацыі ва ўсім свеце на шанаванне і падтрыманне разнастайнасці. У шмат якіх умовах двухмоўная і шматмоўная адукацыйная палітыка неабходна для падтрымкі культурнай ідэнтычнасці навучэнцаў і забеспячэння іх поўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Гэта цягне за сабой падтрымку моў карэнных меншасцей, а таксама стварэнне базы для асваення вучнямі дамінуючай мовы ці мовы большасці.

> Моўная разнастайнасць ёсць ключавая асаблівасць агульнага здабытку ведаў; адукацыя мае адыграць ключавую ролю ў яе падтрымцы.

Шматмоўная адукацыя стварае дадатковыя магчымасці для ўдзелу ў глабальным дыялогу, працы і культурнай дзейнасці. У свеце, які становіцца ўсё больш узаемазалежным, існуе відавочная каштоўнасць вывучэння розных моў, і іх індывідуальныя і

калектыўныя перавагі не абмяжоўваюцца зносінамі. Шматмоўе абавязвае ўсіх нас стаць актыўнымі перакладчыкамі паміж рознымі знакавымі сістэмамі і развівае большую аўтаномію і крытычнае стаўленне да ўстаноўленых шаблонных значэнняў. Мова – гэта больш чым сродак камунікацыі; мовы нясуць погляды на свет і ўнікальныя шляхі да разумення. Моўная разнастайнасць ёсць ключавая асаблівасць агульнага здабытку ведаў; адукацыя павінна адыграць ключавую ролю ў яе падтрымцы.

## Узбагачэнне матэматычнай граматнасці

Матэматычная граматнасць мае не меншае значэнне для будучыні адукацыі, бо людзям усё часцей прыходзіцца ўжываць свае матэматычныя веды і навыкі ў шырокім шэрагу сітуацый. Матэматычная граматнасць – гэта плён здольнасці людзей назіраць заканамернасці, класіфікаваць і групаваць, лічыць і вымяраць, супастаўляць колькасці і вызначаць адносіны паміж імі. Такія сістэмы лічэння, як дзесятковая і бінарная, складаюць падмурак сучасных камунікацый, аперацый, вылічэнняў і разлікаў. Акрамя авалодання базавымі аперацыямі – складаннем, адніманнем, памнажэннем і дзяленнем, матэматычная граматнасць патрабуе іх прымянення адносна шэрагу разнастайных кантэкстаў і праблем. Існуе бясконцая колькасць прыкладаў прымянення матэматычнай граматнасці, у тым ліку забеспячэнне ўласнай фінансавай стабільнасці і планаванне фінансаў, пагрозы для здароўя і выпадкі захворванняў, ураджайнасць і выдаткі ў сельскай гаспадарцы, парогавыя велічыні забруджвання і якасць навакольнага асяроддзя, мясцовыя прадпрыемствы і банкаўскія паслугі для супольнасцей і г. д. Калі яе разглядаць у кантэксце, матэматычная граматнасць шырока раскрывае нашы чалавечыя магчымасці разумець змены, якія адбываюцца на працягу часу, рабіць прагнозы і планы на будучыню, разумець узаемасувязі і разглядаць тэндэнцыі ў значнай перспектыве.

Матэматычная граматнасць належыць усім людзям, і навучальныя праграмы па матэматычнай граматнасці, якія ўлічваюць культурныя асаблівасці, могуць будаваць значныя сацыяльна-эмацыйныя масты з фармальнай адукацыяй. Напрыклад, традыцыйнае пляценне першых насельнікаў арктычнай Нарвегіі выкарыстоўваецца для пераходу ад разумення вучнямі асобных мадэляў цэлых лікаў да такіх складаных аперацый, як памнажэнне і алгебраічныя зменныя. Падобным чынам школьныя рады ў Канадзе звяртаюцца да мастакоў і настаўнікаў з карэннага насельніцтва для выяўлення сувязяў паміж такімі формамі мастацтва, як бісерапляценне, выраб кошыкаў і макасінаў, з матэматычнымі канцэпцыямі, у тым ліку алгебраічным і прапарцыйным абгрунтаваннем і пражторавым мысленнем. Звязванне матэматычных ведаў з культурнымі ведамі вучняў дазваляе абапірацца на сацыяльна-эмацыйныя вымярэнні для пераадолення разрыву паміж хатнім і школьным асяроддзем. Гэта таксама аспрэчвае памылковае ўяўленне, што матэматыка з'яўляецца "заходняй", і нагадвае нам аб шырокім і даўнім існаванні такіх этнаматэматычных сістэмаў, як матэматыка інуітаў, матэматыка маоры і г. д.

## Апора на гуманітарныя навукі

Веды і даследаванні адносна грамадства і культуры людзей вельмі важныя ў дапамозе вучням асвоіць шырокі спектр падыходаў да праблем, з якімі яны сутыкаюцца. Гуманістычная традыцыя ў яе розных формах зрабіла каштоўны ўнёсак у агульны сусветны здабытак ведаў у найважнейшых аспектах нашага калектыўнага будаўніцтва свету. У той жа час мы павінны прызнаць, што тое, што мы ведаем, з'яўляецца частковым і скажоным. Перагляд таго, што азначае быць чалавекам, патрабуе змянення балансу ў нашых адносінах паміж сабой, з жывой планетай і тэхналогіямі. Гуманітарныя навукі павінны прыстасоўвацца і як сістэмнае поле даследаванняў могуць у сваю чаргу дапамагчы прыстасавацца і нам.

Напрыклад, пры эфектыўным выкладанні гісторыя можа стварыць каштоўны пункт гледжання на сацыяльныя змены і сацыяльныя сістэмы, у тым ліку на дыскрымінацыю і прывілеі. Разуменне гістарычнай выпадковасці, таго, што рэчы маглі б быць не такімі, якімі яны ёсць зараз, мае вялікае значэнне для прагназавання будучых магчымасцяў. Аднак, каб раскрыць гэты патэнцыял, гісторыя павінна выйсці далёка за рамкі захаплення храналогіяй і засяродзіцца на абмеркаванні таго, што з'яўляецца сведчаннем, і як мы ў першую чаргу павінны разумець досвед людзей і не толькі людзей.

Пошук новых спосабаў звязаць і аднавіць сувязі паміж адукацыяй і гуманітарнымі навукамі таксама мае каласальнае значэнне для будучыні дэмакратыі. Філасофія, гісторыя, літаратура і мастацтва могуць звязаць нас з мэтай, ацэнкай крытычнага пошуку, эмпатыяй, этыкай і ўяўленнем. Усе гэтыя гуманістычныя падыходы таксама маюць істотнае значэнне для ўмацавання граматнага стаўлення вучняў да будучыні – іх здольнасці разумець ролю будучыні ў тым, што яны бачаць і робяць. Стаць "граматным адносна будучыні" азначае ўмець больш эфектыўна і вынікова дзейнічаць у будучыні, каб лепш рыхтавацца, аднаўляцца і вынаходзіць рашэнні, калі ўзнікаюць змены. Гэта таксама будзе падтрымлівацца ўмацаваннем ролі гуманітарных навук у грамадскай прасторы як у фармальнай адукацыі, так і за яе межамі. Найважнейшай задачай з'яўляецца калектыўнае аднаўленне сувязяў паміж адукацыяй і гуманітарнымі навукамі з пункту гледжання нашага агульнага чалавецтва, нашай агульнай планеты і нашага калектыўнага імкнення да справядлівасці.

## Навуковы пошук і разуменне

Жаданне разумець фізічны сусвет адлюстроўвае нашу чалавечую здольнасць да пошуку і навучання. Прырода навуковага пошуку – назіраць, ставіць пытанні, прагназаваць, рабіць іспыты, тэарэтызаваць, аспрэчваць і ўдасканальваць разуменне – ёсць эманацыя чалавечага духу. Карані сучаснай навукі ўзыходзяць да найранейшых этапаў пісьмовай гісторыі ў кожнай культуры і грамадстве. Мы карыстаемся яе плёнам ва ўсіх сферах нашага фізічнага і матэрыяльнага жыцця, ад медыцыны да тэхналогій. У рамках шырокай навучальнай праграмы, якая мае моцныя гуманістычныя каштоўнасці і ахоплівае цэльную асобу, асаблівая ўвага павінна быць нададзена навуковай граматнасці і навуковым даследаванням.

У гісторыі чалавецтва навука як істотная праца з ведамі нясе фундаментальную карысць: уяўленне, што ісціна ёсць вынік працэдур і пагадненняў, зробленых калектыўнымі намаганнямі. Аднак яна вырасла ў спецыяльную сферу, якая часам, як здаецца, ставілася вышэй за этычныя пытанні, напрыклад, аб наступствах навуковых адкрыццяў ці эксперыментаў. Гэта выклікала дэбаты і сумненні, якія падрывалі давер да навукі, што існаваў стагоддзямі. Навуковыя метады, высновы і этыка павінны ўлічвацца ў навучальных праграмах ва ўзаемасувязі.

Пашырэнне крайняга рэлятывізму і шырокае распаўсюджванне ілжы ў розных сродках інфармацыі патрабуюць моцнай і вельмі ўдумлівай навуковай граматнасці. Навуковая граматнасць нечакана стала ў цэнтры ўвагі з распаўсюджваннем дэзінфармацыі і фэйкавых навін, асабліва падчас такіх сур'ёзных крызісаў, як пандэмія каранавірусу і глабальнае пацяпленне. Адмаўленне навуковых ведаў і скажэнне "фактаў" прывялі да рэальных наступстваў, выклікалі падазронасць, недавер, страх і нянавісць. Навучальныя праграмы павінны спрыяць захаванню навуковай ісціны і ствараць магчымасці для праніклівага асэнсавання і шчырага пошуку складанай і неадназначнай ісціны.

Навучальныя праграмы павінны спрыяць захаванню навуковай ісціны і ствараць магчымасці для праніклівага асэнсавання і шчырага пошуку складанай і неадназначнай ісціны.

Глабальны агульны здабытак ведаў патрабуе роўных для ўсіх правоў на дакладныя веды, якія спрыяюць дабрабыту людзей. Гэты прынцып мае асаблівае значэнне для навучальных праграм, дзе пасланні і канцэпцыі маюць значны ўплыў на розум, які развіваецца. Напрыклад, у некаторых рэгіёнах ці краінах з буйной горнай і нафтавай галінамі прамысловасці ўрады знаходзяцца пад значным ціскам, каб яны надавалі менш увагі экалагічным наступствам здабычы карысных выкапняў у афіцыйных навучальных праграмах па прыродазнаўчых дысцыплінах. Вельмі важна змагацца з такой дэзінфармацыяй усімі магчымымі адукацыйнымі сродкамі. Патрабуюцца аднаўленыя намаганні, каб пашыраць навуковую граматнасць у свеце, асабліва сярод пазбаўленых правоў і маргіналізаваных груп насельніцтва. Беспрэцэдэнтная колькасць інфармацыі цыркулюе ў сучасным свеце. Навуковая граматнасць, метадычнасць, строгія эмпірычныя падыходы і этыка – усё гэта важныя і неадкладныя пытанні навучальных праграм.

## Навыкі для лічбавага свету

Злучаныя між сабой тэхналогіі ляжаць у аснове нашага ўдзелу ў сферах жыцця, навучання і працы, якія пастаянна пашыраюцца. Акрамя падтрымкі ўсеагульнага доступу да тэхналогій, сістэмы адукацыі абгрунтавана імкнуцца развіваць лічбавыя навыкі і кампетэнцыі, патрэбныя навучэнцам, каб асэнсавана выкарыстоўваць тэхналогіі. Гэтыя здольнасці не "прыроджаныя" і не "прыродныя". Яны будуюцца і ўдасканальваюцца з часам праз мэтанакіраваныя адукацыйныя меры і розныя формы нефармальнага і самастойнага навучання.

У той час як лічбавая адукацыя звычайна засяроджваецца на функцыянальных навыках і тэхнічных ноў-хаў, яна таксама павінна ахопліваць “крытычна неабходную лічбавую граматнасць” – комплекс усведамленняў і адносінаў да палітыкі лічбавага грамадства і лічбавай эканомікі. Гэта адукацыя вылучае на першы план здольнасць вучняў да аналізу палітычных асаблівасцяў лічбавых тэхналогій і маніпуляцыі імі для дасягнення пэўных вынікаў. Навучэнцы павінны распазнаваць матывацыю дзеючых бакоў у лічбавых прасторах і бачыць, што робіць іх асабіста і як членаў груп часткай больш вялікіх лічбавых экасістэм. Сёння злучаныя тэхналогіі могуць глыбока ўздзейнічаць нават на людзей, якія ніколі не карыстаюцца імі або ніколі не бачаць іх.

> Навучальныя планы павінны падтрымліваць сумесныя дзеянні настаўнікаў і вучняў датычна тэхналогій, іх удзел у вызначэнні таго, як тэхналогіі выкарыстоўваюцца і ў якіх мэтах.

Адукацыя адносна тэхналогій таксама абавязкова абапіраецца на самі тэхналогіі. Наборы навыкаў і крытычны погляд, неабходныя для разумення тэхналогій і канчатковага авалодвання імі, таксама будуць нязменна рухацца наперад, змяняючыся ў адпаведнасці з тэмпамі тэхналагічнага прагрэсу. Аднак гэта не азначае, што адукацыя павінна стаць вуліцай з аднабаковым рухам у адпаведнасці з апошнімі тэхналагічнымі дасягненнямі. Адукацыя таксама павінна адыгрываць ролю ў кіраўніцтве тэхналагічнымі інавацыямі і лічбавай трансфармацыяй грамадстваў. Навучальныя праграмы павінны падтрымліваць сумесныя дзеянні настаўнікаў і вучняў датычна тэхналогій, іх удзел у вызначэнні таго, як тэхналогіі выкарыстоўваюцца і ў якіх мэтах.

## Развіццё фантазіі, меркаванняў і магчымасцяў праз мастацкую адукацыю

Адукацыя ў мастацтве – музыцы, тэатры, танцы, дызайне, выяўленчым мастацтве, літаратуры, паэзіі і іншых галінах мастацтва – можа значна пашырыць здольнасць вучняў да асвойвання складаных навук; адукацыя таксама можа падтрымаць сацыяльна-эмацыйнае навучанне на ўсёй працягласці навучальнай праграмы. Гэта можа палепшыць нашы чалавечыя здольнасці атрымаць доступ да вопыту іншых праз эмпатыю ці прачытванне невербальных падказак.

Мастацтва таксама можа выявіць пэўныя ісціны, якія падчас нябачныя, і прапанаваць канкрэтныя шляхі для ўжывання множных перспектыў і інтэрпрэтацый свету. Шматлікія формы мастацкага выяўлення звяртаюцца да тонкасцяў і супярэчнасцяў жыцця, даводзячы вучням, што маленькая розніца можа мець вялікія наступствы. Мастацкі досвед часта патрабуе гатоўнасці паддацца невядомаму, даводзячы вучням, што ўсё змяняецца разам з абставінамі і магчымасцямі. Мастацтва таксама дапамагае нам навучыцца казаць, паказваць і адчуваць тое, што мае быць сказана, паказана і адчута, дапамагаючы рухаць наперад гарызонты ведаў, быцця і камунікацыі ў мастацтве і па-за мастацтвам.

Навучальныя праграмы, якія заклікаюць да творчага самавыяўлення праз мастацтва, маюць велізарны патэнцыял для фарміравання будучыні. Заняткі мастацтвам даюць новыя

мовы і сродкі для асэнсавання свету, крытычнага аналізу культурных з'яў і палітычных дзеянняў. Навучальныя праграмы таксама могуць выхоўваць крытычнае асэнсаванне і ўзаемадзеянне з культурнай спадчынай і магутнымі сімваламі, рэпертуарамі і спасылкамі на нашу калектыўную ідэнтычнасць.

## Выхаванне ў галіне правоў чалавека, актыўнага грамадзянства і ўдзелу ў дэмакратычных працэсах

Пры дасягненні поўнага патэнцыялу адукацыя ў галіне правоў чалавека можа быць трансфармацыйнай, пры гэтым прапануючы агульную мову і кропку ўваходу ў маральны сусвет, прыхільны прызнанню і поспяховасці ўсіх. Адукацыя ў галіне правоў чалавека можа падтрымліваць суб'ектнасць навучэнцаў. Развіццё навыкаў аналізу няроўнасці і выхавання крытычнай свядомасці – шлях да падтрымкі сумеснага ўдзелу, і ў гэтым плане адукацыя ў галіне правоў чалавека моцна падтрымлівае выхаванне грамадзян.

Адукацыя ў галіне правоў чалавека можа таксама паляпшаць агульную эфектыўнасць нацыянальных сістэм адукацыі і, у сваю чаргу, падтрымліваць устойлівае і справядлівае эканамічнае, сацыяльнае і палітычнае развіццё. Праз навучанне аб асноўных правах, годнасці і свабодзе ўсіх людзей адукацыя сама павінна зрабіцца месцам для выканання абяцання роўнасці. Адукацыя ў галіне правоў чалавека і выхаванне грамадзянства маюць глыбокую сувязь з адукацыяй у галіне будаўніцтва міру. У шматлікіх сітуацыях гвалт ёсць асноўны спосаб адносін паміж людзьмі; цэлыя групы насельніцтва, у тым ліку жанчыны і дзеці, церпяць ад дыскрымінацыі, славеснай і фізічнай абразы, і бачаць, як жорстка скарачаюцца іх магчымасці жыць і развівацца. Разам з абарончым заканадаўствам і дабрачыннымі агенцтвамі адукацыя ў галіне правоў чалавека можа спрыяць будаўніцтву мірных грамадстваў, якія ў стане вырашаць рознагалоссі праз перамовы і дыпламатыю.

Адукацыя будуе патэнцыял для ўстойлівых грамадзянскіх, сацыяльных і палітычных дзеянняў, навучаючы людзей, як трэба сумесна абмяркоўваць і аналізаваць сваю працу ў агульных рамках. Міжасабовая і калектыўная суб'ектнасці атрымліваюць моцную падтрымку, калі навучальныя праграмы засяроджваюцца на будаўніцтве кааліцый і стварэнні сувязей з больш шырокай гісторыяй і шляхамі актывізму і салідарнасці. Адукацыя падтрымлівае стратэгічныя і трансфармацыйныя дзеянні, калі яна арыентуецца на выхаванне доўгатэрміновага мыслення, дыялогу і дыскусіі, якія маюць месца ў публічнай прасторы. Адукацыя ў галіне правоў чалавека таксама павінна прасоўваць дэбаты і абмеркаванне дылем датычна таго, што азначае быць чалавекам, і яна павінна вывучаць этычныя пытанні адносна захавання розных формаў жыцця на планеце.

Яна таксама павінна імкнуцца да забеспячэння навыкаў і магчымасцяў, неабходных для крытычнага і крэатыўнага палітычнага мыслення і адвакацыі, маніторынгу выпадкаў несправядлівасці і парушэнняў правоў чалавека; яна таксама павінна ставіць пытанні, выкрываць і супрацьстаяць сілавым структурам і сувязям, якія дыскрымінуюць групы насельніцтва ў сувязі з іх гендарам, расай, прыналежнасцю да карэннага насельніцтва, мовай,

рэлігіяй, узростам, інваліднасцю, сексуальнай арыентацыяй ці статусам грамадзянства. Таму дыялог паміж сістэмамі адукацыі і сацыяльнымі рухамі з'яўляецца асноватворным.

Навучальныя праграмы таксама павінны адыграць сваю ролю ў вырашэнні праблемы гендарнай няроўнасці. Распаўсюджаныя наступствы патрыярхату – ідэалагічнай сістэмы, згодна з якой мужчыны атрымліваюць большасць сацыяльных правоў і правамоцтваў – папранейшаму ляжаць у аснове пасланняў і складу мыслення, якія перадаюцца дзецям і моладзі ў грамадстве і ў школе. Прыгнятальніцкія гендарныя ролі і гендарная дыскрымінацыя шкодныя для ўсіх у грамадстве. Асноўныя прынцыпы роўнасці павінны вывучацца ў маладым узросце. Хлапчукі павінны як мага раней навучыцца адстойваць гендарную роўнасць і не працягваць хатнія ці сацыяльныя сістэмы адносінаў, якія грунтуюцца на няроўнасці і могуць даваць ім адмысловую перавагу над іх сёстрамі ці дзяўчынкамі-аднагодкамі. Чаканне таго, што дочкі і сёстры будуць несці большую частку хатніх абавязкаў і клопатаў, негатыўна ўплывае на ўдзел у школьным жыцці, таксама як і невідавочныя ідэі аб іх каштоўнасці і вартасці як падпарадкаваных іншым людзям. Прынцыпы гендарнай роўнасці павінны быць паслядоўнымі ва ўсіх асяроддзях, дзе сацыялізуюцца і вучацца дзеці: дома, у класе, на школьным двары і ў супольнасці. Прасоўванне роўнасці – гэта калектыўная справа, якая вымагае падтрымкі з боку ўсіх людзей.

У тым жа ключы навучальныя праграмы павінны звяртацца да вырашэння праблемы расізму і імкнуцца аспрэчыць стэрэатыпныя і дыскрымінацыйныя ўяўленні і наратывы аб групах насельніцтва рознага культурнага і моўнага паходжання, якія суіснуюць у нашых грамадствах, такіх як карэнныя народы, супольнасці нашчадкаў выхадцаў з Афрыкі і этнічныя меншасці.

## Роля вышэйшай адукацыі ў пашырэнні магчымасцяў

Новы сацыяльны кантракт на адукацыю будзе патрабаваць пераасэнсавання не толькі тых шляхоў, якімі адукацыя чэрпае з агульнага здабытку ведаў, але і шляхоў, якімі яна падтрымлівае свой далейшы рост і больш шырокую інклюзіўнасць. Нідзе гэта не прыкметна так, як у вышэйшай адукацыі, якая мае адыграць ключавую ролю ва ўмацаванні агульнага здабытку ведаў. Вышэйшая адукацыя цяпер перажывае адзін з найвялікшых часоў нявызначанасці ў сваёй доўгай гісторыі. Універсітэты змяшчаюць значную частку сусветнага патэнцыялу для стварэння ведаў і даследаванняў. Адкрытая навука і адкрыты доступ знаходзяць у ВНУ гатовага саюзніка, які прысвячае свае высілкі прасоўванню даследаванняў, інавацый і пошукаў разам з адукацыяй будучых пакаленняў даследчыкаў і спецыялістаў.

### Універсітэцкія даследаванні для адкрытага агульнага здабытку ведаў

Розныя віды ведаў павінны прызнавацца актывамі, якія трэба развіваць і выкарыстоўваць для сумеснага дабрабыту ўсіх людзей. Трэба змагацца з сучасным усярэдніваннем і

няроўным размеркаваннем ведаў паміж рэгіёнамі. Замест таго, каб ствараць веды, абмежаваныя нашымі сучаснымі эканамічнымі, палітычнымі і сацыяльнымі нормамі, універсітэцкія даследаванні павінны аддаваць перавагу новым магчымасцям. Гэта пачынаецца з прызнання таго, што існуюць множныя формы ведаў, а таксама з большага выкарыстання розных моў. Такім чынам, універсітэты могуць зрабіць істотны ўнёсак у пашырэнне агульнага здабытку ведаў і забеспячэнне яго інклюзіўнасці і разнастайнасці.

Міжуніверсітэцкае супрацоўніцтва і намаганні па інтэрнацыяналізацыі з’яўляюцца прыкладамі адкрытасці, якія маюць вялікія перспектывы для далейшага нашага агульнага глабальнага дабрабыту. Усе прагнозы паказваюць на бесперапынны рост колькасці абітурыентаў вышэйшай адукацыі ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі. Многія ўніверсітэты маюць высакародную традыцыю падтрымкі публічнасці адукацыі, ствараючы публічныя прасторы для навучання; яны спагадліва ставяцца да патрабаванняў грамадства, падсправаздачныя грамадству аб сваім кіраўніцтве і спрыяюць інтарэсам грамадства. Аднак універсітэты – гэта таксама месцы, дзе праз цэнавыя бар’еры і прэтэнзіі на інтэлектуальную маёмасць ствараецца шмат закрытых прастораў, асабліва ў апошнія дзесяцігоддзі. Нягледзячы на шматлікія спробы зрабіць адваротнае, сістэмы вышэйшай адукацыі захоўваюцца як лакацыі, якія выключаюць і маргіналізуюць. Гэтае пытанне трэба неадкладна вырашаць.

> Вышэйшая адукацыя павінна жорстка адстойваць бясплатны і адкрыты доступ да ведаў і навукі.

Вышэйшая адукацыя павінна жорстка адстойваць бясплатны і адкрыты доступ да ведаў і навукі, калі справа даходзіць, акрамя іншага, да акадэмічных стыпендый, навучальных матэрыялаў, праграмнага забеспячэння і лічбавай сувязі. Важна, што паняцце “адкрыты” датычыцца не толькі даступнасці і прастаты доступу, але таксама маецца на ўвазе, што асобныя людзі могуць змяняць інфармацыю і веды і маніпуляваць імі.

## Прафесійна-тэхнічная вышэйшая адукацыя і агульны здабытак ведаў

Прафесійна-тэхнічныя ўстановы, вышэйшыя за ўзровень сярэдняй адукацыі, у тым ліку грамадскія каледжы, політэхнічныя школы, павінны разглядацца не толькі як навучальныя ўстановы, але як месцы, дзе праводзяцца прыкладныя даследаванні. Яны павінны асобна вызначаць значэнне прадукцыйных здольнасцей у нашым асабістым і калектыўным жыцці, эфектыўнае функцыянаванне адукацыйных суполак, шматлікіх шляхоў да змястоўнай працы і патэнцыял для інтэграцыі, партнёрства і кааперацыі паміж рознымі сектарамі і супольнасцямі. Мясцовы характар многіх шчыльна звязаных з супольнасцямі прафесійна-тэхнічных устаноў дае магчымасць для прасоўвання паспяховых мясцовых культур навучання. Мясцовыя супольнасці маюць выразныя сувязі з агульным здабыткам ведаў, і прафесійна-тэхнічныя ўстановы могуць саўдзельнічаць у распрацоўцы ідэй аб іх прымяненні адметнымі, кантэкстуальна значнымі шляхамі.

## Вышэйшая адукацыя павінна падтрымліваць разнастайныя падыходы да ведаў

Узаемаадносіны паміж вышэйшай адукацыяй і міжкультурнай, эпістэмнай разнастайнасцю часта былі неадназначнымі. З аднаго боку, вышэйшая адукацыя ганарыцца прылучэннем студэнтаў да новых светапоглядаў і ідэй. Аднак у той жа самы час вышэйшая адукацыя распрацавала адметныя шляхі арганізацыі, абгрунтавання і легітымізацыі пэўных формаў стварэння ведаў.

Метады прыродазнаўчых навук і канцэпцыі сацыяльных даследаванняў, такія як “строгасць”, “надзейнасць” і “абгрунтаванасць”, не з’яўляюцца культурна нейтральнымі. Сацыяльныя працэсы, забеспячэнне якасці і эканамічныя чыннікі навуковага друку, як правіла, не забяспечваюць міжкультурную і эпістэмную разнастайнасць. Традыцыйныя карэнныя веды і спосабы стварэння і абмену ведамі, як правіла, лічацца аб’ектам, а не формай даследаванняў.

Па меры таго, як пашыраецца мноства шляхоў да ведаў і дзеянняў, экасістэмы ведаў, якія чэрпаюць з багацця культур і досведаў, павінны набываць большую каштоўнасць. Партнёрскія сувязі паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і супольнасцямі ва ўсіх частках свету павінны рабіцца сапраўды ўзаемнымі. Уяўленне аб множных шляхах да ведаў і дзеянняў як аб крыніцы сілы і ўстойлівасці дапаможа нам паменшыць некаторыя асіметрыі ў самім сектары вышэйшай адукацыі.

Разнастайнасць таксама можа падтрымлівацца належнай ацэнкай інстытуцыйнай варыятыўнасці ў сферы вышэйшай адукацыі. Калі доступ да вышэйшай адукацыі працягне пашырацца, як і павінна быць, нам спатрэбіцца шэраг іншых устаноў. Адкрытасць агульнага здабытку ведаў таксама патрабуе гнуткіх структур вышэйшай адукацыі, якія дазваляюць атрымаць доступ як мага большай колькасці людзей.

## Прынцыпы дыялогу і дзеянняў

У гэтым раздзеле прапануецца, каб у навучальных планах, згодна з новым сацыяльным кантрактам на адукацыю, падкрэслівалася экалагічнае, міжкультурнае і міждысцыплінарнае навучанне, якое садзейнічае доступу студэнтаў да ведаў і іх магчымасці ствараць веды, развіваючы іх здольнасць да крытычнага аналізу і прымянення яго вынікаў. Разглядаючы перыяд да 2050 года, можна вызначыць чатыры прынцыпы, якія могуць дапамагчы накіраваць дыялог і дзеянні, неабходныя для рэалізацыі гэтай рэкамендацыі.

- **Навучальныя праграмы павінны павялічваць магчымасці вучняў атрымліваць доступ да агульнага здабытку ведаў і рабіць свой унёсак у яго**. Назапашаныя пакаленнямі калектыўныя рэсурсы ведаў чалавецтва павінны фарміраваць аснову навучальных праграм. Агульны здабытак ведаў павінен быць лёгкадаступным для карыстання і дапаўненняў. Мы павінны навучыць вучняў (усіх узростаў) крэатыўна і крытычна ўзаемадзейнічаць з ведамі, аспрэчваючы дапушчэнні і інтарэсы. Адукацыя павінна надзяляць людзей магчымасцямі для выпраўлення пропускаў і выключэнняў у агульным здабытку ведаў і забяспечыць, каб гэта быў трывалы, адкрыты рэсурс, які адлюстроўвае разнастайнасць шляхоў да ведання і існавання ў свеце.

- **Экалагічны крызіс патрабуе навучальных праграм, якія фундаментальна пераарыентуюць разуменне месца людзей у свеце**. Трэба вызначыць прыярытэт эфектыўнай і значнай адукацыі ў галіне змянення клімату. На працягу ўсёй навучальнай праграмы мы павінны выкладаць мастацтва жыцця з павагай і адказнасцю на планеце, пашкоджанай праз дзейнасць чалавека.

- **Распаўсюджванню дэзынфармацыі трэба супрацьстаяць праз навуковую, лічбавую і гуманістычную граматнасць**. У навучальных праграмах трэба падкрэсліваць навуковы пошук і здольнасць адрозніваць строгія даследаванні ад хлусні. Мы павінны развіваць лічбавыя навыкі, якія надзяляюць навучэнцаў магчымасцю змястоўна выкарыстоўваць тэхналогіі. Навучальныя праграмы павінны таксама забяспечыць вучням магчымасць “абапірацца” на навукі і тэхналогіі, дапамагаючы вызначыць, як яны выкарыстоўваюцца і ў якіх мэтах.

- **Правы чалавека і ўдзел у дэмакратычных працэсах павінны стаць ключавымі “цаглінамі” навучання, якое змяняе людзей і свет**. Мы павінны надаць прыярытэт адукацыі ў галіне правоў чалавека, якая падтрымлівае суб’ектнасць вучняў і прапануе кропку ўваходу ў маральны сусвет, прыхільны да прызнання і поспеху для ўсіх. Да пытанняў гендарнай роўнасці неабходна звяртацца на працягу ўсёй навучальнай праграмы, і прыгнятальныя гендарныя стэрэатыпы павінны быць ліквідаваныя. Вучні таксама павінны навучыцца непасрэдна супрацьстаяць расізму і дыскрымінацыі ва ўсіх формах.

Гэтыя чатыры кіруючыя прынцыпы могуць натхніць на перанос новага сацыяльнага кантракта на адукацыю ў адукацыйную практыку.

# Раздзел 5

## Трансфармацыйная праца настаўнікаў

> Настаўнік не абавязкова мае прывілеяваны доступ да мудрай ісціны. Як і яго вучні, ён знаходзіцца на шляху станаўлення той асобы, якой ён павінен быць.

**Ту Веймін (Wei-ming Tu)**, "Чалавецтва і самаразвіццё", 1996 год

**Настаўнікі павінны знаходзіцца ў цэнтры ўвагі новага сацыяльнага кантракта на адукацыю; трэба пераглядзець каштоўнасць і пераасэнсаваць іх прафесію як сумесную працу, якая спараджае новыя веды для дасягнення адукацыйных і сацыяльных пераўтварэнняў.**

Настаўнікам належыць унікальная роля ў стварэнні новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Настаўніцтва – гэта складаная, далікатная і патрабавальная прафесія, прадстаўнікі якой працуюць на стыку супярэчнасцяў паміж грамадскім і асабістым. Настаўнікі працуюць разам, каб мабілізаваць агульны здабытак ведаў у дыялогу з маладымі пакаленнямі, якія будуць наследаваць і сумесна будаваць будучыню. Настаўніцтва прадугледжвае групавую працу, адначасова абапіраючыся на ўнікальныя патрэбы і здольнасці кожнага вучня. Гэтыя супярэчнасці і парадоксы характарызуюць незаменную працу настаўнікаў.

Настаўніцтва патрабуе спачування, кампетэнтнасці, ведаў і рашучага адстойвання этычных прынцыпаў. Мудрых і вучоных заўсёды паважалі ў розных культурах ва ўсім свеце, і праз гэту традыцыю настаўнік выступае ў якасці адмысловага дзеяча ў кантэксце школы. Настаўнікі – ключавыя фігуры, ад якіх залежаць магчымасці для пераўтварэнняў. У сваю чаргу яны павінны прызнаваць суб’ектнасць сваіх вучняў адносна іх удзелу, супрацоўніцтва і навучання падчас педагагічных кантактаў. Каб выконваць гэтую складаную працу, настаўнікі павінны мець развітыя супрацоўніцкія педагагічныя суполкі, якія адзначаюцца дастатковай ступенню свабоды і падтрымкі. Падтрымка аўтаноміі, развіцця і супрацоўніцтва настаўнікаў з’яўляецца важнай праявай грамадскай салідарнасці дзеля будучыні адукацыі.

Гэты раздзел пачынаецца з перагляду будучыні адукацыі як “супрацоўніцкай прафесіі”, якая паспяхова існуе, эвалюцыяніруе і функцыянуе дзякуючы камандней працы і спецыялістам, якія ўзмацняюць шматбаковую працу па адукацыі разнастайных навучэнцаў. Там, дзе настаўнікаў прызнаюць мыслячымі спецыялістамі-практыкамі і стваральнікамі ведаў, яны робяць свой унёсак у веды, неабходныя для пераўтварэння адукацыйнага асяроддзя, палітыкі, даследаванняў і практыкі, як у рамках, так і па-за рамкамі іх прафесіі.

Далей у раздзеле абмяркоўваюцца магчымыя наступствы новага сацыяльнага кантракта на адукацыю на ўсёй працягласці развіцця настаўніка – ад навабранца да пачаткоўца і сталага спецыяліста – падобна да падарожжа, якое доўжыцца як індывідуальна, так і ў кампаніі, у багатым кантынууме розных часоў і прастораў.

Аўтары раздзела заклікаюць школы, супольнасці, сем’і, адміністратараў, прадстаўнікоў вышэйшай адукацыі і палітычных арганізацый аб’ядначца ў салідарнасці з настаўнікамі, прызнаць важнасць іх працы і стварыць умовы, якія будуць спрыяць іх поспехам. Раздзел завяршаюць “Кіруючыя прынцыпы дыялогу і дзеянняў да 2050 года”, якія ўяўляюць асаблівую цікаўнасць для настаўнікаў, кіраўнікоў школ і прадстаўнікоў урадаў і ўключаюць падтрымку супрацоўніцтва паміж настаўнікамі, прыярытэт стварэння ведаў, падтрымку аўтаноміі настаўнікаў і ўдзел у грамадскіх дэбатах па пытаннях адукацыі.

## Новы погляд на настаўніцтва як на супрацоўніцкую прафесію

У розныя часы і ў розных мясцовасцях настаўнікі выконвалі шэраг сацыяльных роляў і функцый. Уяўленне аб ролях настаўнікаў можа быць розным у розных культурах, напрыклад, яны могуць разглядацца як дзяржаўныя служачыя і грамадская інтэлігенцыя, прафесіяналы і артысты, лідары супольнасцей і лідары перамен, маральныя аўтарытэты і праваднікі будучага даверу. Многія найвялікшыя фігуры ў гісторыі чалавецтва апісваюцца як настаўнікі; ад духоўных лідараў і навукоўцаў да старажытных філосафаў і матэматыкаў – усе яны паднялі спадчынныя веды на новыя вяршыні, навучаючы тых, хто быў побач з імі.

Гістарычна склалася так, што настаўнікі адыгрывалі вельмі важную ролю ў стварэнні сацыяльнага кантракта на адукацыю ў дзевятнаццатым і дваццатым стагоддзях. Яны займалі цэнтральнае месца ў забеспячэнні абавязковай масавай адукацыі, наладжваючы адносіны з грамадствам, арганізоўваючы школьнае навучанне. Настаўнікі з самага пачатку выступалі ў якасці асветнікаў і ініцыятараў першых народных школ. Пачатковае вызначэнне "нармальныя школы" ілюструе тое, што чакалася ад іх: нармалізацыя стандартнай школьнай структуры, навучальнай праграмы, педагогікі і паўсядзённай працы. Стандартызацыя і мадэліраванне павінны былі ўсталяваць нормы і шаблоны, якія маглі служыць у якасці эталонаў для іншых школ. Вынікі працы мінулага стагоддзя бачныя ў кансалідацыі педагагічных адукацыйных устаноў ва ўсім свеце, ад Злучаных Штатаў Амерыкі да Кітая, ад Бразіліі да Індыі.

З пашырэннем школьнай адукацыі настаўнікі паасобку зрабіліся цэнтральнымі дзеячамі ў сэнсе іх працы, роляў і заслуг. Такім жа чынам павышаны запыт на адукацыю разглядаецца як пашыраная мадэль "аднаго пакою" для стварэння школ, падзеленых на ўзроставыя групы, якія былі замацаваныя за рознымі класнымі пакоямі. Аднак гэта пашыраная школьная мадэль "латок для яек" не пераасэнсоўвала ролю настаўнікаў, якія засталіся асабіста адказнымі за свае планы і матэрыялы ўрокаў і рэдка ўзаемадзейнічалі. Гэтая мадэль стварае ўсё больш няўстойлівыя ціскі на настаўнікаў.

> Трэба падмацоўваць асабістыя таленты і здольнасці настаўнікаў праз супрацоўніцтва і падтрымку.

Трэба падмацоўваць асабістыя таленты і здольнасці настаўнікаў праз супрацоўніцтва і падтрымку. Настаўнікі адыгрываюць і павінны па-ранейшаму адыгрываць цэнтральную ролю ў перабудове сацыяльнага кантракта на адукацыю дзеля нашай сумеснай будучыні. Іх здольнасці да гэтага наўпрост залежаць ад таго, у якой ступені кааперацыя і супрацоўніцтва ўплецены ў іх мадэлі працы.

### Настаўнікі ў інклюзіўным адукацыйным асяроддзі

Для падтрымкі вучняў настаўнікі павінны супрацоўнічаць са сваімі калегамі і іншымі спецыялістамі ў сваіх школах, каб забяспечыць кожнага вучня дапамогай у навучанні.

Уяўленне аб адукацыі як аб індывідуальнай працы настаўніка ставіць такія патрабаванні, якія немагчыма выканаць аднаму чалавеку і якія могуць змусіць многіх людзей пакінуць прафесію. У той жа час фізічныя, сацыяльныя і эмацыйныя патрэбы вучняў неад'емныя ад іх здольнасці вучыцца. Вучням патрэбна падтрымка ад сістэмы, якая павялічвае эфектыўнасць настаўнікаў пры іншай важнай падтрымцы, якая можа ўключаць падтрымку здароўя і харчавання, сацыяльныя паслугі, клопат аб псіхічным здароўі і спецыяльных навучальных патрэбах, у тым ліку асабліва эфектыўным з'яўляецца ўдзел сем'яў у падтрымцы адукацыі іх дзяцей.

Узнікаюць перспектыўныя ініцыятывы па каманднай працы настаўнікаў. Напрыклад, некаторыя школы ствараюць агульныя каманды па планаванні, у якія ўваходзяць класныя настаўнікі, спецыялісты па павышэнні ўзроўню граматнасці і педагогі, якія працуюць з дзецьмі са спецыяльнымі патрэбамі, што дае магчымасць кожнаму падзяліцца сваімі думкамі, ідэямі і назіраннямі адносна спосабаў падтрымкі шырокага кола навучэнцаў у навучанні чытанню і пісьму. У такіх партнёрскіх адносінах, заснаваных на сумесным выкладанні, настаўнікі працуюць разам над задавальненнем канкрэтных патрэбаў асобных вучняў, адначасова калектыўна кіруючы класам. У іншых выпадках дзяржаўныя службы і некамерцыйныя арганізацыі супрацоўнічаюць са школамі ў прыярытэтных сферах, каб падтрымліваць сувязі з вучнямі і сем'ямі па-за школай, спрыяючы іх агульнаму навучанню, здароўю і дабрабыту. Існуюць незлічоныя падыходы да забеспячэння кожнаму вучню поўнага спектру патрэбнай яму ці ёй падтрымкі ад ментараў, саветнікаў, спецыялістаў і калег-настаўнікаў.

У святле такіх магчымасцяў супрацоўніцтва можна лепш зразумець арганізацыйную ролю, якую адыгрываюць настаўнікі ў будаўніцтве новых адукацыйных прастораў з вялікай колькасцю пляцовак і пунктаў. Гэтае новае асяроддзе не выпадковае, яно ёсць вынік сістэматычнай і мэтанакіраванай працы, якая праводзіцца ў кожнай мясцовасці. Мясцовыя лідары, старэйшыны, улады, супольнасці і сем'і – кожны з іх павінен адыграць сваю важную ролю. Сацыяльныя работнікі, кансультанты, рэсурсы для спецыяльнай адукацыі, бібліятэкары і спецыялісты па павышэнні граматнасці могуць далей умацаваць унікальную дынаміку, якую дэманструюць вучні ў пабудаваным настаўнікамі навучальным асяроддзі.

Адукацыйнае асяроддзе вакол школы павінна ўключаць сетку навучальных прастораў. Лепш, каб падзелы паміж класным навучаннем і пазакласнай дзейнасцю ў школе ці па-за школай былі размытыя ці сцёртыя. Настаўнікі маюць ключавое значэнне для распрацоўкі і наладжвання сувязяў, якія падтрымліваюць гэтыя сеткі, аднак, каб гэтыя высілкі былі эфектыўнымі, трэба змяніць іх характар, ідэнтычнасць і ідэнтыфікацыю. Адыгрываючы сацыяльную і інстытуцыйную ролі ў арганізацыі новых адукацыйных экасістэм і сеціваў навучальных прастораў, настаўнікі і каманды іх калег з'яўляюцца найважнейшымі ўдзельнікамі фарміравання будучыні адукацыі.

Настаўніцтва – гэта не пра асобу, якая кіруе дзейнасцю вучня ці праводзіць урокі за зачыненымі дзвярыма класнага пакоя. Замест гэтага мы павінны лічыць настаўніцтва

працай, якая адбываецца праз школу і разам з іншымі педагогамі. Новы погляд на адукацыю не як на навучанне ў класных пакоях, а навучанне ў школах як навучальных арганізацыях, не заўсёды просты. Сапраўды, нягнуткасць школьнага выхавання можа ўскладніць працэсы супрацоўніцтва ў педагагічнай прафесіі. Ідэя супрацоўніцтва не скарачае абавязацельствы ці важнасць асобных людзей. Наадварот, яна ўводзіць новыя абавязкі ў калектыўных дзеяннях ва ўсёй школьнай прасторы, калі павышаюцца індывідуальныя абавязкі ў менеджменце і кіраванні школамі. Пры гэтым спробы сілай насадзіць супрацоўніцтва аказваюцца марнымі і контрпрадуктыўнымі. Павінны адбыцца змены ў арганізацыі навучальнай праграмы і педагогіцы, каб яны спрыялі супрацоўніцтву натуральным чынам. Калі ўся адукацыя арганізавана так, што настаўнікі чытаюць лекцыі ў аўдыторыях, то ў супрацоўніцтве няма сэнсу. Аднак, калі навучанне арганізавана ў разнастайных прасторах і часах на аснове праблем і праектаў, супрацоўніцтва робіцца незаменным.

> Настаўніцтва – гэта не пра асобу, якая кіруе дзейнасцю вучня ці праводзіць урокі за зачыненымі дзвярыма класнага пакоя.

## Распрацоўка і ўвядзенне навучальнай праграмы і педагогікі

Навучальныя праграмы – гэта не толькі тое, што распрацоўваецца і прадпісваецца, але гэта тое, што прымаецца і рэалізуецца. Распрацоўка і рэалізацыя новых формаў навучальных праграм на аснове адкрытых і сумесных ведаў залежаць у вялікай ступені ад працы настаўнікаў. У той час, калі лічбавыя тэхналогіі прапануюць безліч магчымасцяў, інавацыі, хутчэй за ўсё, будуць мець поспех, калі яны распрацоўваюцца для задавальнення асаблівых патрэбаў і супадаюць з характарыстыкамі вучняў у пэўных кантэкстах. Настаўнікі маюць важнае значэнне ў індывідуалізацыі навучання, каб яно было аўтэнтычным і актуальным. Ім патрэбныя свабода ад абмежаванняў, належная падрыхтоўка, вучэбна-метадычныя матэрыялы і падтрымка, каб прыстасоўвацца, будаваць, распрацоўваць і ствараць найлепшыя навучальныя магчымасці для сваіх вучняў. Навучальныя праграмы будучыні павінны надаць настаўнікам шырокую аўтаномію, якая мае моцную падтрымку з боку тэхналогій і якая адбываецца праз цеснае супрацоўніцтва з калегамі і партнёрскія сувязі з прадметнымі экспертамі, такімі як выкладчыкі ўніверсітэтаў і навукоўцы.

Педагогіка, у аснове якой ляжаць падыходы, заснаваныя на ўдзеле супольнасці і супрацоўніцтве, раскрываецца не толькі праз сумеснае навучанне ў класе, але і праз сумеснае навучанне паміж класам і калегіяльнымі навучальнымі супольнасцямі. Некаторыя складаныя праблемы, з якімі сутыкаюцца настаўнікі, нельга вырашыць на індывідуальнай аснове, але з імі могуць справіцца школьныя сеткі, універсітэцкія партнёрскія сувязі ці прафесійныя супольнасці з падтрымкай спецыялізаваных адукацыйных арганізацый. Калі справа даходзіць да планавання высакаякаснага навучання, існуе безліч шляхоў супрацоўніцтва паміж настаўнікамі, у тым ліку навучальныя групы, настаўніцкія саветы, педагагічныя калектывы, куратарства з боку калег, коўчынг, назіранні і наведванне заняткаў.

Пераасэнсаванне навучальных праграм і педагогікі немагчыма без удзелу настаўнікаў.

Прафесійныя настаўніцкія веды будуюцца на дыялогу паміж тэорыяй і практыкай і развіваюцца праз асабістыя і калектыўныя разважанні аб сукупнасці досведу, які працягвае расці. Не бывае дзвюх аднолькавых педагагічных сітуацый, што часткова робіць міжасабовую працу настаўнікаў з вучнямі незаменнай нават найдасканалейшымі машынамі. Педагогіка – гэта тое, што дазваляе кожнаму вучню быць часткай чалавечых сувязей з ведамі, уваходзіць у свет з разуменнем, крэатыўнасцю і чуласцю. Пераасэнсаванне навучальных праграм і педагогікі немагчыма без удзелу настаўнікаў.

### Настаўнікі і адукацыйныя даследаванні

Адзін з найбольш крытычных аспектаў для асэнсавання настаўнікам – гэта яго суадносіны з ведамі. Для некаторых найбольшае значэнне мае выдатнае валоданне прадметамі, якія выкладаюцца. Для іншых на пярэдні план выходзяць дыдактычныя і педагагічныя веды. Трэці від ведаў – гэта прафесійныя педагагічныя веды. У любой прафесіі спецыялісты-практыкі спрыяюць стварэнню і распаўсюджванню экспертных ведаў, часта ў выніку сістэматычных эксперыментаў, ацэнкі досведу і практыкі.

Заснаваныя на практыцы веды неабходныя для фармавання прафесіі, у якой настаўнікі вызначаюцца як мыслячыя спецыялісты-практыкі. На асабістым узроўні прафесійныя педагагічныя веды маюць інтуітыўныя, практычныя і міжасабовыя вымярэнні. Супрацоўніцкая настаўніцкая праца натуральна аб'ядноўвае такія параметры, як рэфлексія і абмен ведамі з калегамі. Такія даследаванні ўсё часцей набываюць пісьмовую форму, а настаўнікі становяцца аўтарамі. Кожная прафесія павінна не толькі адзначыць сваю спадчыну, досвед і практыкі, яна таксама павінна ўсталяваць новыя рубяжы для пошуку і інавацый, вызначыць пытанні для даследаванняў і праводзіць іх. Калі настаўнікі прызнаюцца мыслячымі спецыялістамі-практыкамі і стваральнікамі ведаў, яны спрыяюць росту корпуса ведаў, неабходных для пераўтварэння адукацыйнага асяроддзя, палітыкі, даследаванняў і практыкі ў галіне адукацыі, як у рамках, так і па-за рамкамі іх уласнай прафесіі.

## Шлях станаўлення настаўніка, пераплецены з жыццём

Зараз у свеце існуе шырокі спектр сістэм і ўстаноў для падрыхтоўкі настаўнікаў да выканання іх функцый. Трэба прызнаць, што, незалежна ад іх сертыфікацыі ці досведу, настаўнікі ніколі не бываюць "канчаткова" ці "цалкам" сфарміраванымі ў сэнсе іх прафесійнай ідэнтычнасці, патэнцыялу ці прафесійнага развіцця. Развіццё настаўніка – гэта багатая і дынамічная паслядоўнасць навучання і досведу, якая адбываецца на працягу ўсяго жыцця і шчыльна пераплятаецца з жыццём.

Таксама варта прызнаваць і цаніць асабістыя і культурныя вымярэнні настаўнікаў. Каб быць настаўнікам, трэба пашыраць кола свайго ўласнага досведу і ўзаемадзейнічаць з сусветам ведаў і ідэй. Настаўнікі, якія самі не захапляюцца чытаннем, не могуць прасоўваць чытанне сярод вучняў. Гэтак жа немагчыма эфектыўна выкладаць навукі без цікаўнасці і інтарэсу да навук. Вучні столькі ж навучаюцца ад жывога прыкладу настаўнікаў, як і ад іх слоў.

"Жывая бібліятэка" кожнага настаўніка ёсць падмурак іх працы. Менавіта ў гэтай радасці навучання і культурнага ўзбагачэння настаўнікі робяцца праваднікамі адукацыі, якая пераплецена з жыццём, і праз гэта яны могуць спрыяць новым формам сумеснага жыцця і салідарнасці з іншымі людзьмі і жывой планетай.

## Наём настаўнікаў

Для некаторых падарожжа да настаўніцтва пачынаецца на ранніх этапах іх уласнай адукацыі. Іншыя бачаць такія магчымасці пазней у жыцці, магчыма, пераходзячы з іншых кар'ерных шляхоў па шэрагу прычын. Масавае пашырэнне школьнага навучання на працягу апошніх трыццаці гадоў падштурхнула да найму больш шырокага кола кандыдатаў, чым, магчыма, меркавалася раней. Гэта мела як пазітыўныя вынікі, напрыклад, рост долі жанчын у прафесіі ў некаторых месцах, так і негатыўныя, напрыклад, зніжэнне долі прафесійна падрыхтаваных настаўнікаў, зніжэнне зарплаты і сацыяльнага статусу, а таксама напружванне сістэм падтрымкі па-за межы іх магчымасцяў.

Шмат дзе таксама вырас запыт на настаўнікаў, што ўплывае на наём таленавітых кандыдатаў. Усё часцей ціскі, рызыкі і складанасць настаўніцтва пераважваюць зацікаўленасць і намеры тых, хто жадае быць настаўнікам, што прыводзіць да значнага зніжэння колькасці тых, хто ўступае ў прафесію. У той жа час запыт працягвае расці: да 2030 года ў свеце спатрэбіцца наняць на працу блізка да 70 мільёнаў новых настаўнікаў пачатковай і сярэдняй адукацыі, каб выканаць чацвёртую Мэту ўстойлівага развіцця. Сітуацыя пагоршылася падчас пандэміі COVID-19, і будзе патрабавацца шмат больш людзей, каб замяніць тых, хто пакінуў прафесію. Без значных зменаў будзе цяжка залучыць значную колькасць матываваных будучых настаўнікаў, каб кампенсаваць нястачу. Гэта будзе неадкладнае пытанне для дзяржаўнай палітыкі і грамадства ў цэлым.

Сітуацыя склалася асабліва няроўна паміж краінамі і рэгіёнамі. Найбольшы недахоп настаўнікаў – у Чорнай Афрыцы, рэгіёне з найбольш хуткім ростам насельніцтва школьнага ўзросту. Спатрэбяцца неадкладныя меры для павышэння настаўніцкага патэнцыялу новых педагагічных кадраў. Пры тым, што існуюць велізарныя таленты, у многіх рэгіёнах бар'еры з боку прапановы часта абмяжоўваюць магчымасць атрымаць сертыфікацыю і кваліфікацыю, асабліва ў краінах з абмежаванымі магчымасцямі атрымання вышэйшай адукацыі. Патрэбны творчыя падыходы да найму і развіцця настаўнікаў, каб па магчымасці ўзмацніць мясцовыя магчымасці, абапіраючыся на багаты патэнцыял супрацоўніцтва мясцовых супольнасцей.

Недахоп кваліфікаваных настаўнікаў таксама выяўляецца на наднацыянальным узроўні, у асноўным з прычыны нягроўнасці. Ужо да пандэміі добра падрыхтаваныя і спрактыкаваныя настаўнікі былі нягроўна размеркаваны, з рэзкай розніцай паміж гарадскімі і сельскімі населенымі пунктамі, а таксама паміж школамі для дзяцей з розных сацыяльна-эканамічных пластоў. Парадаксальна, што ў тых мясцовасцях, якім патрэбны найлепшыя і найбольш спрактыкаваныя настаўнікі, звычайна працуюць пачаткоўцы, добраахвотнікі ці педагогі з нізкай кваліфікацыяй, і там адзначаецца высокая цякучасць кадраў. Разам з палітыкай залучэння новых пакаленняў у прафесію трэба прымаць неадкладныя меры для ўтрымання найбольш кваліфікаваных настаўнікаў.

> Трэба прымаць неадкладныя меры для ўтрымання найбольш кваліфікаваных настаўнікаў.

Наём і зацвярджэнне школьных настаўнікаў з карэнных народаў, мясцовага насельніцтва і дыяспар – у некаторых выпадках, каб лепш адлюстроўваць культурную спадчыну іх вучняў – можа значна спрыяць шанаванню разнастайнасці і палепшыць навучанне студэнтаў. Сапраўды, прафесіяналы – выхадцы з гэтых груп маюць жыццёвы досвед і падтрымліваюць адносіны з супольнасцямі, што дазваляе ім разумець патрэбы, імкненні і культурныя мадэлі, якія маюць велізарную каштоўнасць для стварэння справядлівай і раўнапраўнай будучыні адукацыі.

## Адукацыя настаўнікаў

Трэба пераасэнсаваць адукацыю настаўнікаў у адпаведнасці з прыярытэтамі адукацыі і лепш арыентаваць іх на будучыя выклікі і перспектывы. Нізкая кваліфікацыя многіх настаўнікаў у розных рэгіёнах свету, асабліва ў Чорнай Афрыцы, патрабуе неадкладных мер. Не існуе адзінай для ўсіх мадэлі змянення гэтай сітуацыі. Супрацоўніцтва розных дзеячаў, звязаных з адукацыяй настаўнікаў – такіх як дзяржаўныя органы, даследчыкі, настаўніцкія асацыяцыі, лідары супольнасцей і г. д., – прапануе магчымасці для стварэння новых прастораў для навучання і інавацый.

У навучанні настаўнікаў нельга ігнараваць значнасць лічбавай культуры, улічваючы тое, якім чынам ствараюцца і распаўсюджваюцца веды, і тыя змены, якія лічбавая культура прыносіць у жыццё людзей і жыццё планеты. Не выкарыстоўваючы тэхналогіі ў якасці панацэі, трэба ўключаць лічбавыя сродкі не толькі для змешанага і дыстанцыйнага прафесійнага развіцця, але ў першую чаргу як тэму для вывучэння. Акрамя таго, неабходна даследаваць наяўнасць сродкаў, педагагічныя вынікі, эпістэмныя і этычныя магчымасці, а таксама прабелы і недахопы лічбавых сродкаў і платформаў.

Эфектыўная адукацыя настаўнікаў павінна ўлічваць чыннікі адтоку. Падтрымка прафесіі патрабуе не толькі задзейнічання дастаткова кваліфікаваных кандыдатаў, яна патрабуе перафармуліроўкі ролі настаўнікаў, каб супрацоўніцтва камандаў з належнымі ведамі і досведам, рэсурсамі і інфраструктурай забяспечвала прафесійныя поспехі. Напрыклад, у значнай частцы свету падчас пандэміі настаўнікі сутыкаліся са стрэсамі і прафесійным

выгараннем у выніку неналежных тэхналагічных платформаў і нізкага ўзроўню прафесійнага развіцца для эфектыўнай падтрымкі дыстанцыйнага навучання, пасля чаго некаторыя людзі пакінулі прафесію.

## Настаўнікі-пачаткоўцы

У кожнай прафесіі няма нічога больш важнага, чым тое, як прымаюцца і сацыялізуюцца новыя пакаленні. Праграмы ўводзін у спецыяльнасць павінны падтрымліваць пачынаючых настаўнікаў на працягу першых і важных гадоў працы з дапамогай структур супрацоўніцтва пры планаванні ўрокаў і куратарствам з боку больш спрактыкаваных калег. Гэты пераходны этап паміж падрыхтоўкай і прафесійнай практыкай з'яўляецца найбольш вырашальным у прафесійным жыцці настаўніка, хоць і часта занядбаным як у палітыцы, так і ў самой прафесіі, і, як вынік, у ім назіраюцца найвышэйшыя ўзроўні цякучасці кадраў.

Настаўніцкая прафесія, як і іншыя прафесіі, звязана з базай ведаў. Прафесійныя педагагічныя веды патрабуюць працэсаў інтэграцыі і сацыялізацыі, якія ахопліваюць установы пачатковай падрыхтоўкі настаўнікаў, школы і спрактыкаваных настаўнікаў. Гэта сувязь выяўляецца нават больш важнай, калі мы ўлічваем змену абставін, кантэкстаў, змены ў навучальным асяроддзі, а таксама разнастайнасць навучэнцаў у адукацыі дваццаць першага стагоддзя. Новыя выклікі патрабуюць супрацоўніцтва пакаленняў настаўнікаў. Нішто не можа адказаць на будучыя выклікі лепш, чым гэта здольнасць настаўнікаў падтрымліваць адзін аднаго як супольнасць калег, якія карыстаюцца ўзаемным даверам.

Настаўнікі стаяць на чале стварэння ведаў, калі яны ўзаемадзейнічаюць з навучэнцамі ў практычных даследаваннях, вырашэнні праблем і праектнай працы ці ў доследах з новымі тэхналогіямі. Гэтыя працэсы павінны фарміраваць падмурак для праграм уводзін у спецыяльнасць і для інтэграцыі настаўнікаў-пачаткоўцаў у прафесію разам з калектывам супрацоўнікаў.

## Працяг прафесійнага развіцця

Неабходна ствараць магчымасці для прафесійнага развіцця і адукацыі настаўнікаў, неабходна падтрымліваць працу настаўнікаў з рознымі, этнічна, культурна і моўна разнастайнымі катэгорыямі насельніцтва; падтрымліваць інклюзію, належную дапамогу вучням з асаблівымі патрэбамі і персаналізаванае навучанне. Настаўнікі павінны забяспечыць належную падтрымку навучэнцаў з традыцыйна выключаных і маргіналізаваных катэгорый насельніцтва. Гэта робіцца асабліва актуальным у рэгіёнах, дзе склад класаў можа кардынальна змяняцца праз рост міграцыі і ўнутранага перамяшчэння ў выніку змянення клімату, сацыяльнага і палітычнага гвалту і ўзброенага канфлікту – умоў, пашырэнне якіх чакаецца ў бліжэйшыя гады.

Прафесійнае развіццё павінна стаць часткай паслядоўнага працэсу, пачынаючы з пачатковай педагагічнай адукацыі і кантраляванай працоўнай практыкі на месцах, за

гэтым ідуць уваход у прафесію, куратарства і прафесійнае развіццё на працоўным месцы на рэгулярнай аснове. Эфектыўнае прасоўванне па кар’ерным шляху павінна быць звязана з мэтанакіраваным бесперапынным прафесійным развіццём, якое засяроджана на штодзённай дзейнасці настаўнікаў, звязана з ім і павінна лёгка ўбудоўвацца ў прафесійную практыку.

Эфектыўныя праграмы прафесійнага развіцця часта выразна засяроджваюцца на тым, што павінны вывучаць вучні і што могуць зрабіць настаўнікі, каб падтрымаць такое навучанне і ацаніць іх прагрэс. Найбольш эфектыўныя праграмы цягнуцца даволі доўгі час і па меншай меры часткова грунтуюцца на школах, будуюцца на досведзе і забяспечваюць паўторныя магчымасці для прымянення вывучанага матэрыялу і развіцця педагагічных і канцэптуальных ведаў.

## Грамадская салідарнасць дзеля ператварэння настаўніцтва

Для таго, каб настаўнікі маглі зрабіць свой унёсак у новы сацыяльны кантракт на адукацыю, неабходна зрабіць важныя змены ў палітыцы, якая кіруе выбарам, падрыхтоўкай і кар’ернымі шляхамі настаўнікаў, а таксама ў арганізацыі самой прафесіі. Супрацоўніцтва не павінна проста абцяжарваць настаўнікаў яшчэ большымі абавязкамі, але яно павінна падтрымлівацца і атрымліваць фінансавыя рэсурсы, каб дазволіць ім узаемадзейнічаць з шырокім колам зацікаўленых у адукацыі бакоў, у прыватнасці, з сем’ямі і супольнасцямі, ВНУ і шэрагам грамадскіх устаноў.

### Умовы працы настаўнікаў

Нягледзячы на даследаванні, якія дэманструюць, што якасная праца настаўнікаў у школе з’яўляецца адзіным найважнейшым чыннікам дасягненняў вучняў, настаўнікі дагэтуль не атрымліваюць дастатковага прызнання, дастатковай ацэнкі, дастатковай аплаты і належнай падтрымкі. Ва ўсім свеце цяжка вырашаюцца пытанні, якія тычацца структуры настаўніцкай кар’еры, кіравання ёю, матывацыі настаўнікаў і задавальнення працай без абавязковых грамадскіх інвестыцый і грамадскай волі. Празмерныя спадзяванні на выпадковых ці нізка кваліфікаваных настаўнікаў могуць быць разбуральнымі для прафесіі і народнай асветы.

Дрэнныя ўмовы працы і нізкая аплата могуць адштурхнуць перспектыўных настаўнікаў. Гендарны характар працы настаўнікаў таксама трэба разглядаць пры аналізе гэтых канфліктаў і запытаў, бо рост колькасці жанчын-настаўніц у некаторых краінах даў падставу для зніжэння аплаты ці пашырэння няроўнасці ў аплаце працы. Неабходна палепшыць умовы працы настаўнікаў не толькі праз грашовую кампенсацыю, але і праз скарачэнне колькасці вучняў у класах, павышэнне ўзроўню бяспекі ў школах, узмацненне грамадскага прафесійнага прызнання і легітымнасці, павышэнне інстытуцыйнай падтрымкі і выхаванне культуры супрацоўніцтва.

Увогуле трэба перапрацаваць структуру кар'еры настаўнікаў. Прагрэс павінен грунтавацца на кампетэнтнасці, прафесійным развіцці і ўдзеле ў школьных праграмах, а таксама ўлічваць, акрамя іншага, куратарства над настаўнікамі-пачаткоўцамі, сумеснае планаванне разам з калегамі-настаўнікамі, кіраўніцтва прадметнымі галінамі ці цыкламі, арганізацыю такіх падтрымліваючых паслуг, як праца рэпетытараў ці дарадцаў, водпуск для даследаванняў і далейшага прафесійнага развіцця. Ва ўмовах нарастаючага ціску настаўнікі патрабуюць больш збалансаваных суадносінаў паміж бюракратычнымі і педагагічнымі патрабаваннямі, а таксама ўліку нябачнай працы, якая з'яўляецца часткай настаўніцтва, напрыклад, ва ўмовах, калі настаўнікі цесна супрацоўнічаюць са сваімі супольнасцямі.

Патрэбны дакладны і гендарна-адчувальны перагляд працоўных статутаў, нормаў і нагрузак, якія тычацца настаўнікаў, каб забяспечыць іх адпаведнасць новым адукацыйным прыярытэтам. Больш за тое, важна прызнаць з'яўленне новых форм кантролю праз патрабаванні і тэхналогіі падсправаздачнасці, якія часта скарачаюць аўтаномію настаўнікаў. Рост маштабнага тэсціравання, ацэнкі настаўнікаў, інспектавання школ, стандартаў выкладання – толькі некаторыя прыклады цяжкага ціску, які ўскладаецца на настаўнікаў часта без супараўнальнай ступені падтрымкі.

Некаторыя сістэмы адукацыі вітаюць тэхналогіі штучнага інтэлекту як шлях да паляпшэння ўнутранага кіравання, эфектыўнасці і падсправаздачнасці перад грамадствам. Нягледзячы на дасягненні ў плане ведаў і бачання адукацыйных працэсаў, рост тэхналогій машыннага навучання пагражае фрагментаваннем адукацыйных працэсаў на "наборы даных" і паскарэннем тэндэнцый да менеджарызму, нагляду і дэпрафесіяналізацыі настаўнікаў. У прыватнасці, выкарыстанне праграмнага забеспячэння для распазнавання твараў і штучнага інтэлекту для маніторынгу вучняў і настаўнікаў дзяржавамі, якія могуць выкарыстоўваць такія рэсурсы для палітычнага нагляду, супярэчыць Артыкулу 26 Дэкларацыі правоў чалавека, які зацвярджае прасоўванне асноўных свабодаў і правоў чалавека як мэту адукацыі.

Праца настаўнікаў звязана з вялікай адказнасцю і як такая павінна быць падсправаздачнай перад грамадствам і ў першую чаргу перад будучыняй. Для гэтага яны павінны не баяцца працаваць у атмасферы адкрытасці і даверу і смела прасоўваць новыя спосабы мыслення і прыналежнасці да свету, што разыходзіцца з некаторымі апошнімі формамі падсправаздачнасці, якія грунтуюцца на празмерным менеджарызме і карпаратывізме, што хутчэй шкодзіць, чым спрыяе іх працы.

## Пастаянныя сувязі паміж універсітэтамі і выкладчыкамі

Існуе цесная сувязь паміж вышэйшай адукацыяй і настаўніцкай прафесіяй, і новыя інстытуцыйныя канфігурацыі павінны ўвасабляць гэту сувязь. Ідэя пераасэнсоўвання новай будучыні разам павінна ператварацца ў супрацоўніцтва і кааперацыю паміж школамі, настаўнікамі і ўніверсітэтамі падчас пачатковай педагагічнай адукацыі

і бесперапыннага прафесійнага развіцця. Вышэйшая адукацыя здольная кінуць выклік і сфарміраваць склад мыслення і методыкі наступнага пакалення педагогаў. У сваю чаргу, педагогі могуць дапамагчы ўніверсітэтам змяніцца, аднавіць іх грамадскую місію і лепш зразумець ролі, якія яны адыгрываюць у паляпшэнні адукацыйных экасістэм.

Сярод сваіх больш агульных сувязяў пэўныя абавязацельствы ўніверсітэтаў датычна адукацыі настаўнікаў неабходна павысіць. Гістарычна склалася так, што гэта адна з асноўных сувязей паміж пачатковай і сярэдняй адукацыяй і ўніверсітэтамі. Тым не менш у большасці месцаў існуе патрэба ў фундаментальных зменах у праграмах і стратэгіях адукацыі педагогаў.

Ні ўніверсітэты, ні школы не ў стане самастойна праводзіць пачатковую падрыхтоўку настаўнікаў.

Найважнейшае з гэтых абавязацельстваў звязана з патрэбай у заснаваным на ўзаемаадносінах падыходзе да стварэння і рэалізацыі праграм навучання настаўнікаў, у прыватнасці, падчас пачатковай падрыхтоўкі настаўнікаў. Ні ўніверсітэты, ні школы не ў стане самастойна праводзіць пачатковую падрыхтоўку настаўнікаў. Некаторыя праграмы запаўняюць гэты прабел, засяроджваючыся на стварэнні новых прастораў і ўмоў, калі шматлікія дзеячы адукацыі, у тым ліку дзяржаўныя органы, асацыяцыі настаўнікаў і няўрадавыя ініцыятывы, могуць аб’яднацца дзеля адданай сумеснай працы. Іншыя праграмы глыбока ўкараняюцца ў школах, прымаючы заснаваны на пошуку падыход да навучання і дзеянняў. Яны не павінны абмяжоўвацца педагагічнымі факультэтамі, але яны могуць злучаць пачатковую і сярэднюю адукацыю з поўным спектрам агульнага здабытку ведаў, які будзе прасунуты і мабілізаваны ўніверсітэтамі. Падобна таму, як універсітэты адкрылі навуковыя і індустрыяльныя “паркі” ў многіх месцах, нам патрэбныя падобныя арыентаваныя на адукацыю прасторы, здольныя аб’яднаць усе зацікаўленыя бакі для сумеснай распрацоўкі навучання і працы па падрыхтоўцы выкладчыкаў.

Адпаведнае абавязацельства прадугледжвае ўзмацненне праграм уводзін у настаўніцкую прафесію. Найлепшыя з іх аддаюць перавагу куратарству і праводзяць сацыялізацыю маладых настаўнікаў праз забеспячэнне належных пераходных перыядаў паміж прафесійным развіццём і прафесійнай практыкай – усе яны патрабуюць шчыльнага супрацоўніцтва паміж універсітэтамі і педагагічнымі каледжамі. Пастаянныя кантакты паміж настаўнікамі і ўніверсітэтамі могуць значна спрыяць паляпшэнням у школах і ў трансфармацыйных працэсах у адукацыі. Праграмы і факультэты выкладчыкаў ВНУ павінны захоўваць сувязі з настаўнікамі на працягу іх прафесійнага жыцця, заахвочваючы да дыялектычных узаемаадносін, у якіх педагогі прыносяць досвед сваёй працы ў свае каледжы і ўніверсітэты.

Нарэшце, трансфармацый таксама патрабуе педагагічнае развіццё настаўніцтва ў вышэйшай адукацыі, сярод прафесуры. Выкладчыкі і настаўнікі ўніверсітэтаў і каледжаў могуць значна выйграць, калі далучацца да сумеснага планавання, выкладання і падтрымкі навучання вучняў. Педагогіка салідарнасці і супрацоўніцтва мае не меншае значэнне для

вышэйшай адукацыі, чым для дзяцей і падлеткаў, – фактычна яна нават больш актуальная для новых пакаленняў прафесіяналаў, лідараў і даследчыкаў, якіх імкнуцца выпускаць універсітэты.

## Настаўнікі ў прыняцці адукацыйных рашэнняў і ў грамадскай сферы

У наш час нельга аспрэчваць важнасць грамадскай сферы, калі пытанні адукацыі знаходзяцца ў цэнтры дыскусій і разважанняў. Гэта пытанне не толькі абмеркаванняў ці кансультацый, але і будаўніцтва механізмаў прыняцця рашэнняў з удзелам дзяржаўных органаў, бацькоў, супольнасцей, грамадскіх і прыватных арганізацый, асацыяцый і моладзевых рухаў, а таксама настаўнікаў і іх арганізацый.

Настаўніцкая прафесія не заканчваецца ў прафесійнай прасторы, яна працягваецца ў грамадскай прасторы, грамадскім жыцці і стварэнні грамадскага дабра. У гэтым сэнсе яе асаблівае значэнне палягае ў тым, што настаўнікі ўдзельнічаюць у вызначэнні грамадскай палітыкі. Такога не адбываецца ў некаторых сітуацыях, калі настаўнікі пазбаўленыя нават мізэрнай магчымасці для дзеянняў, калі не вітаюцца дэбаты і абмеркаванні пытанняў адукацыйнай палітыкі.

Быць настаўнікам азначае заняць сваё месца ў прафесіі, а таксама займаць грамадзянскую пазіцыю па асноўных пытаннях адукацыі і будаўніцтва дзяржаўнай палітыкі. Асноўнай мэтай удзелу настаўнікаў з’яўляецца не столькі абарона іх інтарэсаў, колькі вынясенне іх голасу і ведаў у больш шырокую грамадскую і палітычную сферу.

Гледзячы ў будучыню, важна адзначыць, што праца настаўнікаў не абмяжоўваецца класнай прасторай, але павінна распаўсюджвацца на ўсю арганізацыю і дзейнасць школы. Гэта адыгрывае істотную ролю ў наданні школам магчымасці стаць навучальнымі арганізацыямі, у якіх настаўнікі фарміруюць і падзяляюць бачанне, арыентаванае на навучанне ўсіх вучняў, і ў якіх існуюць магчымасці бесперапыннага навучання для ўсяго персаналу. Настаўнікі могуць быць лідарамі супрацоўніцтва і сумеснага навучання ў межах культуры даследаванняў, інавацый і пошуку; і яны здольныя спрыяць інтэграваным сістэмам арганізацыі і сумеснай рэалізацыі навучання.

## Прынцыпы дыялогу і дзейнасці

У гэтым раздзеле прапануецца далейшая прафесіяналізацыя настаўніцтва ў новым сацыяльным кантракце на адукацыю ў якасці сумеснага намагання, калі настаўнікі атрымліваюць прызнанне за іх працу ў якасці стваральнікаў ведаў і ключавых фігур у пераўтварэннях адукацыі і грамадства. Калі мы разглядаем перыяд да 2050 года, ёсць чатыры прынцыпы, якія могуць дапамагчы накіраваць дыялог і дзеянні, неабходныя для рэалізацыі гэтай рэкамендацыі:

- **Праца настаўнікаў павінна характарызавацца супрацоўніцтвам і камандной працай**. Мы павінны падтрымліваць супрацоўніцтва настаўнікаў у якасці галоўных арганізатараў умоў, узаемасувязяў, прастораў і часу адукацыі. Якасная адукацыя дасягаецца каманднай працай і спрыяльнымі ўмовамі, якія забяспечваюць задавальненне фізічных, грамадскіх і эмацыйных патрэбаў вучняў.

- **Стварэнне ведаў, абмеркаванні і даследаванні павінны стаць неад'емнымі часткамі навучання**. Настаўнікам неабходныя падтрымка і прызнанне ў якасці інтэлектуальна задзейнічаных навучэнцаў, якія выяўляюць новыя сферы пошукаў і інавацый, вызначаюць пытанні для даследаванняў і ствараюць новыя педагагічныя практыкі.

- **Трэба падтрымаць аўтаномію і свабоду настаўнікаў. Неабходна заахвочваць моцную прафесійную ідэнтычнасць настаўнікаў.** Гэта ўключае належныя ўводзіны ў прафесію і бесперапыннае прафесійнае развіццё, якое забяспечвае настаўнікам магчымасць эфектыўна выкарыстоўваць іх меркаванні і досвед у планаванні і навучанні.

- **Настаўнікі павінны ўдзельнічаць у грамадскіх дэбатах і дыялогу па пытаннях будучыні адукацыі**. Мы павінны забяспечыць прысутнасць настаўнікаў у грамадскіх дэбатах і механізмах прыняцця рашэнняў з удзелам грамадства, што патрэбна для калектыўнага пераасэнсоўвання адукацыі.

Ствараючы новы сацыяльны кантракт на адукацыю, мы павінны натхняцца гэтымі чатырма кіруючымі прынцыпамі, звязанымі з трансфармацыйнай працай настаўнікаў. Сумесны дыялог па пытаннях настаўніцтва і настаўнікаў ёсць істотны кампанент аднаўлення адукацыі.

# Раздзел 6

## Захаванне і пераўтварэнне школ

Дом быў месцам, дзе я была павінна адпавядаць чужым уяўленням аб тым, кім і чым я павінна быць. Школа была месцам, дзе я магла забыцца пра такую сябе і вынайсці сябе наноў праз ідэі… Класны пакой, з усімі яго абмежаваннямі, застаецца месцам магчымасцяў. У гэтай сферы магчымасцяў мы можам працаваць дзеля свабоды, патрабаваць ад сябе і нашых таварышаў адкрытасці розуму і сэрца, якая дазваляе нам сутыкацца з рэальнасцю, нават калі мы сумесна малюем у нашым уяўленні шляхі да пераходу, парушэння межаў.

**бэл хукс (bell hooks)**, “Навучанне парушаць межы: адукацыя як практыка свабоды”, 1994 год

**Школы павінны быць абароненымі месцамі адукацыі ў сувязі з інклюзіяй, роўнасцю, а таксама асабістым і калектыўным дабрабытам, якія яны падтрымліваюць; яны таксама павінны быць пераасэнсаванымі, каб больш эфектыўна прасоўваць пераўтварэнне свету да больш справядлівай, роўнай і ўстойлівай будучыні.**

Каб зрабіць магчымай педагогіку супрацоўніцтва і салідарнасці і ўмацаваць узаемасувязі з агульным здабыткам ведаў, крытычна важна мець азначаныя для гэтых мэтаў час і прасторы. Школы, з усімі іх магчымасцямі і абяцаннямі, хібамі і абмежаваннямі, застаюцца найважнейшымі адукацыйнымі ўстановамі. Школы ўвасабляюць прыхільнасць грамадства да адукацыі як грамадскай чалавечай дзейнасці. Аднак праектаванне школ не з’яўляецца нейтральным і адлюстроўвае дапушчэнні адносна навучання, поспехаў, дасягненняў і стасункаў. Пабудаванае асяроддзе і рэжымы часу, якія створаны ў школах, крышталізуюць тое, што ёсць магчымым, што забараняецца, што вітаецца і што выключаецца. Настаўнікі як галоўныя арганізатары адукацыйных кантактаў павінны выдаткоўваць шмат працоўнага часу на тыя арганізацыйныя схемы і віды ўзаемадзеянняў і навучання, якія яны робяць магчымымі. Ці будзе школьнае асяроддзе спрыяць супрацоўніцтву, даследаванням і эксперыментам? Ці будзе яно істотна нецярпімым ці прыхільным да навучання і разважанняў шляхам спроб і памылак? Ці будзе яно спрыяць шэрагу кантактаў, не толькі ў рамках класа ці ўзроставай групы, але і паміж узростамі і этапамі жыцця? І якія віды куратарства, сяброўства і ментальнасці будуць будавацца праз гэтыя кантакты? Ці будзе школьнае асяроддзе засяроджвацца вышэй за ўсё на асабістых дасягненнях, або яно будзе лічыць, што асабістае развіццё і развіццё аднагодкаў з’яўляюцца ўзаемаспрыяльнымі?

Гэты раздзел пачынаецца з кароткага агляду з’яўлення школ як неабходных грамадскіх устаноў, якія адыгрываюць важную ролю ў фактычна кожнай культуры і традыцыі. Яны не толькі ўяўляюць сабой унікальныя час і прастору пачатковай і сярэдняй адукацыі, але многія з іх таксама робяцца самастойнымі грамадскімі цэнтрамі, аб’ядноўваючы шэраг грамадскіх тавараў і паслуг, якія падтрымліваюць дабрабыт асобаў, сем’яў і супольнасцей. Тым не менш школы абмежаваныя ў дасягненнях, часткова праз вузкія вызначэнні прасторавых і часавых структур навучання. Далей у раздзеле абмяркоўваюцца магчымыя пераўтварэнні. Пашырэнне сферы навучання за рамкі класнага пакоя, перагляд часу і структуры ўрокаў, што спрыяла б больш глыбокаму ўзаемадзеянню, а таксама думкі аб патэнцыяле лічбавых тэхналогій у падтрымцы таго, што ўзнікае ў рамках школ – усе гэтыя складнікі трэба ўлічваць, звязваючы стварэнне новага сацыяльнага кантракта на адукацыю і пераўтварэнне школы.

Моцныя школы маюць крытычнае значэнне, калі адукацыя мае абавязак дапамагчы нам пабудаваць спрыяльную для жыцця калектыўную будучыню, якая ў стане адаптавацца да крызісаў, а таксама да ўсяго невядомага і нявызначанага.

Раздзел завяршаецца “Кіруючымі прынцыпамі дыялогу і дзейнасці да 2050 года”, што будзе цікавым настаўнікам і педагогам, уладам і партнёрам з ліку грамадзянскай супольнасці; у раздзел уключаны тэмы: абарона і перапланаванне школ як прасторы для супрацоўніцтва; станоўчае выкарыстанне лічбавых тэхналогій; а таксама мадэліраванне ўстойлівасці і правоў чалавека.

## Незаменная роля школ

Калі б школа не існавала, нам бы прыйшлося яе вынайсці. Школы – гэта цэнтральны складнік больш шырокіх адукацыйных экасістэм. Іх жыццяздольнасць адлюстроўвае прыхільнасць грамадства да адукацыі як да грамадскага дабра. Школы даюць дзецям і моладзі ўнікальныя ўмовы для ўдзелу ў агульным здабытку ведаў. Гэта тыя месцы, дзе можна рызыкаваць, сутыкацца з выклікамі і эксперыментаваць з магчымасцямі. Школы забяспечваюць кожнаму доступ да досведу, магчымасцяў, ведаў, этыкі і каштоўнасцяў, якія будуць падтрымліваць нашу сумесную будучыню. У перспектыве да 2050 года школы павінны будуць выхоўваць этыку салідарнасці і ўзаемнасці праз міжпакаленчыя, міжкультурныя і плюралістычныя кантакты.

Калі б школа не існавала, нам бы прыйшлося яе вынайсці.

Істотная адукацыйная праца адбываецца ў шмат якіх часах і прасторах, аднак грамадскія час і прастора школы з’яўляюцца ўнікальнымі. Школьная прастора спрыяе сацыяльным узаемаадносінам. Адукацыя і навучанне стымулююць узаемадзеянні, дыялог і абмен, і школы павінны быць адмыслова пабудаваныя для гэтай мэты. Школы ёсць формы калектыўнага жыцця, якія аб’ядноўваюць людзей дзеля навучання як ад іншых людзей, так і разам з імі, у розных узростах і на розных этапах жыцця. Магчымасці для дыстанцыйнага ці аддаленага навучання могуць падтрымліваць працу школ, але яны не могуць цалкам замяніць іх міжасабовы характар.

Нарастаючыя непрадбачаныя збоі, такія як глабальная пандэмія COVID-19 і эпідэмія ліхаманкі Эбола ў Заходняй Афрыцы, гвалтоўныя канфлікты і надзвычайныя сітуацыі кліматычнага характару, робяць унікальную ролю школ яшчэ больш відавочнай. Гэтыя выпадкі нагадалі нам аб важнасці школ для навучання, а таксама ў якасці цэнтраў грамадскага дабрабыту. Школа – адна з нешматлікіх устаноў, арыентаваных на абарону і забеспячэнне магчымасцяў для найбольш бедных і ўразлівых. Як цэнтры сацыяльнага жыцця, школы могуць прапанаваць магутную падтрымку ў самазабеспячэнні і развіцці ўстойлівых адносінаў як на мясцовым узроўні, так і з вонкавым светам. Напрыклад, ва ўмовах раптоўнага і беспрэцэдэнтнага масавага закрыцця школ у 2020 і 2021 гадах мільёны дзяцей і падлеткаў ва ўсім свеце былі пазбаўленыя доступу да сваіх школ, аднакласнікаў і настаўнікаў. Такі працяглы недахоп вочнага навучання глыбока адбіўся на сацыяльным, інтэлектуальным і псіхічным становішчы мільёнаў дзяцей і падлеткаў, які будзе адчувацца ўсё іх жыццё.

Незалежна ад узросту вучняў школы павінны спрыяць цікаўнасці і імкненню да ведаў. Вучні павінны сутыкацца з ідэямі і досведам, з якімі яны звычайна не сутыкаюцца дома ці ў сваім непасрэдным асяроддзі. Мэтанакіраваныя педагагічныя кантакты робяць школы незаменнымі. Унікальная з’ява сярод мноства іншых адукацыйных устаноў, школа – гэта месца навучання і выкладання. Людзі вучацца, а таксама здольныя выкладаць і навучацца. Гэта цудоўная дынаміка звязвае нас з агульным здабыткам ведаў праз прастору і час, праз пакаленні і спосабы пазнання, і яна звязвае нас між сабой. Няма школ без настаўнікаў. Настаўнікі спрыяюць выкананню педагагічнай місіі – зрабіць веды даступнымі для

ўсіх, стварыць калектыўныя мэты і магчымасці і садзейнічаць эмансіпацыйным інтэлектуальным пошукам. Настаўнікі таксама залежаць ад здаровага функцыянавання прасторы і часу школ, што павінны ўзмацняць і падтрымліваць іх працу.

## Агульныя гістарычныя абавязацельствы

Вылучаныя прасторы і час для набыцця ведаў, навыкаў, каштоўнасцей і разумення прысутнічаюць у большасці культур, дзе практыкі ведаў дасягнулі ўзроўню складанасці, які не можа быць вывучаны праз простае назіранне, паўтарэнне ці аповед. У многіх выпадках ранняе школьнае навучанне ўзнікала разам з развіццём пісьма. Цікава, што англійскае слова “школа” (school) паходзіць ад грэчаскага σχολή, якое азначае “вольны час”. І хоць грэчаская ўстанова паслужыла цэнтральнай мадэллю для развіцця адукацыі ў Еўропе, многія культуры стварылі свае ўстановы школьнага навучання, такія як ешыва, медрэсэ і кальмекак. Па меры таго, як школы развіваліся і распаўсюджваліся па свеце на працягу апошніх двух стагоддзяў, яны прымалі на сябе ролю аднаго з цэнтральных аб’ектаў грамадскай інфраструктуры для арганізацыі міжпакаленчага дыялогу аб тым, як жыць у свеце, ствараць розныя асяроддзі і клапаціцца аб іх. Школы дазваляюць нам знаёміцца з культурнай спадчынай, а таксама ўзнаўляць і пашыраць яе.

Школы сталі адным з ключавых прасторава-часавых кантынуумаў для мэтанакіраванай арганізацыі сустрэч з агульным здабыткам ведаў. Школы маюць магчымасць прасоўваць эпістэмічныя практыкі, уводзячы вучняў у багатыя традыцыі развагі, вывучэння, даследаванняў і пошукаў. Школьная дзейнасць і практыкаванні могуць спрыяць развіццю пэўнага стаўлення і адносінаў да ведаў. Больш вагі гістарычна надаецца перадачы ўсталяваных сцвярджэнняў ісціны (сцвярджэнняў праўдзівасці сістэмы поглядаў). Аднак значныя зрухі, якія адбыліся ў апошнія некалькі дзесяцігоддзяў, паставілі пад сумнеў прынятыя ў многіх школах метады прамога выкладання. Практыкі і культуры школьнага навучання, якія прадугледжваюць большую ступень удзелу, усё больш засяроджваюцца на выхаванні разумення таго, як ствараюцца і якія наступствы маюць зацверджаныя ісціны. Дылемы і выклікі, з якімі мы зараз сутыкаемся, могуць быць прадуктыўна вырашаныя праз забяспечванне развіцця шэрагу эпістэмных практык у школах і фарміраванне канструктыўных, больш шырокіх альянсаў паміж эпістэмалогіяй і экалогіяй ведаў.

На працягу ўсяго гэтага зруху ад прастораў перадачы ведаў да большай ступені ўдзелу і даследаванняў у школах, школьнае навучанне застаецца вельмі важным. Аднак, каб пазбегнуць нягнуткасці і захаваць чуйнасць да выклікаў свету, нам неабходна разуменне тых шматлікіх спосабаў пазнання, якія могуць быць зашыфраваныя ў часе і прасторах навучання, дзеля развіцця, а не збяднення чалавечага досведу. Застаецца яшчэ шмат працы па стварэнні прастораў і часу школьнага навучання, якія могуць спрыяць грамадскай дзейнасці ў міжпакаленчым навучанні.

## Неабходнае пераўтварэнне школ

Школы павінны стаць месцамі, дзе кожны можа фарміраваць і рэалізоўваць свае імкненні да пераўтварэнняў, зменаў і дабрабыту. Школы павінны ў першую чаргу дазваляць нам рэалізоўваць непрадбачаныя магчымасці як асабіста, так і ў калектыве. У многіх частках свету павышаны доступ да школьнага навучання забяспечыў асобам і цэлым супольнасцям трансфармацыйныя магчымасці павышаць свядомасць, развіваць новыя навыкі і разуменне і прадугледжваць новыя траекторыі навучання і развіцця. Аднак сённяшнія школы занадта часта служаць для паглыблення няроўнасці і пашырэння дыспарытэтаў, ад якіх трэба адвучвацца і якія трэба выпраўляць.

> Школы павінны ў першую чаргу дазваляць нам рэалізоўваць непрадбачаныя магчымасці як асабіста, так і ў калектыве.

Каб ажыццявіць глыбокія перамены, прынцыпы арганізацыі будучых школ павінны засяроджвацца на інклюзіі і супрацоўніцтве. Дасканаласць, дасягненні, якасць, вымярэнне і прагрэс – гэта таксама каштоўныя прынцыпы, якія можна пераглядзець, каб яны былі больш інклюзіўнымі, а не маргіналізуючымі.

Мы можам уявіць сабе гэтае новае школьнае асяроддзе як вялікую бібліятэку, дзе адны вучні вучацца паасобна, звязаныя з інтэрнэтам ці без яго, іншыя прад’яўляюць сваю працу аднакласнікам і настаўнікам. А яшчэ іншыя знаходзяцца па-за межамі бібліятэкі, у кантакце з людзьмі і светам па-за школай, магчыма, у аддаленых месцах. Бібліятэка падтрымлівае велізарную разнастайнасць сітуацый і прасторава-часавых кантынуумаў. Гэта новае асяроддзе вельмі адрозніваецца ад звычайнай структуры школы і класнага пакоя. Гэта бібліятэка можа ўспрымацца і ў метафарычным сэнсе, і літаральна. Яна нагадвае нам, што школьныя час і прастора павінны служыць у якасці парталаў для сувязі навучэнцаў з агульным здабыткам ведаў.

### Школа як месца для супрацоўніцтва, клопату і зменаў

Ператвараючыся ў інклюзіўнае і спрыяльнае супрацоўніцтву навучальнае асяроддзе, школы таксама павінны быць месцамі бяспекі, вольнымі ад гвалту і здзекаў, якія вітаюць навучэнцаў з іх адрозненнямі і разнастайнасцю. Калектыўнае і сумеснае навучанне не азначае аднолькавасць. Эфектыўнае сумеснае навучанне выкарыстоўвае адрозненні вучняў і настаўнікаў (у іх магчымасцях, здольнасцях, у тым ліку пазнавальных, інтарэсах і схільнасцях). З аднаго боку, навучанне можна разглядаць як асабістую вандроўку, у якую адпраўляецца кожны з нас. Сумеснае навучанне павінна быць інклюзіўным і роўным, без шкоды для індывідуальнасці навучэнцаў, якія ўдзельнічаюць у ім. Але, з іншага боку, навучанне – гэта таксама і калектыўная вандроўка, якая адбываецца ва ўзаемаадносінах з іншымі.

Самаадукацыя важная як частка больш шырокай карціны, паколькі індывідуальная і калектыўная функцыі адукацыі сумесна рухаюць і ўзмацняюць адна адну. Хоць мы

не можам вучыцца за іншых, разам мы можам вывучыць больш. Тое, што мы ведаем, залежыць ад таго, што ведаюць іншыя, і наадварот. Адукацыя ўзнікае менавіта ў нашых узаемаадносінах і ўзаемазалежнасцях. Эфектыўнае калектыўнае навучанне ўжо адбываецца ў многіх натхняльных школах па ўсім свеце. Аднак школы паўсюдна павінны быць лепш арыентаванымі на гэтыя ўзаемаадносіны і ўзаемазалежнасці.

Школы і настаўнікі робяць незаменную справу, падтрымліваючы навучэнцаў. Шмат хто можа паказаць на настаўніка ці школьны досвед, якія станоўча змянілі іх жыццё. У той самы час школы занадта часта выключаюць, маргіналізуюць і распаўсюджваюць няроўнасць. У свеце каля паловы вучняў заканчваюць сярэднюю адукацыю, не дасягнуўшы нават мінімальных узроўняў валодання асноўнымі кампетэнцыямі – гэта непрымальны вынік і няздольнасць школ выканаць свае абавязкі перад іх вучнямі і грамадствамі. Трэба забяспечыць магчымасць дынамічных зменаў у бок адаптыўных і трансфармацыйных школ, і гэта цалкам магчыма, як нам паказваюць прыклады з усяго свету.

Школа можа толькі выгадаць ад больш шчыльнай сувязі з іншымі адукацыйнымі прасторамі. Склаўся відавочны кансэнсус сярод мільёна ўдзельнікаў ініцыятывы "Будучыня адукацыі": планаванне школ (у сэнсе праектаў будынкаў, навучальных праграм, арганізацыі класаў і навучальнай дзейнасці) патрабуе зменаў. Натхнёныя бачаннем адукацыі ў 2050 годзе аўтары мастацкіх твораў прадбачаць адыход ад расстаўленых радамі сталоў і парт. Некалькі панэляў з удзелам адукацыйных наватараў прапаноўвалі шляхі пераўтварэння школ, калі мы належным чынам вызначым спосабы, якімі навучанне будзе адбывацца ў розныя часы і ў розных месцах: напрыклад, размякчаючы муры паміж класамі і вонкавым светам і канцэптуальна разглядаючы ўрокі як падарожжы. Увогуле школы для будучых пакаленняў павінны выглядаць і ўспрымацца інакш, зрабіўшыся больш інклюзіўнымі, прывабнымі, займальнымі і актуальнымі.

Яны павінны стаць месцамі, дзе вучні вучацца жыць устойліва і несці гэтыя погляды да сваіх родных і ў свае супольнасці. Ёсць вялікі патэнцыял у "зялёных" школ і ў пераводзе адукацыі на вугляродную нейтральнасць. Вучні могуць пракладаць шлях у гэтай працы, развіваючы веды і навыкі, якія дапамогуць ім будаваць зялёную эканоміку, якой вельмі не хапае нашаму свету.

Каб дасягнуць таго, чаго мы ад іх чакаем, школы павінны парваць з жорсткімі, аднолькавымі арганізацыйнымі мадэлямі, якія характарызуюць вялікую частку іх гісторыі апошнія два стагоддзі. Абнаўленне жыццёва неабходнае. Крыніцу разумення будучыні даюць аграмадныя намаганні ў дзевятнаццатым і дваццатым стагоддзях, якія стварылі інфармацыйную аснову для вядомых нам сёння канвенцыйных школьных мадэляў. На працягу апошніх ста пяцідзесяці гадоў архітэктары, эксперты ў галіне аховы здароўя, філосафы, дзяржаўныя служачыя, педагогі, супольнасці і сем'і абапіраліся на адукацыйныя погляды, якія праходзяць праз доўгую гісторыю чалавецтва, для пашырэння магчымасцяў адукацыі. З часам гэта надало матэрыяльную форму – напрыклад, у выглядзе школьных будынкаў і класных памяшканняў – незвычайным сацыяльным установам масавай народнай асветы. Сёння патрабуюцца такія ж фантазія, асэнсаванне, рашучасць

і супрацоўніцтва, каб надаць матэрыяльную форму новым школам, арыентаваным на больш справядлівую і раўнапраўную сумесную будучыню.

## Ад класаў да супольнасці навучэнцаў

Ва ўсім свеце класныя памяшканні сталі асноўнымі адукацыйнымі месцамі выкладання і навучання ў школах. Калі ўявіць новае месца для інклюзіі і супрацоўніцтва, хутчэй за ўсё, паняцце “клас” як “памяшканне” можна пакінуць у мінулым. Пры гэтым не трэба адмаўляцца ад каштоўнасці, якую ўяўляе сабой прыналежнасць да вызначанай і разнастайнай суполкі таварышаў па вучобе.

У традыцыйных школьных мадэлях шмат высілкаў было выдаткавана на класіфікацыі вучняў па ўзросце, дасягненнях, здольнасцях ці гендары. Наадварот, настаўнікам трэба даць магчымасць развіваць, эксперыментаваць і адаптаваць групы вучняў, якія ўтвараюцца ў школах. Часам лепш мець меншыя групы навучэнцаў, часам – большыя. Аднак каштоўнасць прыналежнасці да суполкі навучэнцаў ёсць рыса школы, якую трэба ўзмацняць. Вучні могуць быць больш не абмежаванымі традыцыйнымі памяшканнямі класаў у будучых школах, аднак ім па-ранейшаму будзе патрэбна ўстойлівае ўзаемадзеянне з аднакласнікамі, з усёй той радасцю і з тымі сязьмі, якія суправаджае сумеснае навучанне.

> Вучні могуць быць больш не абмежаванымі традыцыйнымі памяшканнямі класаў у будучых школах, аднак ім па-ранейшаму будзе патрэбна ўстойлівае ўзаемадзеянне з аднакласнікамі.

Трэба таксама пераасэнсаваць чаканні ад навучання ў класе. Занадта многа дзе ў свеце дзеці і моладзь сядзяць увесь дзень, пасіўна ўспрымаючы вялікія аб’ёмы інфармацыі. Гэта норма ўбудаваная ў архітэктуру школ, дызайн мэблі, прадметы і матэрыялы, якія прысутнічаюць у класных пакоях. Ціхі, паслухмяны вучань зрабіўся сінонімам канцэнтрацыі і прадукцыйнасці. Занадта часта прафесійнае выкладанне атаясамліваецца з падтрыманнем парадку і знішчэннем “залішняга” шуму ці руху. Калі нерухомасць разглядаецца як патрабаванне для навучання, школа і яе класы робяцца стомнымі і непрыемнымі месцамі. Глыбокая, імерсійная, абсарбіруючая ўвага можа мець каласальнае адукацыйнае значэнне. Аднак вы павінны задаць пытанне: ці спрыяе гэтаму належным чынам арганізацыя нашых сучасных класаў і школ?

Як бы мы ні былі абавязаны абараняць грамадскі простор школы, яна не павінна змяшчацца ў чатырох сценах. Школа можа быць адкрытай і гнуткай, выкарыстоўваць вялікі шэраг грамадскіх, культурных і прыродных рэсурсаў. Абмежаванне адукацыі шаблоннымі класнымі памяшканнямі абмяжоўвае навучанне і звужае дыяпазон перспектыў і магчымасцяў, якія павінны ствараць школы.

## Структуры для падтрымкі дыверсіфікаванай педагогікі

Урокі і расклады патрабуюць перафармулёўкі. Урок выконвае важную функцыю канцэнтрацыі ўвагі групы вучняў на сумеснай справе і з'яўляецца важным механізмам структуравання адукацыйных кантактаў і правядзення дыялогу паміж пакаленнямі. Аднак традыцыйныя схемы ўрокаў таксама маюць значныя абмежаванні, асабліва калі яны вызначаюцца выключна як фіксаваны адрэзак часу, які паўтараецца штодня ці штотыдзень.

Урок павінен саступіць педагогіцы, якая шануе разнастайнасць метадаў і мадальнасцяў вучэння і навучання. Існуе шмат іншых спосабаў аб'яднаць людзей для агульнай справы, выкарыстоўваючы разнастайныя мадальнасці вучэння і навучання, якія звяртаюцца да міжпакаленчага і міжкультурнага абмену і грунтуюцца на высокіх здольнасцях і ведах настаўнікаў. Напрыклад, адукацыйныя падыходы на аснове вырашэння праблем і праектаў могуць прапанаваць больш шырокі ўдзел і супрацоўніцтва, чым традыцыйныя ўрокі. Методыкі, заснаваныя на пошуках і практычных даследаваннях, могуць прыцягваць вучняў да адначасовага набыцця, выкарыстання і стварэння ведаў. Методыкі, якія прадугледжваюць удзел супольнасці і навучанне аказанню паслуг, могуць надаць навучанню моцнае пачуццё сэнсу, калі яны ажыццяўляюцца са сціплай пазіцыі навучання. Значная перапрацоўка арганізацыі школьнага навучання неабходна, каб такія методыкі надавалі поўную магчымасць развіваць здольнасці вучняў да сумеснай працы і пашыраць нашы здольнасці да калектыўных разважанняў і дзеянняў у духу салідарнасці.

## Лічбавая сфера ў дапамогу школе

Калі лічбавыя камунікацыйныя тэхналогіі дазваляюць вучням злучацца з іншымі людзьмі, якія маюць падобныя інтарэсы і пытанні, яны падтрымліваюць працу настаўнікаў і школ. Лічбавая сувязь значна павышае даступнасць інфармацыі, тэкстаў і мастацкіх формаў з усяго свету для настаўнікаў і вучняў. Цяпер калекцыі найвялікшых бібліятэк і музеяў свету могуць быць даступныя ў любым месцы і ў любы час. Лічбавыя інструменты таксама дазваляюць вучням ствараць відэа, рабіць мультымедыйныя прэзентацыі, распрацоўваць камп'ютарныя гульні і прыкладныя праграмы, якія выносяць іх творчыя ідэі ў свет.

> Пандэмія даказала, што школу нельга цалкам перанесці ў віртуальныя прасторы.

Лічбавыя прылады маюць наватарскі патэнцыял для падтрымкі інавацыйных форм выкладання і навучання ў школах. Лічбавыя інструменты таксама карысныя для прасоўвання эфектыўных зносін паміж бацькамі, настаўнікамі і вучнямі, у сваю чаргу дапамагаючы бацькам падтрымліваць школьнае навучанне іх дзяцей.

Пандэмія даказала, што школу нельга цалкам перанесці ў віртуальныя прасторы. Нават у раёнах з высокім узроўнем пранікнення інтэрнэту і адносна роўнай даступнасцю прыладаў поўнае ці частковае закрыццё школьных будынкаў падчас перабояў пралівае новае святло на значэнне сумеснай фізічнай і грамадскай прысутнасці ў школах. Віртуальныя

класы, доступ да якіх можна атрымаць дома, уяўляюць сабой абмежаваную замену таго, што могуць прапанаваць фізічныя школьныя лакацыі.

Імправізацыі і эксперыменты падчас выклікаў і парушэнняў – ад пандэміі COVID-19 да адукацыі падчас іншых надзвычайных сітуацый – паказалі рашучасць, адданасць і вынаходлівасць настаўнікаў і вучняў. Напрыклад, у той час, калі многія сістэмы школьнага навучання ўсвядомілі, што на першым месцы павінны быць асабістыя патрэбы і сацыяльнае забеспячэнне, тэсты былі адкладзеныя, патрабаванні навучальных праграм да ахопу зместу былі часова скасаваныя, і ўзаемадзеянні ў класе засяроджваліся на аўтэнтычным навучанні і дабрабыце. Падчас COVID праца настаўнікаў стала больш бачнай для грамадства, асабліва для бацькоў. Высокі ўзровень экспертных ведаў і педагагічнага ўзаемадзеяння, якія патрабуюцца ад настаўнікаў, адначасова сталі шанавацца і папалі пад пільную ўвагу грамадства. Некаторыя вучні адчулі камфорт у анлайнавай і дыстанцыйнай адукацыі, і іх станоўчы досвед нагадвае нам, што будучыя школы павінны быць арыентаванымі на вучняў такім чынам, каб падтрымліваць сацыяльнае, эмацыйнае, кагнітыўнае і маральнае развіццё цэльнай асобы. Фарміраванне сацыяльнага вымярэння навучання таксама прадугледжвае падтрымку грамадзянскага выхавання ў свеце, які робіцца ўсё больш узаемазвязаным, каб дазволіць нам клапаціцца адзін аб адным, прымаць пункты гледжання і досвед іншых людзей і ўдзельнічаць у адказнай працы з асяроддзем і нашымі сумеснымі прыроднымі рэсурсамі. Лічбавыя сродкі самі па сабе не могуць дасягнуць гэтых мэтаў. Неабходна навучанне ў школах і па-за межамі школ, якое прадугледжвае ўдзел і ўзаемадзеянне.

Школы павінны быць месцамі, дзе вучні больш цесна звязаныя з магчымасцямі, якія прапануе ім будучыня, чым з абмежаваннямі іх мінулага. Прынцып роўных магчымасцяў накіраваны на тое, каб даць вучням, незалежна ад іх паходжання, магчымасць не быць абмежаванымі спадзяваннямі іншых людзей, каб сацыяльнае паходжанне не было сацыяльным лёсам і будучыня магла быць лепшай за мінулае, як для асобных людзей, так і для грамадстваў.

Ключавая праблема большасці форм машыннага навучання зводзіцца да таго, што яна можа толькі ствараць будучыню, гледзячы ў мінулае. Даследаванні паказваюць, што тыя ж стэрэатыпы, гендарныя перадузятасці і расізм, якія прысутнічаюць у прыняцці рашэнняў людзьмі, яшчэ больш укараніліся ў лічбавых платформах па той простай прычыне, што машыны “навучаюцца” на наборах даных, якія змяшчаюць тыя ж перадузятасці, якія назіраюцца ў сучасным грамадстве. Гэта таксама тычыцца алгарытмаў, якія служаць падмуркамі для большасці заснаваных на тэхналогіях персаналізаваных навучальных праграм. Вучань, які праходзіць такі курс навучання, будзе вядомы і вызначаецца толькі ў сувязі з яго мінулымі паказчыкамі: колькі задач былі вырашаны няправільна апошні час, якія слабыя месцы былі выяўлены. Гэта пакідае малы прастор для вынаходніцтва, самапазнання і ўсведамлення магчымасцяў, якім павінны спрыяць школы.

Настаўнікі могуць стаць праекціроўшчыкамі персаналізаванага навучання, грунтуючыся на розных наборах дапушчэнняў, арыентуючыся не на мінулыя асабістыя няўдачы,

а на магчымасці ўзаемадзеяння і прыналежнасці. Лічбавыя сродкі могуць падтрымаць выкладанне і навучанне ў многіх формах. Аднак менавіта нашы міжасабовыя кантакты і моцныя ўзаемасувязі (не толькі паміж настаўнікамі і вучнямі, але таксама сярод вучняў і сярод настаўнікаў) забяспечваюць супрацоўніцтва, якое дазваляе вучням дакрануцца да багацця і разнастайнасці сумеснага здабытку ведаў чалавецтва, падтрымліваць інтэлектуальны рост і рабіць магчымым сумеснае стварэнне справядлівай і ўстойлівай будучыні.

Школы – гэта таксама месцы, дзе мы можам навучыць вучняў адносіцца да лічбавых прастораў і асяроддзяў як да падлеглых зменам і недасканалых стварэнняў чалавека. Праграмаванне і вылічальнае мысленне ўзніклі як стрыжнёвыя прадметы ў многіх адукацыйных сістэмах; яны дапамагаюць асвятляць спосабы, якімі ўзведзены нашы лічбавыя збудаванні, і даюць наборы як практычных, так і тэарэтычных інструментаў для іх перабудовы. Простае спажыванне лічбавых сродкаў, нават адукацыйных, зрэдку надае навучэнцам мінімальна неабходную дыстанцыю, каб абмяркоўваць новыя магчымасці лічбавізацыі. Розныя ўмовы, стымулы, напрамкі, логіка і функцыянал магчымыя для тэхналогій і сетак, якія злучаюць нас і якія ствараюць інфармацыйны падмурак значнай часткі нашага мыслення. З гэтых прычын адукацыя павінна ставіцца да лічбавых узаемадзеянняў як да аб'ектаў пошукаў і вывучэння, а не толькі як да сродкаў дасягнення мэтаў навучальных праграм. Фармальная адукацыя павінна ўключаць дыскусіі аб лічбавых правах, наглядзе, уласнасці, прыватнасці, уладзе, кантролі і бяспецы. Часта ўзгадваюць, што мы можам аднойчы апынуцца ў лічбавых сусветах, аднак да пэўнай ступені і ў некаторых месцах гэта ўжо адбылося. У некаторых краінах сярэдні чалавек нярэдка праводзіць больш за дзесяць гадзін у дзень анлайн, пагружаны ў лічбавыя тэхналогіі. Школы павінны дапамагаць вучням навучыцца быць паспяховымі ў гэтых умовах і выкарыстоўваць іх, каб тварыць, спраўляцца з выклікамі і расці. Школы павінны прапагандаваць этыку чалавечага кантролю – як калектыўнага, так і асабістага – над тэхналогіямі.

## Стварэнне культуры супрацоўніцтва

Школы цалкам здольныя прасоўваць супрацоўніцтва, калектыўнае лідарства, калектыўнае навучанне і няспынны рост у бок больш справядлівай і раўнапраўнай будучыні. Аднак нармалізацыя гэтага ў якасці цэнтральнай мэты школьнага навучання будзе патрабаваць развіцця новых магчымасцяў сярод настаўнікаў, адміністратараў і супрацоўнікаў школ. Адказнасць школ павінна змяніцца з рэжыму выканання патрабаванняў на сумеснае вызначэнне мэтаў і сумесную ацэнку. Школьнае кіраўніцтва павінна садзейнічаць прафесійнай калегіяльнасці, аўтаноміі і ўзаемадапамозе, а не камандаванню і кантролю. Школы, якія прасоўваюць супрацоўніцтва паміж вучнямі, таксама павінны прасоўваць яго паміж настаўнікамі. Гэта падтрымліваецца школьнай культурай, якая прасоўвае бесперапыннае прафесійнае развіццё настаўнікаў, адміністратараў і супрацоўнікаў. Коўчынг, куратарства, індывідуальныя і групавыя заняткі, практычныя даследаванні і навуковае супрацоўніцтва з іншымі школамі і з універсітэтамі – усё гэта дапамагае перавынайсці школу як навучальную арганізацыю.

Ва ўсім свеце сотні тысяч настаўнікаў і безліч школ ужо зрабілі крокі наперад у гэтых напрамках. Напрыклад, у розных раёнах пражывання карэнных народаў школы пераасэнсоўваюцца, каб спрыяць навучанню і ўзаемадзеянню як паміж культурамі, так і з больш чым чалавечым светам, чэрпаючы з міжпакаленчых ведаў, ведаў продкаў, на мове і на практыках даследаванняў. У іншых выпадках школы арганізуюцца ў напрамку пошуку, што ўключае канструктыўны ўдзел грамады і творчыя калектыўныя справы. Прагрэс сярэдняй спецыяльнай адукацыі таксама знішчае штучны разрыў паміж тэорыяй і практыкай праз пераасэнсаваныя формы вучнёўства, змястоўныя курсы і эфектыўнае выкладанне.

Нам патрэбныя школы, якія атаясамліваюць сябе з глабальнай салідарнасцю, якія прыхільныя абмену ведамі з іншымі школамі і паміж народамі і прысвячаюць сябе абнаўленню і аднаўленню ў якасці грамадскіх месцаў і асяроддзяў супрацоўніцтва. Школы адыгрываюць важную ролю ў агульным умацаванні адукацыі як грамадскага дабра.

## Пераход ад школы да вышэйшай адукацыі

Гістарычна склалася так, што за межамі педагагічных факультэтаў, універсітэтаў і каледжаў мала ўвагі надавалася пачатковай і сярэдняй адукацыі. Аднак у апошнія дзесяцігоддзі з’явілася ўсведамленне таго, што многія праблемы ўніверсітэтаў і каледжаў, звязаныя з дасягненнямі студэнтаў, павінны вырашацца да пачатку вышэйшай адукацыі. Ад матэматыкі да прыродазнаўчых навук, ад літаратуры да філасофіі быў распрацаваны цэлы шэраг пераходных і ўзбагачальных праграм для ўзмацнення сувязей паміж вышэйшай адукацыяй і школамі, часта для таго, каб забяспечыць удзел гістарычна недастаткова прадстаўленых груп. У той жа час голас універсітэцкіх даследчыкаў зрабіўся больш чутным у агульных дэбатах па пытаннях адукацыі.

Ніякія меркаванні адносна ролі вышэйшай адукацыі не могуць абмінуць пытанняў непазбежных сувязей з пачатковай і сярэдняй адукацыяй, а таксама з навучаннем дарослых і пазашкольнай адукацыяй. Для таго, каб навучэнцы маглі дабівацца поспехаў у вышэйшай адукацыі і па-за яе межамі ў 2050 годзе, трэба звязаць каштоўнасці і арганізацыю на ўсіх узроўнях адукацыі. Будучыя палітычныя праграмы вышэйшай адукацыі павінны ахопліваць усе ўзроўні адукацыі і ў большай ступені ўлічваць нетрадыцыйныя траекторыі і шляхі адукацыі. Прызнанне ўзаемазвязанасці розных узроўняў і тыпаў адукацыі гаворыць аб неабходнасці сектаральнага падыходу да далейшага развіцця вышэйшай адукацыі, заснаванага на навучанні на працягу ўсяго жыцця. Партнёрскія сувязі паміж школьнымі сістэмамі і ўніверсітэтамі могуць спрыяць пераасэнсаванню і ўзмацненню адукацыі. Універсітэцкія бібліятэкі і даследчыя цэнтры могуць падтрымліваць вучняў пачатковага і сярэдняга

> Будучыя палітычныя праграмы вышэйшай адукацыі павінны ахопліваць усе ўзроўні адукацыі і ў большай ступені ўлічваць нетрадыцыйныя траекторыі і шляхі адукацыі.

ўзроўняў. Веды і досвед універсітэцкіх прафесараў павінны быць даступнымі для мясцовых школ. Такія партнёрскія сувязі ўзмацняюць інстытуцыйны патэнцыял сістэм адукацыі па распрацоўцы і рэалізацыі рашэнняў. Яны таксама даюць універсітэтам магчымасць больш свядома інтэграваць свае тры стрыжнёвыя функцыі – даследаванні, выкладанне і далучэнне грамадскасці – у грамадскую дзейнасць па найбольш значных пытаннях нашых дзён.

## Прынцыпы дыялогу і дзейнасці

У гэтым раздзеле прапануецца, каб у новым сацыяльным кантракце на адукацыю школы былі абароненымі месцамі адукацыі ў сувязі з інклюзіяй, роўнасцю, а таксама асабістым і калектыўным дабрабытам, якія яны падтрымліваюць, – і адначасова пераасэнсаванымі, каб больш эфектыўна прасоўваць пераўтварэнне свету ў бок больш справядлівай, раўнапраўнай і ўстойлівай будучыні. У перспектыве да 2050 года ёсць чатыры прынцыпы, якія могуць накіроўваць дыялог і дзейнасць, неабходныя для выканання гэтай рэкамендацыі:

- **Школы павінны быць абароненыя ў якасці месцаў, дзе вучні сутыкаюцца з выклікамі і магчымасцямі, недасяжнымі для іх у іншых месцах**. Калі б школы не існавалі, нам бы прыйшлося іх вынайсці. Мы павінны забяспечыць, каб школы аб'ядноўвалі разнастайныя групы людзей, каб вучыцца адзін ад аднаго і разам з іншымі.

- **Стварэнне калектыўных магчымасцяў павінна накіроўваць перапланаванне школ**. Архітэктура, прасторы, час, расклады і групаванне вучняў павінны планавацца для нарошчвання патэнцыялу супрацоўніцтва людзей. Культура супрацоўніцтва павінна панаваць у адміністрацыях і кіраўніцтве школ, а таксама ў адносінах паміж школамі.

- **Лічбавыя тэхналогіі павінны быць накіраваны на падтрымку школ, а не на іх замену**. Мы павінны выкарыстоўваць лічбавыя інструменты для павышэння крэатыўнасці вучняў і паляпшэння зносін паміж імі. Калі штучны інтэлект і лічбавыя алгарытмы ўводзяцца ў школы, мы павінны забяспечыць, каб яны не паўтаралі існуючыя стэрэатыпы і сістэмы выключэння.

- **Школы павінны мадэляваць будучыню, да якой мы імкнёмся, забяспечваючы правы чалавека і робячыся прыкладамі ўстойлівасці і вугляроднай нейтральнасці**. Вучням трэба давяраць і ставіць ім задачу ўзначаліць шлях да азелянення сектара адукацыі. Мы павінны забяспечыць, каб усе адукацыйныя стратэгіі былі ўстойлівымі і прасоўвалі правы чалавека.

Калі мы ствараем новы сацыяльны кантракт на адукацыю, кожны павінен паўсюль чэрпаць натхненне з гэтых чатырох прынцыпаў адносна захавання і пераўтварэння школы – адной з найбольш важных і магутных адукацыйных устаноў чалавецтва.

# Раздзел 7

## Адукацыя ў розныя часы і ў розных прасторах

Горад робіцца адукацыйным праз неабходнасць адукацыі, навучання, выкладання, ведання, тварэння, мараў і асэнсавання таго, што ўсе мы – мужчыны і жанчыны, якія займаюць яго палі, горы, даліны, рэкі, вуліцы, плошчы, фантаны, жылыя і нежылыя дамы, – пакідаем на ўсім адбітак пэўнага часу і стылю, смак пэўнай эпохі…
Горад – гэта мы, і мы – гэта Горад.

**Паўлу Фрэйрэ (Paulo Freire)**, "Палітыка і адукацыя", 1993 год

**У новым сацыяльным кантракце на адукацыю мы павінны выкарыстоўваць і пашыраць адукацыйныя магчымасці ўзбагачэння, якія назапашваюцца на працягу жыцця і ў розных культурных і сацыяльных прасторах.**

Шмат хто сёння лічыць, што адукацыя ў першую чаргу накіравана на дзяцей і моладзь з мэтай падрыхтаваць іх да дарослага жыцця. У значнай частцы грамадскіх дыскусій існуе меркаванне, што адукацыя сінанімічная тым спецыялізаваным установам, якія дзейнічаюць на адноснай адлегласці ад сем'яў вучняў і ад грамадства. Спецыялізаваныя ўстановы выявілі карысць для захавання вызначаных часу і месца калектыўнага выкладання і навучання. Адукацыя ў школах зрабілася важным прасторава-часавым кантынуумам чалавечага досведу са сваімі ўласнымі адметнымі характарыстыкамі. Прыярытэт дзяцей і моладзі мае важнае значэнне для прасоўвання раўнапраўя і доступу да магчымасцяў.

Аднак дыскусія аб адукацыі абмяжоўваецца толькі фармальнымі ўстановамі і не ахоплівае багатыя адукацыйныя магчымасці, якія ўвогуле існуюць у грамадстве і паміж грамадствамі. Асноўны прынцып сацыяльнага кантракта на адукацыю, які прапануецца ў гэтым дакладзе, ёсць права на адукацыю для ўсіх на працягу жыцця. Гэты прынцып улічвае той факт, што, паколькі навучанне ніколі не заканчваецца, то і адукацыя павінна далей пашырацца і ўзбагачацца ва ўсе часы і паўсюдна. Гэты прынцып мае велізарныя наступствы для ўсіх узроўняў грамадства і нашага калектыўнага жыцця – для нашых супольнасцей, гарадоў, вёсак і мястэчак, для нашых нацыянальных характараў і культурных сістэм, а таксама для нашых рэгіянальных і міжнародных супольнасцей. Праца, догляд, адпачынак, заняткі мастацтвам, культурныя практыкі, спорт, грамадскае і супольнае жыццё, сацыяльная дзейнасць, інфраструктура, выкарыстанне лічбавых і медыйных інструментаў – усё гэта і шмат іншага з'яўляецца патэнцыйна адукацыйнымі, педагагічнымі і значнымі навучальнымі магчымасцямі для нашай сумеснай будучыні. Новы сацыяльны кантракт на адукацыю павінен прадугледжваць патрэбу і каштоўнасць дынамічных культур навучання ва ўсе часы і ва ўсіх прасторах.

Адна з нашых галоўных задач – пашырыць наша ўяўленне аб тым, дзе і калі адбываецца адукацыя. Гэты новы неадкладны выклік утварыўся 50 гадоў таму ў дакладзе Камісіі Фор, у якім было вызначана бачанне "адукацыйнага горада" ў спробе пераасэнсаваць адукацыйныя сістэмы. Перакладзены па-рознаму на іншыя мовы (напрыклад, на англійскую як "грамадства, якое навучаецца" – learning society), "горад" ёсць метафара месца, якое задзейнічае ўсе верагоднасці і магчымасці, асабліва ў іх узаемазвязанасці. Яна грунтуецца на ідэі, што мы павінны мець цэласнае ўяўленне аб багацці і разнастайнасці прастораў і сацыяльных мерапрыемстваў, якія падтрымліваюць адукацыю, а таксама ўсіх, хто ў ёй удзельнічае.

Згодна з сённяшнімі ўсталяванымі схемамі, адукацыя наогул пачынаецца ў 5 ці 6 гадоў і дасягае канчатковай кропкі каля дзесяцігоддзя пасля гэтага. Гэты дыяпазон пашырыўся з гадамі, і было зроблена шмат намаганняў, каб распаўсюдзіць адукацыйны працэс на ранняе дзяцінства, звяртаючы ўвагу нават на нованароджаных і немаўлят, а таксама

на дарослых на працягу жыцця. У першым выпадку адукацыя ў раннім дзяцінстве разглядаецца сама па сабе як істотны адукацыйны момант, нягледзячы на тое, што яна часта фармальна вызначаецца як "дапачатковая" падрыхтоўка да школьнага навучання. У другім выпадку – часта з пункту гледжання "іншых шанцаў" ці перападрыхтоўкі на працоўных месцах і ССА – адукацыя дарослых набыла цэнтральнае месца ў адукацыйнай палітыцы і стратэгіях у большасці краін свету, нягледзячы на тое, што яна часта фармальна вызначаецца як працяг школы.

Мы маем на ўвазе, што заснаваныя на "школьным фармаце" мадэлі адукацыі часта пераважвалі ў дашкольнай адукацыі і адукацыі дарослых, скарачаючы магчымасці іншых і адметных форм адукацыі. Сапраўды, існуе даўняя традыцыя супраціву гэтаму распаўсюджванню "школьнага фармату" на групы пэўных узростаў і характарыстык, якія па гэтай прычыне павінны мець розныя адукацыйныя працэсы і рамкі.

У выпадку дашкольнай адукацыі гэта традыцыя добра ўсталявалася з прыняццем розных адукацыйных стратэгій, у значнай ступені засяроджаных на прызнанні каштоўнасці эксперыментавання і дабрабыту, а таксама афектыўных, сэнсарных і міжасабовых вымярэнняў. Шмат хто нават верыць, што пераўтварэнне школы з пункту гледжання новай арганізацыі прасторы і часу павінна браць натхненне ў больш адкрытых і гнуткіх мадэлях дашкольнай адукацыі.

Гэтая традыцыя яшчэ больш відавочная ў сферы адукацыі дарослых, дзе на працягу дзесяцігоддзяў узнікала безліч прапаноў "вызваліць ад школы" адукацыю дарослых, то бок прыняць формы і працэсы, якія ўлічваюць аўтаномію дарослых, іх жыццёвы і працоўны досвед, калі навучанне адбываецца па-за рамкамі фармальнай школы. Гэта прапановы па эмансіпацыі адукацыі, якія супрацьстаяць абесчалавечваючым, прыгнятаючым і каланізатарскім сістэмам і імкнуцца надаць дарослым паўнамоцтвы ў іх адносінах з адукацыяй.

Аднак, нягледзячы на гэтыя формы супраціву, нельга адмаўляць, што "школьны фармат" пашырыўся і ўключае дашкольную адукацыю і адукацыю дарослых менавіта з гегемоніяй тэндэнцый да навучання на працягу жыцця. Каб асэнсаваць адукацыю да 2050 года, мы павінны зразумець важнасць усіх прастораў, усіх часоў і форм адукацыі. Гэта, аднак, не азначае, што мы пераўтвараем свет у велізарны класны пакой. Асноватворны зрух у мысленні, які мы павінны зрабіць, гэта разуменне таго, што сённяшнія грамадствы маюць незлічоныя адукацыйныя магчымасці праз культуру, працу, сацыяльныя СМІ і лічбавыя сродкі, якія трэба адпаведна ўлічваць і развіваць як важныя адукацыйныя магчымасці. На працягу далейшых 30 гадоў адным з цэнтральных аспектаў новага сацыяльнага кантракта на адукацыю будзе разуменне таго, як адукацыя пераплятаецца з жыццём. Такім чынам, абараняючы школы як унікальныя адукацыйныя прасторава-часавыя кантынуумы, мы таксама павінны пашырыць наша бачанне на ўсе прасторы і ўсе часы жыцця.

Гэты раздзел пачынаецца з абмеркавання мноства адукацыйных месцаў і магчымасцяў, якія існуюць; у ім сцвярджаецца, што мы павінны накіраваць нашы высілкі на забеспячэнне

Абараняючы школы як унікальныя адукацыйныя прасторава-часавыя кантынуумы, мы таксама павінны пашырыць наша бачанне на ўсе прасторы і ўсе часы жыцця.

падтрымкі інклюзіі і рэагавання на новыя выклікі. Далей разгледжана важная роля, якую адыгрываюць дзяржавы ў забеспячэнні рэалізацыі права на адукацыю, а таксама неабходнасць у кіраванні лічбавымі прасторамі для забеспячэння тэхналагічнай падтрымкі пераасэнсавання адукацыі такімі спосабамі, якія будуць служыць нашай агульнай будучыні. Біясфера Зямлі таксама з'яўляецца важнай адукацыйнай прасторай, якую нельга выпускаць з-пад увагі. Раздзел заканчваецца шэрагам Кіруючых прынцыпаў дыялогу і дзейнасці да 2050 года, якія ўяўляюць асаблівую цікавасць як для ўрадаў, так і для арганізацый грамадзянскай супольнасці, у тым ліку: падкрэсліванне важнасці інклюзіўнай адукацыі дарослых; асэнсаванне новых навучальных прастораў; узмацненне фінансавання; і пашырэнне права на адукацыю.

## Накіраванне адукацыйных магчымасцяў у бок інклюзіі і ўстойлівасці

Для аптымальнай працы кіраванне адукацыяй павінна прызнаваць і шанаваць "капілярнасць", "порыстасць" і паўсюднасць адукацыйных устаноў, грамадскіх устаноў і часовых узаемаадносін. Пры гэтым забеспячэнне падтрымкі інклюзіі і ўстойлівасці разнастайнымі дзеячамі патрабуе супрацоўніцтва і абавязацельстваў, якія забяспечваюць нязменны доступ для ўсіх – як фармальных, так і нефармальных – адукацыйных магчымасцяў.

Этыка інклюзіі павінна накіроўваць нашы калектыўныя высілкі па рэгуляванні адукацыі на аснове прынцыпаў інклюзіўнага планавання. Зыходзіць трэба з тых людзей, якія, як правіла, маргіналізуюцца, і з тых абставін, якія з'яўляюцца найбольш уразлівымі і нестабільнымі. Без дакладных і інклюзіўных каштоўнасцей адукацыйныя экасістэмы могуць зрабіцца нездаровымі і паталагічнымі. Пытанні ўлады, прывілеяў, эксплуатацыі і прыгнёту могуць паўстаць у любых адукацыйных адносінах. Занадта часта адукацыйныя праграмы і ўстановы прыводзяць да паразаў і выключэнняў; этнічныя групы, карэнныя народы і іншыя маргіналізаваныя групы могуць быць змушаныя пакінуць фармальную адукацыю. Уцекачы і інваліды могуць атрымліваць асабліва дрэнныя паслугі. Больш шырокі падыход да адукацыйных сістэм робіць больш выразны акцэнт на ланцуговых рэакцыях і ўзаемазвязаных эфектах паміж установамі, дзеячамі і прасторамі, дзякуючы чаму такія хібы цяжка больш не заўважаць.

### Роля ўрадаў і дзяржаў

Існуе глабальны кансэнсус адносна таго, што адукацыя з'яўляецца асноўным правам чалавека, якое надае магчымасці, і што дзяржавы і грамадствы маюць асаблівы абавязак забяспечыць рэалізацыю гэтага права для ўсіх дзяцей, моладзі і дарослых. Адпаведна

з гэтым, урады і дзяржавы адыгрываюць крытычную ролю ў адукацыйных экасістэмах і маюць значныя абавязкі, за якія яны павінны несці адказнасць.

Замацаванае ў артыкуле 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека права на адукацыю было далей разгорнута ў шэрагу дагавораў, якія з'яўляюцца юрыдычна абавязковымі для дзяржаў. Сярод іх Канвенцыя 1960 года супраць дыскрымінацыі ў адукацыі (CADE) і артыкул 13 Міжнароднага пакта 1966 года па эканамічных, сацыяльных і культурных правах (ICESCR). У апошнім дакуменце ўсе дзяржавы-ўдзельніцы пагадзіліся, што адукацыя павінна дазволіць усім людзям эфектыўна ўдзельнічаць у свабодным грамадстве і прасоўваць узаемаразуменне, талерантнасць і сяброўства паміж усімі нацыямі.

Згодна з сучасным міжнародным правам, дзяржавы-ўдзельніцы адказваюць за тое, каб зрабіць пачатковую адукацыю бясплатнай і абавязковай. Сярэдняя адукацыя ў розных яе формах павінна быць наогул даступнай для ўсіх. Вышэйшая адукацыя павінна быць роўным чынам даступнай для ўсіх на аснове асабістых магчымасцяў. Дзяржавы маюць патроены абавязак адносна права на адукацыю: выконваць, шанаваць і абараняць. Абавязак дзяржавы выконваць уключае абавязак садзейнічаць і забяспечваць, пры гэтым абавязак шанаваць уключае прадухіленне крокаў, якія парушаюць права на адукацыю. І апошняе, але не менш важнае: дзяржава нясе абавязак па абароне і недапушчэнні ўмяшання трэціх бакоў у права на адукацыю.

Права на адукацыю цесна звязана з іншымі правамі чалавека. У гэтым сэнсе дзяржавы як гаранты правоў нясуць абавязак рабіць міжсектаральныя высілкі па стварэнні неабходных умоў для забеспячэння і спрыяння навучанню ўсіх дзяцей і моладзі. Гэта азначае забеспячэнне доступу да асноўных правоў, такіх як права на ваду і санітарыю, на здаровую ежу і харчаванне, на сацыяльную абарону, на жыццё ў стабільным і здаровым сямейным і супольным асяроддзі, якое спрыяе эмацыйнаму і фізічнаму дабрабыту, а таксама на жыццё без любых формаў гвалту.

З пачатку 2000-х гадоў Спецыяльныя дакладчыкі ААН па праве на адукацыю спасылаюцца на адукацыю як на грамадскае дабро, якое абараняе калектыўныя інтарэсы грамадства. Савет ААН па правах чалавека таксама прызнае адукацыю ў якасці грамадскага дабра ў сваіх рэзалюцыях 2005 і 2015 гадоў аб праве на адукацыю. У 2015 годзе прадстаўнікі больш за 160 краін прынялі на Сусветным адукацыйным форуме Інчхонскую дэкларацыю і рамкі дзеянняў "Адукацыя 2030". У гэтым дакуменце яшчэ раз пацвярджаецца, што адукацыя ёсць "асноўнае права чалавека і падмурак для гарантый і рэалізацыі іншых правоў", а таксама сцвярджаецца, што "адукацыя ёсць грамадскае дабро, носьбітам абавязкаў за якое з'яўляецца дзяржава"; а дзяржава разглядаецца як аснова для ўстанаўлення і рэалізацыі стандартаў і нормаў.

Урады павінны адыграць ключавую ролю ў тым, каб адукацыйныя экасістэмы ставіліся да адукацыі як да грамадскага дабра. Як сцвярджалася раней, нам патрэбны падыход "свістаць усіх наверх". Задача абнавіць адукацыю як грамадскае дабро тычыцца ўсіх педагогаў, усіх школ, усіх адукацыйных праграм паўсюдна. І трэба яшчэ раз нагадаць,

што ў многіх выпадках ва ўсім свеце безліч дзяржаўных і недзяржаўных дзеячаў разам забяспечваюць публічнасць народнай асветы.

Дзяржавы нясуць ключавую адказнасць за забеспячэнне належнага і справядлівага фінансавання адукацыйных сістэм для задавальнення патрэбаў іх грамадзян і іншых асобаў, якія жывуць пад іх абаронай. Яны павінны збіраць адпаведныя сумы грошай для дзяржаўнага фінансавання праз падатковую палітыку, дзякуючы якой прыватнае багацце не секвеструецца ў афшорных падатковых зонах, а належным чынам садзейнічае грамадскаму дабру. Урады павінны выдаткоўваць гэтыя рэсурсы справядліва і эфектыўна, каб рэалізаваць агульнае права на адукацыю.

> Дзяржавы нясуць ключавую адказнасць за забеспячэнне належнага і справядлівага фінансавання адукацыйных сістэм.

Дзяржавы таксама адыгрываюць ключавую ролю ў рэгуляванні адукацыі, гарантуючы, што ўсе пастаўшчыкі паслуг у рамках дадзенай экасістэмы будуць прытрымлівацца правоў чалавека і прапаноўваць бяспечны і якасны навучальны досвед. Нарэшце дзяржавы павінны гарантаваць адпаведнасць адукацыі патрэбам грамадзян і іншых асобаў, якія жывуць у іх тэрытарыяльных межах, у прыватнасці, патрэбам гістарычна выключаных ці маргіналізаваных катэгорый насельніцтва. Добрае кіраўніцтва адукацыйнымі сістэмамі патрабуе ўдзелу грамадзян і іншых зацікаўленых бакоў у прыняцці рашэнняў і ў дыялогу і прадугледжвае патрэбу ў большай празрыстасці і справаздачнасці на ўсіх узроўнях.

У выпадку карэнных народаў прымяняюцца дадатковыя палажэнні. Дэкларацыя ААН аб правах карэнных народаў адзначае, што, акрамя валодання правам доступу да ўсіх узроўняў і форм адукацыі, якія забяспечваюцца дзяржавай, карэнныя народы маюць “права ствараць і кантраляваць свае сістэмы адукацыі і навучальныя ўстановы, якія забяспечваюць адукацыю на іх родных мовах, такім чынам, каб гэта адпавядала ўласцівым іх культуры метадам выкладання і навучання”.

З ростам вымушанай міграцыі ва ўсім свеце – асабліва перамяшчэння насельніцтва з-за ціску, звязанага са змяненнем клімату – трэба надаваць асаблівую ўвагу ўцекачам, якія не маюць абароны з боку дзяржавы. Міжнародныя арганізацыі і ўзмоцненае міжнароднае супрацоўніцтва маюць важнае значэнне для забеспячэння правоў на адукацыю ў падобных сітуацыях, якія, як чакаецца, будуць рабіцца ўсё больш звычайнымі.

## Кіраванне лічбавымі навучальнымі прасторамі

Пры належным выкарыстанні тэхналогіі могуць падтрымліваць публічнасць, інклюзіўнасць і агульныя мэты адукацыі. Лічбавыя тэхналогіі заснаваны на шматлікіх алгарытмах, некаторыя з іх маюць вялікі эмансіпацыйны патэнцыял, іншыя маюць вялікае ўздзеянне і нясуць вялікія рызыкі. У гэтым сэнсе “лічбавая рэвалюцыя” нічым не адрозніваецца ад іншых вялікіх тэхналагічных рэвалюцый мінулага, такіх як сельскагаспадарчая ці прамысловая рэвалюцыі. Асноўныя калектыўныя здабыткі прыходзяць разам з турбую-

чым ростам няроўнасці і выключэнняў. Выклік заключаецца ў тым, каб зарыентавацца ў гэтых змешаных наступствах і кіраваць іх будучымі вынікамі.

Неабходна забяспечыць, каб ключавыя рашэнні адносна лічбавых тэхналогій у сувязі з адукацыяй і ведамі прымаліся ў грамадскай сферы і кіраваліся прынцыпам адукацыі як агульнага і грамадскага дабра. Гэта прадугледжвае прыватны кантроль над лічбавай інфраструктурай і абарону ад антыдэмакратычнага захопу і закрыцця доступу да лічбавага агульнага здабытку ведаў, які ўсё часцей фігуруе ў якасці часткі адукацыйных экасістэмаў.

У той час як лічбавыя платформы зрабілі пэўны ўнёсак у веды, адукацыю і даследаванні на працягу апошніх некалькіх дзесяцігоддзяў, назапашаныя грамадскія выгады былі ў асноўным выпадковымі для рэальных, насычаных рэкламай бізнес-мадэляў галіны высокіх тэхналогій. Напрыклад, кампанія Google/Alphabet стала адным з найбольш важных пасярэднікаў у лічбавай публічнай сферы, імкнучыся пашырыць свой ахоп на наша грамадскае лічбавае жыццё. Таму некаторыя з яе найбольш значных сэрвісаў для адукацыі, такія як “Акадэмія Google” (Google Scholar) і “Google Classroom”, фактычна не прыносяць ніякіх даходаў ад рэкламы і нясуць значныя выдаткі да таго часу, пакуль Google будзе лічыць, што іх падтрымка адпавядае інтарэсам кампаніі. Гэта стварае вельмі хісткае становішча для лічбавай інфраструктуры, ад якой адукацыя становіцца ўсё больш залежнай.

З улікам вельмі доўгага спісу іншых сэрвісаў Google, якія, апынуўшыся ў падобнай сітуацыі, нарэшце зачыніліся, занепакоенасць агульнай хісткасцю цяперашняй сістэмы цалкам апраўданая. Закрыццё многіх універсітэцкіх аб’ектаў у 2020 і 2021 гадах у сувязі з пандэміяй COVID азначала, што нават навукоўцы з некаторых найбагацейшых і найлепш забяспечаных універсітэтаў планеты мелі доступ да матэрыялаў толькі ў сувязі з унутранай сістэмай прыняцця рашэнняў Google адносна прывілеяў на такія паслугі, як Акадэмія Google. За многія гады свайго існавання Акадэмія Google Scholar не рабіла зменаў і не дадавала значных новых функцый, што паказвае на яе нізкі прыярытэт у агульнай праграме кампаніі. Гэта павінна служыць перасцярогай адносна ўразлівасці такіх прыватных аб’ектаў навучальнай інфраструктуры і вымушае нас спытацца, ці ёсць больш трывалыя мадэлі надзейнай грамадскай лічбавай інфраструктуры для нашай будучыні грамадскай адукацыі?

Здольнасць лічбавых платформаў заставацца бясплатнымі для грамадскасці таксама ў значнай ступені залежыць ад масавага і сістэматычнага здабывання персанальных даных карыстальнікаў у якасці тавару, настолькі прывабнага, што яго параўноўваюць з “новай нафтай”. Спачатку гэтыя даныя збіраліся з відавочным намерам выкарыстоўваць іх для продажу рэкламы. Пазней платформы, якія стаяць за лічбавымі сэрвісамі, вынайшлі, што частка гэтага масіўнага сховішча карыстальніцкіх даных, якое няспынна пашыраецца, карысна не толькі для стварэння і паляпшэння камерцыйных паслуг і прадуктаў, але і для інжынірынгу ідэй, меркаванняў і пераваг праз штучны інтэлект і машыннае навучанне.

Гэта запусціла гонку за дамінаванне ў штучным інтэлекце паміж найбуйнейшымі кампаніямі свету, якія імкнуцца да перамогі ў барацьбе за долю рынку. У выніку сённяшняя лічбавая

эканоміка кіруецца экстрактывісцкім імператывам, санкцыянуючы распаўсюджванне датчыкаў, алгарытмаў і сеціваў у сферах жыцця, якія раней былі закрытымі для карпаратыўных і прыватных вачэй, пачынаючы ад электронных прылад для чытання кніг і заканчваючы вэб-аглядальнікамі і разумнымі гадзіннікамі. Велізарныя палітычныя наступствы мае распаўсюджанае пачуццё, што мы жывём у час паўсюднага і няспыннага назірання. Яно мае ашаламляльны ўплыў на свабоду выказвання меркаванняў і на пачуццё інтэлектуальнай аўтаноміі людзей. Трывога, звязаная з назіраннем, стварае нябачныя самацэнзурныя перашкоды для творчай дзейнасці, выклікаючы нялёгкія другасныя пытанні, ці можа чытанне вострай ці небяспечнай кнігі мець сур'ёзныя наступствы для ўласнай рэпутацыі чалавека, што сёння з'яўляецца наступствам нашай дзейнасці ў сеціве.

Падобныя эфекты і трывогі могуць узнікаць, калі назіранне і экстрактывізм пашыраюцца на нашы адукацыйныя экасістэмы. Працяглая нармалізацыя назірання – асабліва калі адукацыйныя сістэмы прывучаюць дзяцей да яе з ранняга ўзросту – ставіць нас на траекторыю да радыкальнай эрозіі канцэпцыі чалавечай годнасці і масавага парушэння закладзенага ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека права на прыватнае жыццё і свабоду выказвання меркаванняў.

Занепакоенасць абаронай даных вучняў і настаўнікаў павінна прысутнічаць ва ўсіх размовах адносна месца лічбавых платформаў у адукацыйных экасістэмах. Лёгкасць збору, захоўвання і маніторынгу даных у лічбавых прасторах можа спрыяць паляпшэнням у выкладанні і навучанні. Патрэбныя належныя правілы і пратаколы для абароны вучняў і настаўнікаў ад перагібаў. Этыка празрыстасці павінна накіроўваць палітыку ў дачыненні даных, прычым ананімнасць даных павінна быць наладай па змаўчанні, каб не пацярпелі асобныя людзі.

Адна з прычын, чаму лічбавыя платформы з іх алгарытмавым рэжымам кіравання ведамі падняліся на вяршыню ў такой вялікай колькасці сфераў, у тым ліку ў адукацыйных экасістэмах, мае дачыненне да адсутнасці жыццяздольнага грамадскага адказу на выклік, які ўяўляе сістэматычная арганізацыя глабальных ведаў і кіраванне глабальнымі ведамі, аб'ём якіх хутка расце. У выніку нават эксперты зараз павінны абапірацца на пасрэдніцкія паслугі лічбавых платформаў, якія робяць іх кваліфікаваныя і інфармаваныя меркаванні закладнікамі капрызаў алгарытма кіравання платформы, на якой яны публікуюцца. Пошук доўгатэрміновых рашэнняў для такіх праблем, як "фэйкавыя навіны" і крызіс даверу да навукі і дзяржаўных устаноў, якія мы зараз назіраем шмат дзе, патрабуе нашага інфармаванага калектыўнага ўзаемадзеяння з праўдай і экспертнымі ведамі і досведам, а таксама дэмакратызацыі кіравання ведамі.

> Найлепшая стратэгія накіравання лічбавага зруху ў бок падтрымкі адукацыі як грамадскага дабра – забяспечыць яе дэмакратызацыю ў рамках здаровага грамадскага жыцця.

Гэтыя шматлікія прыклады падкрэсліваюць уразлівасць лічбавай інфраструктуры адукацыі. Пры тым, што можна і трэба ствараць лепшыя лічбавыя інструменты, найлепшая стратэгія

накіравання лічбавага зруху ў бок падтрымкі адукацыі як грамадскага дабра – забяспечыць яе дэмакратызацыю ў рамках здаровага грамадскага жыцця. Многія лічбавыя суполкі і раннія інтэрнэт-тэхналогіі развіваліся сумеснымі намаганнямі на аснове адкрытага кода. Пастаяннае развіццё лічбавых тэхналогій у адукацыі ў напрамках, кіруемых устойлівасцю, справядлівасцю і інклюзіяй, будзе патрабаваць дзеянняў з боку ўрадаў, падтрымкі з боку грамадзянскай супольнасці, а таксама больш шырокай грамадскай схільнасці разглядаць адукацыю не як арэну для спекуляцый, але як прастору для грамадскіх інвестыцый ва ўстойлівую, справядлівую і мірную будучыню.

## Навучанне разам з жывой планетай

Мы павінны пашырыць нашу канцэпцыю таго, дзе адбываецца навучанне па-за межамі чалавекацэнтрычных прастораў і ўстаноў і распаўсюдзіць яе таксама на паркі, гарадскія вуліцы, вясковыя сцежкі, сады, пусткі, угоддзі, лясы, пустыні, азёры, балоты, акіяны і ўсе іншыя аб’екты жыцця, якія належаць не толькі людзям.

Людзі – частка жывой планеты Зямля. Многія даўнія традыцыйныя культуры маюць адпаведны і шырокі погляд на фарміраванне ўзаемавыгадных адносін паміж людзьмі і навакольным светам. Біясфера – важная навучальная прастора. Той факт, што сёння на кантраляваных карэннымі народамі землях змяшчаецца прыкладна 80 % біяразнастайнасці свету, сам па сабе дастатковы, каб прадэманстраваць, што погляды карэнных народаў могуць шмат чаму навучыць кожнага адносна адукацыі, якая клапоціцца аб планеце.

Традыцыйныя веды і вучэнні аб зямлі і вадзе, а таксама многія афрыканскія і азіяцкія касмалогіі пастулююць адносіны, згодна з якімі тыя, хто не з’яўляецца людзьмі, успрымаюцца не толькі як істоты з іх уласнымі правамі, але і як выхавальнікі і настаўнікі, ад якіх людзі могуць вучыцца. У некаторых традыцыях элементы больш чым чалавечага свету разумеюцца як старэйшыя, мудрэйшыя і вартыя павагі, і прызнаецца, што яны могуць шмат чаму навучыць нас.

У заходніх адукацыйных традыцыях існуе доўгая гісторыя вырашэння некаторых з гэтых пытанняў. Былі спробы зрабіць прыродны свет і наваколле часткай навучальных працэсаў у напрамках педагогікі месца, экалагічнай адукацыі, адукацыі на вольным паветры і эмпірычнай адукацыі. Аднак у гэтай працы навакольнае асяроддзе часта пазіцыянавалася як тое, што служыць мэтам навучання. Часта сцвярджаецца, што праз гэтыя кантакты вучні пазнаюць важныя рэчы, аб якіх яны б інакш не даведаліся. Таму ў многіх выпадках адносіны паміж чалавекам і прыродай не разглядаюцца як узаемныя і ўзаемазалежныя. Нечалавечыя істоты таксама не абавязкова ўспрымаюцца як настаўнікі з іх уласнымі формамі суб’ектнасці. З гэтай пазіцыі зыходзяць больш познія формы экалагічнай адукацыі і педагогікі месца. Метафара педагогікі “адраджэння прыроды”, узятая са сферы аховы і аднаўлення навакольнага асяроддзя, мае асаблівыя перспектывы ў сувязі з ідэяй збудавання адукацыі новымі шляхамі.

Многія педагагічныя кантакты, якія ўзнікаюць праз дыялог паміж шматлікімі сістэмамі ведаў і касмалогіямі свету, таксама з’яўляюцца шматабяцаючымі для перагляду ўзаемаадносін паміж адукацыяй і жывой планетай як выніку сумеснай эвалюцыі і сумеснага ўзнікнення са светам. Людзі павінны ўяўляць сябе прыроднымі, а не толькі сацыяльнымі істотамі. Прынцыпы кіравання асяроддзем, якія разглядаюць нас як “апекуноў” і “абаронцаў” прыроды, па-ранейшаму дапускаюць падзел паміж людзьмі і іх навакольным асяроддзем. Нашы экалагічныя ўяўленні павінны цалкам ставіць нас у межы жывой планеты.

Выкліканыя людзьмі экалагічныя крызісы патрабуюць пераасэнсавання навучэнца, які знаходзіцца ў цэнтры адукацыі, арыентаванай на дасягненне агульных мэтаў. Адукацыя не можа проста арыентавацца на ідэальнага касмапалітычнага вучня, якому вольна і ёмка ва ўзаемазвязаным свеце – так званага “вучня дваццаць першага стагоддзя”, якога прадугледжвае адукацыя, засяроджаная на чалавечым развіцці. Каб адукацыя падтрымлівала справядлівую і ўстойлівую будучыню, мы павінны прасоўваць планетарную свядомасць. У цэнтр адукацыі трэба паставіць навучэнца, які дапускае адказнасць за стварэнне свету разам з іншымі істотамі. Гэты пункт погляду мае наступствы для педагагічнай практыкі амаль ва ўсіх сферах. У прыватнасці, глабальная грамадзянская адукацыя павінна быць дакладна настроеная на гэту планетарную свядомасць.

Аднаўленне раўнавагі ў нашых адносінах з жывой планетай патрабуе, каб мы перавучыліся нашым узаемаадносінам і пераасэнсавалі месца і суб’ектнасць людзей. У многіх культурах стагоддзямі ці тысячагоддзямі ведалі, што мы не можам аддзяліць чалавецтва ад астатняй планеты. Напрыклад, паняцце “сумак каўсэй” на мове кечуа надае правы прыродзе і апісвае спосаб экалагічна збалансаванага жыцця. Прынцыпы міжасабовасці (“я ёсць таму, што мы ёсць”) філасофіі Убунту народаў нгуні (банту) могуць прапанаваць шмат чаго, як і будысцкая этыка Каруны (спагады) – гэта толькі два прыклады багатых культурных рэсурсаў, на якія можа абапірацца чалавецтва.

Іншыя грамадствы па-ранейшаму, часам пакутліва, прыходзяць да ўсведамлення нашых агульных чалавечых і планетарных узаемазалежнасцей. Як мы будзем жыць у 2050 годзе як частка Зямлі на аснове прынцыпаў гармоніі, дабрабыту і справядлівасці? У глабальным разуменні ў нас яшчэ няма ўсіх адказаў. Адукацыя, карані якой – у цэласнасці жыцця, павінна быць адным з ключавых інструментаў у нашай сумеснай працы над рашэннямі.

## Пашырэнне часу, калі адбываецца адукацыя

Па меры таго, як жыццё ўсё большай колькасці людзей робіцца даўжэйшым і здаравейшым, будуць змяняцца шляхі, якімі адукацыя пераплятаецца з жыццём. Патрэбы, прыярытэты і мадальнасці адукацыі змяняюцца, калі адбываюцца зрухі ў балансе паміж маладымі і старымі, у прапорцыі людзей працоўнага ўзросту, а таксама ў відах дзейнасці па доглядзе (аплатных і неаплатных), у тым, хто яго выконвае і калі. Фактычна гэтыя пытанні праліваюць яркае святло на асноўныя дапушчэнні, якія робяць нашы грамадствы адносна таго, што азначае ствараць каштоўнасць.

## Адукацыя і догляд на працягу жыцця

Усё часцей прызнаецца, што наш дабрабыт і эканамічная бяспека залежаць не толькі ад фармальнай эканомікі. Аплатная праца – гэта іх частка, але не меншую вагу, несумненна, мае хатняя праца па доглядзе людзей. Яна ўключае працу па доглядзе дзяцей і старых людзей, вытворчасць харчоў і гатаванне ежы, будаўніцтва прытулку, а ў шматлікіх зонах экалагічнага стрэсу – збор вады. Жанчыны і дзяўчаты нясуць найбольшую нагрузку ў плане падтрымання сем'яў, супольнасцей, гігіены і санітарыі, харчовай бяспекі, нават экалагічнага і экасістэмнага здароўя, і яны амаль не атрымліваюць прызнання ці падтрымкі за іх вялікі і важны ўнёсак.

У наступныя 30 гадоў складаныя ўзаемадзеянні перафарміруюць баланс паміж усімі гэтымі відамі "забяспечваючай" дзейнасці па-рознаму ў розных рэгіёнах і мясцовасцях. У некаторых месцах паляпшэнне здароўя і (або) недахоп працоўнай сілы могуць ствараць магчымасці і попыт на больш доўгае працоўнае жыццё старэйшых людзей. У іншых выпадках праблемы догляду старых людзей могуць быць падобнымі да праблемы з доглядам дзяцей, якія характарызавалі апошнія тры дзесяцігоддзі, калі ўсё большая колькасць жанчын далучалася да працоўнай сілы. Могуць узнікнуць новыя формы хатняй гаспадаркі, калі кааператыўнае жыццё і падтрымка з боку пашыранай сям'і зробяцца больш значнымі ў большай частцы свету. Усё гэта азначае, што магчымасці людзей па будаванні і фарміраванні працяглых і надзейных адносін таксама ўяўляюць сабой пытанне адукацыі навучэнцаў усіх узростаў.

Навучыць клапаціцца, зрабіць клопат аб іншых рысай, пераплеценай з жыццём адукацыі, – гэта не проста "плюс". Разглядаючы перыяд да і пасля 2050 года, назіраем у гэтым жорсткую логіку. Трэба аддаць прыярытэт адукацыі, якая падтрымлівае штодзённую працу па падрыхтоўцы і часам вырошчванні прадуктаў харчавання, і адукацыі, якая падтрымлівае харчаванне і пражытак асобных людзей і сем'яў. Гэта больш шырокі погляд на навучанне, да якога нас прыводзіць цвёрдае ўяўленне аб тым, што адукацыя пераплеценая з жыццём і адбываецца ў розных прасторах і ў розныя часы.

## Навучанне і адукацыя дарослых як эмансіпацыйны праект

У апошнія дзесяцігоддзі прынцып навучання на працягу жыцця зрабіўся цэнтральным пунктам у фарміраванні адукацыйнай палітыкі ва ўсім свеце. Напрыклад, МУР-4 заклікае нас "забяспечыць інклюзіўную і справядлівую якасную адукацыю для ўсіх, а таксама прасоўваць магчымасці бесперапыннага навучання для ўсіх".

Існуе моцная эмансіпацыйная традыцыя навучання і адукацыі дарослых, якая адлюстроўваецца ў патэнцыяле, што адкрываецца для людзей, і ў тым, што гэта азначае для ўдзелу грамадзян у шырокім сэнсе. Аднак гэта традыцыя была прыніжана ў апошнія гады з-за празмернай увагі да такіх аспектаў бесперапыннага навучання, як прафесійнае навучанне і фарміраванне навыкаў. Па сутнасці, тое, што было адным з найбольш важных "правоў" дарослых – асабліва тых, хто не меў поўнага доступу да адукацыі на ранніх этапах

**Адукацыя дарослых павінна распаўсюджвацца далёка за рамкі бесперапыннага навучання ў мэтах рынку працы.**

жыцця, – зрабілася “абавязкам” для многіх, таму што ад людзей зараз патрабуецца не адставаць ад жыцця і заставацца прафесійна прыгоднымі. Вынікам гэтага ёсць бесперапынная прафесійная падрыхтоўка і перападрыхтоўка.

Навучанне і адукацыя дарослых павінны будуць выглядаць зусім інакш праз пакаленне. У той час, як змяняюцца нашы эканомікі і грамадствы, адукацыя дарослых павінна выйсці далёка за рамкі бесперапыннага навучання ў мэтах рынку працы. Магчымасці змяніць кар’ерны шлях і прайсці прафесійную перападрыхтоўку павінны злучацца з больш шырокай рэформай усіх адукацыйных сістэм, засяроджанай на стварэнні множных, гнуткіх шляхоў. Як і ва ўсіх сферах адукацыі, каб яна не проста рэагавала на змены (на рынку працы, у тэхналогіях ці навакольным асяроддзі) ці прыстасоўвалася да такіх зменаў, трэба пераглядзець канцэпцыю адукацыі дарослых у бок да сапраўды трансфармацыйнага навучання.

Разглядаючы гарызонт 2050 года і пасля яго, можна дапусціць шэраг глыбокіх зменаў у адукацыі дарослых. Некаторыя прагназуюць, што даволі хутка працягласць жыцця чалавека будзе звычайна перавышаць 100 гадоў. Пакідаючы ўбаку радыкальнае падаўжэнне жыцця людзей, той факт, што так шмат людзей ужо жывуць даўжэй, дае падставу пераглядзець час, калі павінна адбывацца адукацыя. У некаторых раёнах чатыры пакаленні будуць жыць разам у адным прасторава-часавым кантынууме, чаго ніколі не было раней у гісторыі. Культурныя ўяўленні аб дарослaсці і сталасці пройдуць выпрабаванне. Зменяцца звыклы лад жыцця і нашы стаўленні да працы і адпачынку. Ужо цяпер агульна прызнаецца, што працоўныя месцы і характар занятасці могуць рэзка змяняцца на працягу працоўнага жыцця аднаго чалавека. Мы павінны прызнаць, што грамадскае і палітычнае жыццё таксама змяняецца на працягу жыцця чалавека і што такія змены могуць адбывацца больш часта ў будучыні. Новая экасвядомасць і пераасэнсаваны гуманізм, да якіх заклікаюць аўтары гэтага даклада, ёсць прыклады новых пытанняў да адукацыі, з якімі павінны сутыкнуцца навучэнцы ўсіх узростаў. На працягу дваццаць першага стагоддзя адукацыйная палітыка павінна быць накіравана на ўвесь працяг жыцця і надаваць асаблівую ўвагу дарослым і пажылым людзям.

Другое вымярэнне, якое з’яўляецца часткай аптымальнай традыцыі бесперапыннага навучання, тычыцца ідэі ўдзелу і інклюзіі ўразлівых груп, якія вельмі часта пазбаўляюцца адукацыйных магчымасцяў. Удзел і інклюзія ідуць рука аб руку з эмансіпацыйным бачаннем адукацыі дарослых, якое ўключае пазітыўную ацэнку нефармальнага навучання – ведаў і здольнасцей, якія набываюцца па-за рамкамі фармальных школьных устаноў. Палітыка ў галіне адукацыі дарослых павінна прызнаваць нефармальнае навучанне на працягу жыцця чалавека ў рамках прыярытэтаў інклюзіі і ўдзелу.

Нарэшце, тыя, хто займаецца адукацыяй дарослых, павінны лавіраваць спосабамі, каб зрабіць удзел у такой адукацыі ўсё больш апасродкаваным і даступным дзякуючы лічбавым сродкам. У той час, як малодшыя пакаленні з ранніх гадоў маюць зносіны

з лічбавым светам, старэйшыя пакаленні таксама павінны будуць мець гэтыя інструменты, каб па-ранейшаму развіваць і будаваць веды. Адукацыя дарослых павінна садзейнічаць шырокаму доступу да лічбавых сродкаў і рашуча падтрымліваць праграмы рухаў за адкрыты доступ і адкрытыя крыніцы інфармацыі. Умацаванне навуковай граматнасці і барацьба з усімі формамі дэзынфармацыі з’яўляюцца цэнтральнымі элементамі любой стратэгіі адукацыі дарослых цяпер і ў будучыні.

Навучанне і адукацыя дарослых адыгрываюць некалькі роляў. Яны дапамагаюць людзям знайсці шлях да вырашэння цэлага шэрагу праблем і павялічваюць кампетэнцыі і суб’ектнасць. Яны дазваляюць людзям браць на сябе большую адказнасць за сваю будучыню. Акрамя таго, яны дапамагаюць дарослым разумець і аналізаваць зменлівыя парадыгмы і ўладныя адносіны і рабіць крокі да фарміравання справядлівага і ўстойлівага свету. Арыентацыя на будучыню павінна вызначаць адукацыю дарослых, як і адукацыю ва ўсе часы, у яе пераплеценасці з жыццём. Дарослыя адказныя за свет, у якім яны жывуць, а таксама за будучы свет. Адказнасць за будучыню не можа проста перадавацца наступным пакаленням. Патрэбна сумесная этыка міжпакаленчай салідарнасці.

## Пашырэнне права на адукацыю

Улічваючы актуальныя выклікі, якія стаяць перад намі, педагогі, урады і прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці больш інтэнсіўна павінны ажыццяўляць узгаданыя вышэй прапановы ў мэтах належнага кіравання адукацыяй у розныя часы і розных месцах. Прапанаванае тут з’яўляецца не ўтапічнай мадэллю, а, хутчэй, канкрэтнай стратэгіяй выжывання чалавечага роду. Мы таксама павінны звярнуцца да адукацыі, каб злучыць нас з глыбокім сэнсам і радасцю жыцця, асноватворнай часткай якога з’яўляецца навучанне.

У гэтым дакладзе сцвярджаецца неабходнасць уяўляць адукацыю ва ўсёй паўнаце жыцця. Нягледзячы на яе значнасць, адукацыя ў такіх установах, як школы і ўніверсітэты, не павінна разглядацца як адзіная магчымая форма. Адукацыя ў ідэальным варыянце павінна быць калектыўным працэсам, у якім прызнаецца каштоўнасць навучання ад аднагодкаў, міжпакаленчага, а таксама міжкультурнага навучання. Гэтае сацыяльнае вымярэнне падкрэслівае неабходнасць навучання клопату адно аб адным, аб нашых супольнасцях і планеце. Гэтыя калектыўныя працэсы і сацыяльныя вымярэнні павінны існаваць як у рамках школ і ўніверсітэтаў, так і па-за імі.

У перспектыве да 2050 года ўсё большую важнасць будзе набываць пашыранае паняцце права на адукацыю, не абмежаванае традыцыйнымі ўяўленнямі адносна таго, калі і дзе адбываецца адукацыя. Права на адукацыю павінна больш выразна распаўсюджвацца на ўсіх людзей, а не толькі на дзяцей і моладзь. Яно павінна больш дакладна тычыцца адукацыі, якая адбываецца ў мностве месцаў, а не толькі ў класных пакоях і школах.

Разгортванне радыё- і тэлевяшчання для падтрымкі бесперапыннага акадэмічнага навучання падчас закрыцця школ у перыяд пандэміі COVID-19 нагадвае нам аб значэнні

гэтых сродкаў для адукацыі, культуры і агульных ведаў, асабліва для вучняў, якія не маюць доступу да анлайн-матэрыялаў і смарт-прыладаў. Крызіс COVID-19 таксама выявіў велізарнае значэнне лічбавай сувязі і анлайн-платформаў – так што мы пачынаем лічыць доступ да інфармацыі, які таксама з'яўляецца асноўным правам, звязаным з правам на адукацыю такімі шляхамі, якія мы не маглі прадбачыць нават дзесяцігоддзе таму.

Права на адукацыю падтрымліваецца правам на інфармацыю і правам на культуру (і само падтрымлівае гэтыя правы ў сваю чаргу). Свабода перакананняў і іх выказвання можа належным чынам забяспечвацца, калі людзі маюць магчымасць шукаць, атрымліваць інфармацыю і ідэі і дзяліцца імі. У нашым сучасным свеце, перанасычаным сродкамі масавай інфармацыі, поўным фальшывых і лжывых навін, адукацыя павінна адыгрываць значную ролю ў падтрымцы людзей у іх пошуках дакладнай інфармацыі, спрыяючы іх жаданню перадаваць яе сумленна, без маніпуляцый. Адукацыя падтрымлівае права ўдзельнічаць у культурным жыцці, забяспечваючы доступ да культурных рэсурсаў, якія фарміруюць ідэнтычнасць і пашыраюць светапогляд. У сваю чаргу, адукацыя можа падтрымліваць здольнасць людзей рабіць унёсак у культурныя рэсурсы. Адкрыты і гарызантальны дыялог паміж культурамі з'яўляецца ключом да падтрымкі культурнага плюралізму. Адукацыя павінна мадэляваць дыялог як адну са шматлікіх форм яе ўнёску ў заахвочванне культурнага плюралізму.

> Адукацыя падтрымлівае права ўдзельнічаць у культурным жыцці, забяспечваючы доступ да культурных рэсурсаў, якія фарміруюць ідэнтычнасць і пашыраюць светапогляд.

Пашырэнне ўяўлення аб праве на адукацыю ў розныя часы і ў розных прасторах узмацняе адукацыю як агульную справу, як тое, што робіцца, кіруецца і ажыццяўляецца намі і праз нас. Адукацыя як грамадскае, сумеснае дабро, якое сумесна дасягаецца і выбіраецца, павінна быць шчыльна звязанай з нашым штодзённым жыццём. Дзеці і дарослыя павінны ставіцца да адукацыі не як кліенты ці гледачы, але як дзеючыя асобы. Мы адыгрываем розныя ролі ў адукацыі ў розныя моманты жыцця і ў розных напрамках жыцця, і мы робімся яе часткай. Кожны мае права ўдзельнічаць у адукацыі, якая ўмацоўвае тое, што ён ці яна думае, ведае, адчувае і робіць у сваім жыцці, а таксама ўмацоўвае тое, што мы робім разам.

## Прынцыпы дыялогу і дзейнасці

У гэтым раздзеле прапануецца, каб новы сацыяльны кантракт на адукацыю пашырыў нашы магчымасці, якія маюць месца на працягу ўсяго жыцця, у розных культурных і грамадскіх прасторах. У перспектыве да 2050 года ёсць чатыры прынцыпы, якія могуць накіроўваць дыялог і дзейнасць, неабходныя для ажыццяўлення гэтай рэкамендацыі:

- **Ва ўсе часы свайго жыцця людзі павінны мець значныя магчымасці для якаснай адукацыі.** Навучанне павінна быць даўжынёю і шырынёю ў жыццё, а адукацыі дарослых павінны надавацца вага і прызнанне. Мы павінны выкарыстоўваць прынцыпы інклюзіўнага дызайну і пачынаць планаванне з акцэнту на паслугах для найбольш маргіналізаваных людзей, для тых, хто знаходзіцца ў найбольш уразлівых умовах.

- **Здаровыя адукацыйныя экасістэмы звязваюць прыродныя, пабудаваныя і віртуальныя месцы навучання**. Мы павінны лепш ацэньваць біясферу як навучальную прастору. Лічбавыя навучальныя прасторы зараз інтэграваны ў адукацыйныя экасістэмы і павінны развівацца, каб падтрымліваць грамадскія, інклюзіўныя і агульныя мэты адукацыі. Трэба надаваць прыярытэт платформам з адкрытым доступам і адкрытымі крыніцамі інфармацыі, з моцнай абаронай даных вучняў і настаўнікаў.

- **Трэба ўмацоўваць магчымасці ўрадаў вылучаць дзяржаўнае фінансаванне і рэгуляваць адукацыю**. Мы павінны нарошчваць патэнцыял дзяржаў усталёўваць і выконваць стандарты і нормы палажэнняў аб адукацыі, якія з’яўляюцца адаптыўнымі, справядлівымі і падтрымліваюць правы чалавека.

- **Права на адукацыю павінна пашырацца. Нам больш не спрыяе рэалізацыя права на адукацыю праз школьнае навучанне**. Кожны чалавек, дзе б ён ні знаходзіўся, павінен мець права на адукацыю на працягу жыцця. Мы павінны падтрымліваць права на інфармацыю і права на культуру як неабходныя чыннікі, якія забяспечваюць права на адукацыю. Права на сувязь павінна быць сюды ўбудавана.

Пры стварэнні новага сацыяльнага кантракта на адукацыю неабходна прасоўваць гэтыя чатыры кіруючыя прынцыпы. Мы павінны спрыяць дыялогу і дзеянням згодна з гэтымі прынцыпамі і падтрымліваць сумеснае пераасэнсоўванне нашай будучыні на мясцовым, нацыянальным, рэгіянальным і глабальным узроўнях.

# Частка III

## Каталізацыя новага сацыяльнага кантракта на адукацыю

Набліжэнне да множных, часткова супадаючых крызісаў, якія пагражаюць выжыванню чалавецтва і жывой планеты, патрабуе радыкальнай змены курсу. Мы павінны неадкладна скласці новы сацыяльны кантракт на адукацыю, натхнёны прынцыпамі сацыяльнай, эпістэмнай, эканамічнай і экалагічнай справядлівасці, які можа дапамагчы пераўтварыць будучыню. Новы сацыяльны кантракт на адукацыю прадугледжвае абноўленыя падыходы, якія ўмацоўваюць адукацыю як грамадскую сацыяльную справу і грамадскае дабро, а таксама абараняюць агульны здабытак ведаў. У ім прызнаецца, што шэраг урадавых і недзяржаўных партнёраў павінны працаваць разам над ажыццяўленнем нявыкананых абавязацельстваў мінулага і над раскрыццём пераўтваральнага патэнцыялу адукацыі для будучыні. Універсітэты і іншыя партнёры будуць адыгрываць ключавую ролю ў даследаваннях і інавацыях для падтрымкі абнаўлення адукацыі як грамадскага дабра і сумеснага будаўніцтва новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Падобным чынам важна перагледзець ролю рэгіянальных і міжнародных арганізацый па развіцці адукацыі ў фарміраванні міжнароднага супрацоўніцтва і салідарнасці ў тым выглядзе, які нам будзе патрэбны ў перспектыве да 2050 года. Нарэшце, па-за міжнародным і рэгіянальным узроўнямі, ключавымі для кіравання адукацыяй як грамадскім дабром, трэба працягнуць каталізацыю новага сацыяльнага кантракта на адукацыю праз шырокі грамадскі дыялог паміж шматлікімі групамі ва ўсім свеце ў пэўных кантэкстах. Гэты даклад запрашае да працягу гэтага дыялогу.

# Раздзел 8

## Заклік да даследаванняў і інавацый

Ва ўсіх падыходах, якія прадугледжваюць удзел супольнасці, вялікую ролю мае працэс, то бок методыка і метад. У многіх праектах працэс з'яўляецца больш важным за вынік. Працэсы павінны быць паважлівымі, спрыяць людзям, лячыць і вучыць. Чакаецца, што яны будуць падводзіць людзей на адзін крок бліжэй да самавызначэння.

**Лінда Тухіваі Сміт (Linda Tuhiwai Smith)**, "Методыкі дэкаланізацыі", 1999 год

**Каб каталізаваць новы сацыяльны кантракт на адукацыю, Камісія заклікае да сусветнай праграмы сумесных даследаванняў, заснаванай на праве на адукацыю на працягу жыцця, і вітае ўнёскі нізавых асацыяцый, педагогаў, устаноў, сектараў і разнастайных культур.**

Прасоўванне апісаных у папярэдніх раздзелах прапаноў патрабуе высілкаў, эксперыментаў, пошукаў і інавацый у галіне адукацыі ў больш шырокім дыяпазоне кантэкстаў і абставін, чым калі-небудзь раней. У раздзеле робіцца заклік да сумесных даследаванняў і інавацый у галіне адукацыі для нашай пераасэнсаванай будучыні. Як і сама адукацыя, даследаванні і інавацыі ёсць грамадскае дабро; гэта таксама працэсы, якія павінны адыграць ключавыя ролі ў каталізацыі новага сацыяльнага кантракта на адукацыю.

Праграма даследаванняў у галіне будучыні адукацыі пачынаецца з навучэнцаў і настаўнікаў. Розным чынам элементы будучыні адукацыі ўжо знаходзяцца сярод нас, прынамсі, у нейкай пачатковай форме. Зыходны пункт у любой сістэме адукацыі – пошук яркіх кропак, пазітыўных момантаў, якія ўжо ўвасабляюць прынцыпы, сфармуляваныя ў гэтым дакладзе. Вывучэнне і аналіз іх наступстваў разам з умовамі, якія зрабілі іх магчымымі, могуць служыць падставай для выкладзеных у гэтым дакладзе ідэй, у той час як супольнасці шукаюць шляхі ўвасобіць свае ідэі ў аперацыйную стратэгію з падрабязнай інфармацыяй адносна таго, што трэба рабіць па-іншаму на практыцы. Адукацыя гістарычна абапіраецца на шырокі спектр крыніц, метадаў і парадыгмаў даследаванняў. Гэтыя інструменты неабходна ўмацоўваць і ўзмацняць на ўсіх узроўнях, ад дыялогу паміж спецыялістамі і супольнасцямі да ўніверсітэтаў і навукова-даследчых партнёрстваў, а таксама нацыянальных і міжнародных форумаў, у тым ліку арганізаваных ЮНЕСКА.

У гэтым раздзеле ў першую чаргу падкрэсліваюцца шляхі, якімі даследаванні і інавацыі дазваляюць нам сістэматычна навучацца разам – сумесна разважаць, эксперыментаваць і ўздзейнічаць на грамадства і пры гэтым разам пераасэнсоўваць нашу будучыню. Разгледжаныя ў такім святле даследаванні і інавацыі павінны ўзмацняць нашы здольнасці да прадбачання і граматнасці адносна будучыні, падтрымліваючы фантазію і прасоўваючы разуменне ролі будучыні ў тым, што мы бачым і робім у галіне адукацыі. Усе аспекты нашай праграмы даследаванняў у галіне адукацыі прасякнуты этыкай супрацоўніцтва, сціпласці і прадбачання.

> Даследаванні і інавацыі павінны ўзмацняць нашы здольнасці да прадбачання і граматнасці адносна будучыні.

У гэтым раздзеле робіцца заклік да ўсіх удзельнікаў адукацыйных працэсаў прасоўваць веды і даследаванні згодна з прапановамі, якія змяшчаюцца ў гэтым дакладзе. Акрамя гэтага робяцца спецыяльныя заклікі да ўніверсітэтаў, навукова-даследчых інстытутаў і міжнародных арганізацый падтрымаць і сістэматызаваць навучанне і разуменне гэтых тэмаў. Каб выканаць установкі новага сацыяльнага кантракта на адукацыю, мы павінны забяспечыць сябе на міжнародным узроўні інструментамі, якія дазваляюць здзейсніць яго рэалізацыю. Раздзел завяршаецца Кіруючымі прынцыпамі дыялогу і дзейнасці да 2050 года, якія павінны цікавіць усіх удзельнікаў адукацыі і ўключаюць заклік да інклюзіўнай сусветнай праграмы даследаванняў, заснаванай на адрозных пунктах гледжання, змесце і месцах.

# Новая праграма даследаванняў у галіне адукацыі

У гэтым дакладзе выкладзены шэраг назіранняў, прынцыпаў і прапаноў, якія, як сцвярджае Камісія, павінны накіроўваць новую праграму даследаванняў адносна будучыні адукацыі. Гэта вялікая і шматбаковая праграма даследаванняў, арыентаваная на будучыню, усепланетны працэс навучання аб нашай сумеснай будучыні. Яна грунтуецца на разнастайных формах ведаў, пунктах гледжання і канцэптуальных рамках, у якіх ідэі з розных крыніц разглядаюцца хутчэй як дапаўняльныя, а не выключальныя ці супярэчлівыя.

Падкрэсленыя ў гэтым дакладзе прыярытэты ўзмацняюць адзін аднаго і накіроўваюць да ўзгодненай агульнай праграмы даследаванняў. Як падкрэслівалася ў Раздзеле 1, гэтая праграма даследаванняў павінна цэнтралізавана займацца правам на адукацыю, даследаваць усе перашкоды на шляху да якаснай, раўнапраўнай адукацыі для ўсіх. Даследаванні таксама павінны адсочваць, якім чынам апісаныя ў Раздзеле 2 вектары перамен будуць перасякацца з адукацыяй – змены ў нашых клімаце і навакольным асяроддзі, паскарэнне тэхналагічных пераўтварэнняў, паглыбленне расколу ў правячых колах, а таксама нявызначаная будучыня працы і сродкаў да існавання – у наступныя вырашальныя гады. Даследаванні таксама павінны выйсці за рамкі простых вымярэнняў і аналітыкі і вывучаць пытанні абнаўлення адукацыі згодна з аперацыйнымі прынцыпамі, якія апісаны ў Частцы II гэтага даклада, такімі як заснаваная на салідарнасці і супрацоўніцтве педагогіка, узаемаадносіны навучальных праграм з агульным здабыткам ведаў, пашырэнне правоў і магчымасцяў настаўнікаў, пераасэнсаванне школ, а таксама спалучэнне навучання з усімі часамі і прасторамі жыцця. Навучанне, разуменне і досвед, атрыманыя праз гэту далёка ідучую праграму даследаванняў, будуць каталізаваць сумеснае стварэнне новага сацыяльнага кантракта на адукацыю.

## Даследаванні ўнутры адукацыі

Існуе доўгая і значная спадчына адукацыйных даследаванняў, якая цягнецца з пачатку дваццатага стагоддзя і раней і якая прапануе мноства разнастайных навуковых прац, плыняў і пунктаў гледжання, культывуе і крышталізуе ўплывовыя генеалогіі думкі і дзеянняў. Адукацыйныя даследаванні дазваляюць нам лепш зразумець рэальнасць таго, што адбываецца ў школах, класных пакоях і шматлікіх месцах, дзе адбываецца адукацыя. Яны таксама даюць магчымасць зразумець пераўтварэнні, якія адбываюцца з асобнымі людзьмі, у супольнасцях і ў грамадстве наогул.

Даследаванні спецыялістаў, практычныя даследаванні, гістарычныя архіўныя даследаванні, тэматычныя даследаванні, этнаграфія і інш. – гэта толькі частка шматлікіх метадаў, якія апынуліся плённымі для тых, хто працуе ў гэтай галіне. Такім чынам, адукацыю трэба разумець не толькі як поле для правядзення вонкавых эксперыментаў і вывучэння, але і як поле для саміх даследаванняў і аналізу.

Сцвярджэнне школ як месцаў стварэння ведаў і настаўнікаў як уладальнікаў ведаў у значнай ступені залежыць ад таго, як універсітэты, арганізацыі і даследчыкі ўзаемадзейнічаюць і супрацоўнічаюць з тымі, хто займаецца адукацыяй, як яны карыстаюцца іх багатымі ідэямі, разважаннямі і досведам. Універсітэты адыгрываюць вырашальную ролю ў прасоўванні адукацыйных даследаванняў дзякуючы іх досведу як у развіцці дысцыплінарных ведаў, так і ў пераадольванні межаў розных дысцыплін. Настаўнікі заўсёды будуць аднымі з асноўных аўтараў ведаў аб іх прафесіі, якія ёсць вынік сумеснага разважання аб гэтым досведзе, і тут яны павінны атрымаць падтрымку праз публікацыю іх даследаванняў і разважанняў.

> Вучні таксама з’яўляюцца важнымі крыніцамі ведаў і разумення іх уласнага адукацыйнага досведу, спадзяванняў, дасягненняў і разважанняў.

Вучні таксама з’яўляюцца важнымі крыніцамі ведаў і разумення іх уласнага адукацыйнага досведу, спадзяванняў, дасягненняў і разважанняў. Універсітэты і даследчыкі могуць пашырыць падтрымку, захоўваючы дыялог са школамі, настаўнікамі і вучнямі. Ацэнка з удзелам супольнасці, сумесныя даследаванні, даследаванні пад кіраўніцтвам моладзі і пошукі спецыялістаў – гэта толькі частка шматлікіх метадалагічных традыцый, якія могуць выкарыстоўвацца для далейшай сістэматызацыі навучання паміж унутранымі і вонкавымі даследчыкамі адукацыі. Адукацыйныя даследаванні стануць ключавым інструментам абароны і маніторынгу пераўтварэнняў, неабходных для працы з новым сацыяльным кантрактам на адукацыю.

## Мабілізацыя навук аб навучанні

Адно з найбольш унікальных навуковых дасягненняў у адукацыі ў апошнія дзесяцігоддзі было зроблена дзякуючы нейранавукам і вывучэнню мозгу ў сувязі з навучаннем. Гэта ўключае большае разуменне нейрапластычнасці на ўсіх стадыях чалавечага развіцця: анатоміі, структуры і функцый мозгу і чалавечай нейралогіі; здольнасці памяці, апрацоўкі інфармацыі, моўнага развіцця і комплекснага мыслення; а таксама ўплыву на навучанне як станоўчых, так і адмоўных стымулаў, такіх як сон, фізічная актыўнасць, эмоцыі, стрэс і здзекі. Кагнітыўныя працэсы навучання вельмі важныя самі па сабе і даюць разуменне такіх спецыяльных навыкаў, як гаворка, чытанне, пісьмо, прасторавая арыентацыя і г. д.

Нягледзячы на тое, што навукоўцы пакуль што знаходзяцца на пачатку сапраўднага разумення ў гэтай галіне і таго, як яе можна выкарыстаць у дачыненні да адукацыі, яна мае вялікія наступствы для выкладання і навучання, і яе разуменне трэба зрабіць як мага больш даступным для настаўнікаў, даследчыкаў і саміх навучэнцаў. Напрыклад, навукоўцы могуць назіраць трывалыя заканамернасці і карэляцыі паміж паводзінамі і дзейнасцю мозгу ў кантраляваных лабараторных умовах, але пакуль не зразумела, якім чынам гэтыя заканамернасці могуць увасабляцца ў складаных сацыяльных умовах навучання ці як яны могуць адрознівацца для розных груп насельніцтва, народаў, часоў і прастораў.

Будучыя навукі аб навучанні павінны задзейнічаць даследчыкаў з шырокага спектру розных напрамкаў – гендарных, культурных, сацыяльна-эканамічных, лінгвістычных, узроставых і г. д., каб забяспечыць роўнае прадстаўніцтва больш шырокага кола даследчых пытанняў, дапушчэнняў, гіпотэз і прыярытэтаў. Нейраразнастайнасць, адрозненні ў навучанні, даследаванні інваліднасці і спецыяльная адукацыя таксама могуць выйграць ад значных дасягненняў навук аб навучанні.

Якім бы магутным і важным ні было разуменне навук аб навучанні, яно не ахоплівае ўсю шырыню адукацыю. Пазнанне – не адзіны спосаб, якім мы вучымся; грамадскія веды, увасобленыя веды, эмацыйны інтэлект і г. д. узаемадзейнічаюць з тым, што можна зразумець праз нейранавуку, хоць і не вызначаюцца толькі гэтым.

Як падкрэслівалася ў папярэдніх раздзелах па педагогіцы і навучальных праграмах, складанасць адукацыі выцякае з таго факту, што яна непарыўна перасякаецца з усімі аспектамі свету, у тым ліку з яго сацыяльным, эканамічным, экалагічным, матэрыяльным і духоўным вымярэннямі. Існуе істотная небяспека аддзялення свядомасці ад матэрыі, што вядзе да ідэй аб адукацыі, нязначных для многіх з тых, хто навучаецца. Для прасоўвання апісаных у гэтым дакладзе прыярытэтаў неабходна, каб нейранавукі ў большай ступені звязвалі свае вынікі з кантэкстам гэтых разнастайных і складаных бакоў адукацыі, каб атрымаць кагнітыўныя і сацыяльныя перавагі, якія прапануе высакаякасная адукацыя.

## Пераўтварэнне даследчых партнёрстваў у мэтах адукацыі

Міждысцыплінарныя, міжсектаральныя і міжкультурныя даследчыя партнёрствы, якія ахопліваюць акадэмічную і грамадзянскую супольнасць і адукацыйнае асяроддзе, а таксама спрыяюць сумеснай камунікацыі і сумеснаму навучанню, прапануюць велізарны патэнцыял для ажыццяўлення прыярытэтаў і прапаноў, вылучаных у гэтым дакладзе.

Не ўсе даследчыя партнёрскія адносіны з’яўляюцца справядлівымі і раўнапраўнымі, і партнёры з большымі рэсурсамі і інстытуцыянальнымі паўнамоцтвамі могуць залішне ўплываць на ход і вынікі партнёрства, нават калі гэта робіцца ненаўмысна. Для таго, каб аспрэчыць дапушчэнні ў адносінах адукацыі і вакол яе, многія з якіх глыбока ўкараніліся ў нашу канцэпцыю прыроды чалавека, грамадства і больш чым чалавечага свету, патрабуецца эпістэмная сціпласць. Мы павінны адысці ў нашай аперацыйнай парадыгме ад спрошчаных класіфікацый адносна ўзаемаадносін у галіне ведаў, такіх як “поўнач / поўдзень” ці “заходні / не-заходні”, і абапірацца на больш складаную і міжасабовую экалогію ведаў.

У мэтах новага сацыяльнага кантракта на адукацыю неабходна ўзбагаціць гэту адукацыйную экалогію разнастайным досведам і спосабамі пазнання, якія не былі спустошаныя праз выключэнне, дэфіцытнае мысленне і вузкія эпістэмічныя дапушчэнні. Адукацыя з’яўляецца працэсам адносін паміж вучнямі, настаўнікамі, сем’ямі і супольнасцямі, і таму мы павінны шукаць хутчэй міжасабовых, чым іерархічных ведаў. Гэта можна здзейсніць праз умацаванне нацыянальнага і мясцовага даследчага патэнцыялу і ўключаць патэнцыял

людзей, якія могуць ствараць і дэманстраваць веды рознымі спосабамі ў залежнасці ад кантэксту, культуры і мовы.

Акрамя таго, важнымі крыніцамі ведаў і разумення з'яўляюцца галасы нізавых суполак і грамадскіх рухаў, і мы павінны часцей прыслухоўвацца да іх, чэрпаць з іх і дапаўняць іх, бо яны знаходзяцца там, дзе адбываюцца збоі і змены, якія фарміруюць нашу будучыню. Рухі, якія супрацьстаяць знішчэнню нашай планеты і адмаўляюцца ад усіх форм забабонаў і дыскрымінацыі, з'яўляюцца аднымі з многіх прыкладаў сумеснага пераасэнсавання нашай будучыні. Супрацоўніцтва з такімі супольнасцямі і рухамі не заўжды павінна быць фармальным ці інстытуцыйным, але гэта не змяншае яго значэння для калектыўнай працы па вывучэнні ролі адукацыі, а таксама для ўзаемаадносін з такімі рухамі.

## Пашырэнне ведаў, даных і факталагічнай базы

Мабілізацыя новай праграмы даследаванняў у галіне будучыні адукацыі будзе як выкарыстоўваць, так і генерыраваць значныя аб'ёмы шырокага спектру ведаў, даных і фактаў: колькасных і якасных, нарматыўных і апісальных, алічбаваных і эфемерных, тэарэтычных і практычных.

Веды трэба накіроўваць і пашыраць, каб можна было зразумець сучасныя ўмовы і ўявіць новыя будучыя магчымасці для адукацыі. Аднак гістарычна адбывалася так, што пэўныя формы і крыніцы ведаў вылучаліся, а іншыя выключаліся. Веды як наогул, так і веды ў галіне адукацыі шчыльна перасякаюцца з уладамі. Дамінуючыя рэжымы ўлады над людзьмі і планетай трэба замяніць рэжымамі ўлады для людзей і з людзьмі, якія б дазволілі нам знайсці новыя формы інклюзіі і ўдзелу ў адукацыі. У якасці адной з праграм даследаванняў па развіцці будучыні адукацыі ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі неабходна пастаянна пераглядаць характар ведаў, даных і фактаў у галіне адукацыі.

### Умацаванне комплекснай экалогіі ведаў

Каб уявіць большую разнастайнасць магчымых варыянтаў будучыні, чым мы маем зараз, даследаванні і інавацыі не могуць выключаць шматлікія спосабы, якімі разнастайныя групы людзей, культуры і традыцыі счытваюць інфармацыю і разумеюць свет. Сапраўды, кіруючыя прынцыпы гэтага даклада адносна педагогікі, ведаў, удзелу, супрацоўніцтва і салідарнасці ўжо маюць багатыя традыцыі ведаў у шматлікіх культурных светапоглядах і пунктах гледжання. Дэкаланізацыя ведаў патрабуе большага прызнання абгрунтаванасці і дастасавальнасці разнастайных крыніц ведаў да патрабаванняў сучаснасці і будучыні. Яна патрабуе адыходу ад бачання карэнных эпістэмалогій як аб'ектаў вывучэння і пераарыентуе на бачанне іх як магчымых падыходаў да вывучэння і пазнання свету.

У многіх кірунках, пачынаючы ад развіцця да эканомікі і адукацыі, пэўныя віды ведаў больш прывілеяваныя, чым іншыя. Часта веды з глабальнай поўначы перадаюцца

ў раёны, якія знаходзяцца на стадыі развіцця, згодна з дапушчэннем, што створаныя на месцы веды не існуюць або іх не хапае. Аднак гэтыя навязаныя “рашэнні” часта не могуць дапамагчы ўстойліваму развіццю гэтых рэгіёнаў, альбо яны прыносяць карысць некаторым людзям за кошт уразлівых пластоў насельніцтва, а таксама за кошт экалагічнага дабрабыту ў доўгатэрміновай перспектыве.

Карэнныя і плюралістычныя спосабы пазнання аспрэчваюць дапушчэнні аб мадэлях і практыках развіцця.

Ацэнка і прызнанне шматлікіх спосабаў пазнання не павінна разглядацца як прыняцце крайняга рэлятывізму або адмова ад прыхільнасці ісціне. Гэта далёка не так. Карэнныя і плюралістычныя спосабы пазнання аспрэчваюць дапушчэнні аб мадэлях і практыках развіцця, якія не змаглі належным чынам адпавядаць іх рэальнасці. Напрыклад, для многіх заходніх традыцый думкі звычайнай справай стала бінарнае супрацьпастаўленне: тэорыя і практыка, індывідуальнае і калектыўнае, мастацтва і навукі, чалавек і прырода, прагрэсіўнае і кансерватыўнае, веданне і адчуванне, інтэлектуальнае і фізічнае, духоўнае і матэрыяльнае, сучаснае і традыцыйнае і г. д. Неабходным унёскам шматлікіх незаходніх светапоглядаў было аспрэчванне самога пасылу гэтых палярнасцей, праліванне новага святла на іх узаемаадносіны і спараджальную напружанасць як сувязных частак складанага, узаемазвязанага свету.

Так, у часы крызісаў мясцовыя супольнасці часта могуць накіроўваць велізарныя аб’ёмы досведу, ведаў і творчасці на змякчэнне наступстваў і адаптацыю адукацыі да надзвычайных сітуацый. Назапашаныя за доўгі час веды продкаў аб устойлівых сельскагаспадарчых працэсах, грамадскай узаемнасці і шляхах жыцця разам з прыродным светам, паміж іншага, з’яўляюцца важнымі крыніцамі назапашаных звестак, у якіх чалавецтва мае большую патрэбу, чым калі-небудзь раней. Аднак цэлыя абшары такіх ведаў яшчэ не былі цалкам прызнанымі, кананізаванымі і не ўвайшлі ў фармальную адукацыю.

Даследаванні ў галіне будучыні адукацыі будуць патрабаваць абнаўлення і ўключэння разнастайных відаў і крыніц ведаў згодна з вызначанымі ў гэтым дакладзе ключавымі прыярытэтамі. Як згадвалася ў папярэдніх раздзелах, гэта залежыць ад дынамічнага ўдзелу ў агульным здабытку ведаў на справядлівых і раўнапраўных умовах. Пасяховая вытворчасць ведаў для будучыні адукацыі павінна будзе зрабіцца свядома інклюзіўнай, сацыяльна і культурна разнастайнай, міждысцыплінарнай і міжпрафесійнай, а таксама здольнай спрыяць зносінам, супрацоўніцтву, уласнасці і ўзаемнаму навучанню.

## Статыстычныя даныя, паказчыкі і аналіз

Статыстычныя даныя могуць паказаць маментальны “здымак” пэўнага паказчыка, і, суаднесеныя з іншымі апорнымі пунктамі, яны могуць прапанаваць неацэннае разуменне суадносінаў, зменаў і ўмоваў у розныя часы і ў розных месцах. Яны могуць праілюстраваць напрамкі, якія пэўныя паказчыкі прынялі з цягам часу, і спрагназаваць шэраг магчымых вынікаў згодна з рознымі сцэнарамі, варыянтамі, падзеямі ці мерамі ўздзеяння.

Інстытут статыстыкі ЮНЕСКА (UIS) адыгрывае важную ролю ў зборы і публікацыі важнай статыстыкі аб шэрагу паказчыкаў адукацыі. Падыход UIS заснаваны на нарошчванні патэнцыялу па зборы і пацверджанні статыстычных даных на нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях. Дэталізацыя разбіўкі даных па гендары, месцы, узроўні даходаў і іншых характарыстыках спрыяе разуменню пытанняў роўнасці і раўнапраўя. Праца UIS па пастаянным удакладненні азначэнняў, адначасова забяспечваючы статыстычную цэласнасць для эфектыўнага аналізу, мае вялікае значэнне для развіцця і забеспячэння іх якасці і карыснасці. Падтрымка безупыннай працы UIS будзе неабходнай для забеспячэння важнай інфармацыі па нашых найбольш істотных адукацыйных паказчыках, а таксама для забеспячэння даступнасці гэтай інфармацыі для ўсіх.

У той жа час трэба пазбягаць спрошчанасці ў падыходах да статыстычных і колькасных даных у бліжэйшыя дзесяцігоддзі. Катэгарызацыя карысная для аналізу, аднак у той жа час не трэба яе разглядаць як нязменную і зафіксаваную. У рэальнасці катэгорыі заўсёды маюць больш нюансаў, яны больш складаныя і размытыя, чым гэта можа быць абгрунтавана з дапамогай колькаснай ацэнкі. Праца па зборы і пацвярджэнні статыстычных даных, асабліва ў вялікіх маштабах, таксама можа быць працаёмкай і дарагой. Там, дзе гэта магчыма, высілкі па зборы даных павінны ўмацоўваць і ўзмацняць існуючыя нацыянальныя крыніцы даных, каб пазбягаць высокіх патрабаванняў і коштаў, звязаных з накладаннем паралельных набораў даных.

Такім жа чынам, будзе патрабавацца ўважлівае разважанне, каб азначыць істотныя паказчыкі, якія павінны адпавядаць мясцовым адукацыйным прыярытэтам, а таксама міжнародным мэтам. У такіх падыходах неабходна прызнаваць, што не ўсё варта вымяраць і не ўсё вартае ў адукацыі можа быць колькасна ацэнена. Такім чынам, сціплы падыход тых, хто збірае і выкарыстоўвае статыстыку, – ключ да бачання вынікаў як зыходнага пункта для далейшых пошукаў і даследаванняў у прасоўванні задач і прыярытэтаў адукацыі. Удумлівая праца дэпартаментаў ЮНЕСКА побач з іншымі агенцтвамі і даследчыкамі можа выкарыстоўваць адукацыйную статыстыку ў жыцці, робячы магчымыя прагнозы, але таксама апавядаючы гісторыі, якія асвятляюць і аспрэчваюць іх тлумачальную сілу.

## Вялікія даныя і зменлівая прырода ведаў

Тэхналагічныя дасягненні спарадзілі новыя здагадкі адносна таго, што такое веды і як яны павінны ствараецца. Нашы сучасныя тэхналогіі спрыяюць чаканням таго, што інфармацыя, а таксама спараджаемыя ёю веды і разуменне, будуць вялікімі (збірацца з некалькіх апорных пунктаў даных, а не з аднаго), дазволяць пошук (здабыванне і выяўленне), захаванне (магчымасць архівацыі), перадачу (цэласны абмен) і індывідуалізацыю (аптымізацыю для ўласнага ўжывання). Кожная з гэтых якасцей заслугоўвае ўважлівага вывучэння, бо яны атачваюць і фарміруюць ідэі аб адукацыі, у тым ліку аб яе мэтах і працэсах, адкрываючы адны магчымасці і закрываючы іншыя.

Больш шырокі доступ да лічбавых інструментаў даў даследчыкам беспрэцэдэнтныя магчымасці арганізоўваць, сінтэзаваць і апрацоўваць большыя наборы адукацыйных даных, чым калі-небудзь раней. Магчымасці лічбавых метадаў, інструментаў, збору і захоўвання даных, алгарытмічнай апрацоўкі даных выклікалі вялікі энтузіязм адносна таго, як іх можна выкарыстоўваць для паляпшэння разумення, практыкі і эфектыўнасці адукацыйных метадаў і падыходаў. Апрацоўка статыстычных даных, складанне графікаў, геаграфічных карт, схем сетак, пошук заканамернасцей і адсочванне ключавых слоў – толькі частка інструментаў, даступных для выкарыстання даследчыкамі. Таксама існуюць выдатныя магчымасці для даследавання аспектаў нашага адукацыйнага жыцця, якія робяцца ўсё больш алічбаванымі.

Сёння дыфірамбы “вялікім даным” гучаць ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях, у дзяржаўных установах і ў штаб-кватэрах карпарацый. Гэты факт мае два наступствы. Першае зводзіцца да дапушчэння, што ніякую заканамернасць немагчыма выявіць без вялікіх лічбаў, або пунктаў даных, ці вялікай сукупнасці профіляў, мікрапаводзінаў, націскання клавішаў, вочных яблык ці электронных сігналаў. І, згодна з адным варыянтам логікі аналітыкі даных, без заканамернасці няма сэнсу. Другое наступства – гэта больш далікатная тэндэнцыя бачыць даныя – асабліва тыя, якія паддаюцца колькаснаму вымярэнню і добра спалучаюцца з лічбавымі тэхналогіямі, – як найважнейшую форму ведаў. Мы зараз становімся сведкамі нараджэння навукі аб даных як асобнай галіны тэхнічных ведаў, і, як і ў многіх галінах, навука аб даных мае велізарны ўплыў на фарміраванне пераканаўчых наратываў і тлумачэнняў у адукацыі.

Як гэта адбываецца і з іншымі інструментамі, важна, каб даследчыкі ўдасканальвалі, што можа і што не можа быць дасягнута з выкарыстаннем лічбавых інструментаў даследаванняў. У залежнасці ад мэты пэўнага пошуку, большы аб’ём даных не абавязкова дае лепшыя ці больш дакладныя вынікі. Наша пазіцыя арыентавана на мэту праграмы і культуру даследаванняў, а не інструмент. Бачанне, якога могуць дасягнуць камп’ютары, не супадае з тым, якое маюць людзі. Часам праграмнае забеспячэнне можа выявіць нечаканыя і красамоўныя высновы дзякуючы яго здольнасці апрацоўваць большыя аб’ёмы даных хутчэй, чым людзі з іх аналагавымі метадамі. А іншы раз чалавечы мозг можа зразумець змест, сэнс, каштоўнасці і наступствы, якія з’яўляюцца занадта складанымі для штучнага інтэлекту.

У той час як даследчыкі абапіраюцца на велізарны патэнцыял вялікіх даных і лічбавых інструментаў у адукацыі, мы павінны супраціўляцца захапленню праграмным забеспячэннем у лічбавай аналітыцы, каб паказаць меркаваную аб’ектыўнасць. У прыватнасці, мы павінны пастаянна адсочваць прадузятасці і сляпыя плямы ў нашых лічбавых метадах даследаванняў праз прызму справядлівасці і роўнасці, улічваючы тое, што ляжыць па-за межамі праграмавання. Калі гэтыя тэндэнцыі працягнуцца, існуе істотная пагроза, што ў 2050 годзе значная частка нашых ведаў будзе перафарміраваная ў колькасныя, зручныя для алгарытмаў, малекулярныя, прыдатныя для лёгкага захоўвання і хуткага абмену формы, якія даступны толькі з выкарыстаннем лічбавых прыладаў. Мы павінны занепакоіцца тым, што сектар штучнага інтэлекту, які бурна развіваецца, імкнецца

зрабіць гэтыя якасці самаўзнаўляльнымі, аўтаномнымі і незалежнымі ад кантролю з боку людзей. Этычныя рызыкі такіх амбіцый трэба будзе пільна адсочваць на працягу наступных трыццаці гадоў.

## Наватарства ў будучыні адукацыі

Інавацыі ў адукацыі адлюстроўваюць здольнасць да эксперыментаў, абмену, узбагачэння і натхнення іншых людзей. Яны могуць адбывацца ў любым месцы і ў любых маштабах, ад настаўніка, які працуе з асобным вучнем ці класам, да падыходаў у маштабах школы ці краіны. Інавацыі часта з'яўляюцца плёнам супрацоўніцтва і натхнення досведам і поспехамі іншых педагогаў, палітыкаў, даследчыкаў і школ у розных кантэкстах.

### Развіццё, запазычанне і адаптацыя стратэгіі і праграмавання

Вялікае значэнне будзе мець маштабаванне досведу і інавацый у галіне адукацыі на новыя сітуацыі праз абмен практыкамі і стратэгіяй. Імпульс да параўнальнага навучання здольны "зрабіць знаёмае дзіўным", пашыраючы перспектывы і вывучаючы ідыясінкразіі і дапушчэнні, якія прымаюцца як належнае. Адаптацыя і запазычанне самі па сабе павінны разглядацца як працэсы навучання і інавацый. Мы можам услаўляць атрыманы ў іншых месцах досвед і натхняцца ім у святле азначаных у гэтым дакладзе нарматыўных прынцыпаў, пры гэтым улічваючы кантэкстуальныя ўмовы, досвед і існуючыя веды.

Дзеючыя асобы ў адукацыйных сістэмах таксама з'яўляюцца важнымі крыніцамі інавацыйных падыходаў і ўяўленняў. Інавацыі, якія цалкам пераносяцца звонку галіны, абавязкова з'яўляюцца абмежаванымі, нават скажонымі ў іх уяўленнях і прапанаваных рашэннях. Адукацыйныя веды ствараюцца і легітымізуюцца рознымі шляхамі. Іх цэнтральныя дзеячы – настаўнікі, вучні, дырэктары і калектывы школ і інш. – усе яны ўдзельнікі працэсаў даследаванняў і інавацый. Распрацоўка навучальных праграм і рэфармаванне могуць асабліва ўзбагачацца праз унёскі тых, хто карыстаецца імі, у той час як яны ўсё шчыльней узаемадзейнічаюць з агульным здабыткам ведаў. Урады павінны адыграць важную ролю ў гэтай сувязі, забяспечваючы належную падтрымку ўдзелу настаўнікаў і школ у дыялогу, а таксама перагляд сістэм і працэсаў народнай асветы.

Падчас даследаванняў і інавацый часта паўстае пытанне аб маштабах. Перспектыўны досвед можа быць карысным, і ім можна абменьвацца. Аднак самі па сабе "найлепшыя практыкі" часта больш засяроджваюцца на выніках, чым на працэсе ці ўмовах, якія прыводзяць да іх. Пашырэнне супрацоўніцкіх сетак і навучальных суполак – настаўнікаў, школ, спецыялістаў па граматнасці, палітыкаў і інш. – можа садзейнічаць даследаванням і выкарыстанню ў рэжыме рэальнага часу прапаноў наконт навучальных праграм, праграмавання і стратэгій у розных кантэкстах. Этыка сціпласці можа засцерагчы ад антыгістарычных і адарваных ад кантэксту дапушчэнняў, ад якіх залежаць любыя інавацыі ў галіне адукацыі.

Мы заклікаем універсітэты, даследчыя інстытуты і іх партнёраў надаваць асаблівую ўвагу даследаванням і інавацыям для падтрымкі абнаўлення адукацыі як грамадскага дабра і сумеснага будаўніцтва новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Аднак яны могуць дамагчыся найбольшай эфектыўнасці ва ўзаемаадносінах і ў дыялогу з тымі, хто ўжо працуе, думае, разважае ў галіне адукацыі – з настаўнікамі, вучнямі, школамі, сем'ямі, супольнасцю. Як згадвалася ў папярэдніх раздзелах, для гэтага будзе патрабавацца абнаўленне грамадскай місіі ўніверсітэтаў па стварэнні адкрытага і даступнага агульнага здабытку ведаў, а таксама адукацыя новых пакаленняў даследчыкаў і прафесіяналаў, якія імкнуцца да пашырэння ведаў на карысць сабе і чалавецтву.

Мы заклікаем універсітэты, даследчыя інстытуты і іх партнёраў надаваць асаблівую ўвагу даследаванням і інавацыям для падтрымкі абнаўлення адукацыі як грамадскага дабра.

Міжнародныя арганізацыі таксама павінны адыграць унікальную і значную ролю ў прасоўванні даследаванняў і інавацый у галіне адукацыі ў напрамку новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Па выніках гэтага даклада ЮНЕСКА было прапанавана стварыць цэнтр абмену практыкамі, дзе выканаўцы змогуць весці дыялог паміж сабой і здзяйсняць, кожны на свой лад, прапановы, якія выкладзены ў гэтым дакладзе. Хуткасць змены свету і з'яўленне новых ведаў патрабуюць дынамікі і ад гэтага даклада, каб ён мог быць перапісаны ў любы момант.

## Ацэнка, эксперыменты і рэйтынгі

Ацэнка і разважанні ўяўляюць сабой неабходныя працэсы ў жыццёвым цыкле адукацыйных праграм і стратэгій. Ацэнка можа забяспечыць ажыццяўленне менавіта тых мэтаў, якія матывуюць распрацоўку праграмы ці стратэгіі. Яна можа дапамагчы зразумець і апісаць вынікі праграмы і распрацоўкі і, што важна, павінна ўлічваць свае запланаваныя і непрадбачаныя вынікі. Напрыклад, калі праграма ці стратэгія прыносіць відавочную карысць некаторым людзям за кошт росту агульнай роўнасці, ці калі яна стымулюе кароткатэрміновую эфектыўнасць за кошт доўгатэрміновай трываласці, дапушчэнні аб такой меры неабходна аператыўна перагледзець.

У адпаведнасці з замацаванай у гэтым дакладзе этыкай супрацоўніцтва ацэнка павінна выкарыстоўваць рэфлексіўныя здольнасці тых, хто знаходзіцца ўнутры сістэм адукацыі – настаўнікаў, вучняў і школ, і не толькі вызначаць выклікі, слабыя ці моцныя бакі інавацыі, але таксама і прапаноўваць істотныя магчымасці для іх змянення, паляпшэння ці адмаўлення ад іх. Трэба адзначыць, што патрабуецца выразная аналітычная аснова для забеспячэння паслядоўнасці ў мэтах планавання, ацэнкі і рэкамендавання інавацый.

Тэставанне, эксперыментаванне і рандамізаваныя кантрольныя выпрабаванні могуць дапамагчы пацвердзіць здагадкі, скарэкціраваць методыкі, выправіць пралікі і зразумець межы абагульнення. Аднак магчымасць разглядаць пераменныя велічыні ў складаных

сістэмах ізалявана патрабуе ўважлівага абдумвання і складанай распрацоўкі. Асабліва важна тое, што, падтрымліваючы дух супрацоўніцтва пры стварэнні новага сацыяльнага кантракта на адукацыю, мы павінны памятаць пра этычны прынцып, які патрабуе ад нас не праводзіць эксперыменты на людзях. Усе людзі – вучні, настаўнікі і сем'і – павінны разглядацца як паўнавартасныя ўдзельнікі навучання адносна іх уласных адукацыі і развіцця. Выкарыстанне "натуральных" эксперыментаў для разумення наступстваў шырокага ўмяшання ці змен, якія ўжо адчуваюцца ў рамках адукацыйнага досведу, можа таксама даць разуменне сітуацыі ў бліжэйшыя гады, асабліва ў святле значных зменаў і парушэнняў у бліжэйшай будучыні. Такія віды аналізу могуць прапанаваць большую дальнабачнасць для нашага разумення ўстойлівасці адукацыі і яе рэагавання на змены.

Таксама можна зрабіць карысныя параўнанні, каб прапанаваць іншыя перспектывы для разважанняў, паляпшэнняў ці натхнення альбо каб падкрэсліць прыярытэтныя напрамкі для больш шырокіх пошукаў, увагі ці падтрымкі. Аднак занадта часта параўнанні і рэйтынгі выкарыстоўваюцца з мэтай пакарання, пазбаўляючы фінансавай падтрымкі ці ўдзелу сем'яў тыя ўстановы, якія патрабуюць іх больш за астатнія. Параўнанне малаэфектыўнае, калі яно нівеліруе досвед, уніфікуе чаканні і ігнаруе разнастайнасць кантэкстаў, рэсурсаў і гістарычных чыннікаў.

Таксама трэба пераглядзець спосабы, якімі робяцца параўнальныя рэйтынгі ў вышэйшай адукацыі. Цяжка рабіць параўнанні добрасумленна, этычна і не навязваючы аднастайнасць. Параўнанні робяцца праблематычнымі, калі вельмі розныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія працуюць у непараўнальных умовах, змушаныя спаборнічаць у міжнародных рэйтынгах незалежна ад іх уласных адметных абставін. Элітныя мадэлі ўніверсітэтаў, якія маюць належныя рэсурсы і актыўна займаюцца даследаваннямі, непрапарцыйна ўплываюць на амбіцыі іншых вышэйшых навучальных устаноў, часта за кошт мясцовай актуальнасці і задавальнення патрэбаў мясцовых студэнтаў і іх супольнасцей.

Пры гэтым не трэба абвінавачваць толькі самі ВНУ за рэйтынгі і выкліканую канкурэнцыяй інстытуцыйную аднастайнасць. Урады і сусветная палітычная супольнасць таксама павінны не так блізарука засяроджвацца на даследчым аспекце сістэм вышэйшай адукацыі. Больш увагі трэба будзе надаваць большасці ўстаноў, якія наведвае большасць людзей у свеце. Тое, як установы служаць навучанню, прафесійнай будучыні іх вучняў і іх супольнасцям, як установы падтрымліваюць грамадскі дыскурс і палітычныя дыскусіі, тое, як установы спрыяюць экалагічнай, эканамічнай і сацыяльнай справядлівасці – гэтыя аспекты часта застаюцца незаўважанымі, з'яўляючыся выключна важнымі для параўнання, павучальнымі для ўсіх нас. Ацэнка ў галіне вышэйшай адукацыі павінна выходзіць па-за рамкі канкурэнтных рэйтынгаў і замест гэтага імкнуцца палепшыць выкладчыцкі і даследчыцкі патэнцыял усіх вышэйшых навучальных устаноў для выканання іх грамадскай місіі.

## Прынцыпы дыялогу і дзейнасці

У перспектыве да 2050 года ёсць чатыры ключавыя прыярытэты, звязаныя з даследаваннямі і інавацыямі дзеля будучыні адукацыі:

- **Камісія заклікае да адзінай, сусветнай, калектыўнай праграмы даследаванняў па пытаннях будучыні адукацыі**. Гэтая праграма даследаванняў павінна засяроджвацца на праве ўсіх людзей на адукацыю, яна павінна вывучаць будучыя збоі і змены і спрыяць разуменню і досведу адпаведна прынцыпам, выкладзеным у Частцы 2 гэтага даклада. У духу гэтага даклада такая праграма даследаванняў павінна пераўсталяваць прыярытэты ў святле граматнасці і мыслення адносна будучыні.

- **Веды, даныя і факты адносна будучыні адукацыі павінны ўключаць разнастайныя крыніцы і спосабы пазнання**. Ідэі, атрыманыя з розных пунктаў гледжання, могуць прапанаваць розныя перспектывы для сумеснага разумення адукацыі, замест выключэння і замены адно адным.

- **Інавацыі ў галіне адукацыі павінны адлюстроўваць больш шырокі спектр магчымасцяў у розных кантэкстах і месцах**. Параўнанні і досвед могуць быць узаемна натхняльнымі і пры гэтым павінны адпаведна рэагаваць на сацыяльныя і гістарычныя рэаліі дадзенага кантэксту.

- **Даследаванні ў мэтах новага сацыяльнага кантракта на адукацыю павінны быць перагледжаны, і ўсе ўдзельнікі павінны быць запрошаны для яго распрацоўкі**. Насенне ўжо пасеянае, асабліва сярод настаўнікаў, вучняў і школ. Асаблівыя абавязкі ляжаць на даследчых установах, урадах і міжнародных арганізацыях, якія павінны ўдзельнічаць і падтрымліваць праграму даследаванняў, якая каталізуе сумеснае будаўніцтва новага сацыяльнага кантракта на адукацыю.

# Раздзел 9

## Заклік да глабальнай салідарнасці і міжнароднага супрацоўніцтва

Новы грамадскі дагавор унутры грамадства дазволіць моладзі жыць у годных умовах, забяспечыць жанчынам тыя ж перспектывы і магчымасці, што і мужчынам, і абароніць хворых, уразлівых, а таксама прадстаўнікоў розных меншасцей… На працягу існавання аднаго пакалення ўсе дзеці ў краінах з нізкім і сярэднім узроўнямі даходаў маглі б атрымаць доступ да якаснай адукацыі на ўсіх узроўнях. Гэта магчыма. Нам толькі трэба вырашыць гэта зрабіць… Каб ліквідаваць гэтыя прабелы і зрабіць магчымым заключэнне Новага грамадскага дагавору, нам патрэбная Новая глабальная дамова, якая забяспечвае больш шырокае і справядлівае размеркаванне ўлады, багацця і магчымасцяў на міжнародным узроўні.

**Антоніу Гутэрыш (António Guterres)**, Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, лекцыя памяці Нельсана Мандэлы, 18 ліпеня 2020 года

**Для каталізацыі новага сацыяльнага кантракта на адукацыю Камісія нанова заклікае да прыхільнасці глабальным сумесным дзеянням у падтрымку адукацыі як грамадскага дабра, заснаваным на больш справядлівым і раўнапраўным супрацоўніцтве дзяржаўных і недзяржаўных удзельнікаў на мясцовым, нацыянальным і міжнародным узроўнях.**

Прынцып, згодна з якім адукацыя ёсць грамадскае дабро, непарыўна звязаны з глабальнай адказнасцю. У 2020 і 2021 гадах мы сталі сведкамі беспрэцэдэнтнай мабілізацыі навуковых суполак ва ўсім свеце для распрацоўкі вакцын супраць COVID-19 пры падтрымцы ўрадаў, дзяржаўных і прыватных устаноў і грамадзянскай супольнасці. Аднак гэты ўражвальны прыклад таго, што можа зрабіць сусветная навуковая кааперацыя, калі будучае чалавецтва знаходзіцца пад пагрозай, быў зацenены значна больш складанай задачай забеспячэння міжнароднай роўнасці ў пастаўцы тых самых вакцын. Нягледзячы на шырокае прызнанне таго факту, што ніхто не знаходзіцца ў бяспецы, пакуль няма бяспекі для ўсіх, вакцынны нацыяналізм падкрэсліў сур'ёзныя прабелы ў нашай здольнасці сумесна працаваць дзеля глабальнага грамадскага дабра.

> Вакцынны нацыяналізм падкрэсліў сур'ёзныя прабелы ў нашай здольнасці сумесна працаваць.

Адукацыя выхоўвае вынаходлівасць чалавека і нашы здольнасці да калектыўных дзеянняў, кожная з гэтых якасцей неабходная для вырашэння асноўных праблем нашага часу. Так, сёння больш, чым калі-небудзь у гісторыі чалавецтва, пабудова квітнеючага, справядлівага, устойлівага і мірнага свету патрабуе ад усіх людзей, незалежна ад іх паходжання, культуры і ўмоваў, удзелу ў якаснай адукацыі на працягу ўсяго іх жыцця. Трэба, каб доступ да фармальнай адукацыі і навучання дапаўняўся раўнапраўным доступам да ведаў і інфармацыі: кожны чалавек паўсюдна павінен мець лічбавы доступ. Гэтак жа, як здароўе аднаго чалавека звязана са здароўем усіх людзей, наша будучае выжыванне залежыць ад задавальнення адукацыйных патрэбаў кожнага дзіцяці, юнака ці дзяўчыны і дарослага ва ўсім свеце, каб яны маглі добрасумленна і актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні нашай агульнай будучыні і кіраванні ёю. Гэта ўяўленне аб адукацыі як грамадскім дабры павінна быць падмуркам узмацнення міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, а таксама дзяржаўнага фінансавання адукацыі, як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўнях. Забеспячэнне доступу ўсіх дзяцей і моладзі да якаснай адукацыі з'яўляецца важнай апорай больш справядлівага і ўстойлівага глабальнага парадку, як нядаўна заявіў Генеральны Сакратар ААН Антоніу Гутэрыш. Абавязак паважаць, абараняць і выконваць права на адукацыю ўскладаецца не толькі на кожную дзяржаву, але і на міжнародную супольнасць.

## Рэагаванне на ўзмацненне хісткасці сусветнага парадку

Міжнародная адукацыйная кааперацыя працуе ва ўмовах усё большай хісткасці сусветнага парадку з глыбока размытым паняццем сусветнага грамадства, замацаваным у агульных

універсальных каштоўнасцях. Глабальныя форумы, такія як Арганізацыя Аб’яднаных Нацый, якія адказваюць за вызначэнне агульных мэтаў і арганізацыю глабальных калектыўных дзеянняў, сутыкаюцца з жорсткай крытыкай і фінансавымі абмежаваннямі.

Недзяржаўныя ўдзельнікі і грамадзянская супольнасць – тыя, хто сцірае межы, а таксама нарматыўныя прадпрымальнікі, якія адказваюць за прасоўванне правоў чалавека як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўнях у дваццатым стагоддзі, – змагаюцца за пабудову трывалых альянсаў і кааліцый у рамках сусветнага парадку, які становіцца ўсё больш раздробленым. Іх поле для манеўру будзе залежаць ад эканамічных рэалій постпандэмічнага свету, як і міжнароднае фінансаванне іх працоўных дагавораў. Між тым, неліберальныя недзяржаўныя суб’екты самі становяцца прадпрымальнікамі і педагогамі, яшчэ больш здольнымі выкарыстоўваць лічбавыя тэхналогіі і патокі інфармацыі шляхамі, якія супярэчаць каштоўнасцям, зацверджаным у Дэкларацыі правоў чалавека Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, і якія былі выразна вызначаныя нядаўна ў Мэтах устойлівага развіцця.

Эканамічныя змены апошняй паловы стагоддзя былі амаль такімі ж глыбокімі, як і гэтыя палітычныя зрухі. Тэхналагічныя і навуковыя дасягненні разам з эканамічнай глабалізацыяй, безумоўна, спрыяюць павышэнню дабрабыту, зніжэнню беднасці хатніх гаспадарак у свеце і лепшаму доступу да адукацыі. Аднак яны больш не ўслаўляюцца за стварэнне ўсё больш “плоскага” і ўсё больш адкрытага свету. Эканамічны рост стварыў магутныя анклавы для багатых. Тэхналагічнае развіццё адбываецца ў тандэме з новымі формамі эканамічнай і інфармацыйнай манаполіі, якая пагражае самім падмуркам ліберальнай дэмакратыі. Нягледзячы на доўгатрывалую веру ў мацнеючыя адносіны паміж эканамічным ростам і дэмакратыяй, патэнцыял калектыўнай дзейнасці і дэмакратычнага кіравання, як у нацыянальных дзяржавах, так і паміж імі, быў нечакана абмежаваны падчас апошніх дзесяцігоддзяў эканамічнага прагрэсу.

Як, на жаль, паказаў павольны прагрэс у галіне барацьбы са змяненнем клімату, а таксама ў іншых напрамках, якія пільна патрабуюць міжнароднага супрацоўніцтва (міграцыя, мір, інфармацыйная прыватнасць), у апошнія дзесяцігоддзі быў дасягнуты абмежаваны кансэнсус (ці магчымасць кансэнсусу) адносна глабальнага грамадскага дабра і відаў міжнароднага супрацоўніцтва, патрэбных для вырашэння сучасных праблем, якія непрапарцыйна адбіваюцца на бедных.

У рамках цяперашніх рэформаў ААН робіцца спроба ўвесці інавацыі ў адказ на гэты крызіс шматбаковасці. У гэтым раздзеле прапануюцца тры новыя падыходы: уключэнне разнастайных недзяржаўных дзеючых асоб у глабальнае кіраванне праз партнёрствы; рух ад сыходных да шматцэнтрычных дзеянняў; а таксама новыя формы рэгіянальнага супрацоўніцтва, асабліва напрамак “поўдзень-поўдзень” і трыкутная кааперацыя.

## Ад дапамогі да партнёрскіх сувязей

Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне адукацыі не толькі адбываецца ў рамках хісткага сусветнага парадку, але і павінна таксама рэагаваць на яго. Рэалізацыя новай глабальнай

згоды на адукацыю патрабуе абноўленых мадальнасцей міжнароднага супрацоўніцтва. У той жа час адукацыйныя ўстановы самі могуць закладаць падмурак для шырокага разумення сучасных выклікаў і патрэбы ў калектыўных дзеяннях, асабліва з боку моладзі.

Гісторыя паказвае нам, што міжнародная архітэктура адукацыйнага супрацоўніцтва глыбока грунтуецца на каланіялізме разам з імкненнем да абароны нацыянальных эканамічных і геапалітычных інтарэсаў. Гэтая архітэктура вызначаецца вакол фінансавых патокаў і перадачы ідэй з поўначы на поўдзень. Сёння міжнароднае развіццё адукацыі і замежнай дапамогі з’яўляецца праблематычным. Адукацыя не толькі атрымлівае вельмі малую долю агульнага аб’ёму афіцыйнай дапамогі на развіццё (АДР), дапамога адукацыі непрапарцыйна накіравана на краіны з сярэднімі ўзроўнямі даходаў. Дапамога адукацыі змяншаецца ў Чорнай Афрыцы – кантыненце, які будзе мець найбольшую долю моладзі ў 2050 годзе і, згодна з прагнозамі, сутыкнецца з найбольш непасрэднымі экалагічнымі і эканамічнымі выклікамі на Зямлі.

Больш за тое, АДР на адукацыю мае тэндэнцыю надаваць перавагу вышэйшай адукацыі, у тым ліку стыпендыям, што асабліва прыкметна ў найбольшых эканоміках краін-донараў “Вялікай сямёркі” (G7). Занадта мала падтрымкі надаецца забеспячэнню рэалізацыі ўсеагульнага доступу да дашкольнай адукацыі і якаснай пачатковай і сярэдняй адукацыі. Не была прынята пераканаўчая глабальная стратэгія калектыўных дзеянняў па ліквідацыі непісьменнасці сярод дзяцей – мэта, упершыню прынятая ААН у сярэдзіне дваццатага стагоддзя. Колькасць дзяцей па-за школай упарта не змяншаецца, роўна як і колькасць дзяцей і моладзі, якія ходзяць у школу, але мала чаму там вучацца. Адукацыйныя патрэбы ўцекачоў і вымушаных мігрантаў таксама недафінансіруюцца.

Адукацыйныя патрэбы ўцекачоў і вымушаных мігрантаў таксама недафінансіруюцца.

Праблемай застаецца адсутнасць каардынацыі паміж донарамі дапамогі на адукацыю. Гэта асабліва тычыцца двухбаковых арганізацый з поўначы, якія пераважаюць у аб’ёмах дапамогі. Амаль праз дваццаць гадоў пасля Парыжскай дэкларацыі аб эфектыўнасці дапамогі донары адукацыі дагэтуль схільныя прапанаваць дапамогу на развіццё ў разрозненых праектных фарматах, якія не адпавядаюць патрэбам краін. Недастаткова выкарыстоўваюцца шматбаковыя каналы для развіцця адукацыі; таксама страчаны магчымасці аб’яднання і ўзгаднення рэсурсаў шляхамі, якія падтрымліваюць інавацыі, лепшае выкарыстанне фактычнага матэрыялу і ўмацаванне нацыянальнага патэнцыялу.

Аднак таксама ёсць новыя і перспектыўныя напрацоўкі ў адукацыйнай кааперацыі, якія можна развіваць. Удзел грамадзянскай супольнасці ў адукацыі ў мясцовых, нацыянальных і міжнародных маштабах развіваецца на працягу апошніх дзесяцігоддзяў, і з’явіліся новыя партнёрскія сувязі паміж урадамі і недзяржаўнымі ўдзельнікамі. Расце супрацоўніцтва ў напрамку “поўдзень-поўдзень”, а таксама трохбаковыя формы кааперацыі ў галіне развіцця. Нядаўнія магутныя інфармацыйна-прапагандысцкія намаганні дапамаглі забяспечыць больш высокае месца адукацыі ў глабальным палітычным парадку дня. Адукацыя ўсё часцей прысутнічае ў парадку дня глабальных і рэгіянальных палітычных органаў.

Рухаючыся наперад, трэба адзначыць асаблівую важнасць трох відаў глабальнага грамадскага дабра для дасягнення агульнай, больш раўнапраўнай, больш значнай і больш устойлівай будучыні адукацыі. Па-першае, міжнародная супольнасць павінна сумесна дапамагаць урадам і недзяржаўным удзельнікам узгадняць новыя сумесныя мэты, нормы і стандарты, неабходныя для дасягнення новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Па-другое, міжнародная супольнасць павінна інвеставаць у агульнадаступны запас ведаў, даследаванняў, даных і фактаў у галіне адукацыі і прасоўваць яго, а таксама забяспечыць педагогам усіх узроўняў магчымасць ствараць і выкарыстоўваць інфармацыйны запас для паляпшэння сістэм адукацыі. Нарэшце, міжнароднае фінансаванне павінна пашырацца і выкарыстоўвацца для падтрымкі тых пластоў насельніцтва, рэалізацыя чыйго ўсеагульнага права на адукацыю знаходзіцца пад найбольшай пагрозай.

## Насустрач сумесным мэтам, абавязацельствам, нормам і стандартам

Пачынаючы з сярэдзіны дваццатага стагоддзя, калі былі створаны Арганізацыя Аб’яднаных Нацый і ЮНЕСКА, а таксама прынята Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне адукацыі адыгрывае істотную ролю ў дасягненні кансэнсусу адносна мэтаў і задач адукацыі. Сёння неабходнасць абмеркавання сумесных задач у галіне адукацыі яшчэ больш вострая.

Мы павінны перагледзець міжнароднае супрацоўніцтва і адысці ад гістарычнага акцэнту на паўтарэнні ідэй і ўстаноў індустрыяльнага свету. Мы павінны развіваць абмеркаванні ў напрамку“поўдзень-поўдзень”і трохбаковыя формы абмеркавання. Асабліва патрабуецца паляпшэнне дыялогу і дасягненне кансэнсусу паміж рознымі відамі суб’ектаў адукацыі: настаўніцкімі саюзамі, вучнёўскімі рухамі, моладзевымі арганізацыямі, арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, пастаўшчыкамі і наймальнікамі з прыватнага сектару, дабрачыннымі арганізацыямі і асобамі, урадамі і грамадзянамі. У цэнтры засяроджанай на доўгатэрміновай будучыні кааперацыі не могуць не быць галасы дзяцей і моладзі.

У той час як мы ўваходзім у перыяд фінансавых абмежаванняў, выкліканых падаўжэннем пандэміі COVID-19, будзе нарастаць неабходнасць больш строга расстаўляць прыярытэты адносна сумесных мэтаў, а таксама гарантаваць, каб міжнародныя і мясцовыя фінансы адпавядалі абавязацельствам. Глабальныя ўдзельнікі павінны аб’яднацца ў падтрымцы агульнага парадку дня па адвакацыі і зборы сродкаў для дасягнення гэтых мэтаў больш праз каардынацыю сваіх высілкаў, чым праз спаборніцтва за двухбаковае і філантропнае фінансаванне.

Вызначаючы агульныя мэты і рамкі дзеянняў, адукацыйны сектар можа абапірацца на адпаведны досвед сектараў клімату і аховы здароўя. Мы можам зрабіць больш для таго, каб усе, хто садзіцца за стол міжнароднага супрацоўніцтва, ставілі перад сабой свае ўласныя, канкрэтныя і абмежаваныя па часе мэты і абавязацельствы. Міжнароднае супрацоўніцтва павінна быць арганізавана па прынцыпе субсідыярнасці, бо чым больш

канкрэтнай і лакалізаванай будзе мэта і адказнасць за яе выкананне, тым больш рэальнай яна зробіцца ў якасці аб’екта калектыўнай адвакацыі і падсправаздачнасці, і тым больш верагодна, што канкрэтныя адказныя асобы забяспечаць яе выкананне. Больш моцныя рэгіянальныя і глабальныя механізмы маніторынгу могуць быць створаныя, каб забяспечыць адказнасць удзельнікаў за выкананне гэтых абавязацельстваў і мэтаў згодна з аналізам фактычных дасягненняў кожнага ўдзельніка.

На глабальным узроўні адукацыйны сектар і адпаведныя глабальныя органы сутыкаюцца з цяжкасцямі ў расстаноўцы прыярытэтаў па тэматычных і субсектаральных пытаннях, што часта прыводзіць да вялікай колькасці дэкларацый аб будучых выніках, рэдкай дзейнасці і нядольнасці дасягнуць некаторых нашых самых запаветных і даўніх адукацыйных мэтаў. Глабальныя ўстановы не павінны спрабаваць рабіць усе справы. Іх задача – умацоўваць патэнцыял іншых удзельнікаў. Для гэтага яны павінны засяроджвацца на павышэнні глабальнага і рэгіянальнага патэнцыялу для прыняцця заснаваных на кансэнсусе абавязацельстваў, забяспечваючы адказнасць за іх выкананне. Глабальныя ўдзельнікі таксама эфектыўныя, калі яны дзейнічаюць у якасці брокераў ведаў і фактаў, забяспечваючы ўдзел разнастайных удзельнікаў у стварэнні і выкарыстанні ведаў. Яны таксама могуць адыгрываць важную ролю ў якасці апошняй інстанцыі для фінансавання неадкладных адукацыйных патрэб, асабліва ў краінах з нізкімі ўзроўнямі даходаў і ў надзвычайных сітуацыях. У фарміраванні агульнай будучыні адукацыі глабальныя ўстановы могуць адыгрываць унікальную ролю, накіроўваючы нашу ўвагу на больш доўгатэрміновыя выклікі. Напрыклад, неабходна засяроджваць больш даследаванняў і дэбатаў на ролі адукацыі ў рэагаванні на змены ў сферы працы і аўтаматызацыі, на тым, як найлепшым чынам вырашыць трансгранічныя вонкавыя эфекты міграцыі і змянення клімату, а таксама на тым, як кіраваць адукацыйнымі паслугамі, якія робяцца ўсё больш лічбавымі і транснацыянальнымі.

Трэба стварыць агульны парадак дня праз шырокія працэсы ўдзелу і сумеснага прыняцця рашэнняў. Ён павінен быць накіраваны на ліквідацыю напружанасці паміж доўгатэрміновымі разважаннямі адносна кіравання будучыняй і неадкладнасцю ўмяшання ў сучасную сітуацыю для выпраўлення адукацыйнай няроўнасці і выключэнняў, атрыманых у спадчыну з мінулых часоў.

> Глабальныя ўстановы могуць адыгрываць унікальную ролю, накіроўваючы нашу ўвагу на больш доўгатэрміновыя выклікі.

## Кааперацыя ў стварэнні ведаў і выкарыстанні фактaлагічнага матэрыялу

Даследаванні і фактaлагічны матэрыял – гэта глабальнае грамадскае дабро ў галіне адукацыі. У сваёй сукупнасці яны дапамагаюць урадам і іх партнёрам вырашаць праблемы і ўводзіць інавацыі для паскарэння пераўтварэнняў у галіне адукацыі. Яны таксама важныя для падмацавання міжнароднай адказнасці за выкананне глабальных, рэгіянальных і нацыянальных абавязацельстваў.

Існуе значная крытыка злоўжывання разрозненымі данымі, рэйтынгавымі табліцамі і іншымі формамі “кіравання з дапамогай лічбаў” у працы буйных міжнародных арганізацый, пачынаючы з АЭКР і заканчваючы агенцтвамі ААН. Гэта слушная крытыка, аднак нам патрэбны сумесныя статыстычная даныя для раўнапраўнага кіравання адукацыйнымі сістэмамі і забеспячэння грамадскага дабра. Як бачна ў сектарах аховы здароўя і клімату, і як таксама паказала нядаўняя транснацыянальная інфармацыйная кампанія ў галіне адукацыі, высілкі па маніторынгу і ацэнцы прагрэсу могуць садзейнічаць глабальнай адказнасці за выкананне сумесных мэтаў, а таксама за далучэнне розных відаў удзельнікаў у адукацыйным працэсе.

Да гэтага часу глабальныя ўдзельнікі не здолелі аб’яднаць і скаардынаваць інвестыцыі, каб максімальна павялічыць даступнасць і карыснасць міжнародных факталагічных баз і даных. У адрозненне ад глабальнай аховы здароўя, дзе буйныя шматбаковыя арганізацыі аб’ядноўваюць рэсурсы, каб забяспечыць вытворчасць якасных маніторынгавых даных, між агенцтвамі ААН не існуе партнёрскіх узгадненняў для падтрымкі ўстанаўлення сумесных стандартаў, выканання статыстычных і іншых функцый па нарошчванні патэнцыялу. Эфектыўнае прымнажэнне і распаўсюджванне факталагічнай інфармацыі, выяўленне прабелаў у гэтай інфармацыі і даследаваннях, а таксама ўмацоўванне патэнцыялу патрабуюць новых узроўняў каардынацыі і фінансавання з боку глабальных удзельнікаў.

Падтрымка ўмацоўвання патэнцыялу па стварэнні і выкарыстанні ведаў, даных і фактаў таксама патрабуе лепшага фінансавання і каардынацыі. Падчас міжнародныя намаганні ў галіне ведаў і даследаванняў выглядаюць як размова з удзелам толькі аднаго боку. Гэта недапушчальна. Міжнароднае супрацоўніцтва павінна адкрыць больш прасторы для краін, пачынаючы з глабальнай поўначы, каб вызначыць новыя і інавацыйныя даследчыя парадыгмы, якія адпавядаюць іх унікальным абставінам. У галіне аховы здароўя нядаўнія намаганні ў гэтым кірунку былі засяроджаны на стварэнні каардынацыйных платформ з выразнай мэтай павышэння нацыянальнага і мясцовага патэнцыялу і падтрымкі працэсу ўзаемнага навучання паміж краінамі. Важнае значэнне маюць новыя мадэлі інвеставання ў кааперацыі “поўдзень-поўдзень” па вырашэнні праблем адукацыі. Як падкрэслівалася ў Раздзеле 8, гэта патрабуе асобнай увагі да разнастайных эпістэмалогій і шляхоў пазнання, якія ўзбагачаюць мысленне і падтрымліваюць шырокую разнастайнасць інавацыйных рашэнняў.

Вялікім выклікам у галіне адукацыі з’яўляецца фінансаванне міжнародных даследаванняў, стварэння факталагічнай інфармацыі і даных. Пры тым, што каля 25 % глабальных АДР у галіне аховы здароўя выдаткоўваецца на адпаведныя глабальныя тавары (каля 7 мільярдаў долараў ЗША), згодна з разлікамі, фінансаванне агульных ведаў, факталагічнай інфармацыі і даных складала менш за 3 % АДР (ці 200 мільёнаў долараў) у 2015 годзе. Варта разгледзець новыя варыянты паляпшэння глабальнага фінансавання даследаванняў, ведаў і стварэння факталагічных матэрыялаў, напрыклад, шляхам стварэння аб’яднанага фонду, прызначанага для атрымання адукацыйных ведаў і фактаў пад кіраўніцтвам групы агенцтваў ААН.

### Фінансаванне адукацыі там, дзе яна пад пагрозай

Пры тым, што неабходна фундаментальна пераасэнсаваць міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і адысці ад логікі залежнасці ад дапамогі, мы таксама павінны пераасэнсаваць ролю і акцэнт новых адносін з міжнароднай дапамогай адукацыі.

Доля нацыянальных патрэбаў, якая забяспечваецца міжнароднай дапамогай, няўхільна скарачаецца, і таму ўплыў і значнасць гэтай дапамогі на глабальнай сцэне будуць зніжацца. Міжнародная дапамога ўзмацніла дысбаланс сіл, які застаўся ад каланіялізму, і занадта мала зрабіла для ўмацавання ўстойлівасці сістэм адукацыі. У той жа час ёсць патрэба ў фінансавым рэсурсе, які мог бы падтрымаць краіны з нізкімі і ніжэйшымі за сярэдні даходамі – асабліва краіны Афрыкі, дзе ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі будзе жыць большасць моладзі. Сёння толькі 47 % дапамогі накіроўваецца на пачатковую і сярэднюю адукацыю ў краінах з нізкімі і ніжэйшымі за сярэдні даходамі. Мы таксама павінны пераканацца ў рэзерваванні глабальных фінансаў на падтрымку адукацыйных патрэбаў перамешчанага насельніцтва і вымушаных мігрантаў, колькасць якіх будзе расці па меры паглыблення кліматычнага крызісу. Як паказала пандэмія COVID-19, нам па-ранейшаму будзе патрэбны рэзерв міжнароднага фінансавання для рэагавання на надзвычайныя сітуацыі і рэканструкцыю адукацыі пасля крызісаў і надзвычайных сітуацый.

У перыяд да 2050 года мы павінны будзем палепшыць нашы цяперашнія шматбаковыя каналы, каб яны маглі прыцягнуць новыя рэсурсы для ліквідацыі прабелаў, у той жа час узмацняючы мабілізацыю нацыянальных рэсурсаў і нацыянальны патэнцыял. Большая ўзгодненасць дапамогі і каардынацыя паміж донарамі ў дзяржаўных планах і нацыянальных сістэмах адукацыі застаюцца такімі ж актуальнымі сёння, як і тады, калі міжнародныя донары ўхвалілі Парыжскую дэкларацыю 2005 года аб эфектыўнасці дапамогі.

Шматбаковыя каналы прапануюць лепшыя магчымасці для павышэння эфектыўнасці дапамогі, і яны з большай верагоднасцю накіруюць дапамогу краінам і катэгорыям насельніцтва, якія патрабуюць яе больш за астатніх. Аднак яны таксама павінны будуць палепшыць сваю працу, якая па-ранейшаму грунтуецца на праектах, стварае залішнія сувязі паміж пазычальнікамі і атрымальнікамі грантаў са створанымі імі ведамі і вызначэннямі, а таксама мае слабы паслужны спіс падтрымкі нацыянальнага патэнцыялу. Напрыклад, у галіне глабальнай аховы здароўя нядаўнія прапановы па выпраўленні гэтых недахопаў уключаюць аддзяленне тэхнічнай і фінансавай падтрымкі ва ўсіх агенцтвах і стварэнне механізмаў сумеснай справаздачнасці ў міжнародных арганізацыях.

## Роля ЮНЕСКА

ЮНЕСКА сутыкаецца са шматлікімі выклікамі на працягу апошніх 25 гадоў. Нягледзячы на тое, што агенцтва па-ранейшаму афіцыйна адказвае за каардынацыю глабальнага дыялогу і ўстанаўленне стандартаў у адукацыі, а таксама за дасягненне МУР-4 у адукацыі, яму цяжка даецца эфектыўнае выкананне гэтых абавязацельстваў, і яно сутыкаецца

з жорсткай крытыкай. Рэальнасць у тым, што, нягледзячы на маштабы мандата ЮНЕСКА ў сферы адукацыі, навукі і культуры, увесь яго бюджэт меншы за бюджэт шмат якіх еўрапейскіх універсітэтаў. Агульны адукацыйны бюджэт ЮНЕСКА складае толькі долю сродкаў, якія выдаткоўвае Сусветны банк на дзейнасць па стварэнні ведаў і нарошчванні патэнцыялу ў галіне адукацыі.

Каб эфектыўна ўдзельнічаць у нашым бачанні ўстойлівай будучыні адукацыі, ЮНЕСКА павінна будзе пераасэнсаваць свой падыход да развіцця адукацыі. Грунтуючыся на прынцыпе субсідыярнасці, агенцтва павінна разглядаць сябе ў якасці партнёра, чыя праца зводзіцца да ўзмацнення рэгіянальных і нацыянальных устаноў і працэсаў. Па-другое, агенцтва пасрэднічае ў абмене факталагічным матэрыялам і адстойвае павышэнне якасці даных і адказнасці перад грамадзянамі на ўсіх узроўнях адукацыйных сістэм. Захоўваючы сваю ўнікальную ролю ў падтрыманні глабальнага дыялогу аб новым сацыяльным кантракце на адукацыю, ЮНЕСКА павінна накіраваць асноўную частку сваіх фінансавых і людскіх рэсурсаў у рэгіёны, дзе права на адукацыю знаходзіцца пад найбольшай пагрозай – і ў прыватнасці, у Афрыку, дзе да 2050 года будзе жыць і вучыцца большасць моладзі свету.

ЮНЕСКА спатрэбіцца больш дакладнае адчуванне сваёй параўнальнай перавагі ў рамках складанай экасістэмы глабальных і рэгіянальных удзельнікаў працэсаў устанаўлення норм, мабілізацыі фінансаў і ведаў у галіне адукацыі. Агенцтва павінна супрацоўнічаць з партнёрамі ААН над пошукам інавацыйных рашэнняў для забеспячэння права на адукацыю вымушаных мігрантаў і перамешчаных груп насельніцтва, колькасць якіх, як чакаецца, памножыцца ў нашым непрадказальным стагоддзі. Яно павінна выкарыстоўваць сваю глабальную прысутнасць для абароны палепшанага і больш роўнага доступу да лічбавай інфармацыі як аднаго з правоў чалавека. ЮНЕСКА таксама павінна падтрымліваць удзел грамадзян і грамадзянскай супольнасці ў кіраванні адукацыяй, каб зрабіць адукацыю больш адпаведнай іх патрэбам. Яно павінна працягваць сваю дзейнасць у якасці маяка ААН, асвятляючы ролю адукацыі ў будаўніцтве нашай сумеснай будучыні, у тым ліку ўмацоўваючы адукацыю ў мэтах міру, дабрабыту і ўстойлівасці.

ЮНЕСКА валодае ўнікальнай здольнасцю збіраць і мабілізоўваць людзей і ўстановы ва ўсім свеце для фарміравання нашай сумеснай адукацыйнай будучыні. У гэтым яго вялікая сіла. І менавіта гэта сіла патрэбна для стварэння новага, міжнародна ўзгодненага сацыяльнага кантракта на адукацыю і, што больш важна, новай угоды на яго рэалізацыю.

## Прынцыпы дыялогу і дзейнасці

У гэтым раздзеле робіцца заклік да абноўленага міжнароднага супрацоўніцтва ў мэтах рэагавання на будучыя патрэбы, выклікі і магчымасці адукацыі. У перспектыве да 2050 года ёсць чатыры ключавыя прыярытэты, якія звязаны з міжнародным супрацоўніцтвам для будучыні адукацыі:

- **Камісія заклікае ўсіх удзельнікаў працэсу адукацыі супрацоўнічаць на**

**глабальным і рэгіянальным узроўнях па знаходжанні сумесных мэтаў і агульных рашэнняў адукацыйных выклікаў.** Стварэнне новага сацыяльнага кантракта, неабходнага для падтрымкі справядлівай і раўнапраўнай адукацыйнай будучыні ўсяго чалавецтва, мае асаблівае значэнне для тых, чыйму праву на адукацыю найбольш пагражаюць глабальныя выклікі. Да гэтага павінны далучыцца разнастайныя недзяржаўныя суб'екты і партнёрствы, трэба перайсці ад вертыкальнай да шматцэнтрычнай схемы дзеянняў і прыняць новыя формы рэгіянальнага супрацоўніцтва, у тым ліку "поўдзень-поўдзень", і трохбаковую кааперацыю.

- **Міжнароднае супрацоўніцтва павінна зыходзіць з прынцыпу субсідыярнасці, падтрымліваючы і нарошчваючы патэнцыял у мясцовых, нацыянальных і рэгіянальных намаганнях па вырашэнні праблем**. Большая адказнасць за выкананне адукацыйных абавязацельстваў і скаардынаваныя адвакацыйныя высілкі па паляпшэнні адукацыі будуць патрэбныя для ўзмацнення новых абавязацельстваў, нормаў і стандартаў у галіне адукацыі.

- **Застаецца важнай засяроджанасць на міжнародным фінансаванні развіцця краін з нізкімі і ніжэйшымі за сярэдні даходамі**. Гэта, у прыватнасці, тычыцца краін з рэзка абмежаванай эканомікай і маладым насельніцтвам, асабліва ў Афрыцы. Нам таксама патрэбна фінансаванне, арыентаванае на тыя пласты насельніцтва, чыё права на адукацыю парушаецца праз крызісы і надзвычайныя сітуацыі.

- **Агульныя інвестыцыі ў фактaлагічныя матэрыялы, даныя і веды таксама складаюць важную частку эфектыўнага міжнароднага супрацоўніцтва**. У гэтым нашы высілкі таксама павінны кіравацца прынцыпам субсідыярнасці, падкрэсліваючы неабходнасць стварэння падмуркаў для мясцовых, нацыянальных і рэгіянальных магчымасцяў па стварэнні і выкарыстанні ведаў. Нам больш, чым калі-небудзь, неабходна ўзмацняць узаемнае навучанне і абмен ведамі паміж грамадствамі і праз межы ў такіх стрыжнёвых напрамках, як ліквідацыя адукацыйнай няроўнасці і беднасці, паляпшэнне грамадскіх паслуг, а таксама вырашаць больш доўгатэрміновыя праблемы ў сувязі з аўтаматызацыяй і лічбавізацыяй, міграцыяй і экалагічнай устойлівасцю. Патрэбныя аб'яднаныя платформы і новыя крыніцы фінансавання для забеспячэння абодвух вымярэнняў глабальных ведаў і даных для адукацыйнага працэсу.

Гэта праграма глабальнай салідарнасці і дзейнасці павінна будавацца з упартасцю, смеласцю і паслядоўнасцю і нязменна з прыцэлам на перыяд да 2050 года і пасля яго. Яна прадугледжвае сумесную адказнасць і больш высокі ўзровень каардынацыі ў сістэме ААН і ўмацаванне ролі ЮНЕСКА. Без гэтага не могуць быць рэалізаваныя прапановы, сфармуляваныя ў гэтым дакладзе, у прыватнасці, вызначэнне адукацыі як глабальнага, грамадскага і агульнага дабра і ўстанаўленне новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. На працягу жыцця аднаго пакалення мы можам такім чынам пераўтварыць адукацыйныя сістэмы, каб яны былі па-сапраўднаму інклюзіўнымі, актуальнымі і каб яны павышалі нашы магчымасці ў рашэнні глабальных праблем.

# Эпілог
# і
# працяг

## Будуем будучыню адукацыі разам

Мы павінны неадкладна пачаць супрацоўнічаць над стварэннем новага сацыяльнага кантракта на адукацыю, які будзе адпавядаць будучым патрэбам чалавецтва і планеты. У гэтым дакладзе прапанаваны прыярытэты і зроблены рэкамендацыі па стварэнні гэтага новага кантракта на падмурку двух асноватворных прынцыпаў: пашыранага бачання права на адукацыю на працягу жыцця і ўзмацнення адукацыі як грамадскага і агульнага дабра.

Стрыжнёвае месца ў дакладзе займае прапанова новага сацыяльнага кантракта на адукацыю – невідавочных пагадненняў і прынцыпаў, якія забяспечваюць і натхняюць сацыяльную згуртаванасць вакол адукацыі і якія выклікаюць адпаведныя механізмы ў галіне адукацыі. Гэты эпілог прысвечаны абагульненню ключавых прыярытэтаў і прапаноў, якія чытачам прапануецца працягнуць разам з іншымі людзьмі, ператлумачыць і пераасэнсаваць для нашай сумеснай будучыні адукацыі.

Новы сацыяльны кантракт на адукацыю не азначае адмову ад таго, чаму мы сумесна навучыліся і што перажылі ў сферы адукацыі да гэтага часу, але ён таксама не ўяўляе сабой і простай змены курса на ўжо вызначаным шляху. Новы сацыяльны кантракт ужо даўно ствараецца – педагогамі, супольнасцямі, моладдзю і дзецьмі, сем'ямі – тымі, хто ўжо дакладна вызначыў межы існуючых адукацыйных сістэм і першым стаў выкарыстоўваць новыя падыходы для іх пераадолення.Аднак без калектыўных момантаў аб'яднання і спробаў сфармуляваць тое, чаму мы навучаемся ў нашых няспынных намаганнях перабудаваць адукацыю, высілкі часта робяцца ізаляваны або з абмежаванымі папраўкамі на буйныя інстытуцыйныя механізмы. Менавіта праз актыўны ўдзел у дыялогу і практыцы па стварэнні новага сацыяльнага кантракта на адукацыю мы можам абнавіць адукацыю, каб зрабіць справядлівую, раўнапраўную і ўстойлівую будучыню магчымай. Гэты даклад – запрашэнне да кантэкстуалізацыі і прасоўвання такіх грамадскіх дэбатаў. Ён задуманы для каталізацыі і заахвочвання дэбатаў па ўсім свеце аб тым, што сацыяльны кантракт на адукацыю будзе азначаць на практыцы і ў пэўных кантэкстах. Таму гэты даклад ёсць важная вяха на шляху, які цягнецца ў будучыню. Гэта жывы дакумент, які прапануе рамкі, прынцыпы і рэкамендацыі для далейшай распрацоўкі, абмену і пашырэння для людзей з усяго свету. Яго мэта – натхніць да пошуку новых напрамкаў распрацоўкі палітыкі і да інавацыйных крокаў па абнаўленні і пераўтварэнні адукацыі, каб яна сапраўды падрыхтоўвала ўсіх навучэнцаў да вынаходніцтва лепшай будучыні. Ён будзе ўплываць на пераўтварэнне адукацыі толькі тады, калі настаўнікі, вучні, сем'і, чыноўнікі і іншыя ўдзельнікі адукацыі, у тым ліку супольнасці, будуць узаемадзейнічаць з ідэямі гэтага даклада, сумесна дапаўняць іх сэнсам аб практычным значэнні для гэтых супольнасцей.

> Новы сацыяльны кантракт ужо даўно ствараецца – педагогамі, супольніцтвамі, моладдзю і дзецьмі, сем'ямі – тымі, хто ўжо дакладна вызначыў межы існуючых адукацыйных сістэм і першым стаў выкарыстоўваць новыя падыходы для іх пераадолення.

Камісія заклікае ЮНЕСКА развіваць і падтрымліваць належныя магчымасці для абмеркавання, удзелу і абмену доследам у дачыненні да многіх выказаных тут ідэй. Будучы

поспех гэтага даклада залежыць ад яго здольнасці стымуляваць працэс бесперапынных разважанняў і дзеянняў. Адукацыйная праца заўсёды будзе "ў працэсе", і прадстаўленыя тут рэкамендацыі заснаваны на тым дапушчэнні, што яны павінны пастаянна змяняцца і развівацца. Нам патрэбна шырэйшая кааперацыя, калі мы вучымся жыць у большай гармоніі адно з адным, з выбітнымі формамі і сістэмамі жыцця на нашай планеце, а таксама з тэхналогіямі, якія хутка адкрываюць новыя прасторы і магчымасці для пасляховасці людзей, але таксама ствараюць беспрэцэдэнтныя рызыкі.

Глабальны кансэнсус адносна каштоўнасці адукацыі для стварэння і пераўтварэння нашага свету з'яўляецца нашым зыходным пунктам. Гэтае сумеснае перакананне – непарушнае, яно ўмацоўвае нашу рашучасць, калі мы сутыкаемся з новымі выклікамі, многія з якіх не маюць прэцэдэнтаў. Каб усё рабілася па-іншаму, мы ўжо зараз павінны думаць, разумець, слухаць і ўяўляць рэчы па-іншаму. Нам патрэбна адкрытае выяўленне тых усталяваных меркаванняў аб адукацыі, ведах і навучанні, якія могуць адкрыць новыя шляхі да пераўтварэння будучыні.

# Прапановы па стварэнні новага сацыяльнага кантракта

У дакладзе разглядаюцца пяць вымярэнняў перамен, неабходных для стварэння новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Ключавыя прапановы па кожным з гэтых вымярэнняў падкрэслены ў Частцы 2 гэтага даклада разам з кіруючымі прынцыпамі іх рэалізацыі. Не з'яўляючыся вычарпальнымі, яны тым не менш абагульняюцца тут у якасці пачатковых рамак дзейнасці, якія могуць быць лакалізаваны і пашыраны для рэалізацыі новай будучыні праз адукацыю.

## Педагогіка салідарнасці і кааперацыі

Неабходна пераўтварыць педагогіку на аснове прынцыпаў кааперацыі і салідарнасці, замяніўшы даўно ўсталяваныя рэжымы выключэння і індывідуалістычнага спаборніцтва. Педагогіка павінна выхоўваць эмпатыю і спачуванне, а таксама развіваць здольнасці людзей да супрацоўніцтва і пераўтварэння саміх сябе і свету. Навучанне фарміруецца праз узаемаадносіны паміж настаўнікамі, вучнямі і ведамі, якія выходзяць па-за межы школьных нормаў і кодэксаў паводзін. Навучанне пашырае ўзаемаадносіны вучняў з этыкай і клопатам, якія неабходны для таго, каб браць на сябе адказнасць за наш сумесны, агульны свет. Педагогіка – гэта праца па стварэнні трансфармацыйных кантактаў, якія грунтуюцца на тым, што існуе і што можа быць створана.

У перспектыве да 2050 года мы павінны пазбавіцца ад педагагічных рэжымаў, урокаў і вымярэнняў, якія надаюць прыярытэт індывідуалістычным і канкурэнтным вызначэнням дасягненняў. Замест гэтага мы павінны надаць перавагу наступным кіруючым прынцыпам:

Па-першае, індывідуальна і калектыўна трансфармацыйная педагогіка патрабуе ўзаемазвязанасці, узаемазалежнасці і салідарнасці. У той час як настаўнікі вучацца выхоўваць педагагічныя ўзаемаадносіны ў класным пакоі і па-за ім, школы і адукацыйныя сістэмы павінны знаходзіць спосабы інкарпарацыі гэтых практык на больш інстытуцыянальных узроўнях. Досвед і дыялог, паслугі і мэтанакіраваныя дзеянні, даследаванні і разважанні, удзел у канструктыўных грамадскіх рухах і жыцці супольнасцей – гэта толькі частка шматлікіх перспектыўных падыходаў. Школы і адукацыйныя сістэмы таксама павінны зруйнаваць сацыяльныя і сектаральныя муры, каб прыслухацца да сем’яў і супольнасцей, а таксама распаўсюдзіцца на іншыя сферы жыцця, каб падтрымаць новыя сувязі і педагагічныя ўзаемаадносіны па-за класным пакоем.

Па-другое, кааперацыя і супрацоўніцтва павінны фарміраваць аснову педагогікі як калектыўнага міжасабовага працэсу. Настаўнікі могуць удзельнічаць у шырокім спектры стратэгій навучання – ад зваротнай сувязі з калегамі, навучання на аснове праектаў, вырашэння праблем і пастаноўкі задач на аснове запытаў, вучнёўскіх лабараторый, тэхнічных і прафесійных майстэрняў да мастацкага выяўлення і творчага супрацоўніцтва – усё гэта неабходна для развіцця здольнасцей вучняў вырашаць новыя задачы творча і нестандартна, індывідуальна і калектыўна. Школы і адукацыйныя сістэмы могуць вывучаць шляхі для садзейнічання больш шырокаму спектру кантактаў паміж узроставымі групамі, інтарэсамі, грамадскімі сектарамі, мовамі і этапамі навучання. Па-трэцяе, салідарнасць, спачуванне і эмпатыя павінны насычаць працэс навучання. Педагогіка дазваляе вучням зразумець большы досвед, чым іх уласны. Бацькі і сем’і таксама могуць запрашацца да ўдзелу ў абмене поглядамі і ацэнцы разнастайнасці і плюралізму разам з іх дзецьмі, што неабходна, каб пазбавіцца ад перадузятасці, забабонаў і разладу ў розных асяроддзях і адносінах, з якімі сутыкаюцца вучні. Школы і настаўнікі могуць ствараць асяроддзі, у якіх шануецца эмпатыя і падтрымліваюцца розныя гісторыі, мовы і культуры, у прыватнасці, карэнныя супольнасці і шырокі спектр грамадскіх рухаў.

> Педагогіка – гэта праца па стварэнні трансфармацыйных кантактаў, якія грунтуюцца на тым, што існуе і што можа быць створана.

Па-чацвёртае, уся ацэнка з’яўляецца педагагічнай, і таму яе трэба ўважліва разглядаць для падтрымкі больш шырокіх педагагічных прыярытэтаў росту і навучання вучняў. Настаўнікі, школы і адукацыйныя сістэмы могуць выкарыстоўваць ацэнку для вызначэння прыярытэтаў і вырашэння праблемных сфер, у мэтах лепшай падтрымкі індывідуальнага і калектыўнага навучання. Ацэнка не павінна выкарыстоўвацца для пакарання ці стварэння катэгорый “пераможцаў” і “лузераў”. На адукацыйную палітыку не павінны беспадстаўна ўплываць рэйтынгі, якія надаюць празмерны прыярытэт вырваным з кантэксту экзаменам з высокімі крытэрыямі, якія, як было даказана, у сваю чаргу, непрапарцыйна ўплываюць на тое, што адбываецца падчас навучання ў школе і ў школьнай прасторы.

## Навучальная праграма і агульны здабытак ведаў

Трэба наладзіць новыя зносіны паміж адукацыяй і ведамі, магчымасцямі і каштоўнасцямі, якія яна прасоўвае. Навучальныя праграмы павінны фарміравацца ў сувязі з двума важнымі працэсамі, якія ляжаць у аснове адукацыі: набыццём ведаў як часткі агульнай спадчыны чалавецтва і калектыўным стварэннем новых ведаў і новай магчымай будучыні. У перспектыве да 2050 года мы павінны выйсці па-за межы традыцыйных поглядаў на навучальныя праграмы як на простую сетку школьных прадметаў і замест гэтага пераглядзець іх з міждысцыплінарнага і міжкультурнага пунктаў гледжання, якія дазваляюць вучням вучыцца з агульнага здабытку ведаў чалавецтва і рабіць у яго свой унёсак. Варта аддаць перавагу наступным кіруючым прынцыпам:

> У аснове адукацыі ляжаць два важныя працэсы: набыццё ведаў як часткі агульнай спадчыны чалавецтва і калектыўнае стварэнне новых ведаў і новай магчымай будучыні.

Па-першае, навучальныя праграмы павінны павышаць магчымасці навучэнцаў карыстацца агульным здабыткам ведаў і рабіць свой унёсак у агульны здабытак ведаў, які з'яўляецца спадчынай усяго чалавецтва і павінен няспынна пашырацца, уключаючы разнастайныя шляхі пазнання і разумення. Распрацоўка і рэалізацыя навучальных праграм павінны адысці ад вузкай перадачы фактаў і інфармацыі і замест гэтага імкнуцца прывіваць навучэнцам канцэпцыі, навыкі, каштоўнасці і стаўленні, якія дазволяць ім удзельнічаць у розных формах набыцця, прымянення і стварэння ведаў.

Па-другое, наш клімат і планетарныя ўмовы, якія хутка змяняюцца, патрабуюць навучальных праграм, якія прадвызначаюць месца людзей у свеце. Незваротныя планетарныя змены ўжо паскараюцца, і адукацыя павінна выхоўваць разуменне ўласцівай узаемасувязі паміж экалагічным, грамадскім і эканамічным дабрабытам. Навучальныя праграмы павінны абапірацца на разнастайныя формы ведаў, рыхтуючы вучняў і супольнасці да адаптацыі да змянення клімату, змякчэння яго наступстваў ці іх спынення, калі людзі разглядаюцца ў іх непарыўнай узаемасувязі з больш чым чалавечым светам. Навучальныя праграмы павінны падкрэсліваць наступствы змянення клімату для іх супольнасцей, для свету і асабліва для тых, хто часта церпіць ад маргіналізацыі, напрыклад, бедныя, меншасці, а таксама жанчыны і дзяўчаты. Праграмныя веды могуць забяспечыць магутны механізм для мэтанакіраваных дзеянняў і падтрымаць дзяцей і моладзь у далейшых ініцыятывах па змякчэнні наступстваў змянення клімату і намаганнях па абароне навакольнага асяроддзя, якія будуць мець глыбокі ўплыў на іх будучыню.Па-трэцяе, хуткаму распаўсюджванню дэзынфармацыі і маніпуляцый трэба супрацьстаяць з дапамогай розных відаў граматнасці – лічбавай, навуковай, тэкставай, экалагічнай, матэматычнай, – якія дазваляюць кожнаму чалавеку знайсці свой шлях да праўдзівых і дакладных ведаў. Такія віды граматнасці неабходны для змястоўнага і эфектыўнага ўдзелу ў дэмакратычных працэсах на аснове агульнага разумення ісціны. Эфектыўная граматнасць павінна прывіваць разуменне не толькі фактаў, інфармацыі і даных, але таксама і такіх працэсаў, як пацвярджэнне фактаў

і разумны пошук крыніц, якія неабходны, каб рабіць разумныя высновы, пацвярджаць вынікі і дакладна іх перадаваць. Навучальныя праграмы могуць абапірацца на шырокі спектр гістарычных, культурных і метадалагічных падыходаў, якія прывіваюць вучням любоў да разумення, акуратнасці, дакладнасці, а таксама прыхільнасці праўдзе.

Па-чацвёртае, правы чалавека і ўдзел у дэмакратычных працэсах павінны служыць падмуркам для асноватворных прынцыпаў навучальных праграм і навучання, якія пераўтвараюць людзей і свет. Правы чалавека павінны заставацца свяшчэннымі і непарушальнымі, і, як калектыўны зыходны пункт, які ляжыць у аснове сацыяльнага кантракта, яны павінны зрабіцца асноватворнымі для навучальных праграм, якія фарміруюць навучанне. Навучальныя праграмы павінны рабіць акцэнт на неад'емных правах і годнасці ўсіх людзей, а таксама на пільнай патрэбе пераадолець гвалт і пабудаваць мірныя грамадствы. Узаемадзеянне з грамадскімі рухамі і нізавымі суполкамі можа надаць навучальным праграмам аўтэнтычныя шляхі для аспрэчвання і выяўлення ўладных структур, якія дыскрымінуюць групы насельніцтва па гендары, расе, паходжанні з карэннага насельніцтва, мове, сексуальнай арыентацыі, узросце, інваліднасці ці грамадзянстве, а таксама для супрацьстаяння такім структурам.

## Настаўнікі і настаўніцкая прафесія

Дзякуючы сваёй прафесіі настаўнікі маюць унікальную ролю ў стварэнні новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Яны ключавыя арганізатары, якія аб'ядноўваюць розныя элементы і асяроддзі і працуюць разам над павелічэннем ведаў і навыкаў вучняў. Ніводная тэхналогія дагэтуль не ў стане замяніць ці адмяніць патрэбу ў якасных жывых настаўніках. У перспектыве да 2050 года вельмі важна, каб мы адышлі ад погляду на настаўніцтва як на адасобленую практыку, якая залежыць ад адной асобы і камандуе эфектыўным навучаннем. Замест гэтага настаўніцтва павінна стаць супрацоўніцкай прафесіяй, у якой камандная праца забяспечвае змястоўнае навучанне вучняў. Наступныя прынцыпы павінны быць прыярытэтнымі:

> Ніводная тэхналогія дагэтуль не ў стане замяніць ці адмяніць патрэбу ў якасных жывых настаўніках.

Па-першае, супрацоўніцтва і камандная праца павінны характарызаваць дзейнасць настаўнікаў. Вялікі шэраг нашых прапаноў адносна адукацыі выходзіць за межы таго, чаго можна чакаць індывідуальна ад нават найбольш таленавітых настаўнікаў. Нам патрэбна, каб настаўнікі працавалі ў камандах са сваімі калегамі-выкладчыкамі, спецыялістамі па прадметах, спецыялістамі па граматнасці і бібліятэкарамі, педагогамі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, школьнымі кансультантамі, сацыяльнымі работнікамі і іншымі. Патрэба ў сумеснай працы стане нават яшчэ больш актуальнай у бліжэйшыя гады, калі шэраг парушэнняў, з якімі сутыкаецца чалавецтва, будзе пашырацца, а настаўнікі будуць па-ранейшаму першымі дапамагаць дзецям, моладзі і дарослым кіраваць сваім светам належным чынам, адпаведна ўзросту. Як і дабрабыт вучняў, здаровыя

ўзаемаадносіны і псіхічнае здароўе павінны падтрымлівацца ў адукацыйных умовах; настаўнікі таксама павінны атрымліваць падтрымку ў выглядзе прыгоднай для жыцця заработнай платы, кар’ернага росту, бесперапыннай адукацыі, прафесійнага развіцця і асяроддзя для сумеснага навучання, што павінна надаць ім магчымасць выконваць сваю вельмі важную працу.

Па-другое, стварэнне ведаў, разважанні і даследаванні павінны прызнавацца неад’емнай часткай настаўніцтва. Даследаванні і веды аб будучыні адукацыі пачынаюцца з працы, якую выконваюць настаўнікі; і сапраўды, многія элементы новага сацыяльнага кантракта на адукацыю могуць ужо існаваць у трансфармацыйнай педагогіцы, якую практыкуюць многія настаўнікі. Праца настаўнікаў як стваральнікаў ведаў і педагагічных першапраходцаў павінна атрымаць прызнанне і падтрымку; ім неабходна дапамагчы з дакументаваннем, абменам і абмеркаваннем актуальных даследаванняў і досведу з іх калегамі-педагогамі і школамі, як фармальна, так і нефармальна. Універсітэты і вышэйшая адукацыя могуць прапанаваць новыя інстытуцыйныя канфігурацыі, якія забяспечваюць устойлівыя даследчыя і прафесійныя ўзаемаадносіны з настаўнікамі ў падтрымку іх прафесійнага стварэння ведаў.

Па-трэцяе, неабходна падтрымліваць і абараняць прафесійную аўтаномію настаўнікаў. Настаўніцкая прафесія патрабуе шырокага спектру перадавых навыкаў і бесперапыннага прафесійнага развіцця. У бліжэйшыя дзесяцігоддзі шмат падтрымкі будуць патрабаваць узмацненне і пашырэнне якаснай педагагічнай адукацыі, асабліва ў Чорнай Афрыцы, дзе з-за хуткага росту колькасці моладзі запыт на школьнае навучанне па-ранейшаму абганяе наяўнасць кваліфікаваных настаўнікаў. Прафесійнае развіццё маладых настаўнікаў можа надалей забяспечвацца праз бесперапынную адукацыю, куратарства і сумеснае настаўніцтва. Падрыхтоўцы да кожнага ўрока і разважанням трэба адвесці належны час, і гэтая праца павінна аплачвацца на справядлівай і раўнапраўнай аснове. Гарантыі прафесійнай аўтаноміі, грамадскай павагі і годнай заработнай платы забяспечаць стымулы для таго, каб кваліфікаваныя педагогі заставаліся ў прафесіі і каб да яе далучаліся асобы, якія маюць належныя навыкі і матывацыю.

Удзел у грамадскіх дэбатах, дыялогу аб адукацыі, а таксама ў распрацоўцы адукацыйнай палітыкі павінен быць інтэграваны і прызнаны ў якасці часткі стрыжнёвай працы настаўнікаў. Занадта часта рашэнні аб тым, што адбываецца ў сценах школ ці класных пакоях, прымаюцца тымі, хто знаходзіцца далёка па-за сценамі гэтых устаноў, прычым дыялог, узаемадзеянні і істотная сувязь зводзяцца да мінімуму. Дзеля будучыні адукацыі гэта трэба змяніць, і настаўнікі павінны запрашацца на грамадскія дэбаты, абмеркаванні палітыкі і дыялог адносна будучыні нашай адукацыі ў якасці лідараў і важных інфарматараў. Задзейнічанне настаўнікаў у гэтых кірунках павінна быць часткай агульнага разумення аб тым, што гэта складае стрыжнёвую функцыю настаўніцтва: яны павінны разглядацца ў якасці ключавых удзельнікаў стварэння новага сацыяльнага кантракта на адукацыю.

## Захаванне і пераўтварэнне школ

Школы з усімі іх магчымасцямі і перспектывамі, хібамі і абмежаваннямі застаюцца сярод найбольш важных грамадскіх адукацыйных устаноў. Школы з’яўляюцца цэнтральнай апорай больш буйных адукацыйных экасістэм, і іх жыццяздольнасць адлюстроўвае адносіны грамадскасці да адукацыі як да грамадскай чалавечай дзейнасці, а таксама да сваіх дзяцей і моладзі. У перспектыве да 2050 года мы не можам у большай ступені дазволіць сабе мець школы, арганізаваныя па адзінай мадэлі, незалежна ад умоў. Замест цяперашніх архітэктурных, працэдурных і арганізацыйных мадэляў мы павінны зрабіць маштабныя высілкі, каб перапланаваць час і месца школ так, каб адначасова захаваць і пераўтварыць іх. Гэта важная праца павінна кіравацца наступнымі прыярытэтамі:

> Школы з’яўляюцца цэнтральнай апорай больш буйных адукацыйных экасістэм, і іх жыццяздольнасць адлюстроўвае адносіны грамадскасці да адукацыі як да грамадскай чалавечай дзейнасці, а таксама да сваіх дзяцей і моладзі.

Па-першае, трэба абараніць школы як прасторы, дзе вучні сутыкаюцца з выклікамі і магчымасцямі, якіх яны не маюць у іншых месцах. Школам будзе патрабавацца атмасфера супрацоўніцтва і клопату, у якой розныя групы людзей узаемна вучацца разам. Яны могуць даць магчымасць настаўнікам і вучням узаемадзейнічаць з новымі ідэямі, культурамі і шляхамі бачання свету ў атмасферы падтрымкі і клопату, не толькі рыхтуючы дзяцей і моладзь да выклікаў у іх будучым жыцці, але і дапамагаючы ім знаходзіць шлях у свеце, у якім яны жывуць зараз і які хутка змяняецца.

Па-другое, трэба пераасэнсаваць і перапланаваць школьную архітэктуру, прасторы, час, расклады і групаванне вучняў, каб даць магчымасць асобным людзям працаваць разам. Пабудаванае асяроддзе і інклюзіўны дызайн самі па сабе надаюць педагагічную каштоўнасць і ўплываюць на тое, што адбываецца ў сумесных навучальных прасторах. Школьныя адміністрацыі і кіраўніцтва павінны таксама кіравацца культурай супрацоўніцтва, якая будзе кіраваць і ўзаемасувязямі паміж школамі, каб развіваць надзейныя сеткі навучання, разважанняў і інавацый.

Па-трэцяе, лічбавыя тэхналогіі павінны падтрымліваць тое, што адбываецца ў межах школ: іх цяперашнія і прагназаваныя версіі не ўяўляюць сабой належную замену фармальным і рэальным, не віртуальным, навучальным установам. Выкарыстанне лічбавых інструментаў будзе карысным і важным для павышэння крэатыўнасці і камунікацыі вучняў у бліжэйшыя дзесяцігоддзі, а асвойванне лічбавых прастораў можа адкрыць новыя магчымасці для доступу да сумесных ведаў і досведу чалавецтва і да ўдзелу ў іх. Трэба з асцярогай і ўвагай падыходзіць да намаганняў па прымяненні штучнага інтэлекту і лічбавых алгарытмаў у школах, каб яны не множылі і не пагаршалі існуючыя стэрэатыпы і сістэмы выключэння.

Па-чацвёртае, школы павінны мадэліраваць будучыню, да якой мы імкнёмся, забяспечваючы правы чалавека і прапаноўваючы прыклады ўстойлівасці і вугляроднай

нейтральнасці. Вучням трэба давяраць і даручаць дапамогу ў “азеляненні” адукацыйнага сектару. Мясцовыя і традыцыйныя прынцыпы праектавання, якія ўлічваюць умовы і змены ў навакольным асяроддзі, могуць стаць крыніцамі навучання аб адаптацыі, змякчэнні наступстваў і прафілактыцы такіх зменаў, для будаўніцтва лепшай будучыні і стварэння большага сімбіёзу з прыродным светам і сістэмамі, часткай якіх мы з’яўляемся і ад якіх залежым. Мы таксама будзем павінны забяспечыць, каб адукацыйная і іншая палітыка адносна школ падтрымлівала і прасоўвала правы чалавека для ўсіх, хто знаходзіцца як у іх межах, так і па-за імі.

## Адукацыя ў розныя часы і ў розных прасторах

Адной з нашых асноўных задач з’яўляецца пашырэнне ўяўлення аб тым, дзе і як адбываецца адукацыя, распаўсюджванне яго на большы спектр часоў, прастораў і этапаў жыцця. Мы павінны ўяўляць сабе поўны адукацыйны патэнцыял, які існуе ў жыцці і ў грамадстве, ад нараджэння да старасці, і звязаць мноства месцаў, а таксама культурныя, сацыяльныя і тэхналагічныя магчымасці для прасоўвання адукацыі, якія часта ўзаемна накладваюцца. Мы можам уявіць, як нашы будучыя грамадствы будуць забяспечваць і заахвочваць навучанне ў мностве месцаў, акрамя фармальных школ, і ў запланаваны і адвольны час. У перспектыве да 2050 года ёсць чатыры прынцыпы, якія могуць накіроўваць дыялог і дзеянні, неабходныя для рэалізацыі гэтай рэкамендацыі.

> Мы можам уявіць, як нашы будучыя грамадствы будуць забяспечваць і заахвочваць навучанне ў мностве месцаў, акрамя фармальных школ, і ў запланаваны і адвольны час.

Па-першае, людзі павінны мець магчымасці атрымліваць якасную адукацыю на ўсіх этапах жыцця. Адукацыя – справа ўсяго жыцця, і яна ахоплівае ўсе яго сферы. Трэба далей развіваць і падтрымліваць навучанне і адукацыю дарослых, выходзячы па-за рамкі недасканалых канцэпцый “набыцця навыкаў” ці “перападрыхтоўкі”, каб ахапіць трансфармацыйныя магчымасці адукацыі на ўсіх этапах жыцця. Любое планаванне адукацыі на працягу жыцця павінна засяроджвацца на паслугах для найбольш маргіналізаваных людзей і на найбольш уразлівых умовах, дапамагаючы навучэнцам набыць веды, канцэпцыі, стаўленні і навыкі, якія ім патрэбны, каб рэалізаваць магчымасці і спраўляцца з існуючымі і будучымі праблемамі.

Па-другое, здаровыя адукацыйныя экасістэмы звязваюць прыродныя, пабудаваныя і віртуальныя навучальныя пляцоўкі. Біясфера – яе землі, воды, выкапні, атмасфера, сістэмы і ўзаемадзеянні – павінна ўяўляцца як жыццёва важная навучальная прастора. Яна адзін з нашых найпершых педагогаў. Адначасова трэба далей інтэграваць лічбавыя навучальныя прасторы ў адукацыйныя экасістэмы, і яны павінны ствараецца для падтрымкі публічнасці, інклюзіўнасці і агульных добрых мэтаў адукацыі. Трэба надаваць прыярытэт платформам з адкрытым доступам і адкрытымі крыніцамі, якія прапануюць моцную абарону даных вучняў і настаўнікаў.

Па-трэцяе, трэба ўзмацняць дзяржаўнае фінансаванне і магчымасці ўрадаў па рэгуляванні адукацыі. Мы павінны нарошчваць патэнцыял дзяржаў па ўстанаўленні і выкананні стандартаў і нормаў забеспячэння адукацыі, якія будуць спагаднымі, справядлівымі і будуць падтрымліваць правы чалавека. На мясцовым, нацыянальным, рэгіянальным і глабальным узроўнях урады і дзяржаўныя ўстановы павінны прыняць на сябе абавязацельствы па правядзенні дыялогаў і дзеянняў на аснове гэтых прынцыпаў у падтрымку пераасэнсавання нашай будучыні разам.

Па-чацвёртае, трэба пашырыць права на адукацыю: нам больш не падыходзіць тое, што яно грунтуецца на фармальным школьным навучанні. Гледзячы ў будучыню, мы павінны падтрымаць права на навучанне даўжынёю і шырынёю ў жыццё, што робіцца магчымым дзякуючы праву на інфармацыю, сувязь і культуру.

# Заклікі да дзеянняў

У дакладзе робяцца два заклікі да каталізацыі і гарманізацыі намаганняў адносна новага сацыяльнага кантракта на адукацыю: заклік да новай даследчай праграмы ў галіне адукацыі, а таксама заклік да адноўленай салідарнасці і кааперацыі ў падтрымку адукацыі як грамадскага і агульнага дабра. Кіруючыя прынцыпы рэагавання на гэтыя два заклікі абагульнены тут, каб дапамагчы накіраваць і ўмацаваць нашы намаганні па стварэнні новай будучыні адукацыі, рэагуючы на хутка зменлівыя ўмовы.

## Новая праграма даследаванняў у галіне адукацыі

Падкрэсленыя ў гэтым дакладзе прыярытэты падмацоўваюць паслядоўную і агульную для ўсіх праграму даследаванняў. Навучанне, погляды і досвед, атрыманыя з такой далёкасяжнай праграмы даследаванняў, будуць каталізаваць сумеснае стварэнне новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. У перспектыве да 2050 года ёсць чатыры прыярытэты, якія накіроўваюць даследаванні і інавацыі для будучыні адукацыі:

> У цэнтры агульнасусветнай сумеснай праграмы даследаванняў адносна будучыні адукацыі павінна быць права на адукацыю ўсіх людзей на працягу жыцця.

Па-першае, у цэнтры сусветнай сумеснай праграмы даследаванняў адносна будучыні адукацыі павінна быць права на адукацыю ўсіх людзей на працягу жыцця, адначасова прадбачаны будучыя збоі і ўлічаны іх наступствы. Даследаванні таксама павінны выйсці за рамкі простага вымярэння і крытычнага аналізу для вывучэння пытанняў абнаўлення адукацыі згодна з рэкамендаванымі ў гэтым дакладзе кіруючымі прынцыпамі. Трэба пераглядзець прыярытэты гэтай праграмы даследаванняў у святле граматнасці і разважанняў адносна будучыні, каб наблізіць нас да новага сацыяльнага кантракта на адукацыю.

Па-другое, веды, даныя і факты адносна будучыні адукацыі павінны ўключаць разнастайныя крыніцы і шляхі пазнання. Бачанне з розных пунктаў гледжання можа прапанаваць розныя перспектывы для сумеснага разумення адукацыі замест выключэння і замены аднаго адным. Даследчыкі, універсітэты і даследчыя інстытуты павінны вывучаць метадалагічныя дапушчэнні і падыходы, якія з'яўляюцца дэкаланізацыйнымі, дэмакратычнымі, а таксама садзейнічаюць рэалізацыі і прасоўванню правоў чалавека. Школы, настаўнікі, грамадскія рухі, моладзевыя рухі і суполкі з'яўляюцца важнымі крыніцамі ведаў і інфармацыі, і даследчыкі павінны прызнаць іх такімі. Высновы навукі аб вучэнні, нейранавукі, лічбавыя і вялікія даныя, а таксама статыстычныя паказчыкі могуць даць важнае бачанне, калі іх разглядаць у сувязі з больш шырокім спектрам эмпірычных унёскаў, уключаючы якасныя і практычныя даследаванні.Па-трэцяе, інавацыі ў адукацыі павінны адлюстроўваць значна больш шырокі спектр магчымасцяў у розных кантэкстах, у розныя часы і ў розных месцах. Супастаўленні і досвед могуць натхняць людзей, калі яны належным чынам перагледжваюцца і ўзгадняюцца з дакладнымі сацыяльнымі і гістарычнымі рэаліямі пэўнай сітуацыі. Адукацыйныя інавацыі таксама павінны імкнуцца часам адарвацца ад інстытуцыйнай канвергенцыі, якая ўплывае на сучасныя фармальныя сістэмы. Ацэнка і разважанні павінны безупынна і інтэгравана накіроўваць адукацыйную палітыку, павышаючы звычайнае ўдасканаленне да ўзроўню тэорыі зменаў, адрываючыся ад стагнацыі, з аднаго боку, і ад цыклаў бясконцых зменаў рэжыму – з другога.

Па-чацвёртае, трэба перагледзець даследаванні ў мэтах новага сацыяльнага кантракта, каб яны ўключалі больш людзей з розных зацікаўленых груп, у тым ліку тых, хто звычайна не прымае актыўнага ўдзелу ў дыскусіях аб адукацыі. Насенне новага сацыяльнага кантракта ўжо прарастае, асабліва сярод настаўнікаў, вучняў і школ. Асобныя абавязкі захоўваюцца за даследчымі інстытутамі, урадамі і міжнароднымі арганізацыямі, якія павінны ўдзельнічаць і падтрымліваць праграму даследаванняў, якая каталізуе сумесную працу па гэтым кантракце. ЮНЕСКА можа адыграць важную ролю ў якасці цэнтра па абмене ведамі, стварэнні канцэпцый і ідэй адносна нашай сумеснай будучыні адукацыі.

## Аднаўленне міжнароднай салідарнасці і кааперацыі

> У калектыўных дзеяннях неабходна надаваць прыярытэт тым навучэнцам, чыё права на адукацыю падвяргаецца найбольшым пагрозам з прычыны глабальных праблем і зменаў.

Сфармуляванае ў гэтым дакладзе амбіцыйнае бачанне не можа быць рэалізавана без салідарнасці і супрацоўніцтва на ўсіх узроўнях – ад непасрэдных умоў класных пакояў і школ да шырокіх нацыянальных, рэгіянальных і грамадскіх абавязацельстваў і палітычных механізмаў. Даклад заклікае да абнаўлення абавязацельства па глабальным супрацоўніцтве ў падтрымку адукацыі ў якасці грамадскага і агульнага дабра на аснове больш справядлівай і раўнапраўнай кааперацыі паміж дзяржаўнымі і недзяржаўнымі суб'ектамі на мясцовым, нацыянальным і міжнародным узроўнях.

У перспектыве да 2050 года мы павінны прытрымлівацца чатырох кіруючых прынцыпаў, якія тычацца міжнароднай салідарнасці і кааперацыі дзеля будучыні адукацыі.

Па-першае, Камісія заклікае ўсе зацікаўленыя ў адукацыі бакі працаваць разам на глабальным і рэгіянальным узроўнях для стварэння сумесных мэтаў і агульных для ўсіх рашэнняў праблем адукацыі. Трэба гарманізаваць і пераарыентаваць намаганні згодна з бачаннем справядлівай і раўнапраўнай будучыні адукацыі для ўсяго чалавецтва на аснове права на адукацыю на працягу жыцця і каштоўнасці адукацыі ў якасці грамадскага і агульнага дабра. У калектыўных дзеяннях неабходна надаваць прыярытэт тым навучэнцам, чыё права на адукацыю падвяргаецца найбольшым пагрозам з прычыны глабальных праблем і зменаў. На працягу наступных дзесяцігоддзяў глабальнае супрацоўніцтва павінна вырашаць праблему дысбалансу сіл, падключаючы да гэтага недзяржаўных суб’ектаў і партнёрствы. Яно павінна далей перайсці ад вертыкальнага да шматцэнтрычнага дзеяння і ўхваліць новыя формы рэгіянальнай кааперацыі, асабліва ў напрамку “поўдзень-поўдзень”, а таксама трохбаковай кааперацыі.

Па-другое, міжнароднае супрацоўніцтва павінна дзейнічаць, зыходзячы з прынцыпу субсідыярнасці, падтрымліваючы і нарошчваючы патэнцыял мясцовых, нацыянальных і рэгіянальных намаганняў па вырашэнні праблем. Для ўзмацнення новых абавязацельстваў, нормаў і стандартаў у галіне адукацыі будзе патрабавацца больш высокі ўзровень справаздачнасці на кожным узроўні. ЮНЕСКА будзе павінна перагледзець свой падыход да развіцця адукацыі, разглядаючы сябе ў першую чаргу ў якасці партнёра, чыя праца зводзіцца да ўмацавання рэгіянальных і нацыянальных установ і працэсаў, і ў другую чаргу – у якасці пасярэдніка ў абмене фактамі, стваральніка ведаў і праваднікa больш абгрунтаваных даных аб сістэмах адукацыі і падсправаздачнасці перад грамадзянамі. Па-трэцяе, па-ранейшаму важны акцэнт на міжнародным фінансаванні развіцця краін з нізкімі і ніжэй за сярэдні даходамі, у прыватнасці, для краін з рэзка абмежаванай эканомікай і маладым насельніцтвам. Трэба неадкладна засяродзіць асноўную частку фінансавых і людскіх рэсурсаў міжнароднага супрацоўніцтва на рэгіёнах, у якіх права на адукацыю падвяргаецца найбольшай пагрозе – і ў прыватнасці, на Чорнай Афрыцы, дзе да 2050 года будзе жыць і вучыцца пераважная большасць моладзі свету. Гэтыя рэсурсы таксама трэба накіраваць на вырашэнне надзвычайных сітуацый, якія, верагодна, будуць адбывацца больш часта з паскарэннем змянення клімату.

Па-чацвёртае, важнай часткай эфектыўнага супрацоўніцтва таксама з’яўляюцца агульныя інвестыцыі ў фактычныя матэрыялы, даныя і веды. На працягу бліжэйшых дзесяцігоддзяў мы павінны будзем умацоўваць узаемнае навучанне і абмен ведамі паміж грамадствамі і праз межы ў такіх стрыжнёвых напрамках, як скасаванне адукацыйнай няроўнасці і беднасці, паляпшэнне грамадскіх паслуг, а таксама вырашаць больш доўгатэрміновыя праблемы, якія прыносяць аўтаматызацыя і лічбавізацыя, міграцыя і экалагічная няўстойлівасць. ЮНЕСКА адыгрывае вырашальную ролю ў садзейнічанні гэтаму абмену паміж краінамі і рэгіёнамі.

# Дыялог і ўдзел

Маюцца вялікія падставы для надзеі. Шырокамаштабныя змены і інавацыі магчымы ў планаванні адукацыйных сістэм, арганізацыі школ і іншых сістэм адукацыі, а таксама ў навучальных планах і педагагічных падыходах. Усе разам мы можам пераўтварыць адукацыю, каб яна дапамагла нам пабудаваць справядлівую, раўнапраўную і ўстойлівую будучыню, грунтуючыся на тым, што ўжо існуе, і ствараючы тое, што яшчэ неабходна. Мы зменім курс праз мільёны асабістых і калектыўных актаў смеласці, лідарства, супраціўлення, творчасці і клопату аб іншых. Мы маем глыбокія, багатыя і разнастайныя культурныя традыцыі, на якія мы можам абапірацца. Людзі маюць вялікую калектыўную суб'ектнасць, інтэлект і крэатыўнасць. Перспектыўныя практыкі могуць быць інавацыйнымі ці караніцца ў традыцыях, і ў абодвух выпадках яны могуць адкрываць новыя магчымасці.

> Мы зменім курс праз мільёны асабістых і калектыўных актаў смеласці, лідарства, супраціўлення, творчасці і клопату аб іншых.

Прапанаваны ў гэтым дакладзе дыялог павінен прадугледжваць як мага больш шырокі ўдзел. Адукацыя – вырашальны чыннік у грамадзянстве на мясцовым, нацыянальным і глабальным узроўнях. Яна тычыцца кожнага, і кожны можа ўдзельнічаць у стварэнні будучыні адукацыі ў любой сферы ўплыву, у якой ён ці яна знаходзіцца. У гэтым дакладзе прапануецца надзяліць пэўнымі ролямі настаўнікаў, універсітэты, урады, міжнародныя арганізацыі і моладзь для далейшага пашырэння гэтага дыялогу і дзейнасці:

- **Настаўнікі**. Настаўнікі захоўваюць цэнтральнае месца ў будучыні адукацыі. Падобна таму, як яны стварылі падмурак для сацыяльнага кантракта, які дзейнічае з дзевятнаццатага стагоддзя, яны таксама будуць асноўнымі арганізатарамі, практыкамі і даследчыкамі ў стварэнні новага сацыяльнага кантракта на адукацыю. Для гэтага неабходна забяспечыць іх аўтаномію і свабоду, падтрымаць іх развіццё на працягу іх прафесійнага жыцця і прызнаць іх ролю ў грамадстве і іх удзел у дзяржаўнай палітыцы. Натуральным чынам, настаўнікі будуць цэнтральнымі пратаганістамі ў будаўніцтве працэсаў дыялогу і інавацый, аб'яднання і злучэння іншых людзей і груп.

- **Універсітэты і вышэйшая адукацыя**. У кожным раздзеле гэтага даклада, як і цалкам у рэаліях новага сацыяльнага кантракта на адукацыю, прысутнічаюць адмысловыя заклікі да ўніверсітэтаў і вышэйшых навучальных установаў. Сёння мала хто аспрэчвае важную ролю, якую адыгрываюць універсітэты і ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы ў стварэнні і распаўсюджванні ведаў. Так адбываецца ва ўсіх дысцыплінах, аднак гэта асабліва тычыцца адукацыі. Будучыня адукацыі шмат у чым залежыць ад той працы, якая робіцца ў базавай адукацыі, і наадварот. Таксама чакаецца, што ўніверсітэты знойдуць новыя і больш эфектыўныя спосабы адукацыі дзяцей і моладзі, асабліва дзяцей малодшага ўзросту, і прымуць большы ўдзел у адукацыі дарослых. Вышэйшая адукацыя па вызначэнні з'яўляецца локусам трансфармацыйнага дыялогу паміж пакаленнямі, і ад яе залежыць значная частка будучыні, акрэсленай у гэтым

дакладзе. Без моцнай, аўтаномнай, вартай даверу і інавацыйнай вышэйшай адукацыі будзе немагчыма стварыць сацыяльны кантракт на адукацыю, які прадугледжваецца ў гэтым дакладзе.

- **Урады**. У гэтым дакладзе падкрэсліваецца незаменная роля ўрадаў. Аднак гэта не азначае, што яго прапановы належаць толькі да ўзроўню нацыянальных адукацыйных сістэм. Замест таго, каб прытрымлівацца ўрадацэнтрычнай логікі дакладаў аб адукацыйнай рэформе, гэты даклад накіраваны на заахвочванне да ўдзелу больш шырокага кола зацікаўленых бакоў з іх даследаваннямі, ведамі, інавацыямі, аналітыкай і дзейнасцю. Гэта пытанне ацэнкі дзейнасці ўрада на множных узроўнях, не столькі ў логіцы рэформ, колькі з пункту гледжання іх ролі ініцыятараў больш шырокага ўдзелу і каталізатараў інавацый. Акрамя таго, урады маюць унікальныя ролі ў захаванні і кансалідацыі грамадскага характару адукацыі, забяспечваючы належнае і ўстойлівае дзяржаўнае фінансаванне адукацыі і нарошчваючы патэнцыял для належнага рэгулявання адукацыі.

- **Міжнародныя арганізацыі і арганізацыі грамадзянскай супольнасці**. У гэтым дакладзе падкрэсліваецца значнасць міжнародных арганізацый і арганізацый грамадзянскай супольнасці, асабліва праз паўторнае сцвярджэнне адукацыі як грамадскага і агульнага дабра. Гэты паўтор павінен сігналізаваць аб значным зруху ў перспектыве, даючы прастор для новых галасоў у адукацыйнай кааперацыі на мясцовым, нацыянальным, рэгіянальным, міжнародным і міжсектаральным узроўнях. Чакаецца, што эфектыўная мабілізацыя міжнародных арганізацый і арганізацый грамадзянскай супольнасці будзе спрыяць прапанаванаму ў гэтым дакладзе дыялогу дзякуючы іх унікальным ведам, досведу і мабілізацыйнаму патэнцыялу. Гэтыя арганізацыі таксама займаюць адмысловае месца ў забеспячэнні таго, каб людзі, якія падвяргаюцца дыскрымінацыі ў сувязі з іх поглядамі, гендарам, расай ці этнічнасцю, культурай, рэлігійнымі поглядамі ці сексуальнай ідэнтычнасцю, былі пачуты, заўважаны і падтрыманы ў іх праве на адукацыю.

- **Моладзь і дзеці**. Нарэшце, і гэта не выклікае пытанняў, прапанаваны тут дыялог павінен уключаць маладых людзей. Іх будучыня павінна быць перагледжана як поўная магчымасцяў, а не як цяжар. Пытанне не толькі ў тым, каб прыслухоўвацца да іх ці кансультавацца з імі, але ў мабілізацыі і падтрымцы іх у будаўніцтве будучыні, якая будзе належаць і ўжо належыць ім. Апошнія прыклады значных моладзевых і дзіцячых рухаў, асабліва ў барацьбе са змяненнем клімату, расавай дыскрымінацыяй, патрыярхатам і абмежавальнымі гендарнымі нормамі, за разнастайнасць культур і самавызначэнне карэнных народаў – паказваюць нам важныя шляхі да будучыні. Юнакі і дзяўчаты, якія стаяць на чале гэтых рухаў, не прасілі дазволу, хутчэй, яны рэагавалі з пачуццём неадкладнасці і маральнай выразнасці на праблемы, якія занадта часта апануюць ці паралізуюць волю дарослых. Яны павінны адыграць плённую і кіруючую ролю ў будаўніцтве нашай і іх будучыні. Найбольш значны аспект у працяг гэтага даклада – здольнасць прыцягнуць маладых людзей да стварэння новага сацыяльнага кантракта на адукацыю.

Ва ўсім свеце настаўнікі, супольнасці, арганізацыі і ўрады ўжо пачалі працу над шматлікімі перспектыўнымі ініцыятывамі ў галіне адукацыі дзеля неабходных зменаў. Незлічоныя прыклады паказваюць нам шматлікія шляхі для сумеснага стварэння і абмену ведамі. Іншыя прыклады асвятляюць, якім чынам адукацыя можа ствараць сэнс, надзяляць магчымасцямі і паўнамоцтвамі, а таксама дэманструюць шляхі, якія вядуць да лепшай арганізацыі адукацыі ў інтарэсах грамадскага дабра. Гэтыя існуючыя практыкі трэба развіваць, каб яны вызначалі курс стварэння будучыні, поўнай надзеі.

Добрая праца, якая разгортваецца ва ўсім свеце, павінна стаць больш вядомай, і Камісія рэкамендуе ЮНЕСКА стаць каталізатарам і цэнтрам абмену перспектыўнымі практыкамі і інавацыйнай рэалізацыі прынцыпаў, выкладзеных у гэтым дакладзе.

# Запрашэнне да працягу працы

Па сутнасці, гэты даклад змяшчае заклік і мэту садзейнічаць шырокаму сацыяльнаму дыялогу аб пажаданай будучыні і аб тым, як адукацыя можа дапамагчы ў яе стварэнні, і ініцыяваць такі дыялог. Яго ідэі адлюстроўваюць пэўны момант у часе, грунтуючыся на выніках двухгадовага працэсу дыялогу і кансультацый. Прапановы, якія змяшчаюцца ў гэтым дакладзе, заканчваюцца запрашэннямі працягнуць шматлікія размовы, супрацоўніцтва і партнёрства ў будучыні. Менавіта гэтыя размовы, супрацоўніцтва і партнёрства будуць мець найбольшае значэнне для будучыні адукацыі – а не сам даклад.

У той час як у дакладзе фармулюецца бачанне выклікаў і надзей, якія павінны ажывіць намаганні здзяйсняць адукацыю для будучыні, і вылучаюцца ідэі адносна таго, як гэта зрабіць, яго аўтары таксама настойваюць, што новы сацыяльны кантракт на адукацыю не з’яўляецца самавыканальным. Каб набыць форму і мець эфект, даклад павінен быць пераведзены ў праграмы, рэсурсы, сістэмы і працэсы, якія пераўтвараюць штодзённую дзейнасць і досвед вучняў і настаўнікаў.

Адукацыя аб’ядноўвае вялікую колькасць асобаў і груп у складаную сетку ўзаемаадносін. У ёй удзельнічаюць вучні, настаўнікі, сем’і, адміністратары адукацыйных устаноў і лідары на множных урадавых узроўнях, і яна тычыцца дзяржаўнага сектара і таксама грамадзянскай супольнасці ў рамках супольнасцей, правінцый, нацый, рэгіёнаў і ўсяго свету. Пераўтварэнне адукацыйнай культуры ёсць вынік працэсаў сумеснага будаўніцтва, калі многія групы прапаноўваюць свае інтарэсы і сваё бачанне, каб пераглядзець іх у святле новых ідэй і ў размове з іншымі. Кааперацыя мае важнае значэнне для перавода закранутых тут прынцыпаў, прапаноў і стратэгій у новыя рэаліі. Такое сумеснае стварэнне ідэй адносна таго, як мы вучым і вучымся і для якой мэты, вядзе нарэшце да яснасці, прыхільнасці і падтрымкі рэсурсаў і дзейнасці, якія могуць пераўтварыць адукацыйныя практыкі. Практыкі змяняюцца, калі ўмовы, якія падтрымліваюць гэтыя змены, добра разумеюцца, прымаюцца і рэалізуюцца.

Кожны з нас можа зрабіць паляпшэнні ў супольнасцях, у якіх мы жывём. Усе мы маем магчымасць арганізаваць дыялог. Гэта асабліва актуальна ў эпоху, калі паўсюднае пранікненне камунікацыйных тэхналогій і інтэрнэту робіць магчымым беспрэцэдэнтнае супрацоўніцтва паміж настаўнікамі, адукацыйнымі ўстановамі і супольнасцямі для рэалізацыі магчымасцяў і пошуку рашэнняў праблемаў.

Пандэмія COVID-19 адмоўна адбілася на выпуску гэтага даклада і большай часткі яго падрыхтоўкі. Гэта глабальная падзея абудзіла прызнанне важнасці шырокага супрацоўніцтва. Мы яшчэ павінны будзем зазнаць поўную меру шкоды і стратаў, якія былі выкліканы COVID-19, але мы ўжо ведаем, што гэта вельмі сур’ёзна і можа сцерці дзесяцігоддзі прагрэсу. Наступствы пандэміі найбольш жорстка адчулі на сабе бедныя і маргіналізаваныя пласты насельніцтва на глабальным поўдні, дзе яна ўзмацняецца іншымі выклікамі. Яе след – смерці і страты ў спалучэнні з рэаліямі змянення клімату, якое паскараецца і ўзмацняецца, – вельмі моцна нагадвае нам, што мы жывём на гэтай планеце ў сувязі з іншымі. Вынаходніцтва вакцынаў для прафілактыкі COVID-19 паказала маштабы і хуткасць магчымых вынікаў нашага аб’яднання вакол ведаў, навукі і навучання дзеля пошуку рашэнняў. У гэтым дакладзе выказваецца спадзяванне, што гэтае нядаўна здабытае прызнанне дасць штуршок для будаўніцтва новай і больш светлай будучыні адукацыі.

У гэтай сітуацыі неадкладнасці, але і вялікіх магчымасцяў, акрэсленыя ў гэтым дакладзе ідэі дапамагаюць нам пераасэнсаваць нашу будучыню разам і зрабіць новы сацыяльны кантракт на адукацыю. Гэты даклад з’яўляецца запрашэннем да сумеснага абмеркавання і сумесных дзеянняў дзеля сумеснага стварэння будучыні адукацыі. Ён уяўляе сабой зыходны пункт, пачатак працэсу дыялогу і супрацы. Гэты даклад, як і сама адукацыя, не скончаны. Наадварот, ён робіцца актуальным зараз дзякуючы працы педагогаў ва ўсім свеце, а таксама тых, хто працуе поплеч з імі.

# Дадаткі

# Выбраная літаратура

## Незалежныя даклады

Наступныя даклады былі атрыманы ў адказ на адкрыты заклік да арганізацыі семінараў і рабочых груп, каб дапамагчы вызначыць ключавыя выклікі і магчымасці, а таксама зрабіць унёскі і рэкамендацыі для Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі. Каля 200 іншых арганізацый таксама адправілі свае даклады ў ініцыятыву ЮНЕСКА "Будучыня адукацыі" на аснове фокус-групаў, і гэтыя партнёры пералічаны ў раздзеле ніжэй пад рубрыкай "Удзельнікі глабальных кансультацый".


Arab Campaign for Education for All. 2020. *Summary report on the Futures of Education in the Arab States: Building the future (2020–2050)*. Ramallah, Arab Campaign for Education for All. http://www.teachercc.org/articles/view/379

Asia South Pacific Association for Basic and Adult Education. 2021. *From the margins to the center: Youth informing the futures of education*. Manila, Asia South Pacific Association for Basic and Adult Education. http://www.aspbae.org/userfiles/2021/Futures_of_Education_Report.pdf.

Barber, P., Bertet, M., Choi, J., Czerwitzki, K., Njobati, F. F., Grau I Callizo, I., Hambrock, H., Herveau, J., Kastner, A., Laabs, J., Manalo, A., Mesa, J., Mutabazi, S., Muthigani, A., Richard, P., Scheunpflug, A., Sendler-Koschel, B., White, M., and Wodon, Q. 2020. *Christian schools and the futures of education: a contribution to UNESCO's Futures of Education Commission by the International Ofice of Catholic Education and the Global Pedagogical Network – Joining in Reformation*. International Ofice of Catholic Education and Global Pedagogical Network – Joining in Reformation. http://oiecinternational.com/wp-content/uploads/2020/12/OIEC-GPENR-contribution.pdf.

Bridge 47. 2020. *The role of education in addressing future challenges*. Bridge 47. https://www.bridge47.org/sites/default/files/2020-12/bridge47_-_report_to_unesco_foe_international_commission_final.pdf.

Éducation, Recherches et Actualités. 2021. *L'Éducation du futur – L'enseignement supérieur: défis et paradoxes*. Beirut et Paris, Université Saint Joseph et Université Gustave Eiffel. https://www.periodicos.ufam.edu.br/index.php/larecherche.

Emmaüs International. 2020. *Rapport à l'attention de la commission internationale de l'initiative de l' UNESCO: "Les futurs de l'éducation: apprendre à devenir"*. Montreuil, France, Emmaüs International. https://emmaus-international.org/images/actualites/2020/10/EMMAS_INTERNATIONAL_-_Contribution_Les_futurs_de_ldcation__juillet_2020_003.pdf.

Garcés, C. E. 2020. *Aportación para la Comisión Internacional*. Madrid.

International Council for Adult Education (ICAE). 2020. *Adult Learning and Education (ALE) – Because the future cannot wait*. International Council for Adult Education. https://en.unesco.org/futuresofeducation/sites/default/files/2020-10/ICAE%20-%20Futures%20of%20ALE%20FINAL.pdf.

International Task Force on Teachers for Education 2030. 2021. *The futures of teaching: Background paper prepared for the Ініцыятыва "Будучыня адукацыі"*. Paris, UNESCO. https://teachertaskforce.org/knowledge-hub/futures-teaching-background-paper-prepared-futures-education-initiative-0.

International Union for Conservation of Nature (IUCN) Commission on Education and Communication (CEC). 2021. *Visions and Recommendations for the Futures of Education*. Gland, Switzerland, International Union for Conservation of Nature. https://www.iucn.org/sites/dev/files/content/documents/cec_ report_to_unesco_foe_-_6.5.pdf.

Mouvement International ATD Quart Monde. 2020. *Contribution du Mouvement International ATD Quart Monde aux Futurs de l'Éducation*. Pierrelaye, France, Mouvement ATD Quart Monde – Agir Tous pour la Dignité. https://nextcloud.atd-quartmonde.org/index.php/s/DzMMci4yqP6dkPA.

Red Regional por la Educación Inclusiva de Latinoamérica. 2020. *Los futuros de la educación – Contribuciones de la Red Regional por la Educación Inclusiva de Latinoamérica*. Buenos Aires, Red Regional por la Educación Inclusiva de Latinoamérica. https://rededucacioninclusiva.org/wp-content/uploads/2020/09/Los-futuros-de-la-educaci%C3%B3n-Contribuciones-de-la-Red-Regional-por-la-Educaci%C3%B3n-Inclusiva-de-Latinoam%C3%A9rica.pdf.

Schulte, D., Cendon, E. and Makoe, M. 2020. *Re-Visioning the Future of Teaching and Learning in Higher Education: Report on Focus Group Discussions for the UNESCO Ініцыятыва "Будучыня адукацыі"*. University of the Future Network. *https://unifuture.network/wp-content/uploads/sites/2/2020/08/20200722_ UFN_ЮНЕСКА-report_fin.pdf*.

SDG-Education 2030 Steering Committee. 2020. *Contribution to the Futures of Education*. Paris, ЮНЕСКА. https://sdg4education2030.org/sites/default/files/2020-07/Futures%20of%20Education%20SDG-Ed2030%20SC%20contribution%20July%202020.pdf.

Sefton-Green, J., Erstad, O. and Nelligan, P. 2021. *Educational Futures Across Generations*. Centre for Research for Educational Impact (REDI) at Deakin University and Department of Education at the University of Oslo. https://www.deakin.edu.au/__data/assets/pdf_file/0005/2298551/Educational-Futures-Across-Generations.pdf.

Seguy, F. 2021. *Penser l'avenir de l'éducation en contexte de pandémie. Port-au-Prince*, UNESCO. https://unesdoc. unesco.org/ark:/48223/pf0000378392.

UNESCO. 2020. *Humanistic Futures of Learning: Perspectives from ЮНЕСКА Chairs and UNITWIN Networks*. Paris, UNESCO. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000372577/PDF/372577eng.pdf.multi.

UNESCO Institute for Lifelong Learning. 2020. *Embracing a culture of lifelong learning: Contribution to the Ініцыятыва "Будучыня адукацыі"*. Hamburg, UNESCO Institute for Lifelong Learning. https://unesdoc. unesco.org/ark:/48223/pf0000374112/PDF/374112eng.pdf.multi.

UNESCO International Institute for Higher Education in Latin America and the Caribbean (IESALC). 2021. *Thinking Higher and Beyond: Perspectives on the Futures of Higher Education to 2050*. UNESCO International Institute for Higher Education in Latin America and the Caribbean. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000377530.

UNESCO. 2021. *Caribbean Futures of Education – Final Report*. Kingston, UNESCO. https://en.unesco.org/caribbean-futures-of-education.

UNESCO's Collective Consultation of NGOs on Education 2030. 2021. *The role of Civil Society Organisations in 2050 and beyond*. Paris, ЮНЕСКА's Collective Consultation of NGOs on Education 2030. https://en.unesco.org/system/files/the_role_of_csos_in_2050_and_beyond.pdf.

Unescocat and Fòrum Futurs de L'educació. 2020. *How to Get to the Future of Education: Lessons Learned*

*from the Escola Nova 21 Alliance in Catalonia*. Unescocat-Center for UNESCO of Catalonia. https://catesco.org/wp-content/uploads/2020/10/Unescocat-contribution-to-Futures-of-Education.pdf.

Wong, S., Kwok, V., Kwong, T. and Lau, R. 2020. *Individuality, Accessibility, and Inclusivity: Applied Education and Lifelong Learning in Revolutionising Education for the 21st Century*. Our Hong Kong Foundation. https://ourhkfoundation.org.hk/sites/default/files/media/pdf/UNESCO_submission_13102020.pdf.

World Council on Intercultural and Global Competence. 2021. *Contribution from the World Council on Intercultural and Global Competence to the UNESCO Ініцыятыва "Будучыня адукацыі"*. https://iccglobal.org/wp-content/uploads/World-Council-Futures-of-Education-Learning-to-Become-Initiative_.pdf.

Yidan Prize Foundation. 2021. *Perspectives from the Yidan Prize Foundation Council of Luminaries on the Futures of Education*.

## Даведачныя дакументы

Наступныя даведачныя дакументы былі замоўлены ЮНЕСКА для абмеркавання ключавых пытанняў, выкладзеных Міжнароднай камісіяй па будучыні адукацыі.

Assié-Lumumba, N. T. 2020. *Gender, knowledge production, and transformative policy in Africa*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374154.

Buchanan J., Allais S., Anderson M., Calvo R. A., Peter S. and Pietsch T. 2020. *The futures of work: what education can and can't do*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc. unesco.org/ark:/48223/pf0000374435.

Common Worlds Research Collective. 2020. *Learning to become with the world: Education for future survival*. Education Research and Foresight Working Paper 28. Paris, UNESCO

Corson, J. 2020. *Visibly ungoverned: strategies for welcoming diverse forms of knowledge*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/ pf0000374085.

Couture, J. C., Grøttvik, R. and Sellar, S. 2020. *A profession learning to become: the promise of collaboration between teacher organizations and academia*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374156.

Damus, O. 2020. *Les futurs de l'éducation au carrefour des épistémologies du Nord et du Sud*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374047.

Desjardins, R., Torres, C. A. and Wiksten, S. 2020. *Social contract pedagogy: a dialogical and deliberative model for Global Citizenship Education*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374879.

D'Souza, E. 2020. *Education for future work and economic security in India*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374880.

Facer, K. 2021. *Futures in education: towards an ethical practice*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000375792.

Facer, K. 2021. *It's not (just) about jobs: education for economic wellbeing*. Education Research and Foresight Working Paper 29. Paris, UNESCO. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000376150/PDF/376150eng.pdf.multi.

Facer, K. and Selwyn, N. 2021. *Digital technology and the futures of education – towards 'non-stupid' optimism*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ ark:/48223/pf0000377071.

Gautam, S. and Shyangtan, S. 2020. *From suffering to surviving, surviving to living: education for harmony with nature and humanity*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374086.

Grigera, J. 2020. *Futures of Work in Latin America: between technological innovation and crisis*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374436.

Hager, P. and Beckett, D. 2020. *We're all in this together: new principles of co-present group learning*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374089.

Haste, H. and Chopra, V. 2020. *The futures of education for participation in 2050: educating for managing uncertainty and ambiguity*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374441.

Hoppers, C. 2020. *Knowledge production, access and governance: a song from the south*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/ pf0000374033.

Howard, P., Corbett, M., Burke-Saulnier, A. and Young, D. 2020. *Education futures: conservation and change*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374087.

Inayatullah, S. 2020. *Co-creating educational futures: contradictions between the emerging future and the walled past*. Education Research and Foresight Working Paper 27. Paris, ЮНЕСКА. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000373581/PDF/373581eng.pdf.multi.

Labate, H. 2020. *Knowledge access and distribution: the future(s) of what we used to call 'curriculum'*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374153.

Lambrechts, W. 2020. *Learning 'for' and 'in' the future: on the role of resilience and empowerment in education*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374088.

Mengisteab, K. 2020. *Education and participation in African contexts*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374155.

Moore, S. J. and Nesterova, Y. 2020. I*ndigenous knowledges and ways of knowing for a sustainable living*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/ pf0000374046.

Saeed, T. 2020. *Reimagining education: student movements and the possibility of a Critical Pedagogy and Feminist Praxis*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco. org/ark:/48223/pf0000374157.

Schweisfurth, M. 2020. *Future pedagogies: reconciling multifaceted realities and shared visions*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374077.

Smart, A., Sinclair, M., Benavot, A., Bernard, J., Chabbott, C., Russell, S. G. and Williams, J. 2020. *Learning for uncertain futures: The role of textbooks, curriculum, and pedagogy*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374078.

Sriprakash, A., Nally, D., Myers, K., and Ramos-Pinto, P. 2020. *Learning with the past: racism, education and reparative futures*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374045.

Stitzlein, S. M. 2020. *Using civic participation and civic reasoning to shape our future and education*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374034.

Vasavi, A.R. 2020. *Rethinking mass higher education: towards community integrated learning centres*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374442.

Wagner, D., Castillo, N. and Zahra, F. T. 2020. *Global learning equity and education: looking ahead*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000375000.

Ydesen, C., Acosta, F., Milner, A.L., Ruan, Y., Aderet-German, T., Gomez Caride, E. and Hansen, I. S. 2020. *Inclusion in testing times: implications for citizenship and participation*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000374084.

Alongside this background research, an interactive game was developed for the Ініцыятыва "Будучыня адукацыі" to think about alternative learning systems and explore their implications with different groups.

Keats, J. and Candy, S. 2020. *Accession: Building an intergenerational library*. Game developed for the Ініцыятыва "Будучыня адукацыі".

## Унёскі ў глабальныя кансультацыі

Наступныя дакументы былі замоўлены ЮНЕСКА для аналізу і сінтэзу пунктаў гледжання і ідэй, якія атрымліваліся праз працу рабочых груп, анлайнавых платформаў, а таксама каналаў для апытанняў і галасавання, якія былі распрацаваны для гэтай ініцыятывы.

Jacobs, R. and French, C. 2021. *Women, robots and a sustainable generation: Reading artworks envisioning education in 2050 and beyond*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/search/faad9f2c-4a70-4b7a-8ac7-c3cffecd156c.

Melchor, Y. 2021. *Analysis report of the online consultation modality: Your ideas on the futures of education*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/ pf0000378271/PDF/378271eng.pdf.multi.

TakingITGlobal. 2021. *Focus group discussion analysis: Perspectives from the UNESCO Associated School Network's community of students, teachers and parents*. Paper commissioned for the UNESCO Futures

of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000378054/PDF/378054eng.pdf.multi.

UNESCO. 2021. *Education in 2050: Analysis of social media polling campaign for ЮНЕСКА's Futures of Education report*. Paris, UNESCO.

Moeller, K., Agaba, S., Hook, T., Jiang, S., Otting, J., Sedighi, M. and Wyss, N. 2021. *Focus group discussions analysis: September 2019 – November 2020*. Paper commissioned for the UNESCO Futures of Education report. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000375579/PDF/375579eng.pdf.multi.

## Публікацыі Міжнароднай Камісіі па будучыні адукацыі

Падчас распрацоўкі гэтага даклада ў мэтах атрымання водгукаў і прапаноў Камісія апублікавала некалькі прамежкавых бюлетэняў адносна ходу сваёй працы. Акрамя гэтага, Камісія зрабіла рэкамендацыі адносна выкліканых крызісам COVID-19 перабояў у адукацыйным працэсе.

International Commission on the Futures of Education. 2020. *Visioning and Framing the Futures of Education*. UNESCO, Paris. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000373208.

International Commission on the Futures of Education. 2020. *Protecting and transforming education for shared futures: joint statement by International Commission on the Futures of Education*. UNESCO, Paris. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000373380.

International Commission on the Futures of Education. 2020. *Education in a Post-COVID World: Nine ideas for public action*. UNESCO, Paris. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000373717.

International Commission on the Futures of Education. 2021. *Progress update Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі*. UNESCO, Paris. https://unesdoc.unesco.org/ark:/48223/pf0000375746.

# Міжнародная Камісія па будучыні адукацыі

## Мандат

Мандат Міжнароднай камісіі па будучыні адукацыі зводзіцца да калектыўных разважанняў аб тым, якім чынам можа быць пераасэнсавана адукацыя ў свеце, які робіцца ўсё больш складаным, нявызначаным і нестабільным, і прапаноў аналізу і рэкамендацый у выглядзе вядучага даклада, які можа служыць у якасці парадку дня палітычнага дыялогу і дзеянняў на розных узроўнях. У перспектыве да і пасля 2050 года даклад павінен прапанаваць варыянты бачання і стратэгіі для прыняцця як адукацыйнай палітыкі, так і адукацыйнай практыкі. У рамках працэсу распрацоўкі даклада і ўзаемадзеяння з адпаведнымі зацікаўленымі бакамі з усяго свету Камісія павінна разгледзець, як найлепшым чынам максімізаваць працяглы ўплыў даклада пасля яго апублікавання.

Камісія павінна ўлічваць апошнія геапалітычныя зрухі, паскораную дэградацыю экалогіі і змяненне клімату, змены схемаў чалавечай мабільнасці, а таксама экспаненцыяльныя тэмпы навуковых і тэхналагічных інавацый. У той жа час даклад павінен прадугледжваць і аналізаваць мноства магчымых тэхналагічных, сацыяльных, эканамічных і экалагічных парушэнняў у будучыні, і якім чынам адукацыя можа ўплываць на такія будучыя варыянты, а таксама як яны могуць уплываць на адукацыю.

Камісія ўключыць у свой даклад разважанні аб даўняй прыхільнасці ЮНЕСКА плюралістычнаму, комплекснаму і гуманістычнаму падыходу да адукацыі і ведаў як грамадскага дабра. Камісіі прапанавана аспрэчыць і пераацаніць асноўныя прынцыпы, выкладзеныя ў папярэдніх глабальных дакладах ЮНЕСКА аб адукацыі. У выніку Камісія засяродзіцца на вывучэнні ролі адукацыі, навучання і ведаў у святле велізарных выклікаў і магчымасцяў спрагназаванай, імавернай і пажаданай будучыні.

## Члены

**H. E. Sahle-Work Zewde** (Я. Э. Сахле-Ворк Зеўдэ)
Прэзідэнтка, Федэральная Дэмакратычная Рэспубліка Эфіопія
Старшыня, Міжнародная Камісія па будучыні адукацыі

Сахле-Ворк Зеўдэ (H. E. Sahle-Work Zewde) – першая жанчына, якая 25 кастрычніка 2018 года была абрана на пасаду Прэзідэнта, і пяты Прэзідэнт Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія. Пасля прыходу ў Міністэрства замежных спраў Эфіопіі ў 1988 годзе яна служыла ў якасці Пасла Эфіопіі ў Сенегал з акрэдытацыяй у Каба-Вердэ, Гамбіі, Гвінеі, Гвінеі-Бісаў і Малі; Пасла ў Джыбуці, а таксама ў якасці Пастаяннай прадстаўніцы (ПП) у Міжурадавым органе па развіцці; Пасла ў Францыі з акрэдытацыяй у Марока і Тунісе і ПП у ЮНЕСКА; ПП у Афрыканскім саюзе і Генеральная дырэктарка па афрыканскіх справах.

Прэзідэнтка Сахле-Ворк далучылася да ААН у 2009 годзе і служыла ў якасці Спецыяльнай прадстаўніцы Генеральнага сакратара і Старшыні Аб'яднанага офіса ААН па міратворчасці ў Цэнтральнай Афрыканскай Рэспубліцы. У 2011 годзе яна была прызначана першай спецыяльнай Генеральнай дырэктаркай офіса ААН у Найробі, што адпавядае ўзроўню намесніцы Генеральнага сакратара. У чэрвені 2018 года Генеральны сакратар Антоніу Гутэрыш прызначыў яе Спецыяльнай прадстаўніцай у Афрыканскі саюз і Старшынёй Офіса ААН у АС. Яна была першай жанчынай, якая займала гэтыя пасады ў ААН.

**António Nóvoa** (Антоніу Новоа)
прафесар Педагагічнага інстытута Лісабонскага ўніверсітэта, Партугалія
Старшыня Навукова-праектнага камітэта Міжнароднай Камісіі па будучыні адукацыі

Антоніу Новоа з'яўляецца Ганаровым прэзідэнтам Лісабонскага ўніверсітэта, да гэтага з 2006 па 2013 год ён быў яго прэзідэнтам. Як прафесар педагогікі ён абараніў доктарскія дысертацыі ў Жэнеўскім універсітэце і ў Сарбонскім універсітэце ("Парыж-IV"). Ён атрымаў ступень ганаровага доктара ад шэрагу ўніверсітэтаў. Ён праводзіў семінары і чытаў лекцыі ў больш чым 40 краінах і з'яўляецца аўтарам больш за 200 акадэмічных прац. Зараз Новоа з'яўляецца Паслом Партугаліі ў ЮНЕСКА.

**Masanori Aoyagi** (Масаноры Аоягі)
прафесар-эмерыт, Такійскі ўніверсітэт, Японія

Масаноры Аоягі нарадзіўся ў Даляне, Кітай, у 1944 годзе. У якасці аднаго з вядучых даследчыкаў у галіне гісторыі старажытнагрэчаскага і рымскага мастацтва д-р Аоягі больш за 40 гадоў займаўся раскопкамі міжземнаморскіх руін. Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Такійскага ўніверсітэта ў 1967 годзе ён вывучаў гісторыю класічнага мастацтва і археалогію ў Рымскім універсітэце з 1969 па 1972 год. Ён мае ступень доктара навук па літаратуры. Раней ён займаў пасаду камісара Агенцтва па справах культуры. Зараз ён займае пасаду прэзідэнта Інстытута археалогіі Кашынара ў прэфектуры Нара і старшыні Рады дырэктараў Універсітэта мастацтваў Тама.

**Arjun Appadurai** (Арджун Ападураі)
прафесар-эмерыт Нью-Ёркскага ўніверсітэта ў галіне СМІ, культуры і камунікацый і прафесар глабальнай праграмы Макса Вебера Цэнтра выпускнікоў Барда ў Нью-Ёрку, ЗША

Арджун Ападураі з'яўляецца прафесарам-эмерытам Нью-Ёркскага ўніверсітэта ў галіне СМІ, культуры і камунікацый і прафесарам глабальнай праграмы Макса Вебера Цэнтра выпускнікоў Барда ў Нью-Ёрку. Ён адзін з вядучых аналітыкаў у галіне культурнай дынамікі глабалізацыі. Яго навуковыя інтарэсы тычацца пытанняў разнастайнасці, міграцыі, гвалту і гарадоў. Яго апошняя кніга (у суаўтарстве з Neta Alexander) – "Failure" (выдавецтва "Polity Press", 2019 год).

**Patrick Awuah** (Патрык Авуа)
заснавальнік і прэзідэнт, Універсітэт Ашэсі, Гана

Патрык Авуа – заснавальнік і прэзідэнт Універсітэта Ашэсі ў Гане, які імкнецца прасоўваць афрыканскае адраджэнне праз выхаванне новага пакалення этычных і энергічных лідараў. Пад кіраўніцтвам Патрыка ўніверсітэт спалучае шматдысцыплінарнае ядро з уплывовымі спецыяльнасцямі ў такіх галінах, як бізнес, інфарматыка, інфармацыйныя сістэмы кіравання і інжынерная справа. Патрык з'яўляецца стыпендыятам праграмы Мак-Артура і лаўрэатам педагагічнай прэміі Сусветнага саміту па інавацыях у галіне адукацыі. У 2015 годзе часопіс "Fortune" унёс Патрыка ў спіс 50 самых знакамітых лідараў свету.

**Abdel Basset Ben Hassen** (Абдэль-Басэт бен Хасэн)
прэзідэнт, Арабскі інстытут правоў чалавека, Туніс

Абдэль-Басэт бен Хасэн – прэзідэнт Арабскага інстытута правоў чалавека ў Тунісе. Маючы за плячыма трыццацігадовы досвед настаўніцтва ў галіне правоў чалавека, бен Хасэн распрацоўвае і рэалізуе праграмы ў сферы правоў чалавека і адукацыйных рэформаў у рэгіёне Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. Ён пісаў працы па пытаннях правоў чалавека, адукацыі ў галіне правоў чалавека і культуры і з'яўляўся членам рэдакцыйнага камітэта Дзесяцігоддзя адукацыі ў галіне адукацыі ААН.

**Cristovam Buarque** (Крыстовам Буарке)
прафесар-эмерыт, Бразільскі ўніверсітэт, Бразілія

Крыстовам Буарке атрымаў ступень доктара навук ва ўніверсітэце Сарбоны, пасля чаго шэсць гадоў працаваў у Міжамерыканскім банку развіцця ў Вашынгтоне. Ён заслужаны прафесар і былы рэктар Бразільскага ўніверсітэта. У Бразіліі ён займаў пасады міністра адукацыі, губернатара федэральнай акругі і сенатара рэспублікі. Крыстовам Буарке з'яўляецца піянерам канцэпцыі ўмоўных грашовых пераводаў, звязаных з адукацыяй, і ён мае шмат публікацый аб будучыні базавай і вышэйшай адукацыі, якія тычацца як паляпшэння доступу, так і педагагічных інавацый.

**Elisa Guerra** (Эліза Гуэра)
настаўніца і заснавальніца, каледж Валье-дэ-Філадэльфія, Мексіка

Эліза Гуэра з'яўляецца настаўніцай і заснавальніцай Каледжа Валье-дэ-Філадэльфія ў Мексіцы, а таксама дырэктаркай Інстытутаў дасягнення чалавечага патэнцыялу ў рэгіёне Лацінскай Амерыкі. У 2015 годзе яна атрымала прыз "Лепшы педагог у Лацінскай Амерыцы" ад Міжамериканскага банка развіцця і фонду ALAS, а таксама стала фіналісткай глабальнай прэміі "Настаўнік свету". Эліза мае дзве ступені магістра ад Тэхналагічнага інстытута і вышэйшых навучальных устаноў Мантэрэя (ITESM) і

Гарвардскай вышэйшай школы адукацыі. Яна аўтар 26 кніг і падручнікаў і вельмі цікавіцца пытаннямі дашкольнага навучання, глабальнага грамадзянства і інавацыйнага выкладання.

**Badr Jafar** (Бадр Джафар)
генеральны дырэктар, “Crescent Entreprises”, Аб’яднаныя Арабскія Эміраты

Бадр Джафар – генеральны дырэктар кампаніі “Crescent Enterprises” і прэзідэнт кампаніі “Crescent Petroleum”. Бадр заснаваў “Жамчужную ініцыятыву” – некамерцыйную прыватную арганізацыю, якая займаецца прасоўваннем карпаратыўнай культуры празрыстасці і падсправаздачнасці ў супрацоўніцтве з Упраўленнем ААН па партнёрскіх сувязях. Бадр уваходзіць у кансультацыйныя рады Цэнтра прадпрымальніцтва ў Шарджы і тэхнацэнтра “Gaza Sky Geeks”. Бадр супрацоўнічае з шэрагам навучальных устаноў і ўваходзіць у склад кансультацыйных радаў Бізнес-школы імя Джаджа пры Кембрыджскім універсітэце, Цэнтра развіцця і прадпрымальніцтва “Легатум” пры Масачусецкім тэхналагічным інстытуце, Амерыканскага ўніверсітэта ў Бейруце і Амерыканскага ўніверсітэта ў Шарджы. Бадр – заснавальнік Цэнтра стратэгічнай філантропіі пры Кембрыджскім універсітэце.

**Doh-Yeon Kim** (Дох-Ён Кім)
прафесар-эмерыт Сеульскага нацыянальнага ўніверсітэта, былы міністр адукацыі, навукі і тэхналогій, Рэспубліка Карэя

Дох-Ён Кім выкладаў на кафедры матэрыялазнаўства Сеульскага нацыянальнага ўніверсітэта. Потым ён быў прэзідэнтам Універсітэта Ульсана і Пхаханскага навукова-тэхналагічнага ўніверсітэта. Прафесар Кім таксама трымаў пасады міністра адукацыі, навукі і тэхналогій і старшыні Нацыянальнага навукова-тэхнічнага камітэта Рэспублікі Карэя. Ён цікавіцца зменамі, якія будуць узнікаць у адукацыі і выкладанні ў сувязі з прагрэсам у галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

**Justin Yifu Lin** (Джасцін Іфу Лінь)
дэкан, прафесар, Інстытут новай структурнай эканомікі, Пекінскі ўніверсітэт, Кітай

Джасцін Іфу Лінь – дэкан Інстытута новай структурнай эканомікі, дэкан Інстытута кааперацыі і развіцця ў напрамку “поўдзень-поўдзень”, а таксама прафесар і ганаровы дэкан Нацыянальнай школы развіцця пры Пекінскім універсітэце. Да гэтага ён быў старэйшым віцэ-прэзідэнтам і вядучым эканамістам Сусветнага банка, а таксама дырэктарам і заснавальнікам Кітайскага цэнтра эканамічных даследаванняў пры Пекінскім універсітэце. Ён аўтар шматлікіх кніг па эканоміцы і развіцці.

**Яўген Марозаў**
пісьменнік

Яўген Марозаў – пісьменнік і мысліцель у сферы сацыяльных і палітычных наступстваў інфармацыйных тэхналогій. Ён аўтар кніг “Сеткавы падман” (2011) і “Націсні тут, каб выратаваць усё” (2013). Доктар філасофіі па гісторыі навукі ў Гарвардскім універсітэце; быў запрошаны ў якасці выкладчыка ў Джорджтаўнскі і Стэнфардскі ўніверсітэты. Ён таксама з’яўляецца заснавальнікам медыйнага праекта “The Syllabus”, які імкнецца зрабіць сур’ёзныя і акадэмічныя веды больш даступнымі для грамадства.

**Karen Mundy** (Карэн Мундзі)
дырэктарка Міжнароднага інстытута планавання адукацыі (МІПА) ЮНЕСКА і прафесарка (у водпуску) Таронцкага ўніверсітэта – Інстытута адукацыі ў Антарыа, Канада

Карэн Мундзі – новая дырэктарка Інстытута адукацыйнага планавання ЮНЕСКА і прафесар адукацыйнай палітыкі і лідарства ў Таронцкім універсітэце. Яна вядучы эксперт па пытаннях адукацыі ў менш развітых краінах і былая дырэктарка па тэхнічных пытаннях платформы "Глабальнае партнёрства для адукацыі". Яна трымала пасады старшыні па даследаваннях у Канадзе, намесніка дэкана па даследаваннях і інавацыях, а таксама прэзідэнткі Таварыства параўнальнай і міжнароднай адукацыі. Яна аўтарка 6 кніг і дзясяткаў артыкулаў, раздзелаў кніг і праграмных дакументаў па пытаннях адукацыйных рэформаў і палітыкі, а таксама грамадзянскай супольнасці.

**Fernando M. Reimers** (Фернанда М. Рэймерс)
прафесар, Гарвардская вышэйшая педагагічная школа, ЗША

Фернанда М. Рэймерс – прафесар міжнароднай адукацыйнай практыкі ў Фондзе Форда, а таксама дырэктар Глабальнай ініцыятывы па інавацыях у адукацыі пры Гарвардскай вышэйшай педагагічнай школе. Эксперт па пытаннях адукацыі ў галіне глабальнага грамадзянства; яго праца заснавана на разуменні таго, як трэба выхоўваць дзяцей і моладзь, каб яны маглі дамагчыся поспехаў у XXI стагоддзі. Ён напісаў, рэдагаваў ці ўдзельнічаў у рэдагаванні 40 акадэмічных кніг, а таксама апублікаваў больш за 100 артыкулаў і раздзелаў кніг, якія тычацца значэння адукацыі ў зменлівым свеце. Ён таксама распрацаваў разам з яго камандамі аспірантаў некалькі праектных навучальных праграм у адпаведнасці з Мэтамі ўстойлівага развіцця ААН, якія выкарыстоўваюцца ў школах па ўсім свеце.

**Tarcila Rivera Zea** (Тарсіла Рывера Зэа)
прэзідэнтка, Цэнтр карэнных культур Перу CHIRAPAQ

Тарсіла Рывера Зэа з'яўляецца адной з найбольш прызнаных мясцовых актывістак у Перу і ў свеце. Больш за 40 гадоў яна абараняе правы карэнных народаў разам з CHIRAPAQ – Культурным цэнтрам карэнных народаў Перу, асацыяцыяй, якая спрыяе зацвярджэнню культурнай самабытнасці і асвеце жанчын з ліку карэнных народаў, а таксама маладых лідараў. Яна таксама ўдзельнічае ў Кантынентальнай сетцы жанчын карэнных народнасцей Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі (ECMIA) і ў Міжнародным форуме жанчын з карэнных народаў (FIMI).

**Serigne Mbaye Thiam** (Серэнье Мбае Ціам)
Міністр водазабеспячэння і каналізацыі, Сенегал

Серэнье Мбае Ціам скончыў Руанскую школу бізнесу. У Сенегале ён быў членам парламента, генеральным дакладчыкам па бюджэце, прэс-сакратаром урада, міністрам

вышэйшай адукацыі і даследаванняў і міністрам адукацыі. З траўня 2018 года па верасень 2021 года ён быў віцэ-старшынёй рады дырэктараў Глабальнага партнёрства па адукацыі. Зараз сп. Ціам з'яўляецца міністрам водазабеспячэння і каналізацыі Сенегала.

**Vaira Vike-Freiberga** (Вайра Віке-Фрэйбэрга)
былая Прэзідэнтка Латвіі, зараз сустаршыня, Міжнародны цэнтр Нізамі Гянджэві, Баку, Азербайджан

Д-р Вайра Віке-Фрэйбэрга была Прэзідэнткай Латвіі з 1999 па 2007 год, а таксама прэзідэнткай Сусветнага альянса лідараў ("Мадрыдскага клуба") з 2013 па 2019 год. Яна была Спецыяльнай пасланніцай ААН па пытаннях рэформаў, а таксама ўваходзіла ў шматлікія групы высокага ўзроўню Еўрапейскага звязу. Яна аўтарка 17 кніг і больш за 200 артыкулаў, член пяці акадэмій і ганаровая супрацоўніца Каледжа Вольфсана пры Оксфардскім універсітэце.

**Maha Yahya** (Маха Ях'я)
дырэктарка Сярэднеўсходняга цэнтра Карнегі імя Малькальма Х. Кера

Яе праца ў асноўным засяроджана на пытаннях палітычнага гвалту, палітыкі ідэнтычнасці, няроўнасці, грамадзянства і крызісу ўцекачоў. Яна абараніла дзве доктарскія дысертацыі па сацыялогіі і гуманітарных навуках у Масачусецкім тэхналагічным інстытуце (MIT) і Школе Архітэктурнай асацыяцыі (AA) у Лондане. Яна ўваходзіць у склад шэрагу кансультацыйных радаў і з'яўляецца глабальным членам Трохбаковай камісіі, сустаршынёй Міжнароднай кансультацыйнай рады Інстытута грамадзянскай супольнасці і грамадзянства імя Асфары пры Амерыканскім універсітэце ў Бейруце, а таксама ўваходзіць у Раду дырэктараў Асацыяцыі Ана-Акра.

# Ініцыятыва “Будучыня адукацыі”

## Кансультатыўны савет

Кансультатыўны савет быў упаўнаважаны забяспечваць стратэгічнае кіраўніцтва ЮНЕСКА па ініцыятыве “Будучыня адукацыі” ў цэлым.

**Mr Tariq Al Gurg (Сп. Тарык аль-Гург)**
Генеральны дырэктар, арганізацыя “Dubai Cares”

**Ms Alice P. Albright (Сп. Эліс П. Олбрайт)**
Генеральная дырэктарка, Глабальнае партнёрства для адукацыі (GPE)

**Mr Gordon Brown (Сп. Гордан Браўн)**
Спецыяльны пасланнік ААН па пытаннях глабальнай адукацыі

**Ms Annette Dixon (Сп. Анэт Дзіксан**)
Віцэ-прэзідэнтка па пытаннях чалавечага развіцця, Група Сусветнага банка

**Ms Henrietta Fore (Сп. Генрыета Фор**)
Выканаўчая дырэктарка, ЮНІСЭФ

**Ms Susan Hopgood (Сп. Сюзан Хопгуд)**
Прэзідэнтка федэрацыі “Education International”

**Mr Carlos Moedas (Сп. Карлас Маэдас**)
Камісар па пытаннях даследаванняў, навукі і інавацый, Еўрапейская камісія, 2014–2019

**Mr Matías Rodríguez Inciarte (Сп. Маці**яс Радрыгез Інсіартэ)
Прэзідэнт Універсітэта Сантандэра і віцэ-прэзідэнт сеткі ўніверсітэтаў “Універсія”

**Mr Refat Sabbah (Сп. Рэфат Сабах)**
Прэзідэнт, Глабальная кампанія ў галіне адукацыі

**Mr Jeffrey D Sachs (Сп. Джэфры Д. Сакс**)
Дырэктар, Цэнтр устойлівага развіцця, Калумбійскі ўніверсітэт

**Ms Cecilia Scharp (Сп. Сесілія Шарп)**
Намесніца генеральнага дырэктара, Шведскае агенцтва па пытаннях міжнароднага развіцця

**Mr Andreas Schleicher (Сп. Андрэас Шляйхер)**
Дырэктар, Дырэктарат па пытаннях адукацыі і навыкаў, АЭСР

**Ms Alette Van Leur (Сп. Алет ван Леур)**
Дырэктарка, Дэпартамент сектаральнай палітыкі, Міжнародная арганізацыя працы

**Ms Hilligje van’t Land (Сп. Хільджы ван’т Ланд)**
Генеральная сакратарка, Міжнародная асацыяцыя ўніверсітэтаў

**Ms Yume Yamaguchi (Сп. Юмэ Ямагучы)**
Дырэктарка, Інстытут перспектыўных даследаванняў устойлівасці, Універсітэт Арганізацыі Аб’яднаных Нацый

# Удзельнікі глабальных кансультацый

## Арганізацыі і сеткі

Наступныя недзяржаўныя арганізацыі, арганізацыі грамадзянскай супольнасці, дзяржаўныя органы, акадэмічныя ўстановы і даследчыя арганізацыі, арганізацыі прыватнага сектара, моладзевыя і вучнёўскія арганізацыі і сеткі, а таксама нацыянальныя камісіі ЮНЕСКА прынялі ўдзел у глабальным абмеркаванні пытанняў будучыні адукацыі (2019–2021) праз дыскусіі ў фокус-групах, тэматычныя даклады, вэбінар і іншыя віды дзейнасці. Актуальны спіс арганізацый, якія ўдзельнічаюць у ініцыятыве "Будучыня адукацыі", размешчаны на сайце.

Арганізацыя "СМІ для развіцця Abhivyakti"
Ініцыятыва па акадэмічным і кар'ерным развіцці, Камерун
Рымская акадэмія мастацтваў і новых тэхналогій
Фонд "Adream"
Афрыканская арганізацыя бібліятэчных і інфармацыйных асацыяцый і ўстаноў (AfLIA)
Міжнародны фонд "Agastya"
Агенцтва культурнай дыпламатыі (ACD)
Адкрыты ўніверсітэт Аляма Ікбал
Амаля
Амерыканская псіхалагічная асацыяцыя (APA) пры ААН
Універсітэт Аміты
Арабская кампанія па адукацыі для ўсіх
Арабскі інстытут правоў чалавека
Універсітэт Арыстоцеля ў Салоніках
Універсітэт штата Арызона
Ашока
Асацыяцыя базавай адукацыі і адукацыі дарослых у Азіяцка-Паўднёва-Ціхаакіянскім рэгіёне (ASPBAE)
Іспанская асацыяцыя Мантэсоры
Асацыяцыя бацькоў-адвентыстаў за развіццё адукацыі (APADE)
Асацыяцыя за альтэрнатывы ўстойлівага развіцця (ASDA)
Міжнародная асацыяцыя студэнтаў эканамічных і камерцыйных навук (AIESEC)
Міжнародная асацыяцыя Мантэсоры, ЗША (AMI/USA)
Міжнародная асацыяцыя Мантэсоры (AMI), Расія
Міжнародная асацыяцыя Мантэсоры (AMI), Чорная Афрыка
Міжнародная асацыяцыя Мантэсоры (AMI), Злучанае Каралеўства
Асацыяцыя Мантэсоры, Тайланд
Нігерыйская асацыяцыя педагогаў за развіццё (ANED)
Універсітэт Атабаскі
Сацыяльнае прадпрыемства "AzCorp Entertainment"
Бангладэшская нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА
Банладэшскі моладзевы форум
Пекінскі педагагічны ўніверсітэт
Сацыяльнае прадпрыемства "Bilingualism Matters"
Сацыяльнае прадпрыемства "Bilingualism Matters", Сіенскі філіял, Сіенскі ўніверсітэт для іншаземцаў
Кампанія "biNu"

Рада Еўрапейскіх студэнтаў тэхнічных ВНУ
Арганізацыя “Brainwiz”
Праект “Bridge 47”
Камерунская міжнародная мадэль ААН
Канадская камісія па справах ЮНЕСКА (CCU)
Дэпартамент занятасці і сацыяльнага развіцця Канады (ESDC)
Грамадскі рух “Catalyst 2030”
Цэнтр ініцыятывы па развіцці адукацыі і набыцці навыкаў
Цэнтр зацікаўленага прадбачання
Цэнтр міжкультурнага дыялогу
Міжнародны каталіцкі цэнтр па супрацоўніцтве з ЮНЕСКА (CCIC)
Цэнтр параўнальных і міжнародных даследаванняў у галіне адукацыі (CIRE)
Цэнтр даследаванняў уплыву на адукацыю (REDI) пры Універсітэце Дыкіна
Цэнтр моладзі і развіцця, Малаві
Цэнтр даследаванняў у галіне вышэйшай адукацыі, Папскі каталіцкі ўніверсітэт Рыу-Гранды-ду-Сул (PUCRS)
Цэнтр навуковых, акадэмічных і аспіранцкіх даследаванняў, Мексіка
Цэнтр сацыяльна-асветніцкіх даследаванняў і дзеянняў – CIASES
Усходні рэгіянальны настаўніцкі цэнтр – Мальданада
Паўднёва-Заходні рэгіянальны настаўніцкі цэнтр – Калонія
Дыпламаваны педагагічны каледж
Кампанія “Cinglevue”
Грамадскія адукацыйныя партнёрствы, Усходні Тымор
Кліматычная камісія за вышэйшую і дадатковую адукацыю ў Вялікабрытаніі
Моладзевая сетка “Кліматычная разумная сельская гаспадарка” (CSAYN)
Кааліцыя за развіццё адукацыі, Шры-Ланка
Калектыўная кансультацыя недзяржаўных арганізацый
Педагагічны каледж Калумбійскага ўніверсітэта
Камісія Коста-Рыкі па супрацоўніцтве з ЮНЕСКА
Іспанская нацыянальная камісія па супрацоўніцтве з ЮНЕСКА
Сусветны камітэт па навучанні на працягу жыцця
Нацыянальная камісія па справах адукацыі, навукі і культуры, Алжыр
Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, Ангола
Нацыянальная камісія па супрацоўніцтве з ЮНЕСКА, Гаіці
Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, Лаос
Нацыянальная камісія па справах адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Ліван
Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, Мадагаскар
Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, Руанда
Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, Швейцарыя
Таварыства параўнальнай і міжнароднай адукацыі (CIES)
Азіяцкае таварыства параўнальнай адукацыі (CESA)
Рада педагагічнай адукацыі, Нацыянальная адміністрацыя народнай асветы (ANEP), Уругвай
Вышэйшая школа дзяржаўнага кіравання і кіравання развіццём пры Філіпінскай акадэміі развіцця
Пастаяннае прадстаўніцтва Швейцарыі ў ЮНЕСКА і ў міжнароднай арганізацыі “Франкафонія”
Дэпартамент агульнай і дашкольнай адукацыі, Міністэрства адукацыі, Азербайджан
Некамерцыйная арганізацыя “Дзеянні ў мэтах развіцця без межаў – NABA’A”
Універсітэт “Дуракіт Пандыт”
Міжамерыканскі дыялог
Арганізацыя “Dream a Dream”
Інстытут міжнароднага супрацоўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў (Германія)
Грамадская сетка за рэформы адукацыі “E-Net”, Філіпіны

Ініцыятыва “Адукацыйныя экасістэмы $e^2$”
ED, Уэльс
Куратарская праграма EDUCAFIN
Кааліцыя “Адукацыя для ўсіх”, Самалі
Міжнародная некамерцыйная арганізацыя “Адукацыя для незалежнага свету”
Федэрацыя “Міжнародная адукацыя”
Група “Адукацыя, даследаванні і інавацыі” (EDRAC)
Ініцыятыва “Адукацыя+”
Сетка для будучыні адукацыі (EFN), Педагагічная школа, Брыстальскі ўніверсітэт
Непальскі цэнтр развіцця адукацыйных рэсурсаў (ERDCN)
Грамадская арганізацыя “Eidos Global”
Рух “Emmaus International”
Студыя “Epiphany Labs”
Студэнцкая сетка “Эразмус”
Моладзевая сетка “Адукацыя для ўстойлівай будучыні”, Японія
Еўрапейская супольнасць дэмакратычнай адукацыі
Еўрапейская асацыяцыя студэнтаў-стаматолагаў (EDSA)
Еўрапейская асацыяцыя бацькоў (EPA)
Еўрапейская студэнцкая сетка
Еўрапейскі студэнцкі звяз
Еўрапейскі моладзевы форум
Экспертны кансультатыўны савет па трансфармацыйнай адукацыі Аўстрыйскай камісіі па справах ЮНЕСКА
Фінскія недзяржаўныя арганізацыі, якія працуюць у галіне развіцця – Fingo
Фінская нацыянальная рада адукацыі
Арганізацыя “Firenze Fiera”
Фонд працаўладкавання моладзі Уганды
Франклінскі ўніверсітэт
Фонд Галуста Гюльбенкяна
Фонд Мустакісаў
Фонд Санціляна
Праграма падрыхтоўкі настаўнікаў “Галілеа” (GTTP)
Генеральная дырэкцыя планавання, Міністэрства адукацыі Балівіі
Даследчая платформа “GeoPoll”
Нямецкая камісія па справах ЮНЕСКА
Партнёрства “Girls Not Brides AR”
Асацыяцыя “Дадзім надзею безнадзейным” (GHTHA)
Глабальная кампанія для адукацыі
Міжнародная моладзевая арганізацыя “Global Changemakers”
Глабальны Альянс “Уплыў адукацыйных тэхналогій”
Глабальная сетка па адукацыйнай палітыцы
Праграма “Global Hands-On Universe” (GHOU)
Глабальная педагагічная сетка – далучэнне да рэфармацыі (GPENreformation)
Глабальная сетка ўніверсітэтаў за інавацыі (GUNi)
Арганізацыя “Маладыя зялёныя свету”
Ініцыятыва “Grow Waitaha – Ōtautahi” (Крайстчэрч, Новая Зеландыя)
Грэцкая асацыяцыя па прасоўванні рыторыкі ў адукацыі HundrED
Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА, Інданезія
Ініцыятыва за артыкул 12 Канвенцыі аб правах дзіцяці (InArt12)
Праект “Innovazing Vision”
Інстытут даследаванняў народанасельніцтва і сацыяльнай палітыкі, Нацыянальная даследчая рада Італіі
Педагагічны інстытут, Лісабонскі ўніверсітэт
Педагагічны ўніверсітэт – Роча
Політэхнічны інстытут у Бежы і Партугальскі ўніверсітэт гуманітарных навук і тэхналогій у Лісабоне (ULHT)
Міжнародная асацыяцыя ўніверсітэтаў (IAU)
Міжнародны цэнтр інавацый у сферы вышэйшай адукацыі пад эгідай ЮНЕСКА (UNESCO-ICHEI)
Міжнародны цэнтр сеткі асацыяваных школ ЮНЕСКА (ICUA), Кітай
Міжнародная рада вышэйшай адукацыі (ICAE)

Міжнародная рада адкрытай і дыстанцыйнай адукацыі (ICDE)

Міжнародная асацыяцыя развіцця адукацыі, Шатландыя (IDEAS)

Міжнародныя мадэлі ААН

Міжнародная асацыяцыя студэнтаў-фармацэўтаў (IPSF)

Міжнароднае таварыства адукацыі праз мастацтва (InSEA)

Міжнародная моладзевая рада

Міжнародны ўніверсітэт і каледжы INTI

Дабрачынная арганізацыя "Isa Viswa Prajnana Trust"

Усеагульны дзяржаўны інстытут "Perna – Alighieri", Авеліна

Дзяржаўны прафесійны інстытут харчова-вінаробнага і гасцінічнага абслугоўвання "R. Virtuoso", Салерна

Камісія па пытаннях адукацыі і камунікацыі, Міжнародны звяз аховы прыроды

Каганга: глабальны альянс сацыяльна-эмацыйнага навучання і жыццёвых навыкаў

Група "Kidskintha"

Карэйская нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА

Міжнародная асацыяцыя ўніверсітэцкіх прафесараў і дацэнтаў – IAUPL

Міжнародная арганізацыя за права на адукацыю (OIDEL)

Сусветная арганізацыя за дашкольную адукацыю (OMEP)

Латвійская нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА

Дабрачынная арганізацыя "Навучанне праз ландшафты"

Ліванскі ўніверсітэт (LU)

Хакерспейс "Прытулак стваральніка"

"Me2Glosses", філіял "Bilingualism Matters" у Салоніках

Праект "Міленіум"

Міністэрства народнай асветы, Гаіці

Міністэрства адукацыі, Лаоская НДР

Міністэрства адукацыі, Руанда

Міністэрства адукацыі, Італія

Міністэрства адукацыі і навукі, Латвійская Рэспубліка

Міністэрства адукацыі, Квебек

Міністэрства адукацыі, Беларусь

Міністэрства адукацыі, Бутан

Міністэрства адукацыі, Эквадор

Міністэрства адукацыі, даследаванняў і рэлігіі, Грэцыя

Міністэрства адукацыі, Румынія

Міністэрства замежных спраў, Партугалія

Міністэрства народнай асветы, Інданезія

Асацыяцыя Мантэсоры, Тайланд

Мантэсоры, Мексіка

Міжнародны рух "ATD Quart Monde"

Нацыянальная кампанія за адукацыю, Непал

Нацыянальная камісія Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі па справах ЮНЕСКА

Нацыянальная камісія Кітайскай Народнай Рэспублікі па справах ЮНЕСКА

Нацыянальны інстытут планавання і адміністрацыі адукацыі, Індыя

Нацыянальная моладзевая рада, Індыя

Нацыянальная моладзевая рада, Мальта

Нацыянальная моладзевая рада, Намібія

Агенцтва "Neo-bienêtre"

Сетка міжнароднай палітыкі і супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі (NORRAG)

Сетка цэнтраў адукацыйнай палітыкі

Арганізацыя "Стварэнне сувязяў для інтэграцыі задачы 4.7 МУР і сацыяльна-эмацыйных навыкаў у адукацыйныя матэрыялы" (NISSEM)

Паўночнаамерыканская асацыяцыя настаўнікаў Мантэсоры

Паўночна-Заходні ўніверсітэт

Група "Oceane"

Міжнароднае бюро каталіцкага навучання (OIEC)

Канцылярыя пасланніка Генеральнага сакратара па справах моладзі (ААН)

Ініцыятыва “Майстэрня будучай адукацыі”

Універсітэт Акаямы

Рада па справах адукацыі горада Амута, Японія

Фонд “Адна сям’я”

Фонд “Наш Ганконг”

Некамерцыйная арганізацыя “Па-за кнігамі”

Некамерцыйная арганізацыя “Людзі для адукацыі”

Пастаянная дэлегацыя Каралеўства Саудаўскай Аравіі ў ЮНЕСКА

Пастаянная дэлегацыя В’етнама ў ЮНЕСКА

Перуанская нацыянальная камісія па супрацоўніцтве з ЮНЕСКА

Філіпінскае таварыства “Разважанні аб будучыні”

Філіпінскае таварыства дзяржаўнай адміністрацыі

Польская нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА

Кампанія “Адукацыя ў Портлендзе”

Партугальская нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА

Партугальская сетка навучальных суполак (Rede CAP)

Міжнародны траставы фонд Прынца

Фонд “За будучыню”

Дабрачынная арганізацыя “Падыходы да аховы”

Праект “Сінэргіі развіцця адукацыі”

Рэгіянальная сетка інклюзіўнай адукацыі

Рэгіянальны цэнтр планавання адукацыі (RCEP)

Цэнтр “РэСурс” пры Бурэнскім каледжы мастацтваў

Міжнародная арганізацыя “RET”

Суполка нацыянальных дыялогаў “Rete”

Асацыяцыя “Дасягненне роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі”

Ініцыятыва “Права на адукацыю”

Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт

Сантандэрскія ўніверсітэты

Міжнародная арганізацыя “Scholas Occurrentes”

Парыжскі інстытут палітычных даследаванняў, кампус Пуацье

Кіруючы камітэт, Мэта ўстойлівага развіцця ў галіне адукацыі да 2030 года

Суполка “ShapingEDU”, Універсітэт штата Арызона

Славенская недзяржаўная арганізацыя “Платформа для развіцця глабальнай адукацыйнай і гуманітарнай дапамогі” (SLOGA)

Таварыства міжкультурнай адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі і даследаванняў (SIETAR)

Педагагічная сетка за ўстойлівае развіццё адукацыі ў Паўднёва-Усходняй Азіі (SEA-ESD)

Ініцыятыва па стратэгіі і інавацыях для развіцця

Адукацыйны фонд “Вучэбная зала”

Падкамітэт па справах дзяцей-мігрантаў і ўцекачоў, Камітэт НДА па міграцыі

Паўднёва-заходні цэнтр крэатыўнай адукацыі, Бат-Спаўскі ўніверсітэт

Шведская асацыяцыя дыстанцыйнай адукацыі (SADE)

Шведская асацыяцыя дыстанцыйнага навучання, Хэрнёсанд

Шведская нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА

Агенцтва “Sweducation”

Швейцарскае агенцтва развіцця і супрацоўніцтва (SDC)

Te Pū Tiaki Mana Taonga / Асацыяцыя педагогаў за межамі класа

Праграма “Вучыць для Ліберыі”

Універсітэт Тамасат

Арабская сетка народнай асветы / экуменістычны праект па народнай асвеце – Ліванская кааліцыя “Адукацыя для ўсіх”

Навукова-даследчы і аналітычны цэнтр “Дыялог”

Фонд “The Edge”

Універсітэт Джорджа Вашынгтона

Фонд міру “Гоі”

Фонд “Хамдан”

Інстытут інавацый, Аўстралія

Міжнародны інстытут даследаванняў і

нарошчвання патэнцыялу вышэйшай адукацыі (IIHEd), Глабальны ўніверсітэт О. П. Джындала

Міжнародная аператыўная група “Настаўнікі за адукацыю 2030”

Праект “Міленіум”

Міністэрства адукацыі Кітайскай Народнай Рэспублікі

Філіял Міжнароднай асацыяцыі Мантэсоры ў Вялікабрытаніі, Злучанае Каралеўства

Кампанія “Tybed”

Нарвежская асацыяцыя ААН

Філіпінская нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА

Форум аб будучыні адукацыі “Unescocat”

Амерыканская асацыяцыя ААН

Інстытут перспектыўных даследаванняў устойлівасці Універсітэта Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (UNU-IAS)

Кордаўскі каталіцкі ўніверсітэт

Нацыянальны ўніверсітэт Трэцяга Лютага

Універсітэт Трэцяга Лютага

Універсітэт Сержы

Універсітэт Лаваля

Брыстальскі ўніверсітэт

Дандыйскі ўніверсітэт

Эдынбургскі ўніверсітэт

Латвійскі ўніверсітэт

Лідскі ўніверсітэт

Мэрылендскі ўніверсітэт у Каледж-Парку

Універсітэт Осла

Пірэйскі ўніверсітэт

Саленскі ўніверсітэт

Сетка “Універсітэт будучыні”

Тлемсенскі ўніверсітэт

Універсітэцкі каледж BIA

В’етнамская асацыяцыя за адукацыю для ўсіх

Прадстаўніцтва студэнтаў Вільнюскага ўніверсітэта

Група “Visionary Education”

Дабрачынныя арганізацыі “Галасуй за школы” і “Падыходы да аховы”

Сусветная рада па міжкультурных і глабальных кампетэнцыях

Сусветная арганізацыя сям’і (Паўднёваафрыканскі і еўрапейскі рэгіён)

Сусветная федэрацыя даследаванняў будучыні (WFSF)

Сусветная група па эўтагогіцы, Лонданская лабараторыя ведаў

Сусветная моладзевая асамблея

Ельскі ўніверсітэт

Ёркскі ўніверсітэт

Таварыства маладых дыпламатаў (YDS)

Моладзевая асацыяцыя развіцця аграрнага і марскога сектараў (YAMDA)

Карпарацыя маладых прадпрымальнікаў, Дэмакратычная Рэспубліка Конга (YEC-DRC)

Партнёрства “Дзень без вады”

## Школы

Наступныя школы правялі дыскусіі і сустрэчы фокус-груп з вучнямі, настаўнікамі і (або) бацькамі ў кантэксце ініцыятывы “Будучыня адукацыі”. Звярніце ўвагу, што многія пералічаныя ніжэй школы ўваходзяць у Сетку асацыяваных школ ЮНЕСКА (ASPnet).

**Алжыр**

Каледж сярэдняй адукацыі імя Ахмеда Зазуа Джыджэля

Школа братоў Самет Бліда

Прыватная школа Эль-Авэль-Анаба

Прыватная школа Цытадэлі ведаў, Алжыр

**Ангола**

Політэхнічны сярэдні інстытут імя Альда Лары

Цэнтр прафесійнай адукацыі

Каледж імя Грэгорыя Семеды

Індустрыяльны політэхнічны інстытут у Кілама Кіяксі № 8056 “Новае жыццё”

Каледж Жасімар

Ліцэй Нгола Кілуанжы № 1145

Ліцэй № 8054 – даўніверсітэцкі цэнтр "Нова Віда"

Сярэдні прамысловы інстытут у Луандзе

Сярэдні тэхнічны інстытут гасцінічнай гаспадаркі і турызму № 2009

Сярэдні эканамічны інстытут у Луандзе

Сярэдні інстытут адміністравання і менеджменту № 8055 "Новае жыццё" (IMAG-Nova Vida)

Сярэдняя школа імя Муту-я-Кевелы

Пачатковая школа імя Хасэ Марці № 1136

Пачатковая школа № 1134 – былая 1050

Публічная школа № 1140 (былая 1058) імя Першага мая

Публічная школа № 1122 (былая 1107) – у Байру Азул

Сярэдняя школа "Моладзь у барацьбе" № 1057 – былая 2033

Школа падрыхтоўкі медыцынскіх тэхнікаў у Луандзе

**Азербайджан**

Бакінскі еўрапейскі ліцэй

Сучасны адукацыйны комплекс

Школа № 220 імя Арастуна Махмудава

Школа-ліцэй № 6 імя Т. Ісмаілава

**Бангладэш**

Каледж імя Абу Зар аль-Гіфары, Дака

Кантонменцкі каледж імя Адамджы

Дзяржаўная дзявочая школа-каледж у Азімпуры, Дака

Бангладэшская міжнародная школа-каледж, Махакхалі, Дака

Кембрыйская школа-каледж, Дака

Дакскі камерцыйны каледж, Дака

Дакскі мадэльны каледж-інтэрнат

Інжынерная ўніверсітэцкая школа-каледж, Дака

Дзяржаўны бенгальскі каледж, Мірпур, Дака

Дзяржаўны мемарыяльны каледж Бхіку, Манікгандж

Дзяржаўная лабараторная сярэдняя школа, Дака

Мадарыпурскі дзяржаўны каледж, Мадарыпур

Муншыганджскі дзяржаўны жаночы каледж, Муншыгандж

Удаянская сярэдняя школа старэйшай ступені, Дака

**Беларусь**

Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны, г. Мінск

Мінская гімназія № 2

Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Гімназія № 33, г. Мінск"

Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Гродзенская гарадская гімназія"

Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа № 201, г. Мінск"

Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Гімназія № 50, г. Мінск"

Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сноўская сярэдняя школа"

Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Мінская гімназія № 12"

Гімназія № 2, г. Орша

**Канада**

Школы Таронцкага ўніверсітэта

**Кітай**

Сярэдняя школа малодшай ступені, Хайнань

Сярэдняя школа вышэйшай ступені № 2, Ледун-Хуанлю

Сярэдняя школа вышэйшай ступені пры Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэце

Сярэдняя школа вышэйшай ступені № 2, Цындаа

Сярэдняя школа вышэйшай ступені, Шанхай

Школа імя Сун Цынлін, Шанхай

Эксперыментальная сярэдняя школа вышэйшай ступені пры Пекінскім педагагічным універсітэце

Сярэдняя школа вышэйшай ступені пры Кітайскім народным універсітэце

**Калумбія**

Асветніцкая карпарацыя “Хвіліна Божая”

**Коста-Рыка**

Экалагічны каледж, Пехібае

Каледж, Сэдрас

Каледж, Санта-Ана

Кастарыканскі гуманістычны каледж – кампус Нікоя

Каледж Юрусці

Прафесійна-тэхнічны каледж, Аросі / Інстытут правінцыі Алахуэла

Прафесійна-тэхнічны каледж, Турубарэс

Прафесійна-тэхнічны каледж імя Дона Боска

Школа імя Кармэн Ліры

Школа імя Караліны Дэнт-Альварада

Цэнтральная школа, Трэс-Рыас

Школа, Палома

Дзіцячая школа “Ойча наш”, Сан-Хасэ

Школа пры Нацыянальным інстытуце жыллёвага будаўніцтва і ўрбанізму, Лас-Каньяс

Школа імя Хасэ Кубера Муньёс

Школа імя Хасэ Рыкарда Орлік-Заморы

Школа імя Хуана Флорэс-Уманья

Школа “Ла-Фуэнтэ”

Школа Гран-Самарыя

Школа лідараў, Дайтонія-Таламанка

Школа лідараў, Сэктар-Нортэ

Школа ААН

Школа Сан-Францыска

Школа імя Томаса Джэферсана

Навуковая школа-каледж Цэнтра даследаванняў трапічнай сельскай гаспадаркі і вышэйшай адукацыі

Школа Залатой даліны

Педагагічны інстытут пры Нацыянальным універсітэце (UNA)

Ліцэй, Асэры

Ліцэй імя Марыё Борна, Лімон

Школа імя святога Антонія

Школа імя святога Грыгорыя

Школа імя святога Іуды

Заходні каледж

**Данія**

Гандлёвая школа, Ольбарг

Саборная школа, Ольбарг

Дзяржаўная гімназія, Орхус

Школа, Абсалонс

Грамадская школа Ольмінд-Віуф

Гімназія, Ольсунд

Школа-інтэрнат, Оскаў

Сельскагаспадарчая школа, Асмільдскае абацтва

Гімназія “Аўрэхой”

Яслі-школа “Дзіцячы свет”, Борынг

Школа-інтэрнат і гімназія, Багсверд

Школа “Брэдагер”

Паўднёвы бізнес-каледж

Кампус Елінг, Універсітэцкі каледж Малога Бельта

Цэнтр прафесійнага навучання, Лолан і Фальстэр

Гімназія, Крысціяхаўнс

Гімназія, Эга

Школа, Эгтвед

Школа і дзіцячы садок, Элтанг

Школа, Эндруп

Гімназія і сярэдняя школа, Эспергердэ

Паўночны цэнтр прафесійнай адукацыі “Паўночны”

Паўночна-заходні цэнтр прафесійнай адукацыі

Паўднёвы цэнтр прафесійнай адукацыі

Школа-інтэрнат, Факсэхус

Гімназія, Гамель-Гелеруп

Гімназія “Геф’ён”

Гімназія, Гладсаксэ

Саборная школа, Хадэрслеў

Школа-інтэрнат, Хан Херэд

Цэнтральная школа, Хельсінгёр

Школа дадатковай адукацыі, Фюн

Школа, Холюф-Піле

Бізнес-каледж кампаніі IBC
Гімназія-школа імя Інгрыды Есперсен
Незалежная школа, Елінг
Школа, Юэльсміндэ
Каледж Кольда
Школа-інтэрнат, Лангелан
Школа “Лёрнмарк”
Школа, Малы Бельт
Школа, Ліндберг
Школа “Меркантэк”
Гімназія і сярэдняя школа, Нествед
Школа “NEXT”
Міжнародная гімназія імя Нільса Брока
Школа, Ніво
Паўночная гімназія
Саборная школа, Нюкёбінг
Саборная школа, Одэнсэ
Школа, Ольстэд
Гімназія, Падэруп
Школа, Підэрсборг
Прафесійнае вучылішча, Паўночны ўніверсітэцкі каледж
Прафесійнае вучылішча, Цэнтральны ўніверсітэцкі каледж
Дэпартамент сацыяльных спраў і аховы здароўя, Ранерс
Школа, Ранцаўсміндэ
Школа-інтэрнат, Ранум
Школа, Ранум
Гімназія “Рэдкіле”
Гімназія, Роскіле
Тэхнічная школа, Роскіле
Школа, Скоўбрынё
Школа “Сёнерскоў”
Школа, Сортэдам
Эсбергская сацыяльная і медыцынская школа
Паўночная сацыяльная і медыцынская школа
Паўднёвая сацыяльная і медыцынская школа
Школа, Стор Маглебю
Пляжная школа
Тэх-Каледж
Бізнес-школа “Цітген”
Гандлёвая школа, Цёнэр
Акадэмія бізнесу “Традыюм”
Асацыяцыя “U/Nord”
Заходне-Хімерландская гімназія
Навучальная ўстанова “Відэн Джурс”
Цэнтр адукацыі дарослых “Сторстрам”
Зеланцкі бізнес-каледж

**Фінляндыя**

Сярэдняя школа, Альпіла
Шведская агульнаадукацыйная школа, Поры
Школа завочнага навучання “Кулькуры”
Сярэдняя школа вышэйшай ступені, Хаапаярвіі
Сярэдняя школа малодшай ступені, Хаапаярвіі
Лінгвістычная сярэдняя школа, Хельсінкі
Педагагічная школа Хельсінкскага ўніверсітэта
Ліцэй, Ісалмі
Хрысціянскі каледж, Ювяскюля
Ліцэй-каледж, Ювяскюля
Педагагічная школа, Ювяскюля
Школа імя К. Ю. Стольберга
Сярэдняя школа, Кайта
Школа, Келон
Школа, Кірхдорф, Кемпеле
Аб’яднаная школа імя Кільпінена
Сярэдняя школа “Лааніла”
Сярэдняя мастацкая школа, Лапінлахці
Сярэдняя школа ў Ліцэйскім парку
Сярэдняя школа, Малелянрынтэ
Сярэдняя школа, Орывесі
Педагагічная школа, Оўлу
Педагагічны ліцэй (школа), Оўлу
Фінская кааператыўная школа, Оўлу
Школа “Путаа”
Педагагічная школа, Раўма
Прафесійна-тэхнічны каледж, Сайма Сампа
Фінска-руская школа
Педагагічная школа пры ўніверсітэце Тамперэ
Школа, Цікала

Сярэдняя школа, Туусула

Ліцэй-школа, Васа

**Германія**

Школа імя Альберта Швейцэра, Хофгайсмар

Школа імя Эдзіты Штайн, Равенсбург і Аўлендорф

Свабодная вальдорфская школа, Карлсруэ

Агульнаадукацыйная школа, Брэмен-Мітэ

Школы камерцыйнай і хатняй эканомікі і сацыяльнай дапамогі, Эмендзінген

Школа імя Генрыха Герца, Гамбург

Гімназія “Ільталь”, Ілінген

Школа “Лімес”, Ідштайн

Гімназія імя Макса Планка, Берлін

Гімназія імя Остэндорфера, Ноймаркт

Школа імя Сафі Шоль, Берлін

Муніцыпальная рэальная школа “Ім Клеўхен”

Варнцкая гімназія, Фёльклінген

**Грэцыя**

1-я сярэдняя школа малодшай ступені, Серэ

1-я сярэдняя школа вышэйшай ступені, Іерапетра

2-я сярэдняя школа вышэйшай ступені, Еракас

2-я сярэдняя школа малодшай ступені, Еракас

2-я сярэдняя школа вышэйшай ступені, Ханья

2-я сярэдняя школа вышэйшай ступені, Серэ

2-я прафесійна-тэхнічная сярэдняя школа вышэйшай ступені, Рэтымнан

4-я сярэдняя школа малодшай ступені, Амарусіён

4-я сярэдняя школа вышэйшай ступені, Серэ

5-я сярэдняя школа малодшай ступені, Айія-Параскеві

Амерыканскі каледж “Пірс”

Сярэдняя школа малодшай ступені імя Арыстоцеля, Серэ

Сярэдняя школа малодшай ступені імя Дукаса

Эксперыментальная сярэдняя школа малодшай ступені, Рэтымнан

Эсперыментальная пачатковая школа, Серэ

Сярэдняя школа малодшай ступені – Афінскі каледж

Сярэдняя школа малодшай ступені Успення Прасвятой Багародзіцы, Серэ

Сярэдняя школа малодшай ступені – каледж “Псіхіка”

Музычная школа, Серэ

Сярэдняя школа малодшай ступені “Пратыпа”

Сярэдняя школа малодшай ступені “Пратыпа”, Анаўрыта

Сярэдняя школа малодшай ступені імя Раліса, Пірэй

Сярэдняя школа вышэйшай ступені, Пентапалі, Серэ

Сярэдняя школа малодшай ступені імя Загар’янакаса

**Гватэмала**

Аграрна-прамысловы кааператыў “Новае світанне”

**Гаіці**

Каледж, Катубанама

Каледж, Кот-Пляж

**Інданезія**

Сярэдняя лабараторная школа Кэбаяран

**Італія**

Дзяржаўны тэхнічны камерцыйна-турыстычны інстытут імя Віктара Эмануіла, Бергама

**Японія**

Сярэдняя школа малодшай ступені, Амагі

Пачатковая школа, Аманахара

Пачатковая школа, Гінсуй

Сярэдняя школа малодшай ступені, Хака

Пачатковая школа, Хаямадаі

Пачатковая школа, Хаяме

Пачатковая школа, Хірабару

Пачатковая школа, Каміучы

Сярэдняя школа малодшай ступені, Кунугі

Пачатковая школа, Куранага

Сярэдняя школа малодшай ступені, Мацубара

Пачатковая школа, Мейджы

Пачатковая школа, Мііке

Пачатковая школа, Міната

Сярэдняя школа малодшай ступені, Міянахара

Пачатковая школа, Накатома

Пачатковая школа, Амута-Чво

Школа спецыяльнай адукацыі з асаблівым доглядам, Амута

Пачатковая школа, Сіракава

Сярэдняя школа малодшай ступені, Тачыбана

Пачатковая школа, Тайсо

Пачатковая школа, Такаторы

Сярэдняя школа малодшай ступені, Такуха

Сярэдняя школа малодшай ступені, Такума

Пачатковая школа, Тамагава

Пачатковая школа, Тэгама

Пачатковая школа, Тэнрыё

Пачатковая школа, Ёсіна

**Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка**

Каледж, Сісатанак

Каледж, Сісавад

Пачатковая школа, Нахайдзяа

Пачатковая школа, Пхонпапаа

Пачатковая школа, Пхонпханаа

Пачатковая школа, Пхонтхан

Пачатковая школа, Сокпалаўанг

Сярэдняя школа, Чампасак

Сярэдняя школа, Пхіават

Ліцэй, Чантхабаўлі

Ліцэй імя Ха Шы Міна, В’енцьян

Сярэдняя школа, В’енцьян

**Ліван**

Школа “Ахлія”

Сярэдняя школа “Аль-Каўтар”

Сучасная школа “Аль-Манар”, Рас эль-Метн

Цэнтральны каледж, Джунія

Французскі каледж Святой Сям’і, Фанар

Каледж сясцёр Найсвяцейшага Сэрца, Буршрыя

Каледж Маці Божай, Джамхур

Пратэстанцкі французскі каледж “Мантана”, Дзік эль-Мэхдзі

Каледж святога Грыгорыя, Бейрут

Установа святой Ганны Безансонскай, Бейрут

Каледж “Грынфілд”, Бейрут

Школа імя Бахаа Эддзіна Харыры, Сайда

Фонд імама Садра – школа “Рэхаб аль-Захраа”

Сучасны ліванскі інстытут – каледж імя айца Мішэля Халіфе, Фанар

Міжнародны каледж, Бейрут

Школы Ісламскай філантрапічнай асацыяцыі “Амліе”

Школы Ліванскага ордэну маранітаў (OLM)

Школа, Бейрут

Школа “Макасэд Алі бен-Талеб”, Бейрут

Прасвятая Багародзіца Дабравешчання, Рмаіш

Сярэдняя школа старэйшай ступені імя Рафіка Харыры, Сайда

Сярэдняя школа старэйшай ступені імя Марыі Маці Мудрасці, Айн-Саадэ

**Мадагаскар**

Агульнаадукацыйны каледж, Амбохіманарына

Агульнаадукацыйны каледж, Антанімена

Агульнаадукацыйны каледж, Нанісана

Прыватны каледж “ESSOR”

Прыватны каледж “Калумба”, Амбатамаінты

Прыватны каледж “Пятуння”

Прыватны каледж “Княжацкі палац”

Прыватная школа “Пінокіа”

Дзяржаўная пачатковая школа Амбатаманаіна Лавасоа

Дзяржаўная пачатковая школа, Амбахідроа 1

Дзяржаўная пачатковая школа, Беравіна

Ліцэй, Андрыянампаінімерына Сабоці-намехана

Ліцэй імя Гарацыя Франсуа, Анталаха

Ліцэй імя Жана-Жазефа Рабеарывела

Ліцэй, Мьярынарыва-Ітасі

Ліцэй, Нанісана

Ліцэй імя Наверсона, Фіянаранцоа

Прыватны ліцэй "Лісічка", Сабоці-Намехана

Прыватны ліцэй "Маленькія херувімы"

Ліцэй, Талатаматы

**Мексіка**

Каледж Валле-дэ-Філадэльфія

Інстытут "Альпес" імя святога Ксаверыя

Тэхнічная школа імя Эўхеніа Гарза Сада

**Нарвегія**

Школа Штэйнера, Цёнсберг

**Пакістан**

Граматычная школа, Карачы

**Перу**

Перуанска-нямецкі каледж імя Макса Уле

Навучальная ўстанова імя Хорхэ Басадрэ, Хунін

Дзяржаўны вышэйшы педагагічны інстытут імя Тэадора Пенялозы, Хунін

**Партугалія**

Групоўка школ імя Дзініша, Куартэйра

Групоўка школ, Баталья

Групоўка школ Сэ, Ламегу

Дыяцэзіяльны каледж Маці Божай Увядзення, Калван

Школа EB/123 імя Барталамеа Перастрэла, Фуншал, Мадэйра

Прафесійная школа, Манціжу

Сярэдняя школа імя Аўрэліі дэ Соўза, Порту

Сярэдняя школа імя Філіпы дэ Вільены, Порту

Сярэдняя школа імя Жайме Маніза, Фуншал, Мадэйра

Вышэйшая педагагічная школа імя Жана Пьяжэ, Алмада

Свабодная дзённая школа імя Луіса дэ Соўза, Алмада

Інстытут імя Дуарчэ дэ Лемуса, Агеда

**Рэспубліка Карэя**

Пачатковая школа, Чхыак

Лінгвістычная школа, Чхунам

Дзявочая сярэдняя школа, Чхунроль

Сярэдняя школа, Дэйкэй

Дзявочая сярэдняя школа, Дангіль

Сярэдняя школа, Хёян

Міжнародная сярэдняя школа, Інчхон

Сярэдняя школа, Інчхон-Ёнджон

Лінгвістычная школа, Чанпук

Сярэдняя школа Чонджу-Шынхан

Лінгвістычная школа Чанам

Пачатковая школа пры Нацыянальным універсітэце "Кёнгбук"

Дзявочая сярэдняя школа, Масан

Сярэдняя школа, Мунсан Суок

Дзявочая сярэдняя школа кампаніі Намсунг

Сярэдняя школа, Асон

Сусветная сярэдняя школа, Седжон

Сярэдняя школа, Шын Нам

Дзявочая сярэдняя школа, Шынсун

Пачатковая школа пры Нацыянальным педагагічным універсітэце Канджу

Дзявочая сярэдняя школа "Вонхва"

Сярэдняя школа, Янчхон

Сярэдняя школа Ёнджу-джэль

**Руанда**

Асацыяцыя бацькоў-адвентыстаў за развіццё адукацыі, Кічукіра

Каледж Хрыста-Цара, Ньянза

Каледж Хрыста-Цара/Ньянза

Каледж, Гісены

Каледж, Гісены (Іньемераміхіга)

Каледж святога Андрэя

Каледж святога Андрэя

Пачатковая школа святога Іосіфа

Пачатковая школа святога Іосіфа/Кічукіра

Пачатковая школа SOS

Пачатковая школа SOS, Качыру

Тэхнічная школа SOS

Тэхнічная школа SOS, Кігалі

Дзявочая школа Форума афрыканскіх жанчын-педагогаў, Кігалі

Дзявочая школа Форума афрыканскіх жанчын-педагогаў, Кігалі

Школьная група святой Бернадэты/SAVE

Школьная група Каралевы Марыі, Руаза

Школьная група Божай Маці Лурда/Біймана

Школьная група, Ньянза/Кічукіра

Школьная група Каралевы Марыі, Руаза

Школьная група Божай Маці Лурдскай, Біймана

Школьная група, Ньянза/Кічукіра

Школьная група святой Бернадэты/SAVE

Ліцэй, Кігалі

Ліцэй, Кігалі

Ліцэй Божай Маці ў Сіто

Ліцэй Божай Маці ў Сіто

Педагагічны каледж, Муханга

Педагагічны каледж, Муханга

**Славенія**

Гімназія, Цэле-цэнтр, Цэле

Гімназія, Нова-Горыца

Гімназія, Птуй

IV пачатковая школа, Цэле

Пачатковая школа імя 16 снежня, Майстрана

Пачатковая школа імя Алаіза Градніка, Добава

Пачатковая школа імя братоў Палянчычаў, Марыбар

Пачатковая школа імя Цырыла Космача, Піран

Пачатковая школа імя Цветка Голара, Шкоф'я-Лока

Пачатковая школа імя д-ра Ёжэ Пучніка, Чрэшнявец, Славенская Быстрыца

Пачатковая школа імя Душана Фліса, Хочэ

Пачатковая школа імя Франца Беўка, Толмін

Пачатковая школа Грыжэ, Грыжэ

Пачатковая школа і дзіцячы садок, Свэта-Троіца

Пачатковая школа імя Янкі Падэжніка, Марыбар

Пачатковая школа, Капэла

Пачатковая школа, Кабылье

Пачатковая школа Ледзіна, Любляна

Пачатковая школа, Пэсніца

Пачатковая школа, Палянэ, Палянэ над Шкоф'я-Лока

Пачатковая школа Сэльніца-аб-Драві

Пачатковая школа, Свэта-Троіца

Пачатковая школа імя Тонэ Чуфара, Есеніцы

Сярэдняя школа, Шкоф'я-Лока

Школьны цэнтр, Лава, Цэле

Школьны цэнтр, Птуй, Школа эканомікі

Сярэдняя будаўнічая школа і гімназія, Марыбар

Сярэдняя медыцынская і касметалагічная школа, Марыбар

Сярэдняя медыцынская школа, Цэле

**Іспанія**

Каледж, Лос-Абэтас

Публічны каледж, Урчыё

Каледж Святога Сямейства (Сарагоса)

Каледж Трабэнка

Сярэдняя навучальная ўстанова імя Сальвадора Віктрыя (кампус Манрэаль, Тэруэль)

**Злучанае Каралеўства**

Школа, Страталан

**Злучаныя Штаты Амерыкі**

Сярэдняя школа, Ганісан

United Nations
Educational, Scientific
and Cultural Organization

# ПЕРААСЭНСОЎВАЕМ НАШУ БУДУЧЫНЮ РАЗАМ

## Новы сацыяльны кантракт на адукацыю

Пераплеценая будучыня чалавецтва і нашай планеты знаходзіцца пад пагрозай. Патрэбны неадкладныя агульныя дзеянні, каб змяніць курс і пераасэнсаваць нашу будучыню. Адукацыя, якая даўно прызнаная магутнай сілай пазітыўных змен, павінна выканаць новую, тэрміновую і важную працу. Міжнародная камісія па будучыні адукацыі прэзентуе гэты даклад, які рыхтаваўся на працягу двух гадоў у рамках кансультацый, у якіх было задзейнічана каля мільёна чалавек, і запрашае ўрады, установы, арганізацыі і грамадзян ва ўсім свеце да стварэння новага сацыяльнага кантракта на адукацыю, які дапаможа нам пабудаваць мірную, справядлівую і ўстойлівую будучыню разам і для ўсіх. У дакладзе разглядаецца цяперашняе становішча адукацыі паміж мінулымі абяцаннямі і нявызначанай будучыняй, выказваюцца аргументы за абнаўленне адукацыі ў пяці вымярэннях: педагогіка, навучальныя праграмы, настаўніцтва, школы і навучанне ва ўсіх сферах жыцця, і ён заканчваецца каталізацыяй новага сацыяльнага кантракта на адукацыю з заклікамі да правядзення даследаванняў, глабальнай салідарнасці і міжнароднага супрацоўніцтва. Даклад уяўляе цікавасць для навучэнцаў, педагогаў, менеджараў і планіроўшчыкаў адукацыйных сістэм, даследчыкаў, прадстаўнікоў урадаў і грамадзянскай супольнасці; змяшчае глыбокі агляд пытанняў лічбавых тэхналогій, змянення клімату, адкату ад дэмакратыі і палярызацыі грамадства, а таксама няўпэўненай будучыні рынку працы. Даклад мае на мэце не толькі пачаць размову аб адукацыі для кожнага і ініцыяваць разважанне, але і падштурхнуць кожнага з нас да дзеянняў. У ім перш за ўсё сцвярджаецца, што дзякуючы мільёнам індывідуальных і калектыўных актаў мужнасці, лідарства, супраціву, творчасці і клопату мы здолеем змяніць курс і пераўтварыць адукацыю дзеля пабудовы справядлівай, раўнапраўнай і ўстойлівай будучыні.

9 789231 004780

**Будучыня адукацыі**
ЮНЕСКА
7, place de Fontenoy
75352 Парыж, Францыя

futuresofeducation@unesco.org
http://en.unesco.org/futuresofeducation
@UNESCO